Па-другое, пісьмовыя ўзгадкі пра больш-менш значныя гарады на Нёманскім гандлёвым шляху, якія маглі б выступіць контрагентамі Ганзы ў гандлёвых справах на ўласна літоўскіх землях Вялікага Княства Літоўскага, мы сустракаем даволі позна. Так на гандлёвым шляху па Заходняй Дзвіне і Верхнім Дняпры яшчэ да з’яўлення Вялікага Княства Літоўскага і нават самой Ганзы ўзгадваліся такія гарады, як Полацк (862 г.), Смаленск (863 г.), Віцебск (974 г.), Усвяты (1021 г.), Браслаў (1065 г.). У гандлёвым дагаворы 1229 года з Рыгай і Гоцкім берагам

Смаленск, Полацк і Віцебск дзейнічалі ў адносінах да нямецкіх купцоў адзіным фронтам. Такім чынам, на гандлёвым шляху па Заходняй Дзвіне да пачатку XIII стагоддзя ўжо сфарміравалася асяроддзе мясцовых купцоў, з якімі раннеганзейскія купцы маглі б узаемадзейнічаць. А вось узгадкі пра гарады Вялікага Княства Літоўскага, што знаходзіліся на Нёманскім гандлёвым шляху, сустракаюцца значна пазней: Гродна (1128 г.), Трокі (1316 г.), Вільня (1323 г.), Коўна (1361 г.).

Па-трэцяе, гарады на землях Прусіі і ўздоўж ніжняй плыні Нёмана, у параўнанні з тымі ж лівонскімі гарадамі, самі далучыліся да Ганзы адносна позна. Напрыклад, Рыга ў Лівоніі далучылася да Ганзейскага саюза ў 1282 годзе і з гэтага часу пераўтварылася ў адзін з самых багатых і ўплывовых ганзейскіх гарадоў ва Усходняй Прыбалтыцы. Большасць гарадоў, праз якія ажыццяўляўся гандаль па Нёманскім гандлёвым шляху, такія як Кёнігсберг, Данцыг, Тыльзіт, Рагніт, Клайпеда (Мемельбург), спачатку ўзніклі як бургі – умацаваныя крэпасці Тэўтонскага Ордэна. Толькі бліжэй да сярэдзіны XIV стагоддзя асноўныя з гэтых гарадоў сталі членамі Ганзейскага саюза (Кёнігсберг – у 1340 г., Данцыг – каля 1350 г.) і сталі належаць так званай «Прускай кватэры Ганзы». Таму не дзіўна, што ганзейскі гандаль па Нёманскім гандлёвым шляху пачаўся значна пазней, чым у Лівоніі.

Станаўленню Нёманскага гандлёвага шляху і яго далейшаму развіццю таксама спрыяў шэраг іншых прычын. Па-першае, Нёманскі гандлёвы шлях геаграфічна размяшчаўся бліжэй да Заходняй Еўропы, чым, напрыклад, той жа гандлёвы шлях па Заходняй Дзвіне, а тым больш гандлёвы шлях, які ішоў на Вялікі Ноўгарад. Па-другое, развіваліся сродкі воднага транспарту, прыдатныя для эксплуатацыі па рэках, напрыклад, такія як нёманскія сплаўныя караблі – віціны, што таксама спрыяла развіццю гандлю па Нёмане. Па-трэцяе, былі зроблены некаторыя захады па забеспячэнні належнага стану асноўных транспартных водных артэрый Нёманскага гандлёвага шляху – рэк Нёмана і Віліі. Па-чацвёртае, на ўласна літоўскіх землях ВКЛ узніклі гарады, а ў іх купецтва, з якім маглі б весці гандаль ганзейцы. Па-пятае, павелічэнне гарадскога насельніцтва, а разам з тым і рост вытворчасці ў Заходняй Еўропе выклікалі неабходнасць у сыравіне, прадуктах сельскай і лясной гаспадаркі з зямель Усходняй Еўропы. Па-шостае, напачатку XV ст. Тэўтонскі Ордэн пачаў хутка губляць свае перадавыя пазіцыі ў рэгіёне, асабліва відавочна гэта стала пасля Грунвальдскай бітвы 1410 года.

Як вядома, Ордэн спачатку мірна суіснаваў з ганзейскімі купцамі і нават падтрымліваў іх. Але з цягам часу пачаў весці варожую да іх

палітыку, бо жадаў без іх пасрэдніцтва весці гандаль як з Захадам, так і з Усходам Еўропы і мець з гэтага велізарныя прыбыткі. Асабліва гэты канфлікт інтарэсаў узмацніўся пасля таго, як Ордэн абклаў падаткамі ганзейскія гарады на сваіх землях, каб пасля паразы ў бітве пад Грунвальдам выплочваць грошы Польшчы і Літве згодна з Першым Торунскім мірам 1411 года. Акрамя таго, Ордэн імкнуўся актыўна ўмешвацца ва ўнутранныя справы ганзейскіх гарадоў, спрабаваў уводзіць у магістраты гэтых гарадоў сваіх стаўленікаў. У рэшце рэшт такія дзеянні Ордэна прывялі да Трынаццацігадовай вайны (1454–1466 гг.), калі многія ганзейскія гарады Прусіі аб'ядналіся для змагання за свае інтарэсы супраць Ордэна. Таму аслабленне Ордэна ў XV ст. таксама спрыяла развіццю ўласна ганзейскага гандлю ў рэгіёне а разам з тым і больш інтэнсіўнаму выкарыстанню Нёманскага гандлёвага шляху. Паказальна і тое, што ў першай палове XV ст. былі вырашаны тэрытарыяльныя спрэчкі паміж Ордэнам і Вялікім Княствам Літоўскім, асабліва гэта датычылася Жамойці, якая згодна з Мельнскім мірам 1422 года канчаткова перайшла да ВКЛ. Усталяваная мяжа паміж ВКЛ і Ордэнам без зменаў пратрымалася да пачатку XX стагоддзя. Дзякуючы гэтай акалічнасці стала больш бяспечна ажыццяўляць гандаль, не баючыся нападак з боку Ордэна. Такім чынам, дадзеныя прычыны, хоць кожная і ў рознай ступені, паўплывалі на развіццё Нёманскага гандлёвага шляху.

На міжнародным узроўні свабода гандлю гарантавалася ў шэрагу дагавораў і прывілеяў канца XIV – пачатку XV стст. Так, у канцы XIV ст. былі зроблены захады па рэгуляванні гандлю на ніжнім адрэзку Нёманскага гандлёвага шляху. У траўні 1390 года жыхары Жамойці абяцалі даваць дапамогу свайму каралю Вітаўту (*konige Withoud*) і Ордэну пры ўмове дазволу ім вольнага гандлю ў памежных землях Ордэна. Дакумент на гэты конт быў напісаны у Кёнігсбергу і зацверджаны пячаткай вялікага князя літоўскага Вітаўта. Жамойты пад патранажам Вітаўта ў гэтым дакуменце звярталіся не толькі да вялікага магістра, але і ўвогуле да прускіх паноў (*herrin czu Prussin*). У дакуменце таксама ўзгадваліся гарады па ніжняй плыні Нёмана, з якімі жамойты мусілі весці свабодны гандаль. У крыніцы пра гэта паведамляецца наступнае: «што людзі з Прусіі могуць ехаць у зямлю Жамойць і ажыццяўляць гандаль, таксама павінны і мы з Жамойці ехаць у Ёргенбург, Рагніт і Мемель у вашай зямлі» (*das die lute von Prussin mogin czin in das land czu Sameiten do selbins czu kouffslagen, des selbin glich zulle wir von Sameiten ouch wedir czin ken Jorgenburg, ken Ragnith und ken der Memil in ir land*) [1, с. 24]. Калі ўважліва прагледзець геаграфічную карту рэгіёна, становіцца зра-

зумела, чаму жамойты хацелі свабодна гандляваць менавіта з гэтымі гарадамі. Ёргенбург, ці Юрбарк, – сучасны горад Юрбаркас у Літве. Узнік ён як ордэнская крэпасць і размяшчаўся на правым беразе Нёмана, на шляху да Коўна (сучасны Каўнас у Літве). Рагніт – сучасны горад Нёман на беразе аднайменнай ракі ў Калінінградскай вобласці Расіі. І ў рэшце рэшт Мемель – сучасны літоўскі партовы горад Клайпеда на Балтыйскім моры. Такім чынам, гэта былі гарады, праз якія праходзіў ніжні адрэзак Нёманскага гандлёвага шляху і ў якіх ужо дагэтуль узніклі рынкі.

У тым жа траўні 1390 года вялікі маршалак Ордэна Энгельгард Рабэ (*Engilhard Rabe*) падцвердзіў сваёй пячаткай мірны і гандлёвы дагавор з жамойтамі. Па гэтым дагаворы яны атрымалі права ехаць у вышэйазначаныя гарады. З іншага боку, купцы з прускіх зямель маглі свабодна накіроўвацца ў Жамойць, дзе ім таксама павінна была аказвацца ўсялякая падтрымка і дапамога.

У Салінскім мірным дагаворы паміж Тэўтонскім Ордэнам і Вялікім Княствам Літоўскім, які афіцыйна быў заключаны 12 кастрычніка 1398 года, акрамя пытанняў з межамі, значная ўвага надавалася і пытанням свабоднага гандлю. У прыватнасці, вялікі князь Вітаўт падцвярджаў купцам Ордэна свабодны гандаль у межах сваіх уладанняў: «Таксама мусіць быць наша воля, каб людзі вышэйназванага ордэна маглі гандляваць ва ўсіх нашых землях свабодна ад мыта і іншых грашовых пабораў, якіх мы таксама павінны аберагаць як нашых, за выключэннем старых мытаў, што ўведзены здаўна і існуюць да сённяшняга часу» (*Ouch so sal is sin unser wille, das des vorgenanten ordens luthe koufslagen mogen in allen unsern landin frie von czollen und von anderm ungelde, die wir ouch beschirmen sullen als die unsern, usgenomen alde czolle, die von alders gesaczt und gewest sin bis an dese cziet*) [2]. Не выпадкова і тое, што абмен граматамі з тэкстам гэтага дагавора адбыўся на выспе Салін, якая знаходзілася насупраць упадзення ракі Невяжы ў Нёман. Такім чынам, зацвярджэнне дагавора прайшло на памежжы сфер уплыву на Нёманскім гандлёвым шляху.

Згодна з Першым Торунскім мірам 1411 года межы паміж Ордэнам, Польшчай і ВКЛ таксама былі адкрытыя для гандлю. Галоўным чынам з гэтага палажэння ў наступным выгаду мелі купцы з прускіх гарадоў, асабліва Данцыга і Кёнігсберга, якія актыўна пачалі карыстацца сваей геаграфічнай блізкасцю да Вялікага Княства Літоўскага. З гэтага часу пачалося хуткае развіццё гандлю. Напрыклад, калі пасля Грунвальдскай бітвы і Першага Торунскага міру гандаль Данцыга з Польшчай

аднаўляўся вельмі марудна і спазнаваў розныя перашкоды, то з Вялікім Княствам Літоўскім ён аднаўляўся больш хутка і не меў такіх перашкод, як гэта было ў Польшчы [8, с. 159]. Таксама неабходна ўзгадаць, што акрамя таго ў 1415 годзе Вітаўт даў дазвол нямецкім купцам на свабодны гандаль у Вялікім Княстве Літоўскім. У дадзенай грамаце Вітаўт падцвярджаў свабодны рух у межы сваёй дзяржавы для купцоў вялікага магістра Ордэна Міхеля Кохмайстра (*Michel Kochmeister*). Гэтае прадпісанне адносна купцоў было зроблена праз год пасля заключэння міру ля Штрасберга, дарэчы ганзейскага горада. У лісце Вітаўта было сказана, што купцы «вышэйназванага вялікага магістра мусяць ехаць са сваімі таварамі свабодна і ў бяспецы ў нашу краіну Літву, а адтуль ізноў да сваёй радзімы» (*des obenbenumptin herren homeisters in vnsir landt czu Lythauwen vnd wider von dannen cyu irem heymut mit irer kowffenschacz macht sullen haben czu czihen frey vnd sicher*) [18, с. 151]. Такім чынам, нягледзячы на ваенныя канфлікты і непаразуменні з Ордэнам, з боку вялікага князя літоўскага надавалася вялікая ўвага гандлёвым зносінам з нямецкімі купцамі. З боку кіраўніцтва Ордэна таксама мелася разуменне таго, што гандаль з ВКЛ не ў апошнюю чаргу з'яўляецца падмуркам дабрабыту ордэнскай дзяржавы. Таму відавочна, што ў Сярэднія вякі паміж Ордэнам і Вялікім Княствам Літоўскім мелі месца не толькі старонкі гісторыі ваенных сутыкненняў, але і мірнага гандлёвага ўзаемадзеяння.

У канцы XIV – пачатку XV стст. пачаў набіраць моц гандаль драўнінай, а, як вядома, землі Вялікага Княства Літоўскага абапал Нёмана былі вельмі багатымі на гэтую сыравіну. Напрыклад, да сённяшняга часу ў верхняй плыні Нёмана захаваліся рэшткі тых неабсяжных лясных чашчоб – Налібоцкая і Ліпічанская пушчы. Вакол Гродна таксама былі лясныя гушчары, якія цягнуліся па плыні Нёмана з абодвух бакоў. У паэме «Песня пра зубра», выдадзенай у 1523 годзе ў Кракаве, Мікола Гусоўскі ўзгадваў пра неабсяжныя лясы на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага: «Тут на спрыяльнай зямлі, растуць самавітыя дрэвы, большых лясоў ці садоў я і не бачыў яшчэ» [6, с. 19]. Таксама ён паведамляў пра дастаўку тавараў па водных шляхах і гандаль у часы вялікага князя Вітаўта: «Хай прыплываюць да нас караблі адусюль за набыткам, вечна кішаць берагі мноствам тавараў любых. Рэкі, якія нясуць багацці на цэлыя землі, лайбы прыводзяць купцоў з туга набітай сумой» [6, с. 18]. Адным з асноўных тавараў, што ішлі з зямель ВКЛ у Прусію ў тыя часы, была драўніна. Мікола Гусоўскі апісваў, як яна туды трапляла: «Процьму кражытых дрэў па рэках сплаўляюць у мора, з дрэваў пасля караблі

робяць, будынне кладуць там, дзе бракуе лясоў і дзе лясіна патрэбна, каб жытло чалавек меў для радзіны сваёй» [6, с. 19].

Такім чынам, гандаль драўнінай ажыццяўляўся па Нёмане і іншых рэках. З дрэваў вязаліся плыты, якія потым перапраўляліся ўніз да прускіх гарадоў. Больш каштоўную драўніну, відавочна, перавозілі на караблях. У 1405 годзе да вялікага князя Вітаўта па дапамогу ў справе гандлю драўнінай звярнуўся вялікі магістр Ордэна. Вялікі магістр скардзіўся на тое, што калі ён быў у Коўне, то даў згоду пісару Вітаўта Конраду, каб той мог сплавіць драўніну ўніз па рацэ (*das holcz czu flieszen*). Але на тую ж самую драўніну свае правы заявіў вялікі шэфер (*grosscheffer*), г. зн. ордэнскі эканом, які загадваў гаспадарчымі справамі Ордэна. «Калі яшчэ быў мір, драўніна за грошы Ордэна была зрублена, прывезена і складзена на беразе, але ў немірны час яе было забаронена сплаўляць, так што па сённяшні дзень яна засталася ляжаць нязвязаная» (*das das holcz in der czeit, als noch der frede was, mit unserm gelde gehuwen, gefurt und offs uber gesaczt, und im unfrede verboten wart czufliesen, also, das is hutes tages noch stee ungebunden*). Відавочна, што пісар Конрад быў чалавекам даволі прадпрымальным: ён звязаў гэтую драўніну і ўжо гатовы быў адправіць яе на продаж. З гэтай нагоды вялікі магістр і звяртаўся да Вітаўта, каб вялікі князь літоўскі «дазволіў слугам шэфера сплавіць тую драўніну і самім даставіць яе ў Данцыг» (*das holz unsers scheffers dinern lassen czu folgen czu fliesen und ken Danczk czu brengen*) [1, с. 109].

Вялікі князь літоўскі Вітаўт добра разумеў надзвычай вялікую важнасць Нёманскага гандлёвага шляху. Пра гэта сведчыць таксама той факт, што ў 1428 годзе ён адпісаў у тэстаменце сваей жонцы шэраг пасяленняў вакол Нёмана ў Навагародскай зямлі (*terram castrumque Nowogrodek Lithwanicum, cum toto districtu Nowogrodensi*). У іх ліку ўзгадваліся такія пасяленні, як Новае Сяло, Гарадзечна, Брэцена, Басіна, Паўбераг, Дзяляцічы, Любча, Асташына, Негнявічы, Палоная, Карэлічы, Свержань (*Nowesiolo que nunc Kubarka appelatur, item Horodeczna, Bretena, Bassyno, Puolbreha, Dolaticze, Lubcz, Ostaschino, Niehniewicze, Polonaia, Korelicze, Swerszno*) [1, с. 793–794]. Некаторыя з гэтых пасяленняў узніклі як пункты сплаву драўніны альбо як верфі для вырабу нёманскіх гандлёвых суднаў – віцін. Рачныя судны, якія былі сродкамі зносін, ужо ў XIV ст. называліся стругамі і віцінамі [22, с. 74]. Без наяўнасці віцін гандаль на Нёманскім гандлёвым шляху быў бы немагчымы. Віціны былі даволі буйныя караблі шырынёй 4–11 і даўжынёй 30–35 метраў (па некаторых звестках, шырынёй 12–20 локцяў, даўжынёй 75–90 локцяў) з плоскім донішчам. Таму заглыбленне ў ваду было невялікім. Грузападымаль-

насць 70–100 тон (па іншых даных, 10–14 тыс. пудоў). Кіравалі віцінай гаспадар, лоцман і абслуга ў колькасці 10–12 чалавек [21, с. 74–75]. Для пабудовы такіх караблёў неабходна было мець прыдатныя матэрыялы: драўніну для вырабу корпуса карабля і мачтаў, тканіны для ветразей, каноплі для вяровак. Усе гэтыя матэрыялы ў патрэбнай колькасці меліся на землях уздоўж верхняй плыні Нёмана. Таксама ўжо былі рамеснікі, якія валодалі тэхнікай пабудовы рачных суднаў.

Такім чынам, напрыканцы 30-х гг. XV ст. на верхнім адрэзку Нёманскага гандлёвага шляху ўжо дакладна меўся шэраг пасяленняў, якія маглі б абслугоўваць патрэбы гандлю і суднаходства па Нёмане. Трэба мець на ўвазе, што вышэйадзначаныя пасяленні ўзніклі раней, чым узгадваліся пісьмова. У больш позні час некаторыя з гэтых пасяленняў зрабіліся мястэчкамі, напрыклад, такія як Свержань, Любча і Карэлічы. Калі аб'ём гандлю значна павялічыўся, на Нёманскім гандлёвым шляху ўзніклі новыя пасяленні, пра якія мы маем пісьмовыя згадкі больш позняга часу. Так, на верхнім адрэзку Нёманскага гандлёвага шляху ўзгадваліся Масты і Стоўбцы. Першую згадку пра Масты мы знаходзім у адной з кніг Літоўскай Метрыкі (Дзяржаўнага архіва ВКЛ) пад 1486 годам. Значыць Масты ўжо да гэтага часу былі мястэчкам, у якім жыхары займаліся не толькі сельскай гаспадаркай, але рамяством і гандлем [19, с. 3–4]. На пачатку XVI ст. сустракаюцца звесткі пра Стоўбцы, якія потым пераўтварыліся ў даволі значны гандлёвы горад з рачным прыстаннем для караблёў, амбарамі для збожжа, а таксама складамі для розных тавараў, што вывозіліся па Нёманскім гандлёвым шляху ў Прусію.

У 1428 годзе вялікі князь Вітаўт здзейсніў аб'езд сваёй дзяржавы. Па дарозе да яго далучыўся шут Геннэ, які з'яўляўся тайным агентам Ордэна [10, с. 85]. Геннэ на свае вочы пабачыў багацці Вялікага Княства Літоўскага, большасць з якіх потым па Нёманскім гандлёвым шляху трапляла ў Заходнюю Еўропу. Ордэнскі агент паведамляў пра розныя падарункі, якія іншыя князі прыносілі Вітаўту падчас яго вандроўкі. Асабліва часта ў якасці падарункаў Геннэ ўзгадваў каштоўнае футра звяроў, у прыватнасці сабалінае, а таксама вялікую колькасць коней. Натуральна, што на землях ВКЛ Ордэн меў сваіх шпегаў і агентаў, якія перадавалі інфармацыю не толькі пра палітычную сітуацыю ў краіне, але і пра гандлёва-эканамічныя справы.

Адметнасцю Нёманскага гандлёвага шляху было тое, што Ордэн кантраляваў яго ніжні адрэзак, і таму ганзейскія купцы павінны былі пры вядзенні гандлю гэта ўлічваць. У часы Вітаўта гандаль вёўся пераважна з Ордэнам. Пасля смерці Вітаўта (1432 г.) змены адбыліся не

толькі ў палітычным жыцці краіны, але і на Нёманскім гандлёвым шляху. Грамадзянская вайна, што распачалася ў Вялікім Княстве Літоўскім (1432–1439 гг.), мякка кажучы, не спрыяла развіццю гандлёвых адносін. Непасрэдныя зносіны купцоў Данцыга з Вялікім Княствам Літоўскім у гэты час значна скараціліся. Замест таго купцы ВКЛ самі сталі ў вялікай колькасці наведвацца ў Данцыг. Ордэн і Данцыг паводзілі сабе ў дачыненні да іх вельмі асцярожна, таксама як і ў адносінах да палякаў [13, с. 155]. Сітуацыя ў гандлі па Нёманскім гандлёвым шляху змянілася пасля прыходу да ўлады Казіміра Ягелончыка. Менавіта пры ім вялікая ўвага стала надавацца зносінам з Ганзай. Нямецкія купцы ў Коўне атрымалі ад вялікага князя літоўскага Казіміра ў 1441 годзе значныя прывілеі. Як лічыцца, з гэтага часу афіцыйна пачала дзейнічаць ганзейская кантора (гандлёвае прадстаўніцтва Ганзы) у Коўне, якая афіцыйна праіснавала да 1532 года.

Трэба адзначыць, што горад Коўна яшчэ ў часы Вітаўта меў даволі трывалыя гандлёвыя стасункі з гарадамі Прусіі і Ордэнам. Так, Ордэн, па некаторых звестках, яшчэ ў 1398 годзе даў дазвол на заснаванне нямецкага гандлёвага пасялення ў Коўне [17, с. 335]. Як бы там ні было, але гандлёвыя кантакты горада значна пашырыліся толькі пасля атрымання ім у 1408 годзе Магдэбургскага права. Дзейнасць самой ганзейскай канторы ў Коўне была непасрэдна звязана з Нёманскім гандлёвым шляхам. З пункту гледжання лагістыкі, горад Коўна размяшчаўся ў вельмі прыдатным месцы – пры зліцці рэк Вілія і Нёман. Ганзейскія купцы, такім чынам, маглі атрымліваць тавары ВКЛ з двух напрамкаў. Першы напрамак ішоў праз Гродна з зямель, што знаходзіліся вышэй па Нёмане. Другі напрамак ішоў па Віліі, на беразе якой знаходзіўся адзін з самых буйных гарадоў ВКЛ – Вільня. Як вядома, яшчэ напачатку XV ст. Ордэн імкнуўся абмежаваць рух прускіх купцоў на Вільню. У 1413 годзе Ордэн нават прапанаваў, каб купцы з ВКЛ маглі рухацца толькі да Рагніта і Растэнбурга, а прускія купцы у сваю чаргу мелі права рухацца толькі да Гродна і Коўна [4, с. 26]. Але, нягледзячы на такую забарону з боку Ордэна, ганзейскія купцы ўсё ж такі наведваліся ў Вільню. Больш за тое, у Вільні ў іх, як і ў Коўне, узнікла гандлёвае пасяленне [8, с. 159].

Відавочна, што на Нёманскім гандлёвым шляху купцы з Гродна, Вільні і Коўна занялі передавыя пазіцыі. Яны з’яўляліся тымі, хто непасрэдна дастаўляў ганзейцам тавары з розных куткоў Вялікага Княства Літоўскага, а таксама набываў ганзейскія тавары і распаўсюджваў іх далей па рынках іншых гарадоў краіны. Асабліва прывілеяванае становішча ў такім гандлі спачатку займалі жыхары Вільні, якія маглі

без мыта набываць тавары па ўсіх землях Вялікага Княства Літоўскага. Грамата на бяспошліннае набыццё тавараў «месцічам віленскім» была выдадзена ў верасні 1432 года. У грамаце нават геаграфічна акрэсліваліся тыя гарады, дзе з жыхароў Вільні не павінна было здымацца мыта: «Мы велики кнзъ Жикгимонтъ даемъ ведомо всякому сею нашою грамотою пожаловали есмо. виленскихъ местичовъ. ляховъ и руси што имъ мыта недавати. по всей нашои земли какъ издавна не давали а отпустили. есмо имъ вся мыта вечно А протож штобы есте на всихъ виленских местичох мыта не имали ани которыхъ пошлинъ торговыхъ в луцку в киеве и по подольской земли оу смоленскуи оу берестьи в новъгородку оу менску в ковне и по инымъ пак мытомъ по рекамъ и по мостом по ставомъ где николи будуть мыта» [3, с. 2, № 2]. Таму зусім не дзіўна, што купцы з Вільні засяродзілі ў сваіх руках таварапатокі, якія па Нёманскім гандлёвым шляху праз ганзейцаў накіроўваліся ў Прусію, а адтуль разыходзіліся далей па Заходняй Еўропе.

Тое, што па Віліі ад Вільні да Коўна было магчыма суднаходства, як мага лепей спрыяла развіццю гандлёвых стасункаў. Рака Вілія, таксама як і рака Шчара, даволі працяглы час з'яўлялася неад'емнай часткай Нёманскага гандлёвага шляху. Так, вялікі князь літоўскі Казімір клапаціўся пра належны стан водных шляхоў, па якіх ажыццяўлялася дастаўка тавараў ВКЛ ганзейскім купцам. У 1443 годзе ён выдаў грамату, што тычылася суднаходства па Віліі. Вось што было напісана ў дадзенай грамаце: «От великого кнзя казимира королевича. намъстникомъ нашимъ. и тивуномъ. и бояромъ всимъ. по обе стороне вельи от вилни. и до ковна. которыи коли вилневци. пойдуть по вельй с торговлею судномъ. и выбы ихъ пропускали. по нашимъ Езомъ. и по боярьскимъ. починяйте ворота. куда судомъ ходити. также и берегъ приволили есмо имъ. со всею нашею радою. по обею сторонамъ вельи судно тягнути. и въ верхъ. и на низъ. и выбыимъ и берега не боронили. занюж то есть наше доброе. и земьское» [3, с. 10, № 8]. Езы – запруды для лоўлі рыбы, якія звычайна размяшчаліся ўпоперак рэк, безумоўна, перашкаджалі суднаходству. Загад вялікага князя Казіміра забяспечыць бесперашкодны рух па рацэ яшчэ раз сведчыў пра значную ролю ў эканамічным жыцці Вялікага Княства Літоўскага гандлю з Ганзай.

Галоўным цэнтрам ганзейскіх купцоў на Нёманскім гандлёвым шляху нягледзячы на тое, што яны мелі свой гандаль і ў Вільні, стаў горад Коўна. Вышэйазначаны прывілей вялікага князя літоўскага Казіміра, выдадзены ім у студзені 1441 года, дазваляў нямецкім купцам у Коўне гандляваць па старым звычаі, як гэта было ў часы Вітаўта. Жыхары

Коўна павінны былі яго прытрымлівацца і не рабіць аніякіх перашкод немцам у гандлі (*Hyrumb gebiten wir euch ernstlich, das Jr den egenanten kawffman bey der alden gewonheit, den her bey des offtegenanten heren herczog wytowds geczeiten gehat hat, lasset vnd haldet*) [5, с. 280–281, a].

У Коўне ў немцаў склалася арганізацыя накшталт той, якая назіралася ў іншых канторах Ганзы на Усходзе Еўропы. На чале ганзейскай канторы ў Коўне стаялі некалькі «эльтэрманаў», г. зн. старэйшын, якія павінны былі кантраляваць дзейнасць канторы па ўсіх напрамках, а таксама выконваць шэраг пэўных функцый. Так, яны павінны былі сачыць за новымі купцамі, што прыехалі, растлумачваць ім правілы паводзін і статут канторы, збіраць у агульную касу грошы на патрэбы канторы, адстойваць інтарэсы членаў канторы перад кіраўніцтвам горада і вялікімі князямі літоўскімі, вырашаць спрэчкі паміж купцамі.

З самага пачатку свайго існавання кантора Ганзы ў Коўне была падпарадкавана Данцыгу. Больш за тое, яна і ўзнікла як «праект» ганзейскіх гарадоў Прусіі на чале з Данцыгам. Як Рыга ў Лівоніі была тым месцам, куды звярталіся са скаргамі, ці па дапамогу купцы з ганзейскай канторы ў Полацку, таксама Данцыг у Прусіі з’яўляўся такой апеляцыйнай інстанцыяй для ганзейскіх купцоў з Коўна (*gemeynen dwtschen Copmann to kauwen*). Ніхто іншы, акрамя магістрата Данцыга, не меў права прызначаць эльтэрманаў для канторы ў Коўне. Напрыклад, вядома, што ў 1448 годзе на пасады эльтэрманаў ім былі зацверджаны Ганс Мэйнрык (*hans meynrik*) і Ніклас Рунаў (*niclos Runow*) [5, с. 281, b]. Дзейнасць эльтэрманаў у Коўне ніколі не была лёгкай, бо заўсёды ўзнікалі спрэчкі паміж купцамі як унутры самой канторы, так і паміж ганзейскімі купцамі і купцамі Вялікага Княства Літоўскага. Напэўна, нямецкія купцы жылі даволі замкнёна, бо ў 1451 годзе купцы з ВКЛ скардзіліся ў Данцыг, што «нямецкія купцы ў Коўне і Вільні арандуюць дамы і двары, у якіх жывуць, купляюць асабіста сабе ежу, а не сядаюць з гаспадарамі і не харчуюцца разам, хоць гэта было б больш зручна для купцоў і прыносіла б больш паразумення і сяброўства» (*Item das der Deutsche kouffman zcu Cauwen und zcur Wille mitten hewser und hoffe, darinne sie wonen, ire eygene speisze kouffen und nicht mit den wirten in den herbergen legen adir czeren, so es doch meh beqwemer were dem kouffmanne und mehr frundschafft brechte, so sie in den herbergen legen*) [9, с. 79–80, № 110, арт. 7].

Трынаццацігадовая вайна (1454–1466 гг.) перапыніла дзейнасць канторы ў Коўне і замарудзіла ганзейскі гандаль па Нёманскім гандлёвым шляху. Пасля заканчэння вайны і заключэння Другога Торунскага міру

ў 1466 годзе гандлёвыя зносіны былі адноўлены, хоць і суправаджаліся некаторымі спрэчкамі і недарэчнасцямі. З нагоды такіх непаразуменняў кіраўніцтва Данцыга ў 1467 годзе мусіла звяртацца па дапамогу да літоўскіх ваяводаў, што кантралявалі гандаль па Нёманскім гандлёвым шляху з боку Вялікага Княства Літоўскага. Данцыг паведамляў ваяводам гарадоў Вільня, Гродна, Трокі, Коўна і ваяводу Жамойці, што, нягледзячы на старыя прывілеі часоў Вітаўта, а таксама прывілеі вялікага князя літоўскага і караля польскага Казіміра, яго бюргеры і купцы спазнаюць у ВКЛ, у прыватнасці ад бюргераў і жыхароў Коўна, усялякія крыўды і перашкоды (*dasz unsere burger unnd kouffleuthe, die in groszfursthume zcu Letthowen nemlich zcu Kawen vorkeren unnd er koufmanschatcz uben, haben vorczelen laszen, wie sye sich besorgen, das sie durch die borger unnd inwonere zcu Kauwen merglich besweret unnd zcu umbilligen unpflichten widder alle gewonheith unnd gerechtikeith nemlichen durch den hochgeborenen zeliger gedechtnisz hertczogh Wytowde gnediclichen vorlegen und dornach durch den irluchtigsten hochgeborenen fursten unnd hern ern Kazimir konig zcu Polan groszfursten zcu Litthauwen, unszeren allergnedigsten hern, bestetigt unnd geconfirmiret, welche brieffe bey uns in gutter bewarunghe legen, genotiget unnd gedranget mochten werden*) [7, с. 270–271, № 416]. Як бачым, Данцыг у сваім лісце заклікаў не парушаць правы нямецкіх купцоў у Коўне і не перашкаджаць ім у гандлі.

Такім чынам, ганзейскія купцы з Коўна ў сваіх скаргах звярталіся не куды-небудзь а ў горад Данцыг. У сваю чаргу Данцыг абараняў іх інтарэсы перад вышэйшым кіраўніцтвам Вялікага Княства Літоўскага. Тут трэба мець на ўвазе, што вялікія князі літоўскія, з аднога боку, хацелі падтрымаць купцоў ВКЛ і таму імкнуліся рэгламентаваць гандаль нямецкіх купцоў на сваіх землях. Але, з іншага боку, было відавочна, што цалкам абмяжоўваць ганзейскі гандаль на Нёманскім гандлёвым шляху для Вялікага Княства Літоўскага не мела ніякага сэнсу, бо гэты гандаль прыносіў значныя прыбыткі. Аднак трэба было зацвердзіць пэўны парадак гандлёвых зносін. Напэўна, таму каля 1470 года вялікі князь літоўскі і кароль польскі Казімір выдаў ардананс для ганзейскіх купцоў у Коўне. Складаўся гэты ардананс з 26 артыкулаў і павінен быў рэгламентаваць дзейнасць ганзейскай канторы ў Коўне. У адпаведнасці з гэтым ардanансам, нямецкім купцам падцвярджалася права на арганізацыю, а менавіта: яны павінны былі трымаць двух эльтэрманаў і чатырох прысяжных, якія б дапамагалі гэтым эльтэрманам. Так, «эльтэрманы са сваімі прысяжнымі павінны былі збіраць сход» (*so sollen de oldermans mit eren bysitters eyne steven holden*), дзе

вырашаліся б розныя справы канторы [7, с. 626, № 688, арт. 2]. Акрамя пытанняў па арганізацыі самой канторы, увага надавалася канкрэтным пытанням ажыццяўлення гандлю, напрыклад, такім як парадак набыцця розных катэгорый тавараў, наём (фрахт) караблёў, пагрузка і разгрузка караблёў. Арданансам уводзілася абмежаванне па часе для знаходжання ганзейскіх купцоў у Коўне: «Затым ніякі нямецкі купец, які належыць да Ганзы, не павінен заставацца тут больш як за адзін год, так ён павінен скончыць свае справы і ад’ехаць» (*Item so sal ok geyn Duwetsch kopman, de in der Henze is, lenger hir liggen wen eyn jare, so sal he affkamen und sal syner herschop rekenschop doen*) [7, с. 627, № 688, арт. 19]. За парушэнне многіх артыкулаў ардананса ўводзіліся штрафы, якія эльтэрманы павінны былі збіраць з вінаватых.

Нягледзячы на ўсе супярэчнасці, якія існавалі як у самой канторы, так і ў стасунках з жыхарамі Коўна, ганзейскі гандаль з Вялікім Княствам Літоўскім пасля Другога Торунскага міру (1466 г.) спазнаў пярыяд свайго росквіту. Так, у мытных спісах 1473 года ўзгадвалася вялікая колькасць імёнаў жыхароў Данцыга, якія ўносілі грошы на паляпшэнне воднага шляху, а таксама аплочвалі мытныя пошліны [4, с. 82]. Ганзейская кантора ў Коўне ў гэты час зрабілася, калі можна так сказаць, цэнтрам усяго ганзейскага гандлю на сярэднім адрэзку Нёманскага гандлёвага шляху.

Але, як вядома, акрамя канторы ў Коўне ганзейскія купцы наведваліся ў Вільню, Трокі і Гродна. Так, на Нёманскім гандлёвым шляху горад Гродна адыгрываў даволі значную ролю ў зносінах з Захадам. У 1444 годзе вялікі князь і кароль Казімір, калі знаходзіўся ў Брэсце, выдаў гораду Гродна прывілей на так званае Магдэбургскае права. Горад атрымліваў уласны герб, вызваляўся ад павіннасці рамантаваць каралеўскія замкі, пастаўляць фурманкі каралеўскім чыноўнікам і інш. Іншагароднія купцы маглі гандляваць у горадзе з Магдэбурскім правам не інакш, як оптам [15, с. 18]. Цікавы і той факт, што ў 1463 годзе менавіта ў Гродне вялікі князь Казімір хаваўся ад заразнай хваробы, якая тады распаўсюдзілася па Вялікім Княстве Літоўскім.

Праз некалькі гадоў пасля смерці Казіміра, а больш дакладна ў 1496 годзе, новы вялікі князь Аляксандр пацвердзіў і дапоўніў Магдэбургскае права, дадзенае яго папярэднікам гораду Гродна. Паводле прывілею Аляксандра, гродзенцам дазвалялася пабудаваць на Нёмане млын і карыстацца прыбыткамі з яго, дазвалялася мець невялікі луг для гаспадарчых патрэб, таксама надавалася права на трыманне трох корчмаў, грошы ад якіх павінны былі ісці на гарадскую карысць; акра-

мя таго гродзенцы мелі права на пабудову ратушы і гарадской лазні. Асаблівае значэнне для Гродна як для гандлёвага горада мела яго права на пабудову каменнага будынка (камяніцы), у якім была ўсталявана васкабойня, а таксама захоўваліся шалі і вагі для ўзважвання воску. Таксама ўсталёўваліся меры вагі для збожжа і мёду. Відавочна, што эталон вагі гэтых тавараў захоўваўся ў ратушы (*Beda tez miec na ratuszu miare zboz, to iest: beczke ratuszna y miare miodu, to iest, miednice*) [16, с. 61]. Такім чынам, для ўзважвання збожжа ў Гродне выкарыстоўвалася «бочка ратушная».

Гродзенцам дазвалялася праводзіць тры кірмашы ў год, што спрыяла развіццю менавага гандлю. У прывілеі Аляксандра адлюстраванне таксама знайшоў факт знаходжання горада на Нёманскім гандлёвым шляху. Паводле прывілею Аляксандра, жыхары Гродна, якія ехалі па рацэ Нёман да Коўна ці адпраўляліся па рацэ Нецe на Прусію, не павінны былі плаціць ніякіх мытаў (*A sami przerzeczeni obywatele Grodzienscy ku Kownowi przez Niemen idacy zadnemu z nich placic myta, ani na rzece Necie ku Prussam idac, przerzeczone myto y clo placic nie beda powinni*) [16, с. 60–61]. Гэтае палажэнне для горада мела асаблівае значэнне, бо Гродна з'яўлялася буйным пастаўшчыком сельскагаспадарчых прадуктаў на еўрапейскія рынкі. Сувязь з Захадам падтрымлівалася водным шляхам, а таксама шляхамі па сушы. Па Нёмане і Нецe ў Гданьск (Данцыг) і Крулявец (Кёнігсберг) на віцінах вывозілі сельскагаспадарчыя прадукты і жывёлу. У XVI ст. Гродна падтрымлівала трывалыя гандлёвыя сувязі з буйнымі гарадамі Польшчы – Варшавай, Вроцлавам (Брэслаў), Люблінам і інш. Праз Гродна праходзіў шлях, які злучаў Вільню, Бельск, Варшаву і Торунь [11, с. 19]. Відавочна, што Гродна, якое знаходзілася на перакрыжаванні шляхоў, у прыдатным для гандлю месцы, вельмі хутка багацела. Таму зразумела, чаму ў 1507 г. вялікі князь літоўскі і кароль польскі Жыгімонт І выдаў прывілей некалькім гродзенскім мяшчанам і габрэям на збіранне пошліны з воску ў Гродне. Яны па загаду Жыгімонта І павінны былі «в каждого купца отъ каменя воску по шести грошей брати на насъ» [12, с. 479]. Такім чынам уладары ВКЛ імкнуліся атрымліваць прыбыткі на Нёманскім гандлёвым шляху не толькі са звычайных мытаў, але дадаткова з канкрэтных катэгорый найбольш распаўсюджанных тавараў – солі і воску.

З Заходняй Еўропы ў Вялікае Княства Літоўскае па Нёманскім гандлёвым шляху ўвозіліся галоўным чынам сукно, шоўкавыя тканіны, соль, сялёдка, віно. Таксама ўвозіліся «паўднёвыя тавары», г. зн. розная садавіна, разынкі, спецыі, перац і інш. Але самым пашыраным таварам,

які ішоў з Захаду, з’яўлялася соль. З зямель Вялікага Княства Літоўскага па Нёманскім гандлёвым шляху галоўным чынам вывозіліся такія тавары, як драўніна, попел, смала, воск, мёд, футра, скуры, збожжа, каноплі, алей і іншыя прадукты сельскай і лясной гападаркі.

Па Нёманскім гандлёвым шляху гандаль стаў магчымым у першую чаргу дзякуючы таму, што рэкі Вілія, Нёман і Шчара з’яўляліся суднаходнымі артэрыямі, якія злучалі гарады Прусіі з землямі Вялікага Княства Літоўскага. Нёманскі гандлёвы шлях (на першую палову XVI ст.) магчыма ўмоўна падзяліць на тры адрэзкі: ніжні, сярэдні і верхні. Ніжні адрэзак Нёманскага гандлёвага шляху праходзіў ад Кёнігсберга да Юрбарка. Сярэдні адрэзак – ад Юрбарка да Коўна. Верхні адрэзак у сваю чаргу таксама можна падзяліць на тры адгалінаванні: 1) ад Коўна да Вільні і вышэй па рацэ Вілія, 2) ад Коўна праз Гродна, Масты і Любчу да Свержаня і Стоўбцаў, 3) ад Коўна праз Гродна і Масты па рацэ Шчара да Слоніма. Безумоўна, гэты падзел з’яўляецца даволі штучным, але можа быць выкарыстаны як мадэль для далейшага даследавання гісторыі гандлю, развіцця гарадоў і пасяленняў на Нёманскім гандлёвым шляху.

У сваіх гандлёвых вандроўках да Коўна ганзейскія купцы карысталіся старым водным шляхам, з Віслінскай затокі яны па рэках Прэголя (*Pregel*) і Дайма (*Deime*) выходзілі ў Куршскую затоку, а адтуль траплялі непасрэдна праз вусце на раку Нёман. У XIV ст., як вядома, былі праведзеныя некаторыя інжынерныя работы па ўдасканаленні водных шляхоў на ніжнім адрэзку Нёманскага гандлёвага шляху. Злучэннем паміж Прэголяй і Куршскай затокай выступала рака Дайма; гэта быў штучны суднаходны шлях, які стаў магчымы дзякуючы шлюзам у Тапіяў (сучасны горад Гвардзейск у Калінінградскай вобл. Расіі) і ў Лабіяў (сучасны горад Палеск у Калінінградскай вобл. Расіі). Ужо з 70-х гадоў XIV ст. можна знайсці дакументальныя пасведчанні пра існаванне гэтага воднага шляху. Перш за ўсё, такія пасведчанні былі звязаны з узгадкай у інвентарах ордэнскай крэпасці Рагніт надзвычай пласкадонных краблеў, якія курсіравалі па Дайме. Гэты першапачаткова створаны для вайсковых выправаў на Літву водны шлях, у прыватнасці, пачаў выкарыстоўвацца надалей для гандлёвых зносінаў з ВКЛ, а таксама як шлях для транспартавання будаўнічых матэрыялаў і прадуктаў харчавання для ордэнскіх замкаў вакол Нёмана. Для большай бяспекі водных шляхоў, асабліва на Куршскай затоцы, Ордэн запланаваў таксама будаўніцтва яшчэ аднаго канала, аднак так і не здолеў яго завершыць з-за вялікіх тэхнічных складанасцей [14, с. 121]. Такім чынам, ганзейскія купцы і купцы Ордэна ў XV–XVI стст. карысталіся штучнай каналізаванай, г. зн. ператворанай у

канал ракой Дайма, па якой яны траплялі ў Куршскую затоку, а адтуль па Нёмане да заходніх зямель ВКЛ. Рух тавараў, якія прыбывалі з зямель Вялікага Княства Літоўскага, адбываўся ў адваротным кірунку па Дайме на Кёнігсберг. Гэты горад займаў трывалыя пазіцыі ў гандлёвых зносінах з ВКЛ. Пачынаючы з 1466 года, купцы з Кёнігсберга прымалі актыўны ўдзел у вандроўках па Нёманскім гандлёвым шляху да Коўна [22, с. 73]. У Кёнігсбергу меліся склады для беларускіх і літоўскіх тавараў, што траплялі сюды па Нёманскім гандлёвым шляху. Таксама меліся склады для ганзейскіх тавараў, што ішлі ў Коўна, Вільню, Трокі, Гродна і іншыя гарады Вялікага Княства Літоўскага. Ганза і Ордэн пільна сачылі за якасцю тавараў, што прыходзілі з зямель Вялікага Княства Літоўскага. Перш чым трапіць на рынкі Заходняй Еўропы, гэтыя тавары праходзілі жорсткі кантроль. Так, у Кёнігсбергу меліся спецыяльныя асобы – «бракары» (*Braker, wraker*), якія пры аглядзе таго ці іншага тавара павінны былі вырашыць, ці адпавядае ён неабходным патрабаванням якасці. Калі тавары былі дрэннай якасці ці ўвогуле пашкоджаныя, бракары прызнавалі іх недабраякаснымі. «Бракоўнае права» (*Brakrecht*) з'яўлялася добрай крыніцай прыбыткаў горада, які ім валодаў. Напрыклад, у 1450 годзе магістрат Данцыга вёў перапіску з Кёнігсбергам адносна «бракоўкі» попелу, які прыходзіў з Вялікага Княства Літоўскага [5, с. 281]. Магістрат Данцыга скардзіўся ў сваім лісце, што яго купцы, якія прывозяць з ВКЛ попел, павінны плаціць кёнігсбергскім бракарам за іх працу ўжо больш грошай, чым дагэтуль. Як знак якасці бракары з Кёнігсберга на бачурках з попелам выпальвалі выяву мядзведжай лапы [16, с. 137]. Пільнай бракоўцы таксама падвяргалася драўніна, што прыходзіла з Вялікага Княства Літоўскага. Ганзейскія купцы імкнуліся набываць якасную драўніну, таму што яна ішла не толькі на будаўніцтва дамоў, але і на караблебудаўнічыя мэты самой Ганзы. Таму правяраць драўніну імкнуліся не толькі ў Кёнігсбергу, але і ў Коўне, і непасрэдна на месцах яе складання ў лясах. Безумоўна, гэта не падабалася купцам з Вялікага Княства. Увесь час існавання ганзейскай канторы ў Коўне і ганзейскага гандлю па Нёманскім гандлёвым шляху Вялікае Княства Літоўскае імкнулася абмежаваць ганзейскім купцам непасрэдны доступ на свае ўнутраныя рынкі, што рабілася для абароны ўласных гандлёвых інтарэсаў. Набываючы прадукцыю непасрэдна на месцах яе вырабу, а не на рынках гарадоў ВКЛ, немцы атрымлівалі магчымасць значна збіваць яе кошт. Безумоўна, гэта не падабалася купцам Вялікага Княства, таму ў 1492 годзе прускім гандлярам было забаронена наведванне рынкаў за межамі Коўна. Коўна лоўкім чынам магло звязаць свае ўласныя інтарэсы

з інтарэсамі караля і вялікага князя, слушна заяўляючы пра тое, што выкарыстанне новых шляхоў і рынкаў прывядзе да скарачэння выплат вялікаму князю ад мыта, якое павінна здымацца толькі на старых шляхах і рынках, г. зн. у Коўне [4, с. 26]. Такім чынам, у канцы XV ст. вялікія князі літоўскія імкнуліся абмежаваць рух нямецкіх гандляроў далей Коўна. Звязана гэта было таксама з тым, што вялікія князі хацелі захаваць такую істотную крыніцу прыбыткаў, як мытныя выплаты менавіта ў гэтым горадзе. Але на практыцы забараніць нямецкім купцам рух на іншыя землі Вялікага Княства было значна цяжэй.

Напачатку XVI ст. ганзейскія купцы пачалі шукаць альтэрнатыву Нёманскаму гандлёваму шляху на сярэднім яго адрэзку. Галоўнай прычынай, па якой гэта адбылося, было іх жаданне абысці вялікія мытныя пошліны, якія збіраліся ў Коўне. Таксама трэба ўлічваць, што асобна ад звычайнага мыта плаціліся пошліны на воск і соль як на найбольш распаўсюджаныя тавары. Жаданне арандатараў мытняў да хуткага ўзбагачэння прыводзіла ў рэшце рэшт да таго, што замежныя купцы імкнуліся абыходзіць гэтыя мытні. Але гаспадары Вялікага Княства Літоўскага на новых шляхах таксама рабілі загады ўзводзіць новыя мытні, каб не губляць прыбыткі ад замежнага гандлю. Так, у 1520 годзе быў выдадзены гаспадарскі ліст аб стварэнні мытняў у Тэхонаўцах і Тыкоціне. Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт I даручаў пану ваяводу віленскаму ўладкаваць там каморы, таму што соль і іншыя тавары, якія раней ішлі на Коўна, зараз пайшлі па Бугу і Нараве; на новых каморах павінна было збірацца мыта з «соли и изъ иншихъ товаров». «А которые купцы, немцы и наши подданные тое зимы соль провезли безмытно, мы казали тымъ нашимъ выбирчимъ на тыхъ купцов тое мыто брати потому, какъ и въ Ковне бирано» [12, с. 476].

Такім чынам, відавочна, што напачатку XVI ст. ганзейскія купцы, прысутныя ў розных гарадах па Нёманскім гандлёвым шляху і асабліва ў Коўне, шукалі альтэрнатыўныя гандлёвыя шляхі як для ўвозу, так і для вывазу тавараў з ВКЛ. Можна сцвярджаць, што гэты працэс таксама супадаў па часе з заняпадам самой Ганзы. Усё больш актыўна ў ганзейскі гандаль з Усходняй Еўропай пачалі ўмешвацца канкурэнты нямецкіх купцоў – англічане і галандцы. Тым больш, што ўжо ў другой палове XIV ст. англічане наведваліся ў прускія гарады. Вядома, што ў 1372 годзе першыя англійскія караблі прыязджалі ў Прусію [20, с. 113]. Ва ўмовах знешняй канкурэнцыі і ўнутранай нестабільнасці Ганзы ўсё цяжэй было падтрымліваць парадак унутры ковенскай канторы. Эльтэрманы неаднаразова скардзіліся ў Данцыг на адсутнасць згоды паміж

членамі канторы. Ганзейская кантора ў Коўне ў рэшце рэшт скончыла свае існаванне як арганізацыйная адзінка Ганзы на Нёманскім гандлёвым шляху. У 1532 годзе мы знаходзім апошнюю згадку пра яе. Але трэба мець на ўвазе, што былыя члены ганзейскай канторы ў Коўне не зніклі бясследна. Адна частка нямецкіх купцоў вярнулася ў Данцыг. Другая іх частка атрымала мяшчанскае права ў Коўне і засталася там далей весці гандаль, але ўжо не ў якасці ўдзельнікаў зніклай канторы.

Нёманскі гандлёвы шлях таксама не знік бясследна; ён працягваў існаванне і, больш за тое, паспяхова развіваўся. Падчас Лівонскай вайны (1558–1583 гг.) гандлёвыя зносіны па Заходняй Дзвіне перапыніліся. Многія гарады на гандлёвым шляху па Заходняй Дзвіне моцна пацярпелі ад вайны, у тым ліку і галоўны горад беларускага Падзвіння – Полацк. У такіх абставінах Нёманскі гандлёвы шлях зрабіўся тым шляхам, па якім ажыццяўляўся гандаль з Заходняй Еўропай, нягледзячы на мыта і розныя гандлёвыя пошліны. Шляхта Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст. актыўна карысталася Нёманскім гандлёвым шляхам для продажу на Захад лішкаў сельскагаспадарчай прадукцыі са сваіх маёнткаў, а таксама прадукцыі лясной гаспадаркі. З іншага боку, купцы з Прусіі таксама працягвалі дастаўляць свае тавары ў ВКЛ па Нёмане. У 1540 г. у Горждах (*Garsden*) і Юрбарку (*Georgenburg*) былі заснаваны мытні і каморы; у апошнім горадзе на Нёмане купцы з ВКЛ павінны былі набываць соль у прускіх купцоў; тут усталёўвалася «складанье соли» для тых, хто пажадае пасяліцца ў Юрбарку і гандляваць соллю; аднак «купцы чужаземцы маютъ предься зложенье соли мети у Ковне, водле стародавнаго обычая» [12, с. 479–480]. Такім чынам, Нёманскі гандлёвы шлях працягваў існаванне і надалей. Але акцэнты на ім змяніліся, бо ў XVI ст. месцы гандлю былі перасунуты значна ніжэй па Нёмане, калі нават параўнаць геаграфічнае знаходжанне таго ж Коўна і Юрбарка адносна адзін аднаго.

Значэнне Нёманскага гандлёвага шляху для гандлю Ордэна і Ганзы ў канцы XIV – пачатку XVI стст. было без перабольшвання вялікім. Наяўнасць ганзейскай канторы ў Коўне давала магчымасць набываць тавары ў патрэбнай колькасці непасрэдна з Вялікага Княства Літоўскага і дастаўляць іх далей у Кёнігсберг і Данцыг, а адтуль па ўсёй Заходняй Еўропе. Таксама Нёманскі гандлёвы шлях з’яўляўся тым шляхам, па якім Ордэн і Ганза дастаўлялі заходнееўрапейскія тавары да Коўна. З Коўна ганзейскія тавары траплялі ў Трокі, Вільню, Гродна, Ліду, Навагрудак і іншыя гарады ВКЛ і нават далей – у Масковію. Такім чынам, Нёманскі гандлёвы шлях злучаў гарады і рынкі Заходняй і Усходняй Еўропы. Вакол рэк Нёман, Вілія, Шчара ўзнікалі і развіваліся

гарады і пасяленні, якія абслугоўвалі патрэбы міжнароднага гандлю. Нёманскі гандлёвы шлях як гандлёва-эканамічная прастора, нягледзячы на існуючыя супярэчнасці і перапынкі ў гандлі падчас канфліктаў, развіваўся ў пярыяд XIV–XVI стст. досыць дынамічна, таксама паспяхова працягваў ён існаваць і ў больш позні час.

Што для ўкраінцаў значыў Днепр, тое самае ўяўляў для беларусаў і літоўцаў Нёман. Плытагоны сплаўлялі драўніну па Нёмане да Прусіі, віціннікі вялі да Балтыйскага мора караблі-віціны, нагружаныя скарбамі беларускіх і літоўскіх зямель. Ордэнскі і ганзейскі гандаль на Усходзе Еўропы ў канцы XIV – пачатку XVI стст. цяжка было б уявіць без Нёманскага гандлёвага шляху, гісторыя якога яшчэ патрабуе больш дыталёвага даследавання і вывучэння.

Спіс літаратуры

1. Codex Epistolaris Vitoldi, Magni Ducis Lithuaniae: 1376–1430 / collectus opera Antoni Prochaska. – Cracoviae: Acad. Lit. Cracoviensis, 1882. – 1113 p.

2. Das virtuelle Preußische Urkundenbuch. Regesten und Texte zur Geschichte Preußens und des Deutschen Ordens. PrUB, JS 409. (1389 Oktober 12. [Sallinwerder].) – [Электронны рэсурс]. Рэжым доступа: http://www1.uni-hamburg.de/Landesforschung/pub/js/js409.htm. – Дата доступа: 24.08.2011.

3. Собрание древних грамот и актов городов: Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей, и по разным предметам. Ч.1–2. Вильно: типография А. Марциновского, 1843. – 402 с.

4. Forstreuter, K. Die Memel als Handelsstraße Preußens nach Osten / K. Forstreuter. – Königsberg i. Pr.: Gräfe und Unzer Verlag, 1931. – 109 S.

5. Hirsch, T. Danzigs Handels- und Gewerbegeschichte unter der Herrschaft des Deutschen Ordens / T. Hirsch. – Leipzig: S. Hirzel, 1858. – 344 S.

6. Гусоўскі, М. Песня пра зубра = Nicolai Hussoviani Carmen de statura feritate ac venatione bisontis / М. Гусоўскі. – Мн.: БГАКЦ, 1994. – 48 с.

7. Hansisches Urkundenbuch, hg. v. Verein für Hansische Geschichte. Bd. 9: 1463–1470, bearb. von Walther Stein. – Leipzig: Duncker & Humblot, 1903. – 751 S.

8. Simson, P. Geschichte der Stadt Danzig. In 4 Bänden. Bd.1: Bis 1517 / P. Simson. – Danzig: A.W. Kafemann, 1913. – 423 S.

9. Hansisches Urkundenbuch, hg. v. Verein für Hansische Geschichte. Bd.8: 1451–1463, bearb. von Walther Stein. – Leipzig: Duncker & Humblot, 1899. – 857 S.

10. Любавский, М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М.К. Любавский. – СПб.: Наука, 2004. – 310 с.

11. Гродно. Исторический очерк. Мн.: Беларусь, 1964. – 262 с.

12. Довнар-Запольский, М. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. Т.1. / М. Довнар-Запольский. – Киев: Тип. импер. университета св. Владимира, 1901. – 806 с.

13. Daenell, E. Die Blütezeit der Deutschen Hanse: hansische Geschichte von der zweiten Hälfte des XIV. bis zum letzten Viertel des XV. Jahrhunderts. Bd. 2 / E. Daenell. – Berlin, New York: De Gruyter, 1973. – 561 S.

14. Jähnig, B. Zur Wirtschaftsführung des Deutschen Ordens in Preußen vornehmlich vom 13. bis zum frühen 15. Jht. / B. Jähnig // Zur Wirtschaftsentwicklung des Deutschen Ordens im Mittelalter. Quellen und Studien zur Geschichte des Deutschen Ordens, hrsg. von Udo Arnold, Bd. 38. – Magdeburg: Elwert, 1989. – 189 S.

15. Орловский, Е.Ф. Очерк истории города Гродно составленный на основании печатных источников / Е.Ф. Орловский. – Гродно: Тип. губерн. правления, 1889. – 76 с.

16. Gause, F. Die Geschichte der Stadt Königsberg in Preußen. Von der Gründung der Stadt bis zum letzten Kurfürsten. Bd. 1 / F. Gause. – Köln, Weimar, Wien: Böhlau Verlag, 1996. – 571 S.

17. Arnold, U. Königsberg als Wirtschaftsstandort im Mittelalter. Ein Überblick / U. Arnold // Preußische Landesgeschichte. Festschrift für Bernhart Jähnig zum 60. Geburtstag. Herausg. von Udo Arnold, Mario Glauert und Jürgen Sarnowsky. – Marburg: Elwert, 2001. – 614 S.

18. Vitoldiana: Codex privilegiorum Vitoldi magni ducis Lithuaniae, 1386–1430 / Zebr. i wyd. Jerzy Ochmanski. – Warszawa, Poznzn: PWN, 1986. – 256 s.

19. Мараш, Я.Н. и др. Мосты: Историко-экономический очерк / Я.Н. Мараш, И.И. Ковкель, А.С. Себастьян. – Мн.: Беларусь, 1986. – 111 с.

20. Kurowski, F. Der Deutsche Orden. 800 Jahre Geschichte einer ritterlichen Gemeinschaft / F. Kurowski. – München: Herbig, 1997. – 378 S.

21. Кісялеў, У.М. Пуцявінамі Наднямоння / У.М. Кісялеў. – Мн.: Полымя, 1994. – 303 с.

22. Armstedt, R. Geschichte der königlichen Haupt- und Residenzstadt Königsberg in Preußen / R. Armstedt. – Stuttgart, 1899. – 354 S.

Самусік А.Ф.

ПАМІЖ «SEPTEM ARTES LIBERALIS» І «STUDIA HUMANITATIS»: ТРАНСФАРМАЦЫЯ ЕЎРАПЕЙСКАЙ АДУКАЦЫІ Ў XIV–XVI стст.

У XIV–XVI стст. Еўропа ўяўляла сабою рэгіён, дзе на фоне бурлівых палітычных падзей і хуткай эвалюцыі гаспадаркі адбываліся істотныя змены ў грамадскім ды культурным развіцці. У сучаснай гістарыяграфіі яны атрымалі абагульняючую назву Рэнесанс і менавіта ў азначаны перыяд ахапілі большую частку кантынента – узяўшы ўласны пачатак у Італіі, у далейшым гэтыя зрухі дасягнулі Скандынавіі на поўначы і Рэчы Паспалітай на ўсходзе. Іх умацаванне ў сферы палітычнай, гаспадарчай і культурнай дзейнасці вызначылі напрамак паступовай трансфармацыі ўсяго паўсядзённага жыцця ў бок секулярызацыі.

Выдатным чынам прасочваецца гэта на прыкладзе навукі і асветы, якія менавіта ў азначаны перыяд уступілі ў новы этап сваёй эвалюцыі. Вядома, што ў часы сярэднявечча ў школьнай сістэме Еўропы панавалі *«septem artes liberalis»* – сем вольных (вызваленых) мастацтваў. Упершыню ў поўным аб'ёме яны былі прадстаўлены яшчэ ў паэме паўночнаафрыканскага неаплатоніка пачатку V ст. М. Капелы «Брак Меркурыя і Філасофіі» [1, с. 43]. У сваю чаргу першы міністр остгоцкага караля Тэадорыха Баэцый у пачатку VI ст. падзяліў іх на трывіўм (граматыка, рыторыка, дыялектыка) і квадрыўм (арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка) [2, с. 277–278].

Нажаль, далейшы агульны заняпад культуры ў так званыя «цёмныя вякі» прывёў да істотнай карэкцыі іх сутнасці. Шмат у чым адбылося гэта з прычыны пераходу ад навучання ўсіх жадаючых з ліку вольных грамадзян (з чаго, дарэчы, і пайшла назва гэтых дысцыплін) да атрымання адукацыі найперш прадстаўнікамі духоўнага звання. Як след гэтага свецкія ў першаснай аснове «septem artes liberalis» аказаліся падпарадкаваны тэалогіі (Фама Аквінскі). Іх заступнікам быў абвешчаны Святы Дух, а мэтай дадзеных навук стала каментыраванне рэлігійных і антычных твораў з акцэнтам на пошук у іх схаваных універсалій (агульных паняццяў аб узаемасувязі Бога, свету і чалавека). У выніку фундаментам схаластычнай педагогікі стала разуменне сапраўднага значэння кожнай рэчы ці аб'екта, а асноўным інструментам пазнання аказалася мова – дакладна назваць рэч ужо само па сябе значыла растлумачыць яе

ўнутраны сэнс (Ісідор Севільскі). Не дзіўна таму, што аснову вучэбнага працэсу пачала складаць граматыка. Веды ж фактычна сталі мазаікай цытат (сентэнцый), вырваных з агульнага кантэкста і ў большасці выпадкаў страціўшых аўтарскае гучанне [3, с. 308]. Усё гэта прывяло да пэўных змен у «septem artes liberalis» – асноўная ўвага пачала надавацца трывіўму, ўзмацнённаму павучальна-рэлігійнай этыкай. У сваю чаргу, з-за адмоўнага стаўлення вучоных багасловаў да «грахоўных» практычных дысцыплін, квадрыўм выконваў у вучэбным працэсе дапаможную функцыю – уваходзячыя ў яго навукі не выкладаліся сістэматычна, а праходзіліся ва ўрыўках у кантэксце іншых прадметаў.

Разам з тым, нават такі падыход спрыяў больш глыбокаму аналізу рэлігійнай і антычнай літаратуры, у якой тагачасныя навукоўцы і педагогі шукалі прыклады маральных паводзін ды пацверджанне правамоцнасці ўласных дзеянняў. Выяўленыя пры падобных даследаваннях супярэчнасці і разыходжанні ў крыніцах вялі да пашырэння дыспутаў, у час якіх усё большае значэнне пачала атрымліваць практыка лагічнага тлумачэння спрэчных момантаў. У пошуках новых доказаў схаласты пачалі ўжываць назіранне і эксперымент (Р. Бэкан). Але дадзеныя навацыі, безумоўна, не маглі быць станоўча ўспрыняты царквой. У выніку, з XIII ст. пачынаецца крызіс схаластычнай сістэмы адукацыі – скарачаюцца памеры ўжывання антычных аўтараў. Каб пазбегнуць рэлігійнай цэнзуры аўтары ў сваіх творах аддаюць перавагу павучанням і алегорыям. Усё большае значэнне атрымліваюць намёкі, сімвалы, іншасказанні з аданачасовым узмацненнем рэлігійнай састаўляючай [4, с. 116].

Падобнае развіццё падзей прывяло да адрыву навукі і асветы ад рэальных запатрабаванняў грамадства. На чале незадаволеных гэтым сталі найлепш адукаваныя навукоўцы і літаратары (Ф. Петрарка, Д. Бакачыё). Атрымаўшы ў маладосці схаластычную адукацыю, яны першапачаткова жадалі толькі яе мадэрнізацыі. А таму, зыходзячы з аднаго з асноўных пастулатаў схаластыкі аб тым, што дакументальная спадчына Старажытных Грэцыі і Рыма – гэта каштоўная крыніца ідэй, асветнікі-наватары пачалі шукаць адказы на сучасныя ім праблемы ў творах антычных аўтараў. У апошніх жа рэгулярна сустракаецца тэрмін «humanitas», якім абазначалася прырода чалавека і яго духоўная культура – якраз ён і стаў зыходным, калі ў выніку падобных доследаў пачаў фармавацца на працягу XIV–XV стст. новы гуманістычны светапогляд [5, с. 7].

Непасрэдным жа месцам зараджэння Рэнесансу сталі заможныя гарады Паўночнай і Цэнтральнай Італіі, правячая раннебуржуазная эліта якіх

частку назапашаных сродкаў стала выдзяляць на адукацыю сваіх дзяцей ды стварэнне хатніх бібліятэк. Прычына гэтага крылася ў адраджэнні антычнага ідэалу чалавека як markup разнабакова развітай асобы, што ў сваю чаргу прывяло да ўзрастання попыту на кваліфікаваных настаўнікаў. Вынік – заможныя і сярэднія колы гараджан мелі даволі высокі ўзровень пісьменнасці, што тлумачылася шырокім распаўсюджваннем пачатковых і сярэдніх школ, якія ўтрымліваліся на сродкі гарадскіх камун. Менавіта яны і ўзнікшыя на іх аснове ўніверсітэты сталі месцам сканцэнтравання свецкіх ведаў.

На такім фоне выпустошаныя схаластыкай «septem artes liberalis» рашуча адвяргаліся – іх прыхільнікаў пачалі абвінавачваць у самаўпэўненым невуцтве, адрыве мыслення ад рэчаіснасці, падаўленні свабоды творчасці і навуковага пошуку, стымуляванні кампілятарства і каментатарства, адсутнасці ўвагі да зямных праблем чалавечага быцця. На змену ж ім прапаноўваліся «studia humanitatis». Гэты тэрмін таксама быў запазычаны з антычнасці – першым увёў яго яшчэ Цыцэрон у I ст. да н.э. Але калі старажытнарымскі філосаф разумеў пад ім адраджэнне ў Рыме класічнай грэчаскай адукаванасці, то ў часы Рэнесансу ён атрымаў куды больш шырокі сэнс. «Studia humanitatis» сталі ўспрымацца ў якасці шырокай сістэмы ведаў, сканцэнтраванай на вывучэнні чалавека і яго прызначэння, грамадства і законаў, што ў ім пануюць. Лічылася, што менавіта яны адкрываюць шлях да засваення ўсіх багаццяў антычнай грэка-рымскай культурнай традыцыі, падкрэсліваючы, пры гэтым, выхаваўчую састаўляючую новага комплекса навукова-адукацыйных дысцыплін, неад’емнымі часткамі якога сталі: граматыка, філасофія, рыторыка, гісторыя, права, паэтыка, паліталогія і этыка (маральная філасофія) [6, с. 70–73].

Пачынаючы з XV ст., прыхільнікаў «studia humanitatis» пачалі ўсё часцей запрашаць ва ўніверсітэты, а іх выхаванцы сталі рэгулярна займаць адказныя дзяржаўныя пасады. Склалася і новая «гуманістычная» інтэлігенцыя, якая аб’яднала навукова-асветныя і творчыя колы тутэйшага грамадства. Гуманістамі, пры гэтым, найменавалі тых, хто прысвяціў сваё жыццё вывучэнню і выкладанню «studia humanitatis». Якраз па гэтай прычыне і ўзнік, дарэчы, сам тэрмін «humanista» (гуманіст) – па простай аналогіі з назвамі выкладчыкаў іншых вучэбных дысцыплін у тагачаснай Італіі, бо прафесара права традыцыйна найменавалі «legista», а прафесара вольных навук – «artista» [7, с. 7]. У сваю чаргу гуманісты ва ўніверсітэтах ўзначальвалі кафедры рыторыкі, антычнай і новай літаратуры, латыні, грэчаскай мовы, этыкі і дыялектыкі. Але трэба яшчэ

раз падкрэсліць тое, што тэрмін «humanista» з самага пачатку свайго ўжывання абазначаў не толькі прафесійную спецыялізацыю, але і новую пазіцыю светаўспрымання. Менавіта гуманісты сталі стваральнікамі і носьбітамі новай сістэмы ведаў, у цэнтры якой стаяла праблема чалавека, яго зямнога прызначэння. Дзякуючы гэтаму з сярэдзіны XV ст. пачаў фармавацца новы тып навукоўца – markознабакова адукаванага, непрадузята ацэньваючага свет і шукаючага адказы на паўстаючыя ў паўсядзённым жыцці пытанні ў антычнасці.

Першым разгорнутае тлумачэнне сэнсу «studia humanitatis» даў канцлер Фларэнтыйскай рэспублікі К. Салютацы яшчэ ў другой палове XIV ст. На яго думку, яны арыентаваліся на пазнанне чалавечага быцця праз навуковае вывучэнне шматвекавога вопыту ўсёй чалавечай культуры. Згодна разважанням асветніка асноўнай іх мэтай было фармаванне новага чалавека, які валодае здольнасцю да выпрацаваных вопытам і адукацыяй дабрадзейных учынкаў [8, с. 39–48]. Найбольш жа дасканалае абгрунтаванне сутнасці пабудовы «studia humanitatis» даў П. Верджэрыё ў пачатку XV ст. У сваім трактаце «Аб шляхетных норавах і вольных навуках» ён пісаў наконт гуманістычнай адукацыі наступнае: «Свободным умам и тем, кто обязан заниматься государственными делами и присутствовать на общественных собраниях более всего необходимо знать историю и изучать моральную философию… В философии собраны обязанности всех людей и что кому должно соответствовать, в истории – что было сделано и сказано… Не ошибусь, если присоединю к этим наукам третью – красноречие, которое также является частью общественных наук. Благодаря философии мы можем точно думать, что является главным в любом деле; благодаря красноречию – весомо и красиво говорить, что в высшей степени привлекает многие души. История помогает нам и в том, и в другом… Читать, писать и познавать вновь открытые деяния древности, говорить с прошлым и современным, делать нашим и прошлое и будущее. Что может быть более приятным и более полезным?» Акрамя іх важнымі П. Верджэрыё лічыў і іншыя дысцыпліны – граматыку, паэтыку, музыку, арыфметыку, геаметрыю, прыродазнаўства, медыцыну, права і нават тэалогію, знаёмства з якімі, на яго погляд, было карысна ўсім, але паглыбленнае вывучэнне павінна прадугледжваць асобную схільнасць [9, с. 344–348].

Адметным момантам у станаўленні новай гуманістычнай адукацыі стала вызначэнне яе суадносінаў з панаваўшымі ў тыя часы багаслоўскімі навукамі. Гуманісты лічылі, што ў грамадскім светаўспрыманні «царства Бога» саступіла месца «царству Чалавека», а значыць «studia humanitatis»

сталі на адзін узровень з тэалогіяй. Прычым, веды, а не ранейшая вера, з'яўляюцца галоўнай этычнай катэгорыяй, якая раскрывае сэнс зямнога прызначэння чалавека. У сваю чаргу гэта патрабавала істотнага пашырэння кола крыніц для аналізу. Для веры хапала і Свяшчэннага Пісання, для рацыянальных ведаў была неабходна ўся антычная спадчына. Зыходзячы з азначанага відавочна, што «studia humanitatis» узніклі ў супрацьвагу сярэднявечным схаластычным «divina studia» (боскім навукам) і адрозніваліся ад іх практычнай арыентацыяй на фармаванне вольнай, духоўна разняволенай і пазбаўленай шматлікіх састарэлых забабонаў асобы, якая б у сваіх дзеяннях абапіралася на свецкі светапогляд. Новыя дысцыпліны павінны былі толькі дапамагчы ёй ўсвядоміць сваё прызванне, дакладна ацаніць уласныя здольнасці і дзякуючы гэтаму заняць адпаведнае магчымасцям месца ў грамадстве. Адукацыя, такім чынам, ажыццяўляла «шліфоўку» прыроды чалавека, фармавала яго розум, пачуцці і волю, прыдавала дзеянням чалавека грамадскую значнасць.

Як след гэтага, прыхільнікі «studia humanitatis» паступова пачалі надаваць ім усё большую і нават вызначальную ролю ў паўсядзённым жыцці грамадства. Не дзіўна таму, што якраз этыка была абвешчана імі вядучай навукай у новай свецкай сістэме ведаў. Аднак, падобны падыход меў істотны негатыўны момант. На думку шэрагу гуманістаў этычныя законы чалавечага грамадства дадзены людзям Богам і акрэслены ў душы чалавека, а значыць яны маюць перавагу над прыроднымі законамі, поле дзейнасці якіх поўная праяў незразумелага прырода (К. Салютацы). Выснова з гэтага зразумела – гуманітарныя дысцыпліны павінны дамінаваць над прыродазнаўчымі, бо аснова першых заключана ў прынцыпах спрадвечна закладзеных ў розуме саміх людзей і адлюстроўваючых ісцінныя і нязменныя боскія законы, у той час як другія бяруць веды з ненадзейнага і пагражаючага недакладнымі высновамі эксперымента. І трэба прызнаць, што падобныя разважанні былі станоўча ўспрыняты ў шырокіх колах тагачаснага грамадства. Так, фларэнтыйскі купец Дж. да Пагола Марэлі ў сярэдзіне XV ст. раіў чытачу ва ўласных «Нататках» наступнае: «Изучай Вергилия, Боэция, Сенеку или прочих авторов… Из этого воспоследствует большая сила твоего разума: размышляя над поучениями авторов, ты узнаешь, как нужно поступать в настоящей жизни. В зрелом возрасте твой разум сможет наслаждаться мудростью и сладость знания доставит тебе столько приятного и утешительного, как ничто другое: ты не получишь ни от богатства, ни от детей, ни от службы столько, сколько даст тебе наука и сознание того, что ты человек, а не животное» [10, с. 62].

Такім чынам, «studia humanitatis», як і папярэдняя ім схластыка, хай і па іншых прычынах, але таксама не здолелі пераадолець размежаванне навукова-асветнай справы на тэарэтычную і практычную састаўляючыя. Менавіта гэты фактар не дазволіў ім заняць адзінаасобнае месца ў тагачасных навучальных установах, бо шырокім колам насельніцтва ў справе адукацыі найперш былі патрэбны непасрэдна карысныя для жыцця дакладныя і прыродазнаўчыя прадметы. Выключна гуманістычная мадэль адукацыі была асуджана на няўдачу да таго ж з прычыны хуткага развіцця эканомікі і з'яўлення новага ідэала чалавека-прадпрымальніка, якому антычнасць ужо не была патрэбна для дасягнення поспеху ў жыцці. Так, гуманітарныя веды давалі ўнутраную свабоду, але ўсё далей уводзілі ад гуманістычнага ідэалу – рознабаковае развіццё асобы падменялася фармалізаванай літаратурнай адукаванасцю.

Адным з найбольш вядомых крытыкаў «studia humanitatis» стаў Леанарда да Вінчы. На мяжы XV–XVI стст. ён выступаў рэзка супраць абстрактных ведаў і бясплоднага філасофскага разважання, бо такія тэарэтычныя меркаванні, у адрозненні ад вопыту, могуць быць памылковымі. Больш увагі на яго думку трэба было аддаваць матэматыке, бо «нет никакой точности в тех науках, где нельзя использовать ниодной из математических наук». Леанарда да Вінчы таксама лічыў, што «глаз меньше ошибается чем ум» і заклікаў узняць значэнне «механичных искусств» да ўзроўня багаслоўскіх і гуманітарных навук. Тым самым ён паклаў пачатак збліжэнню розных галін ведаў у межах адзінай «сапраўднай» навукі, асновай для якой быў тэзіс аб трывалай сувязі навукі і практыкі: «Истинные науки – те, которые опыт заставил пройти сквозь ощущения… и этими науками наслаждаются в мире их почитатели, чего не могут дать обманчивые воображаемые науки» [11, с. 127].

На фоне падобнай крытыкі «studia humanitatis» непасрэдна ў школах зноў пачалі саступаць месца «septem artes liberalis», якія былі ачышчаны ад схаластычных канонаў і мадэрнізаваны ў адпаведнасці з найноўшымі тагачаснымі навуковымі дасягненнямі. У такім выглядзе яны давалі больш якасную і комплексную адукацыю, а таму хутка набылі шырокую папулярнасць. Адна з першых школ, арганізаваных на азначаных прынцыпах, дзейнічала паблізу ад Мантуі ў 1420–1440-я гг. Ініцыятарам яе стварэння быў вядомы тагачасны матэматык В. да Фельтрэ. Асновай навучальнага працэсу тут сталі якраз «septem artes liberalis», але яны былі дапоўнены класічнымі мовамі, прыродазнаўствам і алгебрай. Штогод тут навучалася да 100 выхаванцаў, 70 з якіх былі са збяднелых сямей. Асноўнай жа мэтай выхаванння было імкненне закласці ў

свядомасці вучняў падмурак агульнай культуры, які б у далейшым надаў бы ім самастойнасць ў дзеяннях і разважаннях, а таксама дазволіў праз самаадукацыю атрымаць неабходныя ў жыцці спецыялізаваныя веды. Адначасова з Мантуанскай школай гуманістычная па духу навучальная ўстанова працавала ў Ферары. Кіраваў ёй педагог-наватар Г. Гуарыні, які лічыў галоўным падрыхтаваць юнакоў да будучай прафесіі, а таму акрамя склаўшых аснову вучэбнага працэсу «studia humanitatis», тут шмат часу было адведзена на вывучэнне карысных для паўсядзённага жыцця прадметаў з ліку дакладных і прыродазнаўчых навук [12, с. 374–379, 381–382].

Такім чынам, відавочна, што ўсё ж ні «septem artes liberalis», ні «studia humanitatis» паасобку не ўспрымаліся тагачаснай еўрапейскай педагогікай. Была відавочна неабходнасць іх злучэння ў суцэльны комплекс, які б прыдаў адукацыйнай справе больш арганізаваны і сістэматызаваны характар. Разам з тым, патрэбны для гэтага час быў ужо амаль вычарпаны. Менавіта свецкая гуманістычная культура шмат у чым падрыхтавала глебу для Рэфармацыі, а з ёй і для Контррэфармацыі, абедзьве якія ў поўнай меры не былі згодны з яе асноўнымі пастулатамі.

Увогуле трэба адзначыць, што якраз рэфарматарскі рух у значнай ступені паспрыяў значнаму аслабленню пазіцый гуманізма ў Еўропе, бо яго прыхільнікі з аднаго боку карысталіся куды большай вядомасцю ў грамадстве, а з другога – рашуча крытыкавалі гуманістаў за адарванасць ад паўсядзённага жыцця, ілюзорнасць ідэалаў і прынцыпаў. У выніку, гуманістычная трактоўка прыроды чалавека сутыкнулася з рэлігійнай антрапалогіяй рэфарматарскіх вучэнняў. Апошнія неслі больш зразумелыя і запатрабаваныя духоўна-рэлігійныя ўстаноўкі, якія адпавядалі паўсядзённым інтарэсам значнай часткі грамадства. Рэфармацыя наблізіла хрысціянства да чалавека, у значнай ступені прагматызавала яго, вызначаўшы вышэйшую маральную задачу асобы як выкананне абавязкаў мірскога жыцця. Лідэры пратэстантаў вельмі хутка зразумелі ўсю важнасць адукацыі. Але яны выступалі за пашырэнне адукацыі, напоўненай духам рэфармаванага хрысціянства, што было куды больш набліжана да паўсядзённасці чым «septem artes liberalis» ці «studia humanitatis».

Найбольш вядомым барацьбітом за рэформу асветы стаў М. Лютэр. Ён ставіў выхаваўчы працэс: «Перед всеми вещами – земными и небесными». У яго разуменні адукацыя павінна была дапамагчы ў рашэнні цэнтральнай праблемы ўсяго рэфарматарскага руху – паставіць унутраную рэлігійнасць чалавека на месца знешняй, а веру ў аўтарытэт замяніць аўтарытэтам веры. Таму ў падкантрольных яму школах

дамінаваў Катэхізіс, а сістэма выхавання ў іх моцна адрознівалася ад гуманістычнай – на змену ідэальнага вобраза гарманічна развітай асобы, адданай агульначалавечай працы прыйшоў чалавек-прагматык, які спалучаў хрысціянскую дабрачыннасць са служэннем уласным патрэбам. Не дзіўна таму і тое, што сам М. Лютэр выступаў катэгарычна супраць склаўшайся ў тагачаснай Еўропе сістэмы адукацыі. У сваім пасланні «Да хрысціянскага дваранства нямецкай нацыі аб выпраўленні хрысціянства» (1520 г.) ён пісаў, што існуючыя школы: «Представляют собой только Gimnasia Epheborum et Grece glorie (игральные дома для юношей и прославления греков)… В них господствует распущенность, Священному Писанию и христианской вере придается мало внимания; в них единолично правит – затмевая Христа – слепой языческий учитель Аристотель» [13, с. 66].

У выніку заходнееўрапейскія навучальныя ўстановы ў XVI ст. сталі месцам сканцэнтравання каталіцкай ці пратэстанцкай рэакцыі, дзе зноў панавала тэалогія і схаластыка. «Studia humanitatis», пры гэтым, на пэўны перыяд аказаліся ўвогуле фактычна забароненымі. Царкоўная інквізіцыя ды цэнзура рабіла працэс вывучэння гуманітарных дысцыплін даволі небяспечнай справай – большасць навукоўцаў пачала аддаваць перавагу пошуку практычнага выкарыстання ўласных доследаў у гаспадарцы, медыцыне і транспарце, а таксама найбольш «мудрагелістым» для рэлігійных кантралёраў навукам (вышэйшая матэматыка, аналітычная геаметрыя і інш.).

Гуманісты пры такім развіцці падзей былі вымушаны шукаць магутных абаронцаў з ліку правячай эліты. У сваю чаргу, арыстакратыя той жа Францыі ды Італіі аддавала перавагу тым ідэям Рэнесанса, якія найперш датычыліся атрымання асалоды ад зямнога жыцця (эпікурэйска-гедыністычны рух). У выніку, двары манархаў і заможных магнатаў пераўтварыліся ў новыя элітарныя культурна-асветныя цэнтры. Тут збіраліся вядомыя мастакі, архітэктары, паэты, выкладчыкі. Хутка пашырылася ў Еўропе і мода на мецэнацкую дзейнасць. Разам з тым, перайманне асобных рэнесансавых традыцый феадальным асяроддзем мела значныя негатыўныя бакі. Так, падтрымка правячых колаў павышала сацыяльны статус інтэлігенцыі, але адначасова прывяла да адасаблення арыстакратычнай культуры ад народнага асяроддзя. Распрацаваная ж гуманістамі канцэпцыя патрыятызму, з улікам умацавання абсалютных манархій стала асновай дзяржаўнай праграмы па знішчэнню вальнадумства. Знайшлі свой водгук і ідэі некаторых з германскіх гуманістаў аб неабходнасці сканцэнтравання ведаў у вузкім асяроддзі высокаадукава-

ных асоб (У. фон Гутэн) – доступ да асветы прадстаўнікоў падатных саслоўяў пачаў абмяжоўвацца [14, с. 603].

Усё гэта прывяло да таго, што нават у найбольш прагрэсіўных на той момант краінах Еўропы свецкая асвета стала дзяліцца на вузкаспецыялізаваную і агульнаадукацыйную. Першая прызначалася для дзяцей буржуазіі і павінна была падрыхтаваць іх для будучай камерцыйнай дзейнасці – з пачатку XVI ст. у Нідэрландах, напрыклад, пачалі адкрывацца так званыя «французскія» школы з выкладаннем толькі французскай мовы і матэматыкі [15, с. 241]. Другая ж мадэль забяспечвала выключна патрэбы дваранства, у асяроддзі якога модна было мець усебаковую адукацыю (хай і ў большасці выпадкаў даволі павярхоўную). Гуманітарныя дысцыпліны тут атрымалі чыста практычны выгляд – красамоўства было неабходна каб вылучыцца з агульнага натоўпу прыдворных, а веданне той жа гісторыі ці права дазваляла, пры гэтым, яшчэ і вызначыцца ўласнай эрудыцыяй.

Далёка не ўсіх, аднак, задавальняла падобнае выпустошванне «studia humanitatis». Якраз у гэты ж перыяд складваюцца асновы гуманістычнага ідэала арыстакрата, выдатна сфармуляваныя графам Б. Касцільёне ў «Кнізе аб прыдворным» (1528 г.). Згодна змешчаных у ёй разважаннях узорны прадстаўнік прывіліяванага саслоўя – гэта універсальна развітая духоўна і фізічна асоба, якая спалучае цэлы шэраг прывабных якасцей (шляхетнасць, дабрадзейнасць, вытанчанасць, адукаванасць) і сваім прыкладам станоўча ўздзейнічае на манарха. Надзвычай важнай была і агучаная аўтарам «наватарская» думка аб тым, што грамадскую павагу і бессмяротную славу можна зарабіць не толькі ў сражэнні, але і на дзяржаўнай службе – праз сваю адданасць Радзіме, эрудыцыю і дабрачыннасць [16, с. 36–37].

Цалкам адпавядала азначанаму вышэй заснаваная І. Штурмам у 1538 г. лютэранская гімназія ў Страсбургу. Поўны курс навучання тут быў разлічаны на 8–10 год і славіўся высокім узроўнем выкладання антычных моў, рыторыкі, матэматыкі, гісторыі і г. д. У 1578 г. тут вучылася ажно да 3 тысяч юнакоў з ліку найбольш вядомых дваранскіх сямей з усёй Еўропы (у 1621 г. гімназія была пераўтворана ва ўніверсітэт). Трэба адразу ж адзначыць, што менавіта яна заклала новы тып навучальнай установы, у якой «studia humanitatis» выкладаліся ў новай рэдакцыі (былі «ачышчаны» ад найбольш радыкальных тэорый гуманістаў) і з улікам патрэб высокародных выхаванцаў. Дапаўненне ж іх дакладнымі ды прыродазнаўчымі дысцыплінамі надавала курсу больш грунтоўны характар, а глыбокае вывучэнне асноў лютэранскага веравучэння аба-

раняла гімназію ад крытыкі кансерватараў і рабіла яе прывабнай для прыхільнікаў гэтай канфесіі з усяго свету [17, с. 96–109].

Падобнае злучэнне набожнасці, красамоўства і ведаў якраз і стала тым кампрамісным варыянтам, пры якім «studia humanitatis» аказаліся ў стане задаволіць шырокія колы грамадства. Доказам гэтага было хуткае перайманне вучэбнай праграмы гімназіі ў Страсбургу нават непадкантрольнымі пратэстантам навучальнымі ўстановамі. Так, у той жа Францыі гэта зрабіў Гюэньскі калеж ў Бардо («Scola Aquitanica»), дзе пры засваенні класічных моў акцэнт рабіўся не на граматыке, а на гутарковай практыке. Да таго ж тут вывучалася французская мова, а таксама даволі якасна праходзілася матэматыка [18, с. 125].

Разам з тым, не былі цалкам забыты і «septem artes liberalis», якія зноў былі вернуты да жыцця езуітамі. У 1581 г. Генеральнай кангрэгацыяй гэтага ордэна быў зацверджаны звод педагагічных правіл «Спосаб і лад навучання», які з 1599 г. стаў абавязковым для езуіцкіх навучальных устаноў ва ўсім свеце. У ім галоўнай задачай езуіцкай асветы было абвешчана пашырэнне сярод выхаванцаў «вучонай і красамоўнай набожнасці» (docta et eloquens pietas). Гэта вельмі сугучна лютэранскай канцэпцыі адукацыі, але за аснову навучальнага працэсу тут былі ўзяты не «studia humanitatis», а схаластыка, мадэрнізаваная з улікам вышэй азначаных жаданняў правячай эліты. Вынікам гэтага стала панаванне ў езуіцкіх вучэбных праграмах дысцыплін, уваходзячых у трывіўм – і найперш лацінскай граматыкі. Навукі ж квадрыўма зноў аказаліся на другарадным месцы – ажно да XVIII ст. іх выкладалі ў большасці выпадкаў фрагментарна і толькі ў кантэксце іншых прадметаў. З усяго ж пераліку «studia humanitatis» толькі гісторыя знайшла сваё месца ў школах езуітаў, ды і то – найбольш увагі імі надавалася антычнасці ды сярэднявеччу [19, с. 65–67].

Уплыў жа педагагічных навацый эпохі Рэнесанса ў езуітаў у першую чаргу адчуваўся ў тым, што выхаванне моладзі ў іх школах усё ж набыло пэўны патрыятычны аспект. На занятках па розных дысцыплінах вучням прывіваліся погляды на тое, што дзяржаўная ўлада створана Богам для народа, а не наадварот, а значыць – усе раўны перад законам. Прычым, кожны сапраўдны грамадзянін абавязаны нягледзячы на ўласнае саслоўнае палажэнне пры неабходнасці аддаць за Радзіму сваё жыццё, ахвяраваць ёй уласную маёмасць, а здрада ж Айчыне – гэта злачынства супраць Бога і грамадства [20, с. 82].

У цэлым жа, відавочна, што пад уплывам гуманістаў і пратэстантаў езуіты імкнуліся злучыць грамадзянскую адказнасць з маральнымі

прынцыпамі хрысціянства. Гэта яскрава прасочваецца ў разуменні імі ўласных педагагічных задач: «Мы занимаемся тяжелой работой по воспитанию молодёжи единственно для хвалы Бога и добра Отчизны. Прежде всего будем стараться, чтобы молодые люди восприняли веру в Бога, добродетели, любовь к ближнему, верность Родине, уважение и благодарность к родителям» [21, с. 51]. Акрамя падобных высокіх этычных разважанняў актыўная грамадская пазіцыя і пачуццё датычнасці да рэальнага жыцця ўмацоўваліся езуітамі ў светаўспрыманні выхаванцаў праз розныя ролевыя гульні – у час заняткаў па фізічнай культуры імітаваліся славутыя сражэнні мінулага.

Уплыў эпохі Рэнесанса адчуваўся ў езуітаў яшчэ і ў тым, што ў навучальны курс так ці інакш, але былі ўключаны практычна ўсе вядомыя на той час антычныя аўтары. Разам з тым, выхаванцы праходзілі толькі спецыяльна адабраныя творы. У лік «дапушчаных» да вывучэння аказаліся: «Фізіка», «Логіка», «Аб душы» Арыстоцеля; «Аратар», «Лісты да сяброў», «Аб дзяржаве», «Аб старасці», «Аб сяброўстве», «Аб абавязках» Цыцэрона; «Журботныя элегіі» і «Фасты» Авідзія; «Энэіда» Вяргілія; «Аб Гальскай вайне» Цэзара; «Опера» і «Выбраныя оды» Гарацыя; «Карміна» Альбія Цыбула; «Іліяда» Гамера; «Эпіграмы» Марцыяла; «Байкі» Эзопа і Федра. Таксама праходзілі кнігі, лісты ды прамовы Катулія, Праперцыя, Лівія, Тацыта, Сенэкі, Салюстыя, Транквілы, Непоты, Плутарха, Платона, Эпікура, Дэмасфена, Агапета, Фэагніда, Гесіёда, Піндара, Г. Назіанзіна, І. Златавуста [22, с. 77–82]. Такі шырокі спектр старажытных аўтараў прыдаваў езуіцкай педагогіке грунтоўны і дасканалы выгляд – вучні былі абавязаны большую частку матэрыялу вучыць на памяць, а таму пасля заканчэння школы былі выдатна эрудыраваны і маглі лёгка аперыраваць спасылкамі на антычныя першакрыніцы для пацвярджэння ўласных прапаноў ды разважанняў. Пры гэтым, аднак, трэба разумець тое, што азначаныя кнігі выкарыстоўваліся выключна як дапаможны матэрыял пры засваенні лацінскай і грэчаскай мовы, дыялектыкі, рыторыкі. Гэта азначала, што выхаванцы канцэнтравалі ўвагу на правапісу, выдатных словазваротах, стылі, а таксама агульнай пабудове тэкста. У той жа час змест апошняга і асабліва сэнс агучаных антычным мысліцелям ідэй як правіла заставаўся за рамкамі вучэбнага працэсу. Настаўнікам раілася толькі скарочана паведамляць біяграфіі, узгаданых у кнігах персанажаў ды арыентаваць клас у плане геаграфічнай лакалізацыі, апісваемых у іх падзей [23, с. 235].

У цэлым жа відавочна, што «septem artes liberalis» у езуітаў хаця і засталіся асновай навучальнага працэсу, але набылі больш змястоўнае

напаўненне (па крайне меры трывіўм) і дзякуючы ўжыванню асобных дасягненняў гуманістычнай ды пратэстанцкай педагогіцы сталі лепш адпавядаць рэчаіснасці. Сведчаць аб гэтым і разважанні заснавальніка гэтага ордэна І. Лайёлы наконт вучэбнай праграмы ствараемых ім вышэйшых навучальных устаноў: «Поскольку целью ордена и преподавания является оказание помощи ближним в познании милосердия Бога и спасения их душ и поскольку этой цели больше всего соответствует теологический факультет, университеты ордена будут прежде всего заниматься изучением теологии и с помощью соответствующих профессоров будут тщательно преподавать все то, что относится к схоластической науке и к Святому Писанию… Поскольку же как наука теология, так и ее практическое применение требуют, особенно в наше время, знания гуманитарных наук, латинского, греческого и еврейского языков, то необходимо заботиться и о соответствующих профессорах для этих наук, причем в достаточном количестве. Следует также преподавать логику, физику и метафизику, моральную науку, разумеется, насколько это будет соответствовать нашей цели» [24, с. 389–390].

Трэба таксама адзначыць, што амаль усе вышэй пералічаныя варыяцыі ўжывання ў тагачаснай школьнай справе «septem artes liberalis» і «studia humanitatis» прысутнічалі і ў навучальных установах Беларусі, якая хаця і знаходзілася на перыферыі еўрапейскай цывілізацыі ды мела складаную канфесійную сітуацыю, усё ж развівалася пад моцным знешнім культурна-асветным уплывам. Істотна ўзрос ён пасля заключэння Крэўскай уніі, калі значна актывізаваліся ўзаемакантакты ВКЛ і Польшчы ў галіне адукацыі.

Тут трэба адразу ж адзначыць, што стан школьнай справы ў гэтых краінах у той час моцна адрозніваўся. Вядомы рускі гісторык А. Пагодзін пісаў з гэтай нагоды наступнае: «Латинское образование, сближая Польшу со всем католическим миром и раскрывая перед ней все ученые очаги того времени, являлось той великолепной культурной почвой, на которой выросли семена и национального просвещения. Православные страны Востока были поставлены в этом отношении в гораздо худшие условия: для них источником образования служила лишь та незначительная литература, которая проникала из Византии с помощью переводов» [25, с. 35]. Не дзіўна таму і тое, што калі ў Польшчы на працягу XIV–XV стст., акрамя існуючага з 1364 г. універсітэта ў Кракаве, каталіцкая царква заснавала каля 100 навучальных устаноў з выкладаннем трывіўма, а яшчэ каля 80 вучылішчаў уключалі ва ўласную вучэбную праграму таксама і квадрыўм, то ў ВКЛ налічвалася ўсяго

толькі некалькі дзесяткаў школ граматы пры праваслаўных манастырах, якія па словах даследчыка мінулага праваслаўнай царквы ў ВКЛ І. Чыстовіча: «были слабыми пособниками образования» [26, с. 210].

Каталіцкая ж асвета ў ВКЛ доўгі час не выходзіла за межы Вільні і была прадстаўлена тут кафедральнай школай (1397), а таксама вучылішчамі францысканцаў (1426) ды дамініканцаў (1507). Толькі з 1526 г. у ВКЛ пачынаецца паўсюднае адкрыццё прыходскім духавенствам пачатковых школ. У статуце Віленскага біскупства 1528 г. адзначалася, што ў гэтых навучальных установах для свецкай моладзі святары павінны выкладаць: «полезные науки, добрые обычаи и главные добродетели католической религии». Традыцыйны трывіўм тут спалучаўся з тлумачэннямі Евангелля, вылічваннем дат царкоўных свят і пастоў, завучваннем на памяць дзесяці божых запаведзяў, малітваў «Ойча наш» і «Вітана будзь Марыя», а таксама размовамі наконт «грахоў смяротных». Акрамя лацінскай і польскай граматыкі ў гэтых школах вывучалі літоўскую ці старабеларускую мову. З антычных жа аўтараў праходзілі творы Цыцэрона, Вяргілія, Эзопа і Сенэкі. Ужо ў канцы 1520-х гг. адпаведным чынам была рэфармавана Віленская кафедральная школа. Навучальны курс быў падзелены на 3 класы, у якіх у поўным аб'ёме праходзіўся трывіўм, а аб навуках квадрыўма выхаванцам давалася агульнае ўяўленне (літургічнае спяванне, вылічванне Пасхі) [27, с. 9, 23].

Такім чынам, не выклікае сумненняў, што на першым этапе свайго пранікнення на тэрыторыю Беларусі, заходнееўрапейская педагогіка тут зыходзіла выключна з «septem artes liberalis», якія ў адпаведнасці з традыцыяй спалучаліся са схаластычнай філасофіяй ды павучальна-рэлігійнай этыкай. Пры гэтым, «studia humanitatis» у ВКЛ не ўспрымаліся нават найлепш адукаванай часткай грамадства. Так, Ф. Скарына ва ўласнай прадмове да кнігі «Быццё» (1519 г.) раіў выкарыстоўваць ў якасці вучэбнага дапаможніка найперш Біблію: «Тут научение седми наук вызволеных достаточное. Хощеши ли умети грамматику… знайдёши в зуполной Библии, Псалтыру… разумети логику… чти книгу светого Иова или Послания светого апостола Павла… помыслиши умети риторику… чти книги Саломоновы. А то суть три науки словесные. Восхощеш ли пак учитися музики… премножество стихов и песен светых по всей книзе сеи знайдеши. Люболити ест умети аритметику… четвёртыи книги Моисеевы часто чти. Пак ли же имаши пред очима науку геометрию… чти книгу Исуса Наувина. Естъли астрономии или звездочети, найдеш на початку книги сее о сотворении солнеца и месеца и звезд… А то суть седм наук вызволеных. Аще ли же кохание имаши ведати о военных,

а о богатырских делех, чти книги Судей или книги Махавеев, более и справедливее в них знайдеш, нежели во Александрии или во Тройи….» [28, с. 46].

У далейшым жа непрыманне антычнай спадчыны часам набывала ў асяроддзі праваслаўных асветнікаў увогуле надзвычай катэгарычны характар. Вядомы украінскі пісьменнік-палеміст І. Вішэнскі ў сваім «Пасланні князю Астрожскаму і да ўсіх праваслаўных хрысціян у Малай Расіі» (пач. XVII ст.) заяўляў: «Не лучше ли тебе изучить Часословец, Псалтырь, Октоих, Апостол, Евангелие и быть простым богоугодником и приобрести вечную жизнь, чем постигнуть Аристотеля, Платона и прослыть в сей жизни мудрым философом, а потом отойти в геену? Рассуди сам: лучше ни аза не знать, да к Христу достигнуть» [29, с. 210-211].

Асобныя ж спробы пашырыць у ВКЛ «studia humanitatis» прадпрымаліся пераважна пратэстантамі, пачынаючы з другой трэці XVI ст. Пэўны аналаг Страсбургскай гімназіі ў 1538–1542 гг. працаваў у Вільні. Тутэйшая лютэранская школа была адкрыта выпускніком універсітэтаў Кракава, Сіены і Вітэнберга А. Кульвай і існавала дзякуючы матэрыяльнай дапамоге каралевы Боны і віленскага ваяводы А. Гаштольда. Займалася тут да 60 юнакоў, пераважна з «сыноў баярскіх». Вучэбная праграма ўключала польскую, лацінскую і нямецкую мовы, гісторыю, арыфметыку і асновы лютэранскага веравызнання. Нажаль, дадзеная школа была хутка зачынена намаганнямі віленскага біскупа П. Гальшанскага [30, с. 40]. Такі ж лёс напаткаў і Віленскае вучылішча права, арганізаванае ў 1566 г. на базе былой парафіяльнай школы пры касцёле св. Яна выхаванцам Балонскага і Падуанскага ўніверсітэтаў, былым прафесарам Кракаўскага ўніверсітэта іспанцам П. Раізіям. Паводле інфармацыі гісторыкаў XIX ст. акцэнт у гэтым вучылішчы рабіўся на паглыбленым засваенні класічных моў, а таксама ўсяго комплексу юрыдычных навук – мясцовае (згодна статутаў ВКЛ 1529 і 1566 гг.), рымскае, грэчаскае, саксонскае, магдэбургскае права. Аднак, пасля прыбыцця ў 1569 г. у сталіцу ВКЛ езуітаў гэтую навучальную ўстанову улады передалі пад іх кантроль і яна стала выконваць функцыі падрыхтоўчага аддзялення пры тутэйшым калегіўме ордэна [31, с. 502].

Больш пашанцавала ў ВКЛ кальвіністам, галоўным заступнікам якіх стаў канцлер М. Радзівіл Чорны. Менавіта па яго ініцыятыве ў 1550-х гг. у Вільні была заснавана 5-класная кальвінская гімназія з шырокай вучэбнай праграмай (выкладаліся асновы кальвінізма, латынь, старажытнагрэчаская мова, рыторыка, паэтыка, матэматыка, гісторыя, права) і вялікай бібліятэкай (меліся працы Катона, Цыцэрона, Вяргілія, Гарацыя,

Арыстоцеля, Ксенафонта, Дэмасфена, Лукіяна і інш.). Дадзеная навучальная ўстанова карысталася шырокай папулярнасцю – яна падтрымлівала трывалыя сувязі з Цюрыхам, а вучыцца сюды прыязджалі юнакі не толькі з Беларусі і Літвы, але таксама і з Прусіі ды Курляндыі [32, с. 7].

Такім чынам, асноўнымі ініцыятарамі распаўсюджвання ў ВКЛ «studia humanitatis» былі пратэстанты. Але, як ужо адзначалася вышэй, іх стаўленне да зместу навучальнага працэсу пэўным чынам адрознівалася ад гуманістычнай традыцыі і мела больш рэлігійна-практычную афарбоўку. Што ж датычыцца «septem artes liberalis» то іх умацаванню на беларускіх землях спрыяў езуіцкі ордэн, які акрамя ўласнай акадэміі ў Вільні (1579) паступова пачаў ствараць тут і сетку сярэдніх навучальных устаноў – першымі ў краі з’явіліся калегіўмы ў Полацку (1581) і Нясвіжы (1584) [33, с. 55].

Акрамя езуітаў успрынялі «septem artes liberalis» і праваслаўныя брацкія школы – у Вільні (1584), Магілёве (1578), Брэсце (1591) і Мінску (1592). Вядомы даследчык К. Харламповіч пісаў, што яны: «Были слишком живой силой и не могли допустить рутины в школьном деле… чуткие к потребностям времени, они постоянно вводили в курс школы новые дополнения и перемены», у выніку чаго «не были ни исключительно греческими, ни исключительно латинскими... каждая школа... прошла две стадии своего развития: сначала она существовала как школа греко-славянская, потом постепенно сближалась с латинскою, причем это сближение заходило порой очень далеко» [34, с. 414–415]. У якасці доказу такога меркавання можна прывесці той факт, што ў Віленскай брацкай школе большую частку настаўнікаў складалі немцы-пратэстанты. А прывілей караля Уладзіслава IV Вазы ад 3 сакавіка 1633 г. юрыдычна зацвердзіў права праваслаўных мяшчан Магілёва «школу наукъ вызволенныхъ, языковъ вшеляких мети и профессоров набирати» [35, с. 182].

У цэлым, відавочна, што свядома ці не, але педагагічная думка ў брацкіх школах развівалася ў агульнаеўрапейскім напрамку. Характэрнае для гуманістычнай педагогікі пашырэнне вучэбнага курсу за кошт маралі, граматыкі, паэтыкі і логікі цалкам адпавядае структуры іх вучэбнага працэсу. Агучаная якраз італьянскімі асветнікамі эпохі Рэнесанса ідэя аб роўнасці роднай і класічных моў таксама знайшла тут сваё адлюстраванне – «простая мова» вывучалася як асобны прадмет, бо ўжывалася не толькі ў паўсядзённым жыцці, але і ў судовай справе. Трэба падкрэсліць і тое, што нягледзячы на выданне брацкімі друкарнямі вялікай колькасці ўласных вучэбных дапаможнікаў і выкарыстаннем, пераважна, візантыйскіх аўтараў (І. Дамаскін, І. Златавуст), антычная

літаратурная спадчына тут успрымалася ў якасці беспярэчнага духоўнага аўтарытэту (Арыстоцель, Платон, Цыцэрон, Сенэка, Эпікур). Сярод жа найбольш істотных адрозненняў праваслаўнай педагогікі ад асветніцкіх ідэй эпохі Рэнесанса было амаль поўнае ігнараванне ею гісторыі. Калі ў тагачасных еўрапейскіх школах на ўзорах дзеянняў антычных ды сярэднявечных герояў засноўваліся практычна ўсе прадметы і ўмацоўвалася ўнутраная матывацыя выхаванцаў да вучобы, то пры аналізе працэса выкладання ў брацкіх школах канкрэтных прыкладаў ужывання падобнай практыкі ўвогуле не сустракаецца [36, с. 44–51]. Такім чынам, вывучэнне дзейнасці брацкіх школ паказвае, што пры арганізацыі вучэбнага і выхаваўчага працэсу іх стваральнікі хутчэй зыходзілі з намеру знайсці пэўны кампраміс паміж праваслаўнай артадоксіяй і рэаліямі тагачаснай еўрапейскай культуры. Пры гэтым, непрымальнымі для іх аказаліся як асобныя занадта прагрэсіўныя ідэі італьянскіх гуманістаў, так і мясцовых кансерватараў. Бліжэй за ўсё ж да існаваўшай у іх педагагічнай сістэмы былі погляды пашыранага ў Францыі і Германіі памяркоўнага «хрысціянскага гуманізму», да якога схіляліся такія навукоўцы як Л. д’Этапль, І. Рэйхлін і Эразм Ратэрдамскі.

Аналізуючы спецыфіку адукацыйнай справы ў ВКЛ неабходна адзначыць тое, што істотным фактарам, які набліжаў яе да заходнееўрапейскай педагогікі была пастаянна ўзрастаючая колькасць мясцовых ураджэнцаў, адпраўляўшыхся на захад з дазволу ўлад: «для набытья наук, в писме цвиченья и учинков рыцерских» [37, с. 120]. Усяго за XIV–XVI стст. падобнай магчымасцю скарысталася да 700 выхадцаў з Беларусі, з якіх 430 скончылі Кракаўскі і Пражскі ўніверсітэты. Астатнія ж вучыліся па ўсёй Еўропе: у Германіі (Берлін, Лейпцыг, Вітэнберг, Нюрнберг, Цюбінген, Інгальштадт, Грэйфсвальд, Расток), Італіі (Падуя, Рым, Балонья), Швейцарыі (Базель), Францыі (Парыж), Англіі (Лондан, Эдынбург) [38, с. 10]. У метрычных кнігах еўрапейскіх універсітэтаў у азначаны перыяд зафіксаваны ураджэнцы звыш 100 населеных пунктаў ВКЛ. Пры гэтым, акрамя айчынных гарадоў і мястэчак (Полацк, Гродна, Брэст, Мінск, Віцебск, Навагрудак, Пінск, Ваўкавыск, Слонім, Клецк, Любань, Орша, Валожын, Ашмяны, Ліда, Ракаў, Мядзель, Любча, Свір, Геранёны, Нясвіж, Дрысвяты, Жупраны, Усялюб). Шэраг студэнтаў прыбылі з больш дробных паселішчаў. Так, у тым жа Кракаўскім універсітэце зафіксаваны студэнты з в. Ліпа каля Нясвіжа (1511), в. Вішня з пад Пружан (1511), в. Пакровы (1522) і в. Забалоцце (1528) Лідскага павету, в. Дварнова Полацкага ваяводства (1532) [39, с. 13–16]. Мэты ж падобных вандровак былі выдатна сфармуляваны ў лісце канцлера ВКЛ

М. Радзівіла Чорнага да свайго сына М. К. Радзівіла Сіроткі, які ў 1563 г. вучыўся ва ўжо згаданай вышэй гімназіі Страсбурга: «З дапамогай Божай добрым аратарам і добрым пісарам лацінскім да хаты рыхтуйся прыехаць, каб пасля навук… быў варты службы ў тых паноў, да якіх я цябе… уладкаваць жадаю» [40, с. 20].

Агульным вынікам развіцця адукацыі ў ВКЛ стала тое, што ў другой палове XVI ст. пісьменнымі тут з'яўляліся ўжо 10–12% насельніцтва. Найбольш адукаванай была, безумоўна, шляхта, у асяроддзі якой чытаць ды пісаць мог кожны трэці [41, с. 169]. Падобны ўзровень лічыўся нармальным у тагачаснай Еўропе і адпавядаў становішчу ў той жа Францыі ці Швецыі.

Падводзячы ж агульную выснову трэба адзначыць наступнае. Аналіз асноўных напрамкаў эвалюцыі асветніцкай справы ў межах еўрапейскай цывілізацыйнай прасторы сведчыць пра тое, што менавіта ў XIV–XVI стст. яна перажывала надзвычай важны пераходны этап, калі тэарэтычная педагогіка і існуючыя на практыцы разнастайныя адукацыйныя сістэмы вагаліся паміж «septem artes liberalis» і «studia humanitatis». Вынікам гэтага стала панаванне ў тагачасных школах граматыка-рытарычнай мадэлі навучання, якая, аднак, з кожным дзесяцігоддзем усё менш і менш задавальвала грамадства, што і стала, дарэчы, адным з фактараў, абумовіўшых пачатак эпохі Асветніцтва, калі былі выпрацаваны асновы гарманічнага спалучэння гуманітарных, прыродазнаўчых і дакладных дысцыплін у адзіны вучэбна-выхаваўчы комплекс сучаснага тыпу.

Спіс літаратуры

1. Аверинцев, С.С. Судьбы европейской культурной традиции в эпоху перехода от античности к средневековью / С.С. Аверинцев // Из истории культуры средних веков и Возрождения / отв. ред. В.А. Карпушин. – М.: Наука, 1976. – С. 17–64.

2. Уколова, В.И. Из истории эстетических учений раннего средневековья (эстетические взгляды Боэция) / В.И. Уколова // Европа в средние века: экономика, политика, культура / отв. ред. З.В. Удальцова. – М.: Наука, 1972. – С. 277–293.

3. Ле Гофф, Ж. Цивилизация средневекового Запада / Ж. Ле Гофф. – М.: Прогресс-Академия, 1992. – 376 с.

4. История педагогики и образования. От зарождения воспитания в первобытном обществе до конца XX в. / под ред. А.И. Пискунова. – М.: ТЦ Сфера, 2007. – 496 с.

5. Брагина, Л.М. Итальянский гуманизм. Этические учения XIV–XV веков / Л.М. Брагина. – М.: Высшая школа, 1977. – 254 с.

6. Ревякина, Н.В. Античные источники итальянской гуманистической педагогики / Н.В. Ревякина // Античное наследие в культуре Возрождения / отв. ред. В.И. Рутенбург. – М.: Наука, 1984. – С. 66-79.

7. Брагина, Л.М. Итальянский гуманизм. Этические учения XIV–XV веков / Л.М. Брагина. – М.: Высшая школа, 1977. – 254 с.

8. Сочинения итальянских гуманистов эпохи Возрождения (XV век) / под ред. Л.М. Брагиной. – М.: Изд-во МГУ, 1985. – 384 с.

9. Ревякина, Н.В. Гуманист Пьер-Паоло Верджерио об умственном труде и ученых / Н.В. Ревякина // Европа в средние века: экономика, политика, культура / отв. ред. З. В. Удальцова. – М.: Наука, 1972. – С. 341–354.

10. Брагина, Л. М. Итальянский гуманизм. Этические учения XIV–XV веков / Л.М. Брагина. – М.: Высшая школа, 1977. – 254 с.

11. Да Винчи, Л. Суждения о науке и искусстве / Л. да Винчи. – СПб.: Изд. «Азбука», 1998. – 224 с.

12. История педагогики Карла Шмидта, изложенная во всемирно-историческрм развитии и в органической связи с культурною жизнью народов: в 5 т. / под ред. В. Ланге. – М.: Тип. Мартынова и К°, 1877–1881. – Т. 2. – 1879. – 463 с.

13. Мартин Лютер – реформатор, проповедник и педагог. Тексты и комментарии / сост. О.В. Курило. – М.: Изд. РОУ, 1996. – 240 с.

14. Памятники мировой эстетической мысли: в 2 т. / под ред. В.П. Шестакова. – М.: Наука, 1962. – Т. 1. – 1962. – 682 с.

15. Додде, Н. Нидерланды / Н. Додде // Педагогика народов мира: История и современность / отв. ред. К. Салимова [и др.]. – М.: Педагогическое общество России, 2000. – С. 235–258.

16. Баткин, Л.М. Итальянские гуманисты: стиль жизни, стиль мышления / Л.М. Баткин. – М.: Наука, 1978. – 200 с.

17. Циглер, Т. История педагогики / Т. Циглер. – СПб.-Киев: Книгоиз-во «Сотрудник», 1911. – 501 с.

18. Джуринский, А.Н. История образования и педагогической мысли / А.Н. Джуринский. – М.: Изд. «Владос-Пресс», 2003. – 400 с.

19. Самусік, А.Ф. Выкладанне дысцыплін гуманітарнага цыкла ў езуіцкіх навучальных установах Беларусі (другая палова XVI – сярэдзіна XVIII стагоддзяў) / А.Ф. Самусік // Веснік адукацыі. – 2006. – № 1. – С. 64–71.

20. Андреев, А.Р. История ордена иезуитов. Иезуиты в Российской империи. XVI – начало XIX века / А.Р. Андреев. – М.: «Русская панорама», 1998. – 256 с.

21. Блинова, Т.Б. Иезуиты в Беларуси (Их роль в организации образования и просвещения) / Т.Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 425 с.

22. Учебные заведения Литвы до присоединения ея к России // Журнал Министерства Народного Просвещения. – 1862. – № 10. – С. 75–92.

23. Самусік, А.Ф. Антычная спадчына ў адукацыйнай справе Беларусі XVIII стагоддзя / А.Ф. Самусік // Молодежь в науке – 2007: прил. к журн. «Весці Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі»: в 4 ч. / редкол. В. В. Гниломедов [и др.]. – Минск: Белорус. наука, 2008. – Ч. 2. Серия гуманитарных наук. – С. 234–237.

24. Бельский, М.А. Распространение физических знаний в XVI – первой половине XVIII веков / М.А. Бельский, С.Н. Черенкевич, Э.М. Шпилевский // Очерки истории

науки и культуры Беларуси IX – начала XX веков / под. ред. П.Т. Петрикова [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1996. – С. 389–393.

25. Погодин, А. Лекции по истории польской литературы: в 4 ч. / А. Погодин. – Харьков: Тип. «Печатное дело», 1913. – Ч. 1. – 1913. – 263 с.

26. Чистович, И. Очерк истории западно-русской церкви: в 2 ч. / И. Чистович. – СПб.: Тип. Департамента уделов, 1882–1884. – Ч. 1. – 1882. – 220 с.

27. Харлампович, К. Западнорусския православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович. – Казань: Тип. Имп. Университета, 1898. – 586 с.

28. Скарына, Ф. Творы: прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія / Ф. Скарына. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 216 с.

29. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией: в 15 т. – СПб.: Археографическая комиссия, 1863–1892. – Т. 2. – 1865. – 288 с.

30. Андрэева, Е.Г. Пратэстанцкая адукацыя: этнічны аспект / Е.Г. Андрэева, Л.М. Лыч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 3. – С. 40–47.

31. Tazbir, J. Roizjusz Piotr / J. Tazbir // Polski Słownik biograficzny. – T. XXXI/4. – Z. 131. – S. 499–503.

32. Самусік, А.Ф. Станаўленне адукацыйнай справы на беларускіх землях ў XIV – сярэдзіне XVI ст. / А.Ф. Самусик // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. – Серыя 2. – 2008. – № 4. – С. 3–7.

33. Блинова, Т.Б. Иезуиты в Беларуси (Их роль в организации образования и просвещения) / Т.Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 425 с.

34. Харлампович, К. Западнорусския православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович. – Казань: Тип. Имп. Университета, 1898. – 586 с.

35. Беларускі архіў: у 3 т. – Мінск: Ін-т бел. культуры, 1927–1930. – Т. 1. – 1927. – 341 с.

36. Мещеряков, В.П. Братские школы Белоруссии (XVI – первая половина XVII в.) / В.П. Мещеряков. – Минск: БГУ, 1977. – 56 с.

37. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. / гал. рэд. І. П. Шамякін. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.

38. Галенчанка, Г.Я. Еўрапейскія сувязі Беларусі ў этна-канфесійным і духоўным кантэксце (XIII – сярэдзіна XVII ст.) / Г.Я. Галенчанка. – Мінск: ЗАО «Пропилеи», 1998. – 11 с.

39. Александровіч, С. Кнігі і людзі. Зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў / С. Александровіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. – 208 с.

40. Chachaj, M. Zagraniczna edukacja Radziwiłłow. Od początku XVI do połowy XVII wieku / M. Chachaj. – Lublin: Wyd-wo Uniwersitetu Marii Curie-Skladowskiej, 1995. – 171 s.

41. Pacevičius, A. Czytelnictwo / A. Pacevičius // Kultura Wielkiego Księstwa Litewskiego: analizy i obrazy / oprac. V. Ališauskas [i inn.]. – Krakow: Universitas, 2006. – S. 162–182.

Варонін В.А.

З ГІСТОРЫІ ЎЗАЕМААДНОСІН ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА З ТАТАРАМІ Ў КАНЦЫ XV – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XVI стст.: ХАН ШЫГ-АХМАТ

На мяжы XV–XVI стст., нягледзячы на распад Залатой Арды, татары працягвалі адыгрываць велізарную ролю ва Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропе. Ваенныя напады татар па-ранейшаму наводзілі страх практычна на ўсіх іх суседзяў (за выключэннем хіба што туркаў), а татарскі фактар працягваў моцна ўплываць на іх знешнюю палітыку. Гісторыі стварэння і распаду разнастайных кааліцый з удзелам татарскіх дзяржаў прысвечана немалая літаратура. На сённяшні дзень высветлены многія аспекты ўзаемаадносін паміж дзяржавамі рэгіёна, прычым апошнім часам самая пільная ўвага надаецца менавіта татарам. У гэтым артыкуле зроблена спроба падыйсці да праблемы, паказаўшы лёс аднаго з татарскіх ханаў. Гаворка ідзе пра Шыг-Ахмата[1] – апошняга хана Заволжскай арды (у Маскве гэту арду называлі Вялікай). Асоба і пакручасты жыццёвы шлях гэтага чалавека выклікала жывую цікавасць ужо ў сучаснікаў, сведчаннем чаго з’яўляюцца дастаткова частыя згадкі пра яго ў тагачасных крыніцах. Тым не менш, далёка не ўсе факты ў іх падаюцца дакладна і без памылак. Гэтыя недакладнасці і памылкі мы, на жаль, знаходзім і ў сучаснай спецыяльнай літаратуры. Прасочваючы незвычайны жыццёвы шлях апошняга заволжскага хана, мы прыходзім да лепшага, больш глыбокага разумення шэрагу важных гістарычных праблем, адкрываем для сябе новыя факты – часам зусім нечаканыя.

Шыг-Ахмат быў адным са шматлікіх сыноў заволжскага хана Ахмата, які спрабаваў, але так і не здолеў вярнуць пад сваю ўладу Маскву і ўсю Паўночна-Усходнюю Русь. Ахмат прытрымліваўся саюза з каралём польскім і вялікім князем літоўскім Казімірам Ягелончыкам, аднак у рашучы момант барацьбы з Масквой так і не дачакаўся ад яго колькі-небудзь прыкметнай падтрымкі. Ахмат быў забіты сібірскім ханам

[1] У гістарычных крыніцах гэта імя мае велізарную колькасць варыянтаў напісання: Шид-Ахмат, Ших-Ахмат, Шиг-Ахмет, Шы-Ахмет, Ши-Ахметь, Шыг-Ахметь, Шиг-Ахметь, Ши-Ахмат і інш. Абраны варыянт дакладна паўтарае напісанне імя ва ўласных ярлыках хана, якія ён накіраваў у Вялікае Княства Літоўскае і якія адклаліся ў Метрыцы Вялікага Княства.

Ібакам і нагайскімі мурзамі ў 1481 годзе – у хуткім часе пасля славутага «стаяння» на рацэ Вугра.

Шыг-Ахмат выйшаў на палітычную арэну ўжо ў хуткім часе пасля гібелі бацькі і практычна адразу заняў віднае месца ў Заволжскай Ардзе. Адным з самых ранніх дакументаў, з якіх мы даведваемся пра Шыг-Ахмата, з'яўляецца яго ярлык да Казіміра Ягелончыка, датаваны 1484 годам [29, p. 101]. Гэты ярлык быў накіраваны да караля ад «солтана наменъшого» Шыг-Ахмата разам з пасольствам і ярлыкамі заволжскага хана Муртазы і іншых знатных татар. Муртаза быў старэйшым братам Шыг-Ахмата [30, p. 170]. Відавочна, што ўжо ў той час становішча Шыг-Ахмата ў дзяржаве было высокім, але пакуль што не першаступенным.

У лісце крымскага хана Менглі-Гірэя да маскоўскага пасла Дзмітрыя Шэіна, датаваным 1487/1488 годам, Шыг-Ахмат разам з братам Муртазой фігуруе ўжо як татарскі «цар» [15, с. 73]. Праўдападобна, што Шыг-Ахмат прыйшоў да ўлады ў 1488 годзе: маскоўскія дыпламатычныя дакументы, адпраўленыя ў Крым у кастрычніку 1487 г., у якасці ханаў Вялікай арды называюць яшчэ Муртазу і Седзі-Ахмата [15, с. 63, 65–67]. У далейшым Шыг-Ахмат яшчэ больш за дзесяць гадоў кіраваў Ардой разам са сваімі братамі-суправіцелямі: у 1491 г. са старэйшым братам Седзі-Ахматам [30, p. 125; 15, с. 108], у 1491–1493 гг. з малодшым братам Сеіт-Махмудам [30, p. 170; 15, с. 119, 168, 175]. Жаніцьба Шыг-Ахмата ў 1493 г. з дачкой нагайскага мурзы Мусы выклікала незадаволенасць заволжскай знаці, і татарскія князі яго «съ Орды сбили» [16, с. 2, 4, 5, 6–7; 15, с. 180; 7, с. 53]. Аднак ужо ў 1494 г. Шыг-Ахмат з Сеіт-Махмудам зноў былі «царамі» [15, с. 211]. У 1498 г. суправіцелем Шыг-Ахмата зноў быў Муртаза [15, с. 250; 30, p. 138]. Толькі ў 1500 г. Шыг-Ахмат стаў адзінаасобным ханам. Менавіта тады маскоўскі пасол у Крыму Іван Кубенскі паведамляў вялікаму князю Івану III: «А на царстве … нынеча Шихъ-Ахметъ, а калга Хозякъ салтанъ, Ахматовъ же сынъ, а князь Тевекель, Темиревъ сынъ» [15, с. 323].

Адносіны паміж Заволжскай і Перакопскай ордамі былі варожымі яшчэ ў часы Ахмата, такімі ж яны заставаліся і пазней. У маі 1491 г. Шыг-Ахмат і Сеіт-Махмуд нават арганізавалі паход на Крым, на Менглі-Гірэя, але ў выніку супрацьдзеяння Івана III былі вымушаны вярнуцца [17, с. 329–330].

Сярод сыноў Ахмата Шыг-Ахмат быў, відаць, самым паслядоўным прыхільнікам і, больш таго, ініцыятарам новага збліжэння з ВКЛ. Самыя першыя пасля гібелі Ахмата спробы аднаўлення саюза былі звязаны менавіта з яго імем. У 1487 г. Шыг-Ахмат накіраваў у ВКЛ свай-

го прадстаўніка Тагіра, але тамтэйшыя ўлады, паводле пазнейшага сцвярджэння Шыг-Ахмата, «некоторих людеи лихих послухавъшы», затрымалі яго на восем гадоў [30, p. 97]. Кантакты былі адноўлены толькі ў 1495 годзе. Пасля прайгранай вайны з Масквой вялікі князь літоўскі Аляксандр быў вымушаны шукаць знешнепалітычных саюзнікаў, і гэтыя пошукі прывялі яго дыпламатаў на ніжнюю Волгу. У сярэдзіне 1495 г. Аляксандр накіраваў да «Ахматавых дзяцей» свайго пасла [15, с. 218], а ўжо ў снежні паслы Шыг-Ахмата Ісуп (Юсуф) і Мусунак, а таксама прадстаўнікі хана Муртазы і князя Цювікеля прыбылі ў Гродна [30, p. 97]. У 1496 г. Аляксандр адправіў да Шыг-Ахмата пасольства на чале з князем Васілём Барысавічам Глінскім [30, p. 98–99]. Аднак па дарозе, «на поли» пасольства было перахоплена і абрабавана татарамі, якія адвялі Глінскага да Менглі-Гірэя ў Крым [31, p. 80]. Тым не менш, у адказ з Волгі ў Вялікае Княства Літоўскае было накіравана пасольства на чале з Алімердэкам. У студзені 1497 г. Аляксандр зноў накіраваў ў Заволжскую Арду пасла – Міхаіла Халецкага [30, p. 118].

У выніку абмена гэтымі пасольствамі бакі дэкларавалі свае намеры наступным чынам: «мы послы нашыми с обу сторонъ … будем зъсылатися о братство и прыязнь межы нами … потверъдимъ» [30, p. 118].

У тым жа 1497 годзе ў Вялікае Княства прыбыло пасольства ў адказ: Абдула-батыр, Хакім-зада, Дана [30, p. 125–126]. На гэты раз Аляксандр абмежаваўся пасылкай талмача Байраша [30, p. 126]. У 1498 г. Шыг-Ахмат накіраваў у ВКЛ Якірхожу і Чорнага Абдулу [30, p. 138]. Адказам Аляксандра было новае пасольства М. Халецкага, які павінен быў ужо прыняць ад Шыг-Ахмата саюзную прысягу, а сам Аляксандр быў гатовы прысягнуць перад наступнымі татарскімі пасламі [30, p. 139–140]. Аднак у гэты момант сітуацыя на Волзе змянілася: у 1499 г. Шыг-Ахмат «был с царства согнан и ограблен», у выніку чаго Халецкі не здолеў нават сустрэцца з ім [30, p. 143, 147]. Змову ўзначаліў, відаць, Сеіт-Махмуд [30, p. 144], але Шыг-Ахмат вельмі хутка скінуў брата і вярнуўся да ўлады. У сакавіку 1500 г. яго прадстаўнікі Елбердзей і Наўмень былі ў Гродне [30, p. 143]. У тым жа годзе Аляксандр накіраваў у Заволжскую арду пасольства на чале з Трызнам [30, p. 150]. Пасольства М. Халецкага, якое планавалася першапачаткова, не было адпраўлена, бо пачалася новая вайна ВКЛ з Масквой, і масквічы ў ходзе ваенных дзеянняў перакрылі дарогі [30, p. 147–148]. У 1500 г. заволжскі хан паслаў да Аляксандра яшчэ адно пасольства – Чорнага Абдулу і Ачкару. Шыг-Ахмат прасіў не затрымліваць іх доўга і адпусціць надыходзячай зімой – з тым разлікам, каб на вясну яны прыбылі да Шыг-Ахмата ў

раён Азова, дзе, відавочна, арда зімавала. Хан прасіў прыслаць да яго пасламі Ібрагіма (Абрагіма) і Халецкага [30, p. 157]. Чорны Абдула і Ачкара і былі, відаць, тымі пасламі заволжскага цара, якія заключылі саюз з Вялікім княствам Літоўскім і Каралеўствам Польскім. Як паведамляе Мацей Стрыйкоўскі, 11 студзеня 1501 г. у Кракаў да польскага караля Яна Ольбрахта прыбылі паслы Шыг-Ахмата і заключылі з ім саюз супраць Менглі-Гірэя і Івана III. Пры заключэнні саюза прысутнічалі і прадстаўнікі Вялікага Княства Літоўскага, накіраваныя ў Кракаў Аляксандрам. Саюз абыйшоўся Польшчы і ВКЛ у 30 тысяч залатых, якія яны абавязваліся выплаціць татарам кажухамі і сукном. Наўзамен Шыг-Ахмат абавязваўся выставіць супраць любога ворага ВКЛ і Польшчы 30-тысячнае войска. Мацей Мяхоўскі, а за ім і іншыя польскія хрaністы, якія праяўлялі немалую цікавасць да татар, так апісвалі абрад прысягі, якую заволжскія паслы прынеслі сваім «звыклым звычаем». Паслы лілі ваду на свае аголеныя шаблі, пілі яе і гаварылі: «Калі нехта гэту дружбу і гэту сяброўскую прысягу парушыць альбо супраць яе выступіць, няхай ён загіне ад шаблі і ператворыцца ў нішто так, як гэта вада». Саюз быў заключаны. Для прынясення прысягі ў адказ да Шыг-Ахмата былі накіраваны паслы Крыштоф Тэсьлік (ад Польшчы) і Міхаіл Халецкі (ад ВКЛ), абодва абазнаныя ў татарскай мове [39, p. 361; 42, s. 312; 30, p. 159–160].

Такое развіццё падзей вельмі ўстрывожыла крымскага хана Менглі-Гірэя – зацятага ворага «Ахматавых дзяцей». Ён пільна сачыў за сітуацыяй і ўжо вясной 1501 г. ведаў пра накіраванне польскага пасла на Волгу, чым быў вельмі незадаволены. Тады ж Менглі-Гірэй атрымаў з Заволжскай арды вестку пра тое, што Шыг-Ахмат збіраецца ісці да Дняпра. Дабразычліўцы раілі крымскаму хану заняць дняпроўскі бераг, каб «Заволжскі, прыцягнуўшы туды, памёр бы з голаду» (інструкцыю крымскаму паслу ў Польшчу, з якой узяты адпаведныя звесткі, трэба датаваць 1501 г., а не 1500 г., як у публікацыі) [38, s. 98–99]. Магчыма, пагроза з боку крымчакоў была той прычынай, якая на нейкі час затрымала хана на Волзе. Яшчэ адной прычынай былі спрэчкі сярод заволжскіх татар адносна мэтазгоднасці такога далёкага пахода. Многім, у тым ліку блізкім сваякам хана, дняпроўская вандроўка падавалася вельмі рызыкоўным прадпрыемствам. Тым не менш, ваяўнічы настрой ў атачэнні хана перамог.

У верасні 1501 г. Шыг-Ахмат на чале велізарнага войска ўварваўся на Севершчыну, якая на той момант ужо была занята маскоўскімі войскамі. Дата падзеі патрабуе дадатковага абгрунтавання. Першапачаткова ў

«Трактаце аб дзвюх Сарматыях» Мяхоўскі напісаў, быццам Шыг-Ахмат прыкачаваў на Севершчыну «пад зіму» (sub hiemem) 1500 года [10, с. 65, 146]. Аднак гэта дата з'яўляецца, відавочна, памылковай. Ужо ў сваёй крыху пазнейшай «Хроніцы палякаў» Мяхоўскі удакладніў дату і назваў яе правільна – верасень 1501 года [39, p. 361]. Гэты самы час (восень 1501 г.) падае і «Хроніка Быхаўца» [20, с. 168].

Ужо тагачасныя крыніцы гавораць пра тое, што войска заволжскіх татар налічвала 60 тысяч ваяроў [26, s. 67]. Паводле крыху пазнейшых звестак М. Мяхоўскага, само войска складалася з 60 тысяч чалавек, з якімі было яшчэ больш за 100 тысяч жанчын і дзяцей [10, с. 65, 146]. За Мяхоўскім ідуць многія пазнейшыя аўтары, у тым ліку замежныя [2, с. 86]. Думаецца, яго лічбам можна верыць.

Першыя дзеянні заволжскиx татар былі ўдалымі: яшчэ па дарозе Шыг-Ахмат атрымаў перамогу над крымчакамі [30, p. 170, 172, 175], а потым здолеў узяць Ноўгарад-Северскі і Рыльск [30, p. 172, 173, 175]. Хан даручыў гэтыя замкі Міхаілу Халецкаму [20, с. 168; 42, s. 313]. Прыкладна ў верасні Шыг-Ахмат адправіў да вялікага князя літоўскага Халецкага і сваё пасольства, паведамляючы Аляксандру пра свой прыход і просячы 15–20 тысяч чалавек у дапамогу [30, p. 170–171; 20, с. 168–169]. Дапамогі людзьмі ён не атрымаў, што Аляксандр патлумачыў уласнымі актыўнымі ваеннымі дзеяннямі супраць маскоўскіх ваявод, аднак 20 верасня ўрад ВКЛ прыняў рашэння спагнаць на патрэбы заволжскіх татар вялікую ардыншчыну ў футрах і сукне з 27 найбуйнейшых дзяржаўных гарадоў [30, p. 171–172].

Нягледзячы на ваенныя дзеянні на Севершчыне, Шыг-Ахмат не жадаў адкрытага разрыву з Іванам III. Больш таго, у снежні 1501 г. ён адправіў у Маскву свайго пасла «о дружбе и любви». У сакавіку 1502 г. Іван III адпусціў яго, адначасова накіраваўшы да Шыг-Ахмата свайго пасла Давыда Ліхарава «о любви же» [17, с. 366, 367]. Увогуле, пад час вайны 1500–1503 гг. інтарэсы ВКЛ і Заволжскай арды размеркаваліся такім чынам, што галоўным праціўнікам ВКЛ была Масква, а асноўным ворагам Шыг-Ахмата быў Менглі-Гірэй. З другім удзельнікам варожай кааліцыі Вялікае княства Літоўскае і Заволжская арда стараліся не канфліктаваць. Тое самае слушна для саюза Масква – Крым.

Адначасова з пасольствам у Маскву Шыг-Ахмат адправіў сваіх паслоў Акім-хаджу і Чорнага Абдулу да Аляксандра. Пасольства прыбыло ў Кракаў 18 снежня. Шыг-Ахмат яшчэ раз паведамляў пра свае ваенныя поспехі, выказваў лёгкае здзіўленне тым, што пра войскі Аляксандра «нигде не слышали есмо» і прасіў у чарговы раз накіраваць да

яго Халецкага, які прыйшоўся татарам вельмі да спадобы. У ханскім ярлыку адзначана: «колько отъ васъ послы бывали, а не бывалъ таковъ добрыи чоловекъ». Аднак сярод шматлікіх просьб, выказаных пасламі Шыг-Ахмата, былі і такія, якія не маглі не выклікаць занепакоенасці Аляксандра. У прыватнасці, паслы павінны былі «просити Киева» [30, p. 172–173]. З пасольствам у адказ зноў паехаў Міхаіл Халецкі [30, p. 178].

Зіму 1501/1502 гг. заволжскія татары правялі недалёка ад Кіева – як пісаў Шыг-Ахмат у ярлыку да Аляксандра, «перешедшы Десну на вашу сторону» [30, p. 176, 177]. Ужо тады татары пачалі рабаваць гэтыя ўскраінныя землі Вялікага Княства [26, s. 67]. Зіма была вельмі халодная і снежная, арда з цяжкасцю яе перанесла. Справа дайшла да таго, што жонка Шыг-Ахмата разам з сынамі пакінула мужа і накіравалася на поўдзень, да Менглі-Гірэя. З імі пакінула хана і перайшла ў Крым вялікая колькасць татар [26, s. 72].

Недзе пад вясну заволжскія татары на чале з ханам адкачавалі крыху на поўдзень і спыніліся ў раёне Канева, дзе, як сцвярджаў Шыг-Ахмат, каля ста дзён чакалі дапамогі ад Аляксандра [18, с. 197]. Шыг-Ахмат прасіў у яго самае малое 4000 чалавек [18, с. 198], але не атрымаў іх.

На вясну 1502 г. Менглі-Гірэй вырушыў супраць Шыг-Ахмата, які стаяў «на Турпаче Воде». Крымскі хан прасіў Івана III прысланць яму да 10 ці 15 чэрвеня свае войска і 20 пішчаляў [15, с. 417], але вырашальная бітва адбылася без удзелу рускіх войск і значна раней, чым меркаваў Менглі-Гірэй: паміж 2 і 6 чэрвеня [15, с. 418–420]. Шыг-Ахмат быў разгромлены, і гэта паражэнне стала для хана катастрофай: пры ім засталося ўсяго шэсць тысяч чалавек [26, s. 104]. Падобна, што ў бітве загінуў адзін з братоў Шыг-Ахмата – Занаі-султан [18, с. 197].

Далейшыя падзеі М. Мяхоўскі і Ж. Герберштэйн выкладалі наступным чынам. Разбіты хан у суправаджэнні прыблізна 300 (у Герберштэйна 600) вершнікаў кінуўся да турэцкага ўладання Белгарада на Днястры, але, западозрыўшы турак у намеры захапіць яго, з атрадам колькасцю 50 (у Герберштэйна 300) коннікаў вярнуўся да Кіева. Тут мясцовы ваявода («Хроніка Быхаўца» канкрэтна называе князя Дзмітрыя Пуцяціча, які ў гэты час сапраўды быў кіеўскім ваяводам) узяў яго палон і адправіў у Вільню [39, p. 365; 10, с. 65, 146; 3, с. 446–449]. У «Хроніцы Быхаўца» гэта апавяданне мае істотныя адрозненні. Быццам бы адразу пасля паражэння Шыг-Ахмат «прыбег да Кіева», дзе Пуцяціч яму «многие дни честь великую чынил и дары многие давал». Аднак, нягледзячы на такі цёплы прыём, хан «безвестно» уцёк да Белгарада, пасля чаго другі раз з’явіўся пад Кіевам [20, с. 169]. Мяхоўскі і Герберштэйн выклалі

сваё апавяданне ў такім стылі, што можна падумаць, быццам падзеі разгортваліся на працягу літаральна некалькіх тыдняў ці ў горшым выпадку некалькіх месяцаў. На самой справе яны занялі прыкладна паўтара гады і былі намнога больш складанымі.

З перапіскі кіраўнікоў польскай знешняй палітыкі вядома, што яшчэ вясной 1502 г. турэцкі султан (Баязід II) жадаў, каб Шыг-Ахмат з’явіўся ў стэпах каля турэцкіх крэпасцяў Белгарад і Кілія. Ён абяцаў даць хану шасцітысячнае войска на чале з сілістрыйскім пашой Малькачам для заваявання Малдавіі. У выпадку, калі Шыг-Ахмат зможа зрабіць гэта, султан абяцаў яму даць свабодна прайсці па сваіх землях «да ўсіх частак свету». У дадатак султан надаў хану белгародскае мыта [26, s. 92]. У гэтых планах і абяцаннях выразна выявілася імкненне султана адцягнуць сілы Шыг-Ахмата на паўднёвы захад і гэтым самым не дапусціць яго сутыкнення з Менглі-Гірэем. Тым не менш, сутыкненне ўсё ж адбылося. Ужо пасля разгрому Шыг-Ахмата з’явіліся чуткі, быццам султан паслаў яго паходам на Венгрыю праз Малдавію [26, s. 104]. Гэта інфармацыя ў выніку не пацвердзілася, але яна зноў указвае на сувязі Шыг-Ахмата з султанам і на імкненне апошняга накіраваць актыўнасць хана ў паўднёва-заходнім напрамку. Аднак султану гэтага зрабіць не ўдалося. Малаверагодна, што пасля разгрому 1502 года Шыг-Ахмат накіраваўся да турэцкіх граніц. Няма сведчанняў пра гэта і ў дакладна датаваных эпісталярных ці дакументальных крыніцах. Вояж заволжскага хана да Белгарада, пра які пісалі Мяхоўскі і Герберштэйн, трэба аднесці да пазнейшага часу, а менавіта да восені 1503 года.

У ліпені 1502 г. пасол Шыг-Ахмата Хож-Ахмет Саіць (Саід) прывёз да Аляксандра ў Навагрудак новыя ханскія ярлыкі. З гэтых ярлыкоў цяжка зразумець, калі яны былі напісаны: да разгрому ці ўжо пасля яго. Па часе больш верагодна другое. Гэта, аднак, практычна не адбілася на змесце пасланняў. Хан і яго набліжаныя падкрэслівалі свае заслугі перад саюзнікам і прасілі Аляксандра як найхутчэй прыйсці да іх з войскам. Яны з трывогай адзначалі: «межы дву воинъ стоимъ… Естли боръзо воискомъ не прыидете, тогды межы дву воинъ не можемъ постояти» [30, р. 178–179]. Аляксандр, які сам вёў цяжкую вайну супраць Масквы, абмежаваўся пасылкай Шыг-Ахмату грошай. У ліпені 1502 г. у Навагрудку Аляксандр актыўна займаўся зборам сродкаў для саюзнікаў-татар. Толькі 21 ліпеня ў гаспадарскі скарб паступіла 1150 залатых фларынаў для перадачы заволжскаму хану «за службу» (pro munere) [28, р. 294].

Адмова Аляксандра дапамагчы хану войскам прывяла да таго, што ўжо восенню 1502 г. Шыг-Ахмат накіраваў у Маскву паслоў, праз якіх

прасіў Івана III здабыць і перадаць яму Астрахань. Вялікі князь маскоўскі пісаў да Менглі-Гірэя пра намеры Шыг-Ахмата наступнае: «он от нашего недруга Литовского хочет отстати и дружбы с ним держати не хочет». Іван III адказаў паслу такім чынам, што ён гатовы заваяваць для Шыг-Ахмата Астрахань у выпадку, калі той разарве саюз з Аляксандрам і не будзе рабіць зла Менглі-Гірэю і яго юрту [15, с. 435–436; 30, p. 181]. Цяжка сказаць, у якой ступені гэта адпавядала сапраўднаму зместу перагавораў. Як бы там ні было, але Шыг-Ахмат не пайшоў на разрыў саюза з ВКЛ і Польшчай. Ён вырашыў сам накіравацца на Волгу, паабяцаўшы Аляксандру вярнуцца і прывесці з сабой нагайцаў [18, с. 200].

Позняй восенню 1502 г. з Крыма ў Маскву прыйшлі весткі аб тым, што Шыг-Ахмат прыбыў на Волгу да Астрахані і паспрабаваў уступіць у саюз з мясцовымі татарамі – сваім дзядзяй астраханскім ханам Абдул-Керымам і нагайцамі. Відаць, перагаворы былі не вельмі ўдалымі, і Шыг-Ахмат накіраваў свайго пасла да турэцкага султана [15, с. 445, 451–452, 456]. Шыг-Ахмат і яго брат Хазяк-султан мелі сярод астраханцаў нямала прыхільнікаў і, напэўна, разлічвалі прыйсці там да ўлады. Яны зазімавалі ў Астрахані, але сваіх людзей з імі было ўсяго 500 чалавек [15, с. 456]. Становішча Шыг-Ахмата было вельмі складаным: хана пакінуў і накіраваўся служыць да Менглі-Гірэя ў Крым нават адзін з самых блізкіх да яго людзей князь Цювікель [15, с. 467]. У красавіку 1503 г. з Крыма ў Маскву прыйшла вестка аб тым, што Шыг-Ахмат «пошел в Нагаи» [15, с. 471]. Тады ж у Вялікае Княства Літоўскае прыбылі паслы ад Шыг-Ахмата, заволжскіх і нагайскіх татар і паведамілі, што нагайцы абралі Шыг-Ахмата сваім гаспадаром («паномъ»). Ад імя Шыг-Ахмата яны выказалі гатоўнасць выступіць супраць любога непрыяцеля, на якога ўкажа «вялікі кароль». У якасці такога ворага Аляксандр як быццам назваў Вялікае Княства Маскоўскае і пераконваў Шыг-Ахмата распачаць ваенныя дзеянні супраць Івана III ужо той жа вясной. Важна адзначыць, што ўвесь гэты час пры Шыг-Ахмаце знаходзіўся пасол Аляксандра [30, p. 192].

Аднак Шыг-Ахмат разглядаў і іншыя варыянты знешнепалітычных саюзаў. Так, летам 1503 г. яго пасол Мухіддзін знаходзіўся ў Стамбуле, дзе вёў перагаворы з султанам [8, с. 104].

У маі ці чэрвені 1503 г. нагайскія мурзы разам з Шыг-Ахматам і Хазяк-Султанам пераправіліся на правы бераг Волгі і перайшлі Мядзведзіцу, прыток Дона. Усё паказвала на тое, што яны накіроўваюцца на захад. Гэта небяспека ўтрымала Менглі-Гірэя ад пахода на Кіеў, да чаго яго настойліва схіляў Іван III [15, с. 474, 477–478; 14, 432]. Аднак сярод

нагайскіх татар не было адзінства. Некаторыя з іх, у прыватнасці блізкі да Менглі-Гірэя мурза Ямгурчэй імкнуліся утрымаць сваіх супляменнікаў ад саюза з Шыг-Ахматам і далёкіх паходаў. Усю рызыкоўнасць ваенных экспедыцый у аддаленыя краіны прадэманстраваў нядаўні паход заволжскага хана. У выніку яшчэ ў сярэдзіне лета Шыг-Ахмат знаходзіўся ў нізоўях Волгі, а 8 ліпеня зноў прыкачаваў да Астрахані. Астрахань і была ў гэты час галоўнай мэтай Шыг-Ахмата: тым жа летам ён накіраваў новае пасольства да Івана III, якое ў чарговы раз прасіла вялікага князя маскоўскага заваяваць для былога заволжскага хана гэты горад [15, с. 482, 486, 489–490; 14, с. 464; 17, 370]. Гэты план не удаўся, і восенню 1503 г. пакінуты нагайцамі Шыг-Ахмат з братам Хазяк-султанам і пляменнікам Халек-султанам з'явіўся пад Кіевам [15, с. 509, 510, 516]. Крымска-маскоўская дыпламатычная перапіска называе Халек-султана братам Шыг-Ахмата, аднак больш верагодна, што ён даводзіўся хану пляменнікам (братанічам) [32, р. 87, 96]. Відаць, людзей з імі было зусім няшмат: на малалікасць прыхільнікаў Шыг-Ахмата ўказваюць маскоўскія крыніцы, датаваныя яшчэ летам 1503 г. [14, с. 432, 435]. Прыкладна ў гэты час Шыг-Ахмат атрымаў ліст ад турэцкага султана (Баязіда) з запрашэннем прыехаць [31, р. 94]. Пра далейшыя падзеі ў дэталях паведамляе ярлык Менглі-Гірэя да Івана III, датаваны 2 ліпеня 1504 года. Пры ўсёй тэндэнцыйнасці гэтага ліста, выкладзеныя ў ім факты, як уяўляецца, у цэлым адпавядаюць гістарычнай рэчаіснасці. Прыкладна так жа, за выключэннем некаторых трактовак, ход падзей падаюць і іншыя крыніцы, у тым ліку прыведзеныя вышэй.

Такім чынам, з ярлыка высвятляецца, што з-пад Кіева Шыг-Ахмат і яго прыхільнікі накіраваліся да Белграда (Днястроўскага), адкуль хацелі ехаць да султана. Аднак султан накіраваў ім насустрач свайго пашу і праз яго абвясціў, што не жадае прапускаць іх у свае землі. Быццам бы ў якасці прычыны быў названы той факт, што Шыг-Ахмат варагуе з Менглі-Гірэем, а султан з крымскім ханам у дружбе: «вас мы не знаем, нам друг и брат Менли-Гирей царь…». Гэта тлумачэнне ярлыка выглядае вельмі падазроным. Яшчэ больш падазроным падаецца выкладанне далейшых падзей: людзі султана быццам бы прывялі Шыг-Ахмата ў Белград, а потым яго адтуль выгналі. У гэтай частцы версія Мяхоўскага і Герберштэйна, згодна з якой туркі планавалі захапіць хана, выглядае значна больш праўдападобнай. Варожыя намеры султана ў дачыненні да Шыг-Ахмата маглі быць выкліканы тым, што ў 1502 г. хан не захацеў выканаць жаданне турэцкага двара і з'явіцца ў раён Белграда і Кіліі. Далей Менглі-Гірэй піша: «И сее зимы, с первозимья наши

дети были в Новом городке; и они, послышав Шиг-Ахметя, за ним гонялися; ино пришла студень велика и вьялица и снеги велики, и они воротилися…». Шыг-Ахмат і яшчэ сямёра з ліку знаці, у тым ліку двое вышэй названых яго сваякоў, былі вымушаны ратавацца ўцёкамі ў Кіеў, дзе мясцовы ваявода князь Дзмітрый (Пуцяціч) захапіў іх і адправіў у Вышгарад [15, с. 516]. З прыведзенага апавядання вынікае, што Шыг-Ахмат аказаўся ў Кіеве і трапіў у палон з надыходам зімовых халадоў, гэта значыць у лістападзе ці снежні 1503 года. Гэту дацiроўку пацвярджае і шэраг іншых крыніц. Удзел кіеўскага ваяводы Дзмітрыя Пуцяціча у захопе хана адзначаюць многія крыніцы. Пры гэтым знаходжанне Пуцяціча ў Кіеве 9 верасня 1503 г. засведчана дакументальна [12, л. 1]. Недзе ў лістападзе ці ў першай палове снежня 1503 г. Шыг-Ахмат ужо быў у Вільні і прасіў Аляксандра, які на той час знаходзіўся ў Польшчы, пра асабістую сустрэчу. Аляксандр паабяцаў сустрэцца з ім у Мельніку, куды планаваў прыбыць 6 студзеня 1504 г. [31, p. 97–98]. Праўда, сустрэча тады не адбылася. У лютым 1504 г. у Маскве пра Шыг-Ахмата ўжо ведалі, што «Литовской [Аляксандр. – В.В.] взял его к себе да держит его в своей земле» [15, с. 510]. У жніўні таго ж года з Масквы ў Крым пісалі, што заволжскага хана трымаюць у Верхнім замку ў Вільні, а яго братоў разаслалі па іншых замках [15, с. 522, 527, 539].

«Хроніка Быхаўца» прадстаўляе ўсю гісторыю асаблівым чынам, робячы акцэнт на дабраахвотнасці паездкі хана ў Літву. Быццам бы пасля другога вяртання Шыг-Ахмата ў Кіеў Аляксандр накіраваў да яго сваіх паслоў і запрасіў да Вільні, а Дзмітрый Пуцяціч толькі праводзіў хана ў сталіцу [20, с. 169]. Аднак наўрадці ўсё было так мірна і спакойна: вядома, напрыклад, што ў Вільні Шыг-Ахмата трымалі пад вартай [42, s. 322]. Мяхоўскі паведамляе пра тое, што хан здзейсніў некалькі спроб уцекчы адтуль [10, с. 65, 146].

Польская дыпламатычная перапіска сведчыць аб тым, што ўжо дастаткова хутка пасля захопу Шыг-Ахмата да Аляксандра прыбыло пасольства з 800 татар, пераважна заволжскіх, і з пагрозамі патрабавала вызваліць хана [26, s. 443]. Але пагрозы нікога не напалохалі. Не адрэагаваў кароль і на міралюбівыя просьбы проста выпусціць хана. З такімі просьбамі да яго звярнулася з Нагаяў маці Шыг-Ахмата і чацвёра яго братоў, «цароў». Тое ж напісалі і некаторыя мурзы (у цытаванай публікацыі адпаведныя ярлыкі памылкова датаваны 1502 годам, на самой справе яны адносяцца, хутчэй за ўсё, да 1504 года) [31, p. 94–95]. Аднак планы Аляксандра адносна далейшага лёсу Шыг-Ахмата, як аказалася, былі зусім іншымі.

Практычна адразу пасля захопу заволжскага хана Аляксандр прыслаў сваіх паслоў ў Крым і паспрабаваў выкарыстаць свой поспех. Ён дабіваўся ад Менглі-Гірэя міра: толькі ў такім выпадку Аляксандр абяцаў вырашыць праблему Шыг-Ахмата пажаданым для Менглі-Гірэя чынам. Калі ж крымскі хан адмовіцца заключаць мір, Аляксандр пагражаў на згубу Менглі-Гірэю выпусціць Шыг-Ахмата разам з братамі. Іван III заклікаў Менглі-Гірэя не верыць Аляксандру і сцвярджаў, што каралю «однолично … Шиг-Ахметя царя ни отпустити, ни убити, ни стати ему с Шиг-Ахметем против нас, тебя и меня…» [15, с. 522, 527, 533, 557].

Відаць, пагроза вызваліць хана была ўсяго толькі блефам з боку Аляксандра. Ужо тады кароль разумеў, што самым лепшым выйсцем будзе не выпускаць хана, а трымаць яго пад надзейнай вартай. Менавіта гэта раілі гаспадару паны-рада Вялікага Княства. Прынамсі, так яны сцвярджалі ў сваім лісце 1505 г. да Менглі-Гірэя [31, p. 325].

Аляксандр імкнуўся выкарыстаць факт палону Шыг-Ахмата і ў сваёй італьянскай дыпламатыі. Каралеўская інструкцыя польскім паслам да папы рымскага Юлія II, датаваная 6 снежня 1504 г., прадпісвала гаварыць ім, што «заволжскі імператар», які прывык мець пры сабе стотысячнае войска, здаўся каралю і цяпер «асабіста знаходзіцца ў каралеўскай уладзе» (est personaliter in potestate regia) [26, s. 443; 38, s. 129-130]. Аляксандр асабліва звярнуў увагу гэтага ваяўнічага папы на магчымасць выкарыстаць палоннага хана ў барацьбе з туркамі. Для папскага прастола гэта была на той момант вельмі актуальная задача. Тады ж Аляксандр накіраваў паслоў у Венецыю. Яны таксама павінны былі паведаміць кіраўнікам рэспублікі Святога Марка пра палоннага татарскага хана. І ў гэтым выпадку Аляксандр паспрабаваў зацікавіць партнёраў па перагаворах прывабнымі перспектывамі. Магутныя венецыянцы ўжо даўно, але безвынікова стараліся прабіцца на паўночны бераг Чорнага мора, дзе спачатку дамінавалі іх канкурэнты генуэзцы, а з 70–80-х гг. XV ст. панавалі туркі. Аляксандр запэўніваў венецыянцаў у тым, што ваенная экспедыцыя ў Крым, якую мог бы пры яго падтрымцы здзейсніць Шыг-Ахмат, дапаможа вызваліць з-пад улады туркаў захопленыя імі гарады і порты, у прыватнасці Мангуп і Кафу. У далейшым можна будзе падумаць таксама пра вызваленне Белгарада і Кіліі. Праўда, на гэта патрэбны грошы: у прыватнасці, каб арда Шыг-Ахмата да часу мірна сябе паводзіла, ёй трэба плаціць 20 000 фларынаў штогадова [26, s. 448, 449, 450].

На пачатку 1505 г. Аляксандр запрасіў Шыг-Ахмата на сойм Вялікага Княства Літоўскага да Брэста. Згодна са сцвярджэннем

М. Стрыйкоўскага, Аляксандр сустрэў яго за пяць міль ад горада (паводле Мяхоўскага, за адну мілю) і загадаў выкласці сукном дарогу, па якой хан павінен быў ісці да каралеўскага намёта. У намёце кароль пасадзіў яго «як таварыша» па правую руку ад сябе, і яны разам быццам бы падпярэзвалі рыцарскімі паясамі «шмат палякаў, літвы і татараў» [42, s. 322]. Гэты апошні факт чытаецца толькі ў хроніцы Стрыйкоўскага. Аднак, апавядаючы пра падзеі брэсцкага сойма, Стрыйкоўскі называе ў якасці сваіх крыніц нейкія «рускія летапісцы», прычым у гэтай частцы ён асабліва часта выкарыстоўваў «Хроніку Быхаўца» ці вельмі блізкі да яе твор. На жаль, няма магчымасці дакладна высветліць крыніцу інфармацыі Стрыйкоўскага, бо, напрыклад, «Хроніка Быхаўца» акурат у гэтым месцы мае страту тэксту.

Пасля заканчэння брэсцкага сойма Аляксандр узяў Шыг-Ахмата з сабой на польскі сойм, які працаваў у сакавіку – чэрвені таго ж года ў Радаме. Тут Шыг-Ахмат быў запрошаны да сенатарскага кола, дзе ў доўгай і эмацыйнай прамове выказаў усе свае скаргі на Аляксандра і на польскіх і літоўскіх паноў, якія запрасілі яго да сябе, а потым кінулі ў бядзе. Хан прасіў адпусціць яго на радзіму. У адказ ён пачуў, што сам ва ўсім вінаваты. Па-першае, калі яго арда стаяла пад Кіевам, татары чынілі мясцовым жыхарам шкоды і ўвогуле паводзілі сябе як сапраўдныя ворагі. Па-другое, не захацеў, як яго аб тым прасілі паны і кіеўскія мяшчане, стаяць «на маскоўскай граніцы пад Старадубам» і здабываць сабе ўсё неабходнае на варожай тэрыторыі. Да ўсяго іншага, калі б ён стаяў менавіта там, яму б не пагражала такая небяспека ад Менглі-Гірэя, як каля Кіева, і ён не быў бы разбіты. Нарэшце, трэцяе і самае горшае: паехаў да турак без нашага ведама і таму, напэўна, нам на шкоду.

Тады Шыг-Ахмат папрасіў адпусціць «да яго братоў, нагайскіх цароў» хаця б яго брата Хазяк-султана. Былы хан разлічваў атрымаць ад іх дзейсную дапамогу, і перш за ўсё перамогай над Менглі-Гірэем вярнуць страчанае становішча. На гэта Аляксандр пагадзіўся, паабяцаўшы сабраць людзей. Тады Шыг-Ахмат паказаў на ўдзельнікаў сойма і запытаўся: «А гэтыя ці не былі б на гэта патрэбныя, навошта вы іх трымаеце?» У адказ яму растлумачылі, што тут не так, як у татар, «не ўсе ў нас на вайну ездзяць»: адны абрабляюць зямлю, другія займаюцца рамёствамі, трэція служаць Богу, чацвёртыя выконваюць судовыя справы і забяспечваюць замкі [39, p. 365–366; 42, s. 323–325]. У гэтым эпізодзе яскрава праявіліся стэрэатыпы сацыяльнага мыслення і сацыяльных паводзінаў прадстаўнікоў дзвюх розных цывілізацый. Як гэта часта здараецца, адрозненні выявіліся ў ходзе канфлікта.

Праз нейкі час, у адпаведнасці з дасягнутай дамоўленасцю, Хазяк-султан адправіўся за Волгу.

Мяхоўскі, апраўдваючы дзеянні Польшчы ў дачыненні да ўзятага ў палон саюзніка, сцвярджаў, быццам польскія паны вырашылі адпусціць Шыг-Ахмата на Волгу, але літоўцы па просьбе Менглі-Гірэя перахапілі яго на дарозе [10, с. 66, 146]. Аднак гэта версія выглядае непераканаўча. Не выклікае сумненняў, што дзеянні кіраўнічых колаў Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага былі скаардынаваныя. Іншая справа, што палякі, відаць, не жадалі трымаць хана на тэрыторыі Кароны. Па-першае, гэта магло ўскладніць іх узаемаадносіны з Крымам, а па-другое, патрабавала значных выдаткаў. З іншага боку, паны-рада Вялікага Княства не хацелі расставацца з ханам: Шыг-Ахмат быў усё ж такі іх «трафеем» і пры пэўных абставінах мог прынесці карысць іх дзяржаве.

У самым канцы 1505 г., знаходзячыся ў Гродне, Аляксандр выдаў прывілей на людзей і землі «около реки Сервъца» Яну Забярэзінскаму, найвышэйшаму маршалку Вялікага Княства Літоўскага. Гаспадар зрабіў гэта ў тым ліку «на прозбу Азяхъматъ, цара завольскага, брата нашого» [37, р. 200]. У «заволжскім цары», нягледзячы на скажонае імя, лёгка пазнаць Шыг-Ахмата. Як вынікае з дакумента, статус палоннага хана пры Аляксандры быў высокім і да яго просьб прыслухоўваліся.

Пасля вяртання з Радама самаго Шыг-Ахмата змясцілі ў Троках, а мурзаў і іншых набліжаных хана разаслалі па іншых месцах [42, s. 325, 326]. Тым часам ў Вялікае Княства Літоўскае прыбылі прадстаўнікі ад нагайцаў у ліку 80 вершнікаў. Хану дазволілі свабодна сустракацца з імі. Вынікам была спроба ўцёкаў, якую Шыг-Ахмат здзейсніў у атачэнні гасцей-супляменнікаў. Аднак спроба аказалася няўдалай: троцкі намеснік Алехна Манівідавіч дагнаў Шыг-Ахмата пад Кіевам і вярнуў пад варту ў Трокі [42, s. 325–326].

Пасля прыезду ў 1506 г. у Вялікае Княства Літоўскае Аляксандр сабраў усіх паноў у Вільні і загадаў прывесці з Трокаў Шыг-Ахмата. У адпаведнасці з паведамленнем М. Стрыйкоўскага, улады Вялікага Княства прынялі рашэнне, згодна з якім маршалак дворны князь Міхаіл Глінскі схапіў хана і адаслаў яго ў зняволенне ў Коўна [42, s. 330; 10, с. 66, 146]. Аднак з перапіскі кароннага канцлера Яна Ласкага, які знаходзіўся пры каралі, вядома, што загад быў аддадзены самім Аляксандрам і што здарылася гэта вясной ці на пачатку лета 1506 г. Менавіта гэтага – зняволення Шыг-Ахмата ў самым аддаленым замку Літвы, дзе ў свой час трымалі яшчэ аднаго палоннага ардынскага хана, Сеіт-Ахмата – пачынаючы з 1505 г. дабіваўся ад Аляксандра і паноў-рад Менглі-Гірэй [30,

p. 231, 234]. У сваім лісце Ласкі гаворыць таксама пра тое, што Шыг-Ахмат быў адпраўлены ў ковенскі замак разам «са сваякамі, князямі, дарадцамі і ўсімі татарамі», агульная колькасць якіх складала каля 200 чалавек. Туды ж былі адпраўлены і нагайскія паслы. Татары былі паасобку разасланы пад варту «па замачках і землях». Менглі-Гірэй з радасцю ўспрыняў гэтую навіну і абяцаў Аляксандру вечны мір [26, s. 539]. Сапраўды, у хуткім часе крымскі хан прыслаў свой ярлык з абяцаннямі міру [1, c. 4–5]. Праўда, яго адрасатам быў ужо не Аляксандр, які памёр 19 жніўня 1506 г., а яго брат і пераемнік Жыгімонт.

Трэба ўвогуле сказаць, што стаўленне уладаў ВКЛ да Шыг-Ахмата было абумоўлена перш за ўсё пажаданнямі крымскага хана. Палонны Шыг-Ахмат стаў той манетай (праўда, зусім не разменнай), за якую ВКЛ спрабавала купіць у Менглі-Гірэя мір і, па магчымасці, саюз. К. Пуласкі ўвогуле лічыў, што крымскага хана стрымлівала ад нападаў на Польшчу і Вялікае Княства толькі боязь таго, што ўлады гэтых краін выпусцяць Шыг-Ахмата [40, s. 74, 156]. Магчыма, аўтарытэтны спецыяліст крыху перабольшваў, аднак роля палоннага заволжскага хана ў стрымліванні нападаў крымскіх татар на азначаныя краіны была сапраўды вялікай. Увогуле, Менглі-Гірэй меў свой погляд на праблему Шыг-Ахмата. У абмен на абяцанні міру ён запатрабаваў папросту забіць свайго зняволенага ворага. У ярлыках да Жыгімонта I Менглі-Гірэй сцвярджаў нават, што смаленскі намеснік Юрый Зяноўевіч, які ў 1507 г. узначальваў пасольства ў Крым, даў такое абяцанне і прысягнуў перад ханам [32, p. 86, 87]. Больш таго, у сваім ярлыку да Васіля III крымскі хан паспяшаўся паведаміць вялікаму князю маскоўскаму, што Шыг-Ахмат быццам бы забіты [32, p. 92]. Аднак Жыгімонт адказаў Менглі-Гірэю, што такога даручэння сваім паслам не даваў і калі яны сапраўды далі хану такое абяцанне, дык зрабілі гэта насуперак каралеўскім інструкцыям. Паслоў апыталі, і яны прысягнулі, што нічога падобнага Менглі-Гірэю не абяцалі. Тым не менш, у сваім лісце ад 26 лістапада 1507 г. кароль запэўніваў магутнага крымскага хана наконт Шыг-Ахмата і яго набліжаных: «есмо твердо далеко запровадивши, в Жомоитъскои земли ихъ в нятъстве посажали, такъ и навеки будеть седети и николи с того нятъства не выидуть…» [32, p. 96, 97, 114]. Пра гэта рашэнне Жыгімонта Менглі-Гірэй хутка паведаміў сваім суседзям – у прыватнасці, малдаўскаму ваяводзе Багдану III [44, s. 87].

Здавалася, што пра Шыг-Ахмата цяпер надоўга забудуць, аднак вельмі хутка яго асоба зноў аказалася ў цэнтры ўвагі. Адным з першых крокаў князя Міхаіла Глінскага, які на пачатку 1508 г. узняў мяцеж супраць Жыгімонта I, была спроба захапіць заволжскага хана. Ужо 21 лю-

тага 1508 г. кароль паведамляў Менглі-Гірэю, што Глінскі пасылаў сваіх людзей да Коўна і спрабаваў «з нятства моцно выбити царя Шиг Ахмата». Згодна з тлумачэннем Жыгімонта, захапіўшы заволжскага хана, Глінскі збіраўся злучыцца з нагайцамі і пайсці вайной і на Жыгімонта, і на самаго Менглі-Гірэя [32, р. 101, 102, 103, 104]. Аднак гэта версія не вытрымлівае крытыкі. Усё выглядала як раз наадварот: у гэты час мяцежны князь як раз наладжваў саюзніцкія адносіны з Васілём III, а з Менглі-Гірэем ён здаўна падтрымліваў сяброўскія сувязі. Дарэчы, шчыльныя сувязі князёў Глінскіх з татарскімі ордамі ўскосна сведчаць пра татарскае паходжанне гэтага рода. Тым не менш, М. Глінскі сапраўды задумаў шырокую дыпламатычную гульню, у якой адводзіў Шыг-Ахмату вельмі прыкметнае месца. Магчыма, мае пад сабой падставы паведамленне Жыгімонта I у Крым аб тым, што мяцежны князь пасылаў да нагайцаў, просячы прыйсці пад Пуціўль, а сам абяцаў тым часам вызваліць хана з тым каб потым разам далучыцца да іх [32, р. 102]. Глінскі, аднак, гэтым не абмежаваўся і паведаміў Менглі-Гірэю і Васілю III, што Шыг-Ахмат ужо знаходзіцца ў яго руках [32, р. 104, 112]. Сапраўдны стан рэчаў высветліўся вельмі хутка. Кароль загадаў паказаць крымскаму паслу Шыг-Ахмата, які па-ранейшаму знаходзіўся ў зняволенні ў Коўне [32, р. 112].

І ў далейшым, нягледзячы на тое, што сітуацыя вакол Шыг-Ахмата пастунова страчвае сваю вастрыню, згадкі пра хана ў дакументах сустракаюцца дастаткова часта. Пра Шыг-Ахмата не забыліся і па-ранейшаму разглядалі яго як патэнцыяльную ваенна-палітычную сілу: саюзную ці варожую.

У 1509 г. пасол Жыгімонта I у Венгрыі Станіслаў Гарэцкі абмяркоўваў сітуацыю вакол Шыг-Ахмата з тамтэйшым каралём Уладзіславам II (братам Жыгімонта) і сенатам. Гарэцкі тлумачыў, што Жыгімонт трымае хана ў разліку на тое, што як толькі татары ўбачаць ханскую шапку, яны «адразу збяруцца і ахвотна пойдуць туды, куды захоча яго каралеўская вялікасць». Апрача таго, Жыгімонт разлічваў на дапамогу нагайцаў. Ён ведаў, што ў Нагаях знаходзяцца маці і трое братоў Шыг-Ахмата, якія ўсімі сіламі прагнуць убачыць хана (пар. вышэй). І калі Шыг-Ахмат будзе вызвалены, кароль зможа атрымаць з Нагаяў «такую колькасць татар, якую толькі захоча, супраць любога ворага». Былі выказаны і іншыя праекты адносна выкарыстання Шыг-Ахмата, якія маглі б зацікавіць венграў [22, р. 44]. Аднак гэтыя праекты былі такімі ж фантастычнымі, як і спадзяванні Жыгімонта на дапамогу незлічонага нагайскага войска, якое будзе ваяваць на яго баку супраць усіх і кожнага.

У 1510 і 1511 гг. малдаўскі ваявода Багдан III прапаноўваў Жыгімонту I зрабіць так, каб Шыг-Ахмат прысягнуў і служыў ім абодвум. Ваявода жадаў, каб Жыгімонт паставіў Шыг-Ахмата «на граніцы літоўскай», каб той абараняў яе і пагражаў адтуль Менглі-Гірэю [44, s. 91, 96–97]. Зразумела, што ў такім выпадку ён прыкрываў бы ад нападаў крымскіх татар і ўсходнюю мяжу Малдавіі. Цікава, што ў той час на службе ў Багдана знаходзілася 500 татар з былой заволжскай арды Шыг-Ахмата, якія, як меркавалася, далучацца да хана [22, p. 123]. Жыгімонт I планаваў абмеркаваць гэта пытанне з панамі-радамі Кароны Польскай на пётркаўскім сойме, які працаваў у студзені – лютым 1511 года [22, p. 121, 123–124], аднак у выніку прапанова малдаўскага гаспадара не была прынята.

Менглі-Гірэй палічыў неабходным уключыць асобны пункт аб Шыг-Ахмаце ў тэкст дагаварной граматы з Жыгімонтам I ад 29 жніўня 1514 г. Крымскі хан патрабаваў, каб яго ворага трымалі ў зняволенні «моцна», пакуль ён там не памрэ [23, p. 163].

Пасля смерці ў 1515 г. хана Менглі-Гірэя і прыходам да ўлады яго сына Мухамед-Гірэя старыя дамоўленасці паміж Вільняй і Крымам былі пацверджаны. Сярод іншага, Жыгімонт I паабяцаў крымскаму хану: «мы и тепер … неприятеля вашого Шиг-Ахмата, царя заволзыского, в панстве нашомъ ховаем, а на вашо лихо его не выпущаемъ» [34, p. 148]. Аналагічны пункт быў уключаны і ў дагавор 1522 г. [24, p. 102]. У дагаварных граматах 1515 і 1518 гг. Мухамед-Гірэя з Васілём III праблема Шыг-Ахмата таксама знайшла сваё адлюстраванне. Вялікі князь маскоўскі браў на сябе абавязак разарваць у будучым перамір'е з Жыгімонтам I у тым выпадку, калі кароль у саюзе з Шыг-Ахматам пойдзе вайной на крымчакоў [16, c. 200, 202, 549]. Шыг-Ахмат застаўся заложнікам сітуацыі, яго лёс мог змяніцца толькі са змяненнем міжнароднай абстаноўкі.

Ва ўмовах вайны з Масквой Жыгімонт I спрабаваў падштурхнуць Мухамед-Гірэя да актыўных дзеянняў на баку Вялікага Княства Літоўскага. Для гэтага была выкарыстана асоба Шыг-Ахмата. На мяжы 1517 і 1518 гадоў татарскія мурзы паведамілі Мухамед-Гірэю, быццам палоннага хана прывялі ў Кіеў і калі крымскі хан той жа зімой не пачне вайну супраць Масквы, выпусцяць [16, c. 496]. Відаць, інфармацыя, а дакладней дэзінфармацыя паходзіла аднекуль з урадавых колаў Вялікага Княства Літоўскага і была звязана з няўдалым паходам войска ВКЛ на Апочку восенню 1517 г. Аднак шантаж не прынёс выніка. Шыг-Ахмат застаўся ў палоне, а Масква і Крым заключылі ў 1518 г. новы мірны дагавор [19, c. 188–194]. Праўда, гэты дагавор зусім не перашкодзіў

Мухамед-Гірэю здзейсніць праз тры гады вялікі паход на Маскву. Канешне, гэты паход быў выгадны для Вільні. Аднак прыкладна такое ж утылітарнае стаўленне дэманстраваў крымскі хан і ў дачыненні да Вялікага Княства Літоўскага. Нягледзячы мірны дагавор, у 1523 г. сын Мухамед-Гірэя Алп-султан здзейсніў паходы на поўдзень гэтай дзяржавы. У адказ Жыгімонт у чарговы раз намякнуў крымскаму хану на магчымасць вызвалення Шыг-Ахмата. Больш таго, кароль патрабаваў ад Мухамед-Гірэя паслаць сваіх сыноў на рабаванне маскоўскіх зямель [34, p. 148].

Утрыманне Шыг-Ахмата, сярод іншага, дорага каштавала скарбу Вялікага Княства. У 1521 годзе паны-рада скардзіліся Жыгімонту I на вялікія выдаткі, якія «з давнихъ часов» ідуць на «цара заволского, и на братанича его, и на слугъ ихъ» [4, с. 512]. Пра тое самае пісаў Жыгімонт I да Мухамед-Гірэя ў Крым [34, p. 148].

У снежні 1517 г., пад час вяртання са свайго першага маскоўскага пасольства, з Шыг-Ахматам сустракаўся імператарскі пасол барон Жыгімонт Герберштэйн, які коратка распавёў пра гэту сустрэчу ў сваіх славутых запісках. Сустрэча адбылася ў Троках, дзе хана трымалі ў мясцовых замках «як бы пад хатнім арыштам». Тутэйшы ваявода Рыгор Осцік (у запісках Герберштэйна недакладна Рыгор Радзівіл) запрасіў барона на абед, на якім прысутнічаў і Шыг-Ахмат. Хан шмат размаўляў з Герберштэйнам праз перакладчыка, называў імператара сваім братам і казаў, што «усе гаспадары і цары браты паміж сабой» [3, с. 634, 635].

Становішча Шыг-Ахмата ў Вялікім Княстве Літоўскім было становішчам ганаровага палоннага, за якім быў прызнаны вельмі высокі статус [41, s. 30]. Яго па-ранейшаму лічылі ханам (татарскім «царом»), і Жыгімонт I у сваіх лістах называў яго братам. Улады Вялікага Княства – і манарх, і паны-рада – неаднаразова звярталіся да хана па параду пры разглядзе спрэчак паміж мясцовымі татарамі. Як правіла, гэта былі спрэчкі «аб месцы». Так, у 1522 г. з дапамогай Шыг-Ахмата свой статус сярод татар пацвердзілі і нават павысілі князі Хазбеевічы-Юшанскія [35, p. 169], а ў 1525 г. сваё месца ў татарскай іерархіі адстаялі князі Кадышавічы [35, p. 382–383]. Праўда, погляд Шыг-Ахмата на праблему не быў устойлівым. Спачатку ён прасіў Жыгімонта паставіць Юшанскіх вышэй за іншых татарскіх князёў, а праз тры гады быў вымушаны прызнаць, што яны ўсё ж роўныя з Кадышавічамі. Магчыма, прычынай змянення пазіцыі Шыг-Ахмата стала яго жаніцьба з сястрой князёў Кадышавічаў. Цікава, што гэтая жонка Шыг-Ахмата ў далейшым не пажадала ехаць з ханам на Волгу і засталася ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Пасля ад’езду мужа яна прыняла каталіцтва пад імем Дароты і зноў выйшла замуж – за гаспадарскага двараніна Яна Габрыяловіча [36, p. 148–149].

Колькасць татар, якія складалі двор Шыг-Ахмата ў Вялікім Княстве Літоўскім, першапачаткова была дастаткова вялікай. Аднак яна паступова змяншалася. Строга кажучы, магчымасці выехаць за межы Вялікага Княства быў пазбаўлены толькі сам хан. Усе астатнія татары, яго сваякі і падданыя, маглі самастойна вырашаць свой лёс: заставацца побач з ханам, перайсці на іншую службу ці вярнуцца ў родныя стэпы. Так, у 1514 г. ваяваў супраць крымчакоў у стэпах брат Шыг-Ахмата Хазяк-султан, а ў 1523 г. – сын Шыг-Ахмата Шыг-Айдар [7, с. 74, 95–96]. Многія татары з ліку наблiжаных палоннага хана прымалі ўдзел у вайне Польшчы з Прускім ордэнам 1519–1521 гг. у якасці наёмнікаў [43, s. 90, 92, 93]. Сярод іх быў і нейкі «царэвіч», якога дакументы не называюць па імені [43, s. 92], – магчыма, Шыг-Ахматаў сын.

Вялікаму Княству Літоўскаму і Кароне Польскай з вялікай цяжкасцю, але ў цэлым усё ж удавалася утрымліваць крымскіх ханаў Менглі-Гірэя і Мухамед-Гірэя ад буйнамаштабных варожых акцый. Сітуацыя рэзка змянілася пасля таго, як у 1524 г. да ўлады ў Крыму прыйшоў хан Саадэт-Гірэй. Ён арыентаваўся на Асманскую імперыю і заняў у дачыненні да Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага адкрыта варожую пазіцыю. Гэты хан не пажадаў заключаць з Жыгімонтам новы мірны дагавор. Справа дайшла да таго, што 1 ліпеня 1524 г. Жыгімонт, занепакоены весткамі пра магчымае ўварванне ў Вялікае Княства татарскага войска на чале з самім новым крымскім ханам, загадаў панам-радзе рыхтаваць паспалітае рушанне [1, с. 156]. У гэты час у Кракаве і Вільні сур’ёзна задумаліся над магчымасцю выпусціць Шыг-Ахмата. Толькі выпусціць куды і да каго? У распараджэнні заволжскага хана на той час засталося ўжо вельмі мала людзей, якія не ўяўлялі сабой колькі-небудзь значнай ваеннай сілы.

Нягледзячы на доўгую адсутнасць Шыг-Ахмата ў стэпах, супляменнікі хана на Волзе і ў Нагаях добра памяталі пра яго. У 1524 г. да караля Жыгімонта ў Кракаў прыехалі двое нагайскіх паслоў «о царе о Ших-Охмате» [14, с. 691]. Яны прасілі адпусціць хана «на царство». За Шыг-Ахмата прасіў яго сын, а таксама татарскія мурзы. Мяркуючы па перапісцы Жыгімонта I з панамі-радай Вялікага Княства Літоўскага, пытанне аб вызваленні Шыг-Ахмата было прынцыпова вырашана ўжо тады. У 1524 г. былы ардынскі хан не трапіў на радзіму толькі таму, што нагайскія і паволжскія татары затрымалі ў сябе пасла Жыгімонта Старо-

га – Мацвея Замаронка [4, с. 518]. Разам з тым, дыпламаты Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага да апошняга стараліся выцягнуць максімум карысці ад знаходжання Шыг-Ахмата ў зняволенні і ад яго вызвалення. У прыватнасці, яны разлічвалі на тое, што сын Шыг-Ахмата «прыцягне» для сустрэчы вызваленага бацькі з дзвюма татарскімі ордамі: заволжскай і нагайскай, – і гэтым самым не дазволіць крымскім татарам пагражаць паўднёвым граніцам Польшчы і Вялікага Княства [4, с. 518]. Аднак гэтыя спадзяванні аказаліся марнымі. Тым не менш, падрыхтоўка да вызвалення Шыг-Ахмата пачалася – тым больш, што пазіцыя крымскага хана не мянялася, а агрэсіўныя дзеянні яго падданых працягваліся. У студзені 1527 г. шматтысячнае войска крымскіх татар здзейсніла напад на паўднёвыя землі Вялікага Княства, але было разбіта на р. Альшаніцы. У перапісцы з рознымі асобамі Жыгімонт I называў крымскага хана сваім «штогадовым ворагам» і прама патлумачыў прычыны вызвалення заволжскага хана. Згодна са словамі гаспадара, гэтымі прычынамі былі нежаданне Саадэт-Гірэя заключаць з ім мірны дагавор ці перамір'е, а таксама асабістае імкненне караля раздражніць і раззлаваць ворага [25, p. 290–291, 293].

У 1527 годзе, на просьбу заволжскіх татар Шыг-Ахмат нарэшце быў адпушчаны «на царство Заволское к сыну его» [6, с. 235]. Згодна са сцвярджэннем беларуска-літоўскіх летапісаў, гэта адбылося «по Велице дни» [9, с. 170; 11, с. 192; 13, с. 213; 6, с. 235], г. зн. пасля 21 красавіка. Шыг-Ахмата праводзілі з усёй урачыстасцю: «и проводили его много поветов до Киева» [6, с. 235]. У суправаджэнні пяцітысячнага коннага войска, з багатымі падарункамі ў грашах, срэбры, тканінах і футрах розных гатункаў хан выехаў з Вільні. Шлях Шыг-Ахмата пралягаў праз Слуцк і Кіеў, адкуль летам таго ж года хан накіраваўся «да ускраін скіфскіх стэпаў» [25, p. 212, 252]. Згодна з паведамленнем беларуска-літоўскіх летапісаў, па выездзе з Кіева «пенезные люди на поле уже стретили его, которые противу его посланы были от сына его» [6, с 235]. Можна не сумнявацца ў тым, што Шыг-Ахмат быў адпушчаны на волю на пэўных умовах. Выглядае на тое, што з хана ўзялі абяцанне ці нават прысягу, у адпаведнасці з якімі ён абавязваўся ў далейшым быць верным саюзнікам Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага і не ваяваць супраць іх. З пазнейшых падзей вынікае, што хан стрымаў сваё слова.

Вызваленне Шыг-Ахмата мела прыкметны ўплыў на міжнародную сітуацыю ў рэгіёне, асабліва ўзрушыўшы Крым і Маскву. Вялікі князь маскоўскі Васіль III паспрабаваў выкарыстаць незадаволенасць крымскага хана Саадэт-Гірэя і прапанаваў яму ісці вайной на Жыгімонта –

менавіта за тое, што той выпусціў з палона злейшага ворага Гірэяў [8, с. 119]. Аднак гэта прапанова не мела ніякіх практычных вынікаў.

Становішча, якое заняў Шыг-Ахмат пасля вызвалення, ды і сам далейшы лёс хана да канца не высветлены. Еўраінаўскі летапіс паведамляе, быццам хан быў забіты татарамі ўжо ў хуткім часе пасля вяртання ў Заволжскую Арду [6, с. 235]. Пра гібель Шыг-Ахмата праз невялікі час пасля вызвалення пісаў у сваіх славутых запісках і Герберштэйн [3, с. 449]. Да гэтых запісак, магчыма, і ўзыходзіць паведамленне Еўраінаўскага летапіса. Аднак да гэтай інфармацыі трэба паставіцца крытычна. Калі Шыг-Ахмат і быў забіты, дык не адразу пасля вяртання ў родныя стэпы, а пазней. У любым выпадку, існуюць надзейныя сведчанні крыніц аб тым, што ён вярнуўся на ніжнюю Волгу [7, с. 55]. Не выключана, што на нейкі час Шыг-Ахмат стаў нават астраханскім ханам [7, с. 107, 108; 8, с. 112]. Ён быў жывы і дзейнічаў супраць крымчакоў як саюзнік Жыгімонта I яшчэ ў 1529 годзе [21, 182, 184].

Лёс Шыг-Ахмата – ардынскага хана, які трапіў у палон і ўтрымліваўся ў Вялікім Княстве Літоўскім, – быў адметным, але не ўнікальным. У 1455 годзе, і таксама ў Кіеве быў захоплены ў палон хан Залатой Арды Сеід-Ахмед. Хана трымалі пад вартай у ковенскім замку, дзе ён і памёр каля 1462 (?) года. Дзякуючы падабенству імёнаў і біяграфій у пазнейшы час гэтых людзей часта блыталі [2, с. 86–87, 89].

Не ўсе татары з арды Шыг-Ахмата вярнуліся з ханам у стэпы. Многія, у тым ліку і яго блізкія сваякі, засталіся ў Вялікім Княстве Літоўскім. Акрамя згаданай вышэй жонкі, засталіся яшчэ брат хана Халек-султан, а таксама Азюбек-султан – як лічыцца, сын Шыг-Ахмата. С.У. Думін лічыць, што яны знаходзіліся на становішчы заложнікаў [5, с. 110], аднак гэта сцвярджэнне выклікае некаторыя сумненні. У прыватнасці, вядома, што жонка Шыг-Ахмата засталася дабраахвотна, а Азюбек-султан валодаў 70 людзьмі і землямі пад Астрынай, якія ён атрымаў ад Жыгімонта I Старога яшчэ ў 1514 годзе [33, p. 144], што таксама мала нагадвае становішча заложніка. Магчыма, што ад Азюбек-султана вядуць сваё паходжанне «царэвічы Астрынскія» [27, s. 245]. Разам з «царэвічамі Пунскімі», якія паходзілі ад Хаджы-Гірэя, «царэвічы Астрынскія» прызнаваліся двума самымі знатнымі татарскімі родамі ў Вялікім Княстве [27, s. XXIX]. Калі ў 1529 годзе вялікім князем літоўскім быў абвешчаны Жыгімонт Аўгуст, ва ўрачыстай цырымоніі ў Вільні прымалі ўдзел, сярод іншых знатных асоб, і два татарскія царэвічы: «а против моистату блиско сидели два царевича на лавках» [6, с. 236]. Цалкам можа быць, што адзін з іх ці нават абодва былі сынамі заволжскага цара Шыг-Ахмата.

Спіс літаратуры

1. Акты, относящиеся к истории Западной России: в 5 т. / Сост. И.И. Григорович. – Санкт-Петербург: Типография II отд. Собственной Е.И.В. Канцелярии, 1846–1853. – Т. 2: 1506–1544 / И.И. Григорович. – 1848. – III+405+15+14 с.

2. Виженер, Блез де. Извлечение из записок (1573) / Блез де Виженер // Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси. Вып. 1 / Перевод К. Мельник; науч. ред. В.Б. Антонович. – Киев, 1890. – С. 59–88.

3. Герберштейн, Сигизмунд. Записки о Московии: в 2 т. / Сигизмунд Герберштейн. – Москва: Памятники исторической мысли, 2008. – Т. 1: Латинский и немецкий тексты, русские переводы с латинского и ранненововерхненемецкого. – 774 с.

4. Документы Московского архива Министерства юстиции. Т.1 / Московский архив Министерства юстиции; подг. к печ. М.В. Довнар-Запольский. – Москва: Товарищество типографии А.И. Мамонтова, 1897. – XXIII+569 с.

5. Думин, С.В. Татарские царевичи в Великом княжестве Литовском (XV–XVI вв.) / С.В. Думин // Древнейшие государства на территории СССР. Материалы и исследования, 1987 г. / Академия Наук СССР. Институт истории СССР; редкол.: А.П. Новосельцев [и др.]. – Москва, 1989. – С. 107–113.

6. Евреиновская летопись // Полное собрание русских летописей. Т. 35 / Академия наук СССР. Институт истории СССР; науч. ред. Н.Н. Улащик. – Москва, 1980. – С. 214–238.

7. Зайцев, И.В. Астраханское ханство / И.В. Зайцев. – Москва: Восточная литература, 2004. – 303 с.

8. Зайцев, И.В. Между Москвой и Стамбулом. Джучидские государства, Москва и Османская империя (начало XV – первая половина XVI вв.). Очерки / И.В. Зайцев. – Москва: Рудомино, 2004. – 216 с.

9. Летопись Рачинского // Полное собрание русских летописей. Т. 35 / Академия наук СССР. Институт истории СССР; науч. ред. Н.Н. Улащик. – Москва, 1980. – С.145–172.

10. Меховский, Матвей. Трактат о двух Сарматиях / Введение, перевод и комментарии С.А. Аннинского. – М.; Л.: Изд. АН СССР, 1936. – X+288 с.

11. Ольшевская летопись // Полное собрание русских летописей. Т. 35 / Академия наук СССР. Институт истории СССР; науч. ред. Н.Н. Улащик. – Москва, 1980. – С. 173–192.

12. Увязчая грамота (лист) киевского воеводы кн. Д.И. Путятича господарскому дворянину Дашко Ивановичу в имение Басань Киевского повета ([1503 г.] сентября 9. Киев) // Российский государственный архив древних актов (РГАДА). – Фонд 1473 – Оп. 1. – Ед. хр. 981. – Л. 1.

13. Румянцевская летопись // Полное собрание русских летописей. Т. 35 / Академия наук СССР. Институт истории СССР; науч. ред. Н.Н. Улащик. – Москва, 1980. – С. 193–213.

14. Сборник императорского Русского Исторического Общества: в 148 т. – Санкт-Петербург/Петроград, 1867–1916. – Т. 35: Памятники дипломатических сноше-

ний Московского государства с Польско-Литовским. Т. 1: 1487–1533 гг. / Под ред. Г.Ф. Карпова. – 1882. – VI+XXII+869+88 с.

15. Сборник императорского Русского Исторического Общества: в 148 т. – Санкт-Петербург/Петроград, 1867–1916. – Т. 41: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Крымской и Нагайской ордами и с Турцией. Т. 1: 1474–1505 гг. / Под ред. Г.Ф. Карпова. – 1884. – XXII+558+82 с.

16. Сборник императорского Русского Исторического Общества: в 148 т. – Санкт-Петербург/Петроград, 1867–1916. – Т. 95: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Крымом, Нагаями и Турцией. – Т. 2: 1508–1521 гг. / Под ред. Г.Ф. Карпова и Г.Ф. Штендмана. – 1895. – XIX+706+108 с.

17. Софийская вторая летопись // Полное собрание русских летописей. Т. 6. Вып. 2 / Российская академия наук. Институт российской истории; науч. ред. С.Н. Кистерев, Л.А. Тимошина. – Москва, 2001. – Стб. 1–416.

18. Уляницкий, В.А. Материалы для истории взаимных отношений России, Польши, Молдавии, Валахии и Турции в XIV–XVI вв./ В.А. Уляницкий. – Москва: Университетская типография, 1887. – 244 с.

19. Хорошкевич, А.Л. Русь и Крым: От союза к противостоянию. Конец XV – начало XVI вв. / А.Л. Хорошкевич. – Москва: Эдиториал УРСС, 2001. – 336 с.

20. Хроника Быховца // Полное собрание русских летописей. Т. 32 / Академия наук СССР. Институт истории СССР; науч. ред. Н.Н. Улащик. – Москва, 1975. – С. 128–173.

21. Черкас, Б.В. Україна в політичних відносинах Великого князівства Литовського з Кримським ханатом (1515–1540) / Б.В. Черкас. – Київ: Інститут історії України НАН України, 2006. – 248 с.

22. Acta Tomiciana: in 18 t. / Wyd. Biblioteka Kórnicka. – Posnaniae: Typis Ludovici Merzbachi, 1852–1999. – T. 1: 1507–1511 / Biblioteka Kórnicka. – 1852. – 237+53 p.

23. Acta Tomiciana: in 18 t. / Wyd. Biblioteka Kórnicka. – Posnaniae: Typis Ludovici Merzbachi, 1852–1999. – T. 3: 1514–1515 / Biblioteka Kórnicka. – 1853. – 450+25 p.

24. Acta Tomiciana: in 18 t. / Wyd. Biblioteka Kórnicka. – Posnaniae: Typis Ludovici Merzbachi, 1852–1999. – T. 6: 1522–1523 / Biblioteka Kórnicka. – 1857. – 361+19 p.

25. Acta Tomiciana: in 18 t. / Wyd. Biblioteka Kórnicka. – Posnaniae: Typis Ludovici Merzbachi, 1852–1999. – T. 9: 1527 / Biblioteka Kórnicka. – 1876. – III+362 p.

26. Akta Aleksandra, króla polskiego, wielkiego księcia litewskiego i t.d. (1501–1506) / Wyd. Fr. Papée. – Kraków: Drukarnia Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1927. – XIV+623 s.

27. Dziadulewicz, Stanisław. Herbarz rodzin tatarskich w Polsce / Stanisław Dziadulewicz. – Wilno: Polski Antykwarjat Naukowy Hieronima Wildera, 1929. – XXX+495 s.

28. Lietuvos Didžiojo Kunigaikščio Aleksandro Jogailaičio dvaro sąskaitų knygos (1494–1504) / Par. D. Antanavičius ir R. Petrauskas. – Vilnius: Lietuvos Pilys, 2007. – 511 p.

29. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Metryka Litewska. – Kn. 4 (1479–1491): Užrašymų knyga 4 / Lietuvos istorijos institutas; par. L. Anužytė. – Vilnius: Žara, 2004. – 286 p.

30. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Kn. 5 (1427–1506): Užrašymų knyga 5 / Lietuvos istorijos institutas; par. E. Banionis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1993. – 402 p.

31. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Metryka Litewska = Литовская Метрика. – Kn. 6 (1494–1506): Užrašymų knyga 6 / Lietuvos istorijos institutas; par. A. Baliulis. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2007. – 516 p.

32. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Kn. 8 (1499–1514): Užrašymų knyga 8 / Lietuvos istorijos institutas; par. A. Baliulis ir kt. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1995. – 708 p.

33. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Metryka Litewska. – Kn. 9 (1511–1518): Užrašymų knyga 9 / Lietuvos istorijos institutas; Uniwersytet im. Adama Mickiewicza w Poznaniu; par. K. Pietkiewicz. – Vilnius: Žara, 2003. – 615 p.

34. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Kn. 11 (1518–1523): Įrašų knyga 11 / Lietuvos istorijos institutas; par. A. Dubonis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1997. – 227 p.

35. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Kn. 12 (1522–1529): Užrašymų knyga 12 / Lietuvos istorijos institutas; par. D. Antanavičius ir A. Baliulis. – Vilnius: Žara, 2001. – 854 p.

36. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Kn. 15 (1528–1538): Užrašymų knyga 15 / Lietuvos istorijos institutas; par. A. Dubonis. – Vilnius: Žara, 2002. – 446 p.

37. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. – Kn. 231 (1540–1543): 12-oji Teismų bylų knyga / Vilniaus universitetas; par. I. Valikokonytė ir kt. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2007. – XXXVI+396 p.

38. Materiały do dziejów dyplomacji polskiej z lat 1486–1516 (Kodeks Zagrzebski) / Oprac. J. Garbacik. – Wrocław–Warszawa–Kraków: Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1966. – XVII+221 s.

39. Miechoviensis, Mathias. Chronica Polonorum / Mathias Miechoviensis. – Craccoviae: Hieronymus Vietor, 1521. – 379 p.

40. Pułaski, Kazimierz. Stosunki z Mendli-Girejem chanem tatarów perekopskich (1469–1515). – Kraków – Warszawa: Drukarnia Wł. Łozińskiego, 1881. – 449 s.

41. Sobczak, Jacek. Położenie prawne ludności tatarskiej w Wielkim Księstwie Litewskim / Jacek Sobczak. – Warszawa – Poznań: PWN, 1984. – 134 s.

42. Stryjkowski, Maciej. Kronika Polska, Litewska, Żmódzka i wszystkiej Rusi: w 2 t./ Maciej Stryjkowski. – 3-e wyd. – Warszawa: Nakład G.L. Glücksberga, 1846. – T. 2: Kroniki księgi 12–25; dzieła pomniejsze. – 568 s.

43. Tyszkiewicz, Jan. Rejestr chorągwi tatarskich walczących w wojnie polsko-krzyżackiej 1519 – 1521 roku / Jan Tyszkiewicz // Zapiski Historyczne. T. LIII. – 1988. – Zesz. 1–2. – S. 85–99.

44. Źródła Dziejowe: w 22 t. / Warszawskie Towarzystwo Naukowe; wyd. A. Jabłonowski, A. Pawiński. – Warszawa, 1876–1897. – T. 10: Sprawy wołoskie za Jagiellonów / wyd. A. Jabłonowski. – 1878. – III+CLXIV+163 s.

Казакоў А.У.

ЛЁСЫ МАСКОЎСКАЙ ЗНАЦІ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

1.

Праблема эміграцыі знаці з Вялікага Княства Маскоўскага і іншых усходнеславянскіх дзяржаў даўно цікавіла даследчыкаў. Аднак, на працягу доўгага часу ад'езды князёў і баярства разглядаліся пераважна ў кантэксце міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе і барацьбы ўнутры Вялікага Княства Маскоўскага. Асобныя выпадкі эміграцыі выклікалі інтарэс як наступства найважнейшых палітычных падзей: ліквідацыя маскоўскім князем Васілём II удзелаў у сваім гаспадарстве, захоп Іванам III Цвяры ў 1485 г., канчатковае падначаленне Разанскай зямлі Васілём III і барацьба за ўладу па яго смерці ў 1533 г., Старадубская вайна 1534–1537 гг. і інш. Бадай што першым з маскоўскіх эмігрантаў, чыё жыццё і дзейнасць у Вялікім Княстве Літоўскім / Рэчы Паспалітай стала прадметам асобнага даследавання яшчэ ў XIX ст., быў князь Андрэй Міхайлавіч Курбскі. Гэта выбітная постаць працягвае натхняць даследчыкаў на стварэнне ўсё новых прац (напрыклад, гл.: Филюшкин А.И. Андрей Михайлович Курбский: просопографическое исследование и герменевтический комментарий к посланиям Андрея Курбского Ивану Грозному. СПб., 2007; Ерусалимский К.Ю. Сборник Курбского: Исследование книжной культуры. М., 2009. Т. 1–2.).

Такая з'ява, як эміграцыя знаці з усходнеславянскіх дзярджаў (галоўным чынам, з Маскоўскай) у Вялікае Княства Літоўскае набывае пастаянны характар з сярэдзіны XV ст. Асноўнымі прычынамі, якія прымушалі арыстакратыю пакідаць радзіму, былі палітычныя [1, с. 10]. Для многіх «недругов» і «изменников» вялікіх князёў маскоўскіх адправіцца ў выгнанне было адзіным спосабам захаваць жыццё і свабоду, а таксама кволую надзею на вяртанне сваіх вотчын з дапамогай літоўскіх гаспадароў. У асобных выпадках эмігрантамі рухалі і асабістыя матывы. Сярод выгнанцаў быў прадстаўлены ўвесь спектр феадальнага саслоўя: ад вялікіх (Міхаіл Барысавіч Цвярскі, Іван Іванавіч Разанскі) і ўдзельных (Іван Андрэевіч Мажайскі, Іван Васільевіч Бораўскі-Яраславіч, Васіль Міхайлавіч Вярэйскі) князёў да дзяцей баярскіх і рознага кшталту служылых людзей [1, с. 9–10].

Эмігранты з вышэйшых колаў набілітэта, пакідаючы свае землі (часта разам з сем’ямі і ў атачэнні сваіх слуг), ніколі не вярталіся назад, назаўсёды гублялі сувязь з былым сацыяльным і культурным асяроддзем. Кантакты з родзічамі, якія заставаліся па той бок мяжы, станавіліся немагчымымі падчас бясконцых канфліктаў паміж Масквой і Вільняй. Вялікае Княства Літоўскае станавілася для эмігрантаў новым домам, які прапаноўваў ім іншыя ўмовы жыцця. З аднаго боку маскоўскія ўцекачы накіроўваліся менавіта ў гэту дзяржаву, бо Вялікае Княства Літоўскае, *Рускае*, Жамойцкае было больш прывабным як краіна з колькасна пераважаючай усходнеславянскай («рускай») этнічнай афарбоўкай, дзе, нягледзячы на пануючае становішча каталіцтва, праваслаўная знаць карысталася ўсімі правамі, акрамя права займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады, хоць і тут не абыходзілася без вядомых выключэнняў. З іншага боку, к пачатку XVI ст. асаблівасці эканамічнага жыцця, дзяржаўнапалітычная і прававая сістэма Вялікага Княства Літоўскага ўжо значна адрознівалі гэту краіну ад тых рускіх зямель, якія ніколі не былі пад уладай літоўскіх гаспадароў, што вымагала ад эмігрантаў праяўлення здольнасці да адаптацыі.

Да вывучэння становішча маскоўскай знаці ў Вялікім Княстве Літоўскім у першай палове XVI ст. спрычыніліся гісторыкі розных краін і часоў. У сваёй фундаментальнай і шырокавядомай працы, прысвечанай княскім родам Вялікага Княства Літоўскага, польскі даследчык Ю. Вольф не абмінае ўвагай і эмігрантаў [2]. Упершыню на падставе шырокага кола разнастайных крыніц, у тым ліку дакументаў Метрыкі, аўтарам былі рэканструяваны біяграфіі такіх асоб як Мацвей Мікіцініч, Сямён Фёдаравіч Бельскі, Іван Іванавіч Разанскі, Іван Львовіч Барацінскі, Іван Дзмітрыевіч Шуйскі. Працы іншага даследчыка шляхецкага стану А. Банецкага адрозніваюцца дакладнасцю пададзенай інфармацыі і крытычным стаўленнем аўтара да сумнеўных звестак [3]. Даследаванні А. Банецкага і Ю. Вольфа, створаныя на мяжы XIX–XX стст., і на сённяшні дзень з’яўляюцца гістарыяграфічнай асновай для вывучэння прывілеяванага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага.

Асобны інтарэс гісторыкаў выклікала самая неардынарная асоба сярод маскоўскіх эмігрантаў першай паловы XVI ст. – князь Сямён Фёдаравіч Бельскі. Амерыканскі навуковец О.П. Бакус, які займаўся вывучэннем гісторыі Расіі і Вялікага Княства Літоўскага XIV–XVI стст., апублікаваў у 1970 г. артыкул, прысвечаны фармаванню паняцця здрады ў Маскоўскай дзяржаве [4]. Ён разгледзеў гэта пытанне на прыкладзе двух выпадкаў эміграцыі – уцёкаў князёў Бельскага і Курбскага. Гэта

было першае даследаванне, якое ўтрымлівала нарыс не толькі авантурысцкай дзейнасці Бельскага (1536–1541 гг.), але і апошняга этапу яго жыцця ў Вялікім Княстве Літоўскім. На рубяжы XX–XXI стст. даследчыцкі інтарэс да асобы князя Бельскага ўзнавіўся. Яна зацікавіла расійскага ўсходазнаўцу І.У. Зайцава ў сувязі з кантактамі гэтага дзеяча са Стамбулам і Перакопам [5]. Аднак самы поўны біяграфічны нарыс аб Бельскім на сённяшні дзень належыць М.М. Крому [6].

Значны ўнёсак у вывучэнне становішча эмігрантаў у Вялікім Княстве Літоўскім (Рэчы Паспалітай) у XVI–XVII стст. зрабіў польскі даследчык І. Граля. На падставе сфрагістычнага матэрыялу ён паспрабаваў ацаніць ступень сацыякультурнай адаптацыі масквічоў у новым асяроддзі [7]. У беларускай гістарыяграфіі да тэмы эміграцыі з Маскоўскай дзяржавы ў Вялікае Княства Літоўскае ў канцы XV – першай трэці XVI ст. аднойчы звярнуўся сучасны даследчык Б.І. Сідарэнка [8]. У адным са сваіх артыкулаў ён зрабіў кароткі агляд выпадкаў перасялення, што мелі месца на працягу дадзенага перыяду, і паспрабаваў паказаць уплыў эміграцыі прадстаўнікоў розных слаёў насельніцтва Паўночна-Усходняй Русі на характар «палітычных працэсаў» паміж дзвюма дзяржавамі. Б.І. Сідарэнка надае няшмат увагі становішчу эмігрантаў у соцыуме Вялікага Княства Літоўскага. Недастаткова абгрунтаваным уяўляецца тэзіс аўтара аб тым, што маскоўская знаць «успрыняла залатыя шляхецкія вольнасці» [8, с. 22]. Артыкул таксама ўтрымлівае некаторыя недакладнасці. Напрыклад, аўтар залічвае ў шэрагі эмігрантаў некаторых палонных масквічоў. Найбольш здзіўляе сцвярджэнне, што ўрад Вялікага Княства Літоўскага сяліў маскоўкіх выхадцаў у аддаленых месцах (Гарадзенскі павет!), бо некаторыя з іх займаліся рабункам мясцовага насельніцтва [8, с. 28]. Гэта выснова зроблена Б.І. Сідарэнкам, відаць, на аснове паведамлення аб тым, што хтосьці са слуг эмігрантаў Івана Лядскага і Сямёна Бельскага, збягаючы назад у Маскву, парабавалі *сваіх гаспадароў* («пограбивъ казны ихъ») [9, с. 94]! Пра іншыя выпадкі такога кшталту з крыніц нічога не вядома.

На сучасным этапе ў расійскай гістарыяграфіі інтарэс да праблемы маскоўскіх выхадцаў у Вялікім Княстве Літоўскім/Рэчы Паспалітай узрастае. Нельга не адзначыць вялізны ўклад у вывучэнне дадзенай праблемы расійскага спецыяліста К.Ю. Ерусалімскага, які даследуе, аднак, больш позні перыяд – другую палову XVI – пачатак XVII ст. [10]. Безумоўнай заслугай гэтага гісторыка з’яўляецца тое, што ён не спыняецца на вывучэнні прычын уцёкаў некаторых асоб за мяжу ў сувязі з палітычнымі падзеямі ў Маскоўскай дзяржаве і фарміаваннем уяўлення

аб здрадзе, а звяртае ўвагу і на становішча эмігрантаў як падданых каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх, іх адаптацыю да новага сацыяльнага і культурнага асяроддзя, адносіны мясцовай шляхты да чужынцаў.

Як відаць з гэтага кароткага агляду гістарыяграфіі, грунтоўных даследаванняў аб становішчы маскоўскіх эмігрантаў у Вялікім Княстве Літоўскім у першай палове XVI ст. няма. Прадстаўленая праца мае на мэце вызначыць шляхі і магчымасці інтэграцыі маскоўскіх выхадцаў у прывілеяванае саслоўе Вялікага Княства Літоўскага. Зробім гэта на прыкладзе лёсаў эміграцкай эліты шляхам аналізу маёмаснага становішча, публічнага жыцця, дзейнасці на дзяржаўнай службе і матрыманіяльных адносін з мясцовым набілітэтам канкрэтных асоб. Таксама паспрабуем высветліць, якім было стаўленне да чужынцаў-масквічоў у тагачасным грамадстве, і як гэта ўплывала на іх адаптацыю ў Вялікім Княстве Літоўскім.

2.

Да эмігрантаў першага шэрагу можна залічыць усю тытулаваную знаць, а менавіта: вялікага князя разанскага Івана Іванавіча, Мацвея Мікіцініча, Івана Львовіча Бароцінскага, Івана Дзмітрыевіча Шуйскага, Сямёна Фёдаравіча Бельскага. Да іх можна дадаць і двух асоб без княскага тытулу – Івана Цімафеевіча Юрлова і Івана Васільевіча Лядскага. Ніжэй прапануецца разгляд становішча кожнай з гэтых асоб.

Князь Мацвей Мікіцініч. Паходжанне князя Мацвея Мікіцініча застаецца невядомым. Той факт, што дакументы Метрыкі не фіксуюць ягонае родавае імя (Мікіцініч – гэта, відавочна, імя па бацьку) кажа аб прыналежнасці Мацвея да здрабнелага княскага роду. З упэўненасцю можна сказаць, што ён уваходзіў у бліжэйшае атачэнне княжны Алены, дачкі Івана III, якая стала жонкай вялікага князя літоўскага Аляксандра ў 1495 г. Мікіцініч прыбыў у Вільню разам з ёй. Мяркуецца, што гэты князь быў нейкім чынам звязаны з вядомым у Расіі родам Рапалоўскіх, але дакладнай інфармацыі на гэты конт крыніцы не даюць [11, с. 77–81].

Жыццё і дзейнасць Мікіцініча ў Вялікім Княстве Літоўскім даволі добра задакументавана. Трэба адзначыць, што гэта постаць заслугоўвае асобнай прасапаграфічнай працы. Тут спынімся толькі на самай агульнай характарыстыцы яго становішча. Алена Іванаўна і Аляксандр за верную службу шчодра адарылі Мікіцініча землямі. Яго ўладанні былі сканцэнтраваны на Магілёўшчыне (з цэнтрам у Княжычах) і ў Ковенскім павеце (з цэнтрам у Езне). Ён таксама валодаў дварамі ў Віленскім паве-

це і нерухомасцю ў сталіцы, за 2500 коп грошаў трымаў у заставе багаты гаспадарскі маёнтак Бірштаны [12, с. 9; 13, арк. 150, 152; 14, с. 40, 51, 82; 15, с. 290; 16, с. 61, 113; 17, с. 50–51; 18, с. 177–183, 185–186; 19, с. 137–138].

Аб заможнасці князя Мацвея сведчаць дадзеныя Перапісу войска 1528 г. Памер яго вайсковай павіннасці быў роўны 79 вершнікам. Па колькасці камбатантаў ён саступаў найбуйнейшым магнатам краіны (Альбрэхту Гаштольду, Канстанціну Астрожскаму, Юрыю Слуцкаму, Яну Забярэзінскаму, Радзівілам і інш.), але апярэджваў такіх дзеячоў, як, напрыклад, падскарбі земскі Багдан Багавіцінавіч (64 коні) і ваявода кіеўскі Андрэй Неміровіч (43 коні) [20, с. 50, 54].

Алена Іванаўна атрымала ад свайго мужа вялізныя ўладанні і зрабіла М. Мікіцініча намеснікам у некаторых з іх: Княжычах, Цяцерыне, Анікштах, Бірштанах і Магілёве [18, с. 175–177, 181–182]. Аднак пазбаўленне пратэкцыі Алены Іванаўны па прычыне яе смерці ў 1513 г. не спрыяла развіццю кар'еры ўрадніка. Тым не менш Мікіцініч быў пакінуты на пасадзе намесніка спалых на гаспадара Бірштан, якія знаходзіліся побач з яго Езненскім дваром [21, с. 154]. Варта адзначыць, што статус Мікіцініча як трымальніка Бірштан быў своеасаблівым. З аднаго боку, ён з'яўляўся арандатарам гэтага маёнтка. З іншага боку, князь Мацвей фігуруе ў крыніцах як бірштанскі намеснік, што было пасадай [21, с. 154]. Гэту пасаду, нягледзячы на ўсе цяжкасці, ён здолеў захаваць да канца жыцця.

У князя Мацвея Мікіцініча было тры жонкі, ад кожнай з якіх ён меў дзяцей: Фяцiння (дачка *Fedię* і яшчэ адна, імя якой невядома), княжна Людміла Духніч (сын Яраслаў, дочкі Анастасія, Ганна і Дабрухна) і княжна Таміла Мсціслаўская (сыны Іван і Астафі, дачка Ганна) [2, s. 118].

Аб даволі высокім не толькі маёмасным, але і сацыяльным становішчы Мацвея Мікіцініча, сведчыць яго шлюбная «палітыка». Дзесьці да 1522 г. адбыліся заручыны паміж адной з ягоных дачок, імя якой не названа, і Янам Мікалаевічам Радзівілам, маршалкам земскім, старостам дарагіцкім і слонімскім. Такім чынам, Мікіцінічы мелі магчымасць парадніцца з адным з найбольш уплывовых магнацкіх родаў. Па невядомай прычыне шлюб не адбыўся [22, слп. 1056–1057].

Князь Мацвей Мікіцініч памёр да 1 траўня 1539 г., калі «кнегиня Матфеевая» была названа ўдавой. Перад смерцю ён падзяліў свае ўладанні паміж сынамі Яраславам і Астаф'ем (трэці сын Іван да таго часу памёр) і жонкай Тамілай [13, арк. 85, 150–153]. Астафі Мацвеевіч памёр бяздзетным і нават нежанатым. Род Мікіцінічаў працягваў князь

Яраслаў, які ўслед за бацькам здолеў наблізіцца да вялікакняскага двара, заняўшы пасаду гаспадарскага маршалка і адначасова дзяржаўцы ляхавіцкага [23, арк. 267]. Гаспадарскім маршалкам, а яшчэ і старостам ковенскім, быў і ягоны сын, таксама Яраслаў [2, s. 124]. Даволі высокае становішча, якое занялі Мікіцінічы ў грамадстве Вялікага Княства Літоўскага, спарадзіла імкненне да адпаведнай рэпрэзентацыі сябе ў гэтым грамадстве. Унукі князя Мацвея сталі ўжываць тытул князёў Галоўчынскіх (ад назвы маёнтка Галоўчын на Магілёўшчыне), а пазней і Рапалоўскіх [2, s. 123]. Апошні з Мікіцінічаў-Галоўчынскіх-Рапалоўскіх, Мікалай Канстанцінавіч, памёр у 1658 г. [2, s. 129].

Такім чынам, Мацвей Мікіцініч стаў даволі буйным землеўладальнікам Вялікага Княства Літоўскага дзякуючы блізкасці да Алены Іванаўны (гэта абумовіла поспех і ягоных нашчадкаў). Аднак варта адзначыць тое, што князь Мацвей не згубіў свайго становішча і пасля смерці вялікай княгіні, хоць у цэлым ягоны выпадак з'яўляецца нетыповым для маскоўскіх эмігрантаў таго часу, якія не мелі падобнай падтрымкі. Акрамя таго, Мікіцініч з'яўляўся адзіным з эмігрантаў свайго часу, чый ад'езд быў санкцыянаваны маскоўскімі ўладамі.

Род *Івана Львовіча Барацінскага* пайшоў ад Мязецкіх, якія, у сваю чаргу, былі адгалінаваннем Чарнігаўскіх князёў [2, с. 7–8]. Сваё родавае прозванне гэта лінія атрымала ад назвы населенага пункта на правабярэжжы р. Угра – Барацін. У выніку маскоўска-літоўскай вайны 1486–1494 гг. Барацінскія сталі слугамі маскоўскага гаспадара [24, с. 137]. Прычыны выезду Івана Львовіча ў Вялікае Княства Літоўскае не вядомыя. Адбылося гэта да 1509 г.

У 1509 г. Іван Львовіч Барацінскі, у ліку іншай шляхты, павінен быў атрымаць ад Жыгімонта Старога 30 бочак жыта [25, с. 414]. Зыходзячы з натуральнага характару і аб'ёму гэтай атправы можна меркаваць, што яна прызначалася для ўтрымання князя і ягоных слуг. Гэта можа быць сведчаннем адсутнасці ў Барацінскага на той момант уласнай крыніцы даходу – зямельнага ўладання. Гэтак, у 1510 г. беззямельныя гаспадарскія дваране разам з грашовымі сумамі атрымалі ад Жыгімонта па 8, 10, 12 і 15 бочак жыта [25, с. 429].

У 1516 г. гаспадарскі дваранін Іван Львовіч просіць у вялікага князя дзве пустыя зямлі, на якіх ён бы мог «дворац справити и пашню мети». Просьба была задаволена падараваннем двух пустаўшчын у Майшагольскім павеце – Некрашоўшчыны і Міткоўшчыны [26, арк. 94 адв. – 95]. 1522 г. датуецца ліст Жыгімонта Старога да Юрыя Радзівіла з распараджэннем адшукаць для князя Барацінскага яшчэ дзве зямлі

ў вышэйзгаданым павеце [27, с. 198; 26, арк. 95]. Там жа ў 1529 г. ён атрымлівае ва ўладанне землі (на гэты раз заселеныя) Місеўшчыну і Шчапанаўшчыну. Паводле Перапісу войска 1528 г., князь Барацінскі мусіў выстаўляць у паспалітае рушэнне 7 вершнікаў [20, с. 54]. Такая колькасць камбатантаў адпавядала 56 сялянскім службам.

Акрамя таго, мы маем звесткі рэтраспектыўнага характару аб валоданні Іванам Львовічам дваром у самой Майшаголі і аб трыманні маёнтку Дусяты ва Уценскім павеце [28, с. 47; 29, с. 185; 30, с. 236]. Нейкія ўладанні Барацінскі павінен быў прыдбаць у якасці пасагу за сваёй жонкай – дачкой князя Івана Львовіча Вяземскага Марыяй (відаць, яго першая жонка засталася ў Маскоўскай дзяржаве). Дзеці Барацінскага мелі правы на «именье матерыстое» Пірошычы ў Аршанскім павеце [28, с. 49].

Дзесьці пасля 1522 і да кастрычніка 1526 гг. Іван Львовіч знаходзіўся ў вялікакняскай няміласці. Прычынай таму стаў паклёп, узведзены на яго нейкім масквіцінам Рыгорам Каргашам. Той абвінавачваў Барацінскага ў намеры збегчы ў Маскву. Жыгімонт Стары адклаў разбіральніцтва па гэтай справе на няпэўны час, да якога аддаў Івана Львовіча «на рукоемство» (г. зн. на парукі) «некоторымъ князем и паномъ и двораномъ нашим». Разбіральніцтва, аднак, так і не адбылося, бо пасля ўцёкаў самога Каргашы ў Маскву і хадайніцтва некаторых радных паноў вялікі князь вызваліў Барацінскага з парукаў і прызнаў яго «за доброго а за верьного слугу» [31, с. 340].

З Марыяй Вяземскай Іван Львовіч меў чатырох сыноў: Івана, Багдана, Мікалая і Яську (Якуба?), а таксама трох дачок: Аўдоццю, Ганну і Палонію [2, s. 8–9]. Аўдоццю (відаць, старэйшую з дачок) ён выдаў за князя Цімафея Юр'евіча Сакалінскага, запісаўшы за ёй двор у Майшаголі. Памёр Іван Львовіч паміж лютым 1534 г. і жніўнем 1537 г., пакінуўшы сваіх несталагадовых дзяцей пад апекай сваяка, гаспадарскага дварaніна пана Івана Сялявы [28, с. 31]. Імаверна, жонка князя Івана памерла яшчэ раней.

Паводле класіфікацыі М.Ф. Спірыдонава маёмаснае становішча Івана Львовіча дазваляе аднесці яго да катэгорыі дробных феадалаў [32, с. 262]. Магчыма, кар'еры ўрадніка перашкодзіла часовая апала, тады як унукам Барацінскага ўдалося займаць пасады ў Аршанскім павеце [2, s. 9]. Парадніліся Барацінскія з сацыяльна роўным сабе родам здрабнелых князёў Вяземскіх, якія страцілі ўласную вотчыну і апынуліся па розныя бакі літоўска-маскоўскай мяжы.

Іван Цімафеевіч Юрлоў паходзіў з вядомага маскоўскага баярскага роду Пляшчэевых, многія з каторых вызначыліся на службе маскоўскім

вялікім князям. Яго бацька Цімафей Міхайлавіч Юрло Пляшчэеў, а таксама адзін з яго родных братоў, нават уваходзілі ў думу Івана ІІІ (прыгадваюцца ў якасці акольнічых). Сам Юрлоў таксама служыў пры яго двары [33, с. 197]. Магчыма, эміграцыя Івана Цімафеевіча была выкліканы апалай яго бліжэйшых сваякоў. Вядома, што вялікі князь маскоўскі прымусова адправіў у манастыр яго брата Васіля. А.А. Зімін мяркуе, што, наадварот, прычынай гэтай апалы мог стаць ад'езд Юрлова [33, с. 197].

Упершыню ў Вялікім Княстве Літоўскім Іван Цімафеевіч згадваецца пад 1514 г., калі яму былі падараваны шэсць пустых зямель у Дарсунішскім павеце (Троцкае ваяводства) у дадатак да атрыманых раней 60 службаў сялян [21, с. 232]. У 1516 г. «пан» Іван Юрлоў прасіў Жыгімонта Старога пацвердзіць яго вотчынныя правы на вышэйзгаданыя землі і сялян, а таксама на «тридцат чоловеков куничников» і пятнаццаць путных слуг у Ясваінскай воласці, што і было зроблена [21, с. 178–180].

У далейшым уладанні Івана Юрлова павялічваліся. Да 1520 г. ён набыў двор у Швінтыніках і землі ў Пашушві (Жамойць), атрымаў ад Юрыя Радзівіла двор у Горадні, у выніку судовага разбіральніцтва авалодаў «городищем» у Дарсунішках [16, с. 72]. У снежні 1522 г. ён атрымаў прывілей на двары Гойжава і Паневяжы, 33 сялянскія службы і чатыры пустаўшчыны ў Вількейскім павеце [27, с. 173]. Праз шэсць дзён вялікі князь пацвердзіў правы Юрлова на шэраг яго ўладанняў. З гэтага дакумента вынікае, што маскоўскі эмігрант валодаў яшчэ дваццацю адной пустаўшчынай у Ясваінскай воласці і чатырма ў Дарсунішскім павеце, а таксама домам у Вільні. Вялікі князь адзначыў, што выдаў Юрлову пацвярджальны прывілей «для его к нам (Жыгімонту Старому. – *А.К.*) верное и справедливое службы» і «на жеданье панов рад наших» [27, с. 177–178]. Сярод уладанняў эмігранта таксама прыгадваюцца маёнткі Новы Двор (Ясваінская воласць) і Даркгуні (Гарадзенскі павет), а таксама яшчэ адзін дом у сталіцы, куплены за 37,5 коп грошаў [27, с. 470]. Яшчэ вядома, што ён трымаў два маёнткі ў заставе: Лынтупы за 300 і Алону за 100 коп грошаў [30, с. 130]. Паводле Перапісу войска 1528 г. Іван Цімафеевіч павінен быў узбройваць 18 вершнікаў, што адпавядала 144 сялянскім службам [20, с. 52]. Для параўнання: гаспадарскі пісар (не апошняя пасада ў краіне!) Іван Гарнастай мусіў выстаўляць у войска 12 вершнікаў [20, с. 50].

Не выключана, што некаторыя са сваіх маёнткаў Юрлоў атрымаў у якасці пасагу за жонкай Ганнай. Яна была дачкой Марціна Багданавіча Храбтовіча [35]. Такім чынам, Юрлоў парадніўся з даволі ўплывовым

родам. Марцін Храбтовіч пачаў кар'еру ўрадніка яшчэ пры вялікім князі Аляксандры, займаючы пасады пры яго двары. Нягледзячы на арышт з-за падазрэння ў падтрымцы М. Глінскаага ў 1509–1511 гг., ён напрыканцы жыцця (памёр у 1526 г.) быў маршалкам гаспадарскім і канюшым троцкім [27, с. 318–319].

Пад 1514 г. Іван Цімафеевіч упершыню згадваецца ў якасці намесніка Ясваінскай воласці (Жамойць) [21, с. 232]. Яго кар'ера ўрадніка складвалася няпроста. Апошні раз у якасці ясваінскага намесніка ён фігуруе ў 1520 г., а ў 1525 г. гэту пасаду ўжо займаў князь Міхаіл Асавіцкі [16, с. 72]. У дакументах 20-х гг. XVI ст. Іван Цімафеевіч называецца толькі панам і гаспадарскім дваранінам. Пазбаўленне Юрлова ўрада адбылося, відаць, па прычыне недахопу грошай у скарбе – Ясваінь была застаўлена жамойцкаму біскупу. Жыгімонт, аднак, планаваў пана Івана «лепшим держаньем осмотрети и пожаловати», але нічога падыходзячага не знайшлося. Па сканчэнні тэрміну заставы Ясваінь была аддадзена эгзулянту Асавіцкаму замест адабраных у яго спачатку Дарсунішак, а потым Скерстамоні. Каб неяк кампенсаваць Юрлову страту ўрада «без причины», вялікі князь у 1525 г. выдаў яму «экспектатыву» – прывілей на тое ж ясваінскае намесніцтва, якое павінна было дастацца Івану Цімафеевічу па смерці Асавіцкага, а таксама даў яму права мець у сваіх маёнтках чатыры карчмы «з волным шинком... без плаченя капщизны» [27, с. 388].

Нягледзячы на гэта, Юрлоў працягваў барацьбу за пасаду і ў верасні 1526 г. атрымаў вялікакняскі прывілей на яе. У ім адзначалася, што ясваінскае намесніцтва вернута Івану Цімафеевічу па хадайніцтве самой каралевы Боны і радных паноў [27, с. 468]. Былі адзначаны і яго заслугі: Юрлоў неаднаразова прымаў удзел у баявых дзеяннях супраць Маскоўскай дзяржавы, у тым ліку ў бітве пад Оршай 1514 г. Але Асавіцкі здолеў схіліць Жыгімонта да рашэння не адбіраць у яго ўрад, матывуючы гэта тым, што са сваіх спустошаных непрыяцелем уладанняў «не мает се чем поживити». Адпаведны прывілей ён атрымаў у лістападзе 1526 г. [27, с. 468]. «Экспектатыва» Юрлову на ясваінскае намесніцтва была адноўлена, аб чым вялікі князь нагадваў старосце жамойцкаму ў чэрвені 1527 г. Відаць, да сваёй смерці (пасля 1528 г.) Іван Цімафеевіч не паспеў заняць гэту пасаду [31, с. 378]. Такім чынам, кар'ера Юрлова як урадніка складвалася супярэчліва па суб'ектыўнай прычыне – непаслядоўнай палітыцы Жыгімонта Старога па раздачы ўрадаў. Трэба адзначыць, што апісаны вышэй выпадак можна разглядаць у кантэксце праблемы «завочных» лістоў вялікакняскай канцылярыі, што выходзіць за рамкі дадзенай працы [36].

З Ганнай Багданаўнай Храбтовіч Юрлоў меў трох дачок: Ганну, Барбару і Кацярыну [28, с. 67]. Нашчадкаў мужчынскага полу ён не пакінуў. Апошні раз Іван Цімафеевіч згадваецца ў студзені 1529 г. [35].

Дзякуючы службе вялікаму князю літоўскаму Юрлоў здолеў стаць заможным землеўладальнікам, карыстаўся падтрымкай гаспадарскай рады і вялікай княгіні Боны.

Іван Іванавіч, апошні з вялікіх разанскіх князёў, скарыстаўшыся набегам крымчакоў на Маскву ў 1521 г., збег з маскоўскай вязніцы ў Вялікае Княства Літоўскае [37, с. 156–157; падрабязна аб апошніх гадах Разанскага княства і лёсе Івана Іванавіча да ўцёкаў з Масквы: 37, с. 145–159].

Аб жыцці Івана Іванавіча Разанскага ў Вялікім Княстве Літоўскім вядома няшмат. Ён атрымаў з рук Жыгімонта Старога двор Стоклішкі ў Троцкім ваяводстве. Адпаведны прывілей не захаваўся. Прынамсі, апошні разанскі князь ужо трымаў Стоклішкі ў кастрычніку 1524 г. [19, с. 136]. Што ж тычыцца яго ўладальніцкіх правоў на гэты маёнтак, то трыманне было ўмоўным. Аб гэтым сведчыць тое, што разанскі князь не меў права раздаваць стоклішскія землі сваім слугам. Пасля яго смерці такія падараванні былі ануляваныя [38, с. 105–106].

Слугі разанскага ўцекача не адрозніваліся законапаслухмянасцю. У 1533 г. яны разам са сваім гаспадаром былі выкліканы на суд за «бои и грабежи бояр стоклишских», але не з’явіліся ў вызначаны тэрмін [39, с. 129]. У 1530 г. Іван Іванавіч быў названы сярод тых асоб, якія павінны былі дакументальна пацвердзіць правы на свае ўладанні [40, с. 291].

Матэрыяльнае становішча разанскага князя нельга назваць стабільным. У 1524 г. Жыгімонт Стары ўзяў на сябе («заступил») пазычаную ім у яўрэя Міхеля Езафовіча суму грошай і загадаў падскарбію земскаму зрабіць адпаведную выплату са скарбу [19, с. 111]. Невядома, ці было выканана гэта распараджэнне, але 11 лістапада 1533 г. у выніку судовага разбіральніцтва вялікі князь абавязаў Івана Іванавіча на працягу 16 тыдняў выплаціць Аўрашку Езафовічу 118 коп грошаў, якія той быў вінен яшчэ ягонаму бацьку Міхелю Езафовічу [39, с. 134–135]. Выканаць пастанову гаспадарскага суда апошні разанскі князь не паспеў: ён памёр да 11 лютага 1534 г., не пакінуўшы нашчадкаў [38, с. 105–106]. Падобна, што ён ніколі не жаніўся.

Такім чынам, у Вялікім Княстве Літоўскім Іван Іванавіч атрымаў маёнтак, які забяспечваў яго матэрыяльнае становішча. Вялікі князь Жыгімонт аказваў яму падтрымку ў вырашэнні фінансавых праблем.

Сямён Фёдаравіч Бельскі паходзіў з вядомага у Вялікім Княстве Літоўскім рода. Бацька Сямёна Фёдар удзельнічаў у раскрытай змове

супраць вялікага князя Казіміра 1481/1482 г., з-за чаго быў вымушаны ратавацца ўцёкамі ў Маскву. У 1500 г. за ім паследаваў яго брат Сямён. Там Бельскія былі набліжаныя да вялікакняскага двара, аб чым, у прыватнасці, сведчыць шлюб паміж Фёдарам Іванавічам і пляменніцай Івана III Ганнай Васільеўнай Разанскай. Сам князь Бельскі, а таксама тры яго сыны, у т. л. Сямёнам Фёдаравічам, адыгрывалі прыкметныя ролі ў дзяржаўна-палітычным жыцці Маскоўскай дзяржавы [33, с. 124–127; 6, с. 99–101]. Становішча Бельскіх змянілася пасля смерці Васіля III (канец 1533 г.), калі ў Маскве абвастрылася ўнутрыпалітычная барацьба. Старэйшы з братоў Дзмітрый на думку А.А. Зіміна «был, пожалуй, самым приближенным к великому князю (Васілю III. – *А.К.*) лицом из служилых княжат» [33, с. 125], а ўжо ў ліпені 1534 г. ён названы сярод тых асоб, якія «ничого не справуют» [41, с. 99]. У такіх умовах далейшая кар'ера князя Сямёна была наўрад ці магчымай: у адрозненне ад братоў, ён так і не атрымаў баярскага чыну. Імаверна, гэта і стала галоўным матывам яго ад'езду [6, с. 103; 4, p. 125]. У жніўні 1534 г. Сямён Фёдаравіч , які знаходзіўся на службе ў Серпухаве ў якасці ваяводы, уцёк разам з акольнічым Іванам Васільевічам Лядскім у Вялікае Княства Літоўскае [6, с. 103].

Разглядаючы становішча князя Бельскага, пакінем за рамкамі яго крымскую авантуру [падрабязней гл.: 5, с. 298–317; 6, с. 98–115]. Ажыццяўляючы свае амбітныя планы, Сямён Фёдаравіч у 1536 г. свавольна выехаў з Вялікага Княства Літоўскага і адсутнічаў там да 1541 г.

Князя Бельскаму Жыгімонт Стары зрабіў дзяржаўцам трох маёнткаў у Троцкім ваяводстве – Стоклішак, Кармялава і Жыжмор [42, s. 398]. О.П. Бакус лічыць, што гэта адбылося прыкладна напрацягу года з моманту з'яўлення Бельскага ў Вялікім Княстве Літоўскім [4, s. 126]. Дзесьці ў 1535 г. сам эмігрант у лісце да Жыгімонта скардзіўся на свавольства свайго слугі Сабесцяна, каторага ён паслаў «до дворов моих (Бельскага. – *А.К.*)» з лагера аб'яднанага польска-літоўскага войска пад Рэчыцай. Як адзначаў князь Сямён, падчас яго адсутнасці Сабесцян сам сябе зрабіўураднікам у яго маёнтках (з ліку якіх названа толькі Кармялава) і нанёс ім шкоду [43, арк. 1–1 адв.; 44, арк. 1]. У Рэчыцы войска знаходзілася да пачатку ліпеня 1535 г., а яго збор у гэтым пункце доўжыўся прыблізна на працягу чэрвеня [45, с. 60–61, 66]. Такім чынам, Бельскі атрымаў Кармялава і нейкія іншыя маёнткі (напэўна, Стоклішкі і Жыжморы) да свайго ад'езду на вайну, хутчэй за ўсё – да пачатку лета 1535 г.

Трэба адзначыць, што статус дзяржаўцы, з аднаго боку, павінен быў забяспечваць даход. З іншага боку, дзяржаўца мусіў ажыццяўляць

адміністратарскія функцыі ў тых гаспадарскіх маёнтках, якія знаходзіліся ў яго трыманні; у гэтым сэнсе ён выступаў намеснікам вялікага князя ў даручаных яму ўладаннях. Такім чынам, Стоклішкі, Кармялава і Жыжморы знаходзіліся ў карыстанні Бельскага на пэўных умовах, забяспечваючы яго маёмаснае становішча. У той жа час ён выконваў функцыі гаспадарскага ўрадніка.

У лютым 1536 г. Сёмён Фёдаравіч выступаў у якасці сведкі па справе Міхаіла Семічава, маскоўскага эмігранта ў другім пакаленні, з менскім дзяржаўцам панам Янам Сцяцковічам. Бельскі аказаў падтрымку Семічаву, пацвердзіўшы яго шляхецкае паходжанне [46, с. 98].

Пакідаючы Вялікае Княства Літоўскае ў 1536 г., Бельскі даручыў апеку над сваімі маёнткамі Альбрэхту Гаштольду [47, арк. 1]. Іх адміністратары падтрымлівалі сувязь з князем Сямёнам, паведамляючы яму аб стане спраў і атрымліваючы ад яго распараджэнні па кіраванні гаспадаркай. Падчас сваёй адсутнасці ў краіне ён пазбавіўся на некаторы перыяд двух з трох урадаў, застаўшыся, відаць, толькі намеснікам жыжморскім. З ліпеня 1538 г. па лістапад 1539 г. у якасці дзяржаўцы кармялаўскага і стоклішскага прыгадваецца вялікакняскі пісар Міхайла Васільевіч Свінюшскі [48, с. 150].

Пасля вяртання ў Вялікае Княства Літоўскае ў 1541 г. Бельскі зноў стаў ураднікам у Кармялаве і Стоклішках. Нічым асаблівым ён не адзначыўся, акрамя пастаянных канфліктаў з суседзямі і ўласнымі слугамі. У 1542 г. Сямён Фёдаравіч прымушаў служыць да Жыжмор гаспадарскіх кавалёў троцкага замку Нарковічаў [49, арк. 1]. Неаднаразова радныя паны пісалі да Бельскага з патрабаваннем выпусціць на волю абрабаваных, збітых і арыштаваных па яго загадзе троцкіх баяр. Князь Сямён адказваў, што гэта яго падданыя, «мужики», каторых ён карае за непаслухмянасць, і абураўся ўмяшаннем у яго справы [50, арк. 1–1 адв.; 51, арк. 1; 52, арк. 1–2; 53, арк. 1–1 адв.; 54, арк. 1]. У 1542 г. Бельскі адабраў у баярына гаспадарскага Сцяпана Крукава (былога служэбніка памерлага разанскага князя) набыты ім у Стоклішках дом, нягледзячы на тое, што ўладальнік прад’явіў дакументы на яго [55, арк. 1; 56, арк. 1]. Ад князя Сямёна цярпелі нават яго намеснікі. Па загадзе Бельскага быў збіты кармялаўскі ўраднік Цімафей Нікіфараў, які адмовіўся ад службы свайму гаспадару з-за таго, што не атрымліваў за яе ўзнагароды [57, арк. 1–3; 58, арк. 1].

У сувязі са звесткамі аб свавольстве Бельскага ў адносінах да падданых і мясцовай шляхты не выклікае здзіўлення паведамленне С. Герберштэйна аб прычыне яго смерці. Па дадзеных імперскага дыпламата, той

бесчалавечна абыходзіўся з галотай і ў выніку быў ёй забіты [59, с. 111]. Версія аб тым, што напрыканцы жыцця Бельскі вярнуўся ў Маскоўскую дзяржаву, не мае дастатковага грунту [6, с. 114–115]. Апошняя згадка аб ім датуецца студзенем 1544 г. [60, арк. 1]. У снежні 1546 г. у якасці трымальніка Жыжмор згадваецца Васіль Жаба, пасля якога гэтым маёнткам валодала яго жонка [61, арк. 154 адв. – 155]. Нашчадкаў Бельскі не пакінуў.

Сямён Фёдаравіч займаў больш высокае становішча ў Вялікім Княстве Літоўскім у параўнанні з іншымі эмігрантамі князкага паходжання (за выключэннем Мацвея Мікіцініча). Апошні вялікі князь Разанскі трымаў толькі Стоклішкі, тады як Бельскі ў дадатак да іх меў яшчэ Кармялава і Жыжморы. Не выключана, што іншы чалавек на яго месцы мог бы зрабіць больш паспяховую кар’еру дзяржаўцы, калі б не пакінуў краіну з мэтай ажыццяўлення сваіх авантурных планаў. Ускосна гэта пацвярджае лёс таварыша Бельскага па ўцёках з Масквы – Івана Васільевіча Лядскага.

Іван Васільевіч Лядскі – найбольш знакаміты прадстаўнік вышэйшага маскоўскага баярства сярод эмігрантаў. Ён паходзіў з адной са старамаскоўскіх фамілій Кошкіных. Бацька Лядскага, Васіль Захар’евіч, нічым асаблівым не вызначыўся па прычыне ранняй смерці. А вось ягоныя браты, а таксама іх дзеці, зрабілі паспяховую кар’еру на службе маскоўскім князям. Іван Васільевіч таксама адыгрываў прыкметную ролю пры двары, вызначыўся ў якасці таленавітага ваеначальніка. Ён неаднаразова прызначаўся на высокія пасады ў войску, удзельнічаў у войнах супраць Вялікага Княства Літоўскага. Са смерцю Васіля III Лядскі, таксама як і Бельскія, губляе былое становішча [33, с. 183–185, 187–188]. Відаць, гэта і стала прычынай яго эміграцыі. Сам Іван Васільевіч тлумачыў свой ад’езд успышкай жорсткай барацьбы пры маскоўскім двары [62, с. 68].

Ад Жыгімонта Старога Лядскі атрымаў пасаду намесніка ў Высокім Двары і Жалудку (Троцкае ваяводства). Можам меркаваць, што гэта адбылося ў той жа час, калі Бельскі стаў намеснікам Стоклішак, Кармялава і Жыжмор. Прынамсі, намеснікам высокадворскім Лядскі быў ужо ў красавіку 1536 г. [63, арк. 123–123 адв.]. У траўні таго ж года прыгадваюцца жалудоцкія падданыя «пана Ивана Василевича Лядского» [39, с. 139–140]. Як і ў выпадку з Бельскім, гэтыя ўрады Лядскага былі не толькі пасадай, але і крыніцай існавання.

Вядома, што Іван Васільевіч атрымаў з рук гаспадара два сёлы ў Свіслацкай воласці – Ачыжжа і Балочча. Адбылося гэта недзе да мая

1536 г. [39, с. 152]. Сярод яго маёнткаў было таксама Носава (Мельніцкі павет) і Чамяры (Камянецкая воласць) [64, s. 317; 65, стб. 508]. Эмігрант праявіў сябе руплівым гаспадаром, абараняючы свае крыніцы даходаў ад прэтэнзій з боку мясцовай шляхты. Адзначыўся Іван Васільевіч і ў публічнай дзейнасці. Сем разоў (у 1536, 1540, 1541 і 1542 гг.) ён выступаў сведкам прыняцця рашэнняў на судзе пад старшынствам намесніка ваўкавыскага і ваяводы віцебскага (з 1542 г. – старосты жамойцкага) Мацея Войцехавіча Яновіча [39, с. 139–140, 145–148, 178–179, 196, 207, 242, 244–246].

Лядскі быў не толькі таленавітым военачальнікам, але і адным з самых адукаваных людзей свайго часу. Валодаючы ведамі па геаграфіі, а таксама, магчыма, прывезенымі з сабой матэрыяламі, Лядскі дапамог нямецкаму картографу Антонію Віду скласці мапу Масковіі, якая пабачыла свет у 1542 г. Сам Від казаў, што гэты эмігрант быў годна прыняты Жыгімонтам Старым «з-за сваёй мудрасці і адоранасці ў мастацтве» [62, с. 68–69].

Праз 10 год пасля атрымання пасады намесніка высокадворскага і жалудоцкага, у 1546 г., Лядскі прыгадваецца ў якасці намесніка медніцкага, што стала павышэннем на дзяржаўнай службе [66, s. 71]. У спісе ўраднікаў Віленскага і Троцкага ваяводстваў 1536 г. намеснік высакадворскі і жалудскі знаходзіўся на 13 месцы, а намеснік медніцкі – на першым [67, прил., с. 33]! Такім чынам, Лядскі заняў першае месца ў іерархіі павятовых ураднікаў сталічнага ваяводства. Двойчы, у 1536 г. і 1538 г., ён атрымліваў ад вялікага князя ўзнагароду за службу ў выглядзе грашовых сум і матэрыяльных каштоўнасцяў [63, арк. 37 адв., 38 адв. – 39].

Апошні раз Лядскі быў прыгаданы ў 1552 г., неўзабаве пасля чаго памёр. Ужо ў чэрвені 1554 г. ён згадваецца як нябожчык [66, s. 71; 68, s. 3–4, 7]. Іван Васільевіч меў сына Івана, каторы разам з ім ад'ехаў у Вялікае Княства Літоўскае. Іван Іванавіч Лядскі займаў пасаду ляснічага падляскага, парадніўся з родам князёў Палубінскіх. Пасля сябе ён пакінуў двух сыноў – Грэгара і Тэадора [69, s. 856; 70, с. 80].

Сярод іншых эмігрантаў Іван Васільевіч Лядскі асаблівай заможнасцю не адрозніваўся, але здолеў заняць самае высокае становішча ў якасці ўрадніка.

Іван Дзмітрыевіч Губка Шуйскі належыў да вядомага ў Расіі княскага рода. Яго бліжэйшыя сваякі адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным жыцці Вялікага Княства Маскоўскага ў канцы XV – першай трэці XVI ст. Дзядзькі Івана Дзмітрыевіча Васіль і Іван Васільевічы дасягнулі

высокага становішча пры маскоўскім двары, тады як яго бацька памёр у маладым узросце і нічым не адзначыўся. Сам Губка не згадваецца ў маскоўскіх крыніцах акрамя радаслоўяў [71, с. 70]. Матывы яго ад'езду застаюцца невядомымі. Магчыма, ён пакінуў краіну ў сувязі з тым, што яго ўплывовыя сваякі былі адхілены ад улады ў 1536–1538 гг. [33, с. 71].

Першая датаваная згадка аб Шуйскім у Вялікім Княстве Літоўскім адносіцца да ліпеня 1537 г. [72, с. 93–96, 99]. Пэўны час ён знаходзіўся на ўтрыманні вялікакняскага скарбу. Памер штогадовай выплаты складаў 80 коп грошаў [78, с. 79]. Яшчэ ў чэрвені 1542 г. Шуйскі не меў маёнткаў [73, с. 79]. Вядома, што Жыгімонт Стары даў яму двор Церабунь у Берасцейскім павеце, пакінуўшы за сабой права забраць гэта ўладанне. Адпаведны прывілей даты не мае [46, с. 120].

Церабунь была застаўлена Шуйскім за 200 коп грошаў, у сувязі з чым у 1555 г. ён меў судовую справу [2, s. 521]. 5 мая 1545 г. князь Іван замацоўвае сваёй пячаткай «лист» берасцейскага войта, падскарбіча земскага пана Яна Аўрамавіча, у якім той сведчыць, што заставіў сваёй жонцы Ганне двор Корніцы і берасцейскае войтаўства за 2000 коп грошаў [30, с. 122]. У 1549 г. Шуйскі па просьбе князя Дзмітрыя Фёдаравіча Сангушкі засведчыў, што апошні даставіў на бераг р. Буг тавар, тады як яго атрымальнік – луцкі войт Іван Борзабагаты – не з'явіўся на сустрэчу [7, с. 110].

Звяртае на сябе ўвагу публічная дзейнасць Шуйскага. Як і Лядскі, ён быў сведкам прыняцця рашэнняў на судзе пад старшынствам Мацея Войцехавіча Яновіча. Склад такіх сведкаў ніколі не быў фіксаваным, а часам насіў выпадковы характар [39, с. XXVII]. Цалкам магчыма, што раз-пораз для выканання гэтай ролі прыцягваліся шляхціцы, якія былі даступныя ў пэўны час у пэўным месцы. Але некаторыя асобы, часцей гаспадарскія дваране, згадваюцца як сведкі пастаянна. Гаспадарскі дваранін, князь Іван Дзмітрыевіч Шуйскі, выступаў у гэтай ролі аж 34 разы з 1537 па 1541 гг. [39, с. 97, 164, 179, 189, 190, 194, 196, 198–200, 206, 225, 226, 229, 232, 234, 236, 242, 246–248, 253, 262, 263; 72, с. 93–96, 98–99, 101, 111–113, 333–334]. Пад 1545 г. у Берасці Шуйскі яшчэ раз згадваецца сярод прысутных на судзе, на гэты раз – гаспадарскім [30, с. 120–122]. Такая «актыўнасць» Івана Дзмітрыевіча на судах пад старшынствам Мацея Яновіча дазваляе нам меркаваць аб існаванні паміж імі нейкай сувязі.

Як сведчыць вышэйзгаданы ліст князя Дзмітрыя Сангушкі ад 1549 г., Шуйскі карыстаўся пячаткай, якая была выраблена мясцовым майстрам [7, с. 110]. Акрамя таго, ініцыялы князя былі выяўлены пры дапамозе

лацінскага алфавіта – «I S», што кажа аб пэўнай ступені сацыяльна-культурнай адаптацыі эмігранта ўжо ў першым пакаленні І. Граля бачыць у гэтым наступства актыўнай публічнай дзейнасці эмігранта [7, с. 111].

Іван Дзмітрыевіч быў жанаты з Марыяй Багданаўнай Багавіцінавай [2, s. 521]. Так яму ўдалося парадніцца з уплывовым родам, праўда, з яго малодшай лініяй. Бацька Марыі Багдан даводзіўся стрыечным братам земскаму пісару Богушу Багавіцінавічу. Памёр Іван Дзмітрыевіч каля 1560 г., пакінуўшы сына Мануіла і, магчыма, дачку Соф'ю [2, s. 521–522]. Яго нашчадкі ў XVI–XVII стст. былі ўраднікамі сярэдняга звяна на Берасцейшчыне. Род Шуйскіх працягваўся да XIX стагоддзя, тады як у Расіі згас у XVII ст. [2, 522–535]

Такім чынам, Іван Дзмітрыевіч Шуйскі як абывацель Вялікага Княства Літоўскага не адрозніваўся асаблівай заможнасцю, але знаходзіўся ў сваяцтве з уплывовым родам Багавіцінаў.

3

Мы ўбачылі, што маскоўскія эмігранты маглі карыстацца асноўнымі правамі шляхецкага саслоўя – валодаць землямі (у т.л. на вотчынным праве) і займаць, няхай і даволі сціплыя, урады. Яны не мелі магчымасці дасягнуць у Вялікім Княстве Літоўскім настолькі ж высокага становішча, якое, напрыклад, займалі пры князі Бельскія ў Вялікім Княстве Маскоўскім. Гэта было абумоўлена вядомай розніцай у дзяржаўна-палітычным ладзе гэтых дзвюх краін. Цяжка ўявіць, каб палітычная эліта Вялікага Княства Літоўскага дапусціла іншаземцаў у свае шэрагі, г. зн. даспусціла іх да ўлады. Маскоўскія ж князі мелі магчымасць набліжаць да сябе ўцекачоў, такіх як Міхаіл Глінскі, часта ставячы іх вышэй за мясцовую арыстакратыю, што, паміж іншага, добра дэманструе шлюб Васіля III з Аленай Глінскай.

У Вялікім Княстве Літоўскім існавалі юрыдычныя нормы, якія рэгламентавалі становішча іншаземцаў. У прывілеі 1447 г. вялікі князь Казімір абавязваўся не даваць зямель і ўрадаў «чюжоземцам» ні ў спадчыннае, ні ў часовае трыманне. Гэта права мелі толькі карэнныя жыхары (*indigenis*) [74, с. 328; 75, с. 220]. Яно было замацавана выключна за мясцовым набілітэтам у прывілеях Аляксандра 1492 г. і Жыгімонта Старога 1506 г. (апошні не казаў аб гэтым наўпрост, але абяцаў выконваць прывілей Аляксандра), а таксама ў Статуце 1529 г. [74, с. 331–332, 335; 75, с. 223, 228; 76, с. 159]. Нягледзячы на гэта, у XV–XVI стст. іншаземцы празнымі шляхамі набывалі тут урады, землі і падданых, у тым ліку атрымлівалі іх з рук вялікіх князёў літоўскіх [77, s. 50–51, 58].

Звяртае на сябе ўвагу яшчэ адна істотная акалічнасць. Многія маскоўскія эмігранты таго часу, у т.л. прадстаўнікі вышэйшай знаці, займалі пасады гаспадарскіх дваран [1, с. 13–14, 16]. Уваходжанне ў двор вялікага князя літоўскага, відаць, было самым простым шляхам забяспечыць сабе трывалае, няхай і невысокае, маёмаснае становішча, інтэгравацца ў мясцовае прывілеяванае саслоўе. У першай палове XVI ст. кола дваран значна павялічваецца за кошт эмігрантаў, а таксама смаленскіх і бранскіх эгзулянтаў. Ужо далёка не ўсе дваране пастаянна знаходзіліся пры гаспадары. Таму само паняцце аб двары як аб коле асабістых слуг вялікага князя, яго непасрэдным атачэнні, на той час перастае адпавядаць рэчаіснасці. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчаць соймавыя матэрыялы сярэдзіны XVI ст. У 1544 г. на сойме ў Берасці шляхта адзначала (вядома ж, з пэўнай доляй перабольшвання), што дваранскі тытул «вжо вси посполите в том панстве... собе прывлашчыли» і прасіла Жыгімонта скласці попіс дваран [78, слп. 126]. На віленскім сойме 1547 г. шляхта патрабавала, каб вялікі князь «рачыл *водле стародавного обычаю двор литовскии на* <u>*своем*</u> *дворе ховати* (вылучана мной. – *А.К.*), а им оттоль платити, отколь за предков его млсти плачоно было» [78, слп. 139–140]. Такім чынам, у першай палове XVI ст. адбываўся працэс маргіналізацыі гаспадарскага двара з-за надання дваранскага тытулу шматлікім выгнанцам з захопленых Масквой зямель, а таксама эмігрантам.

З тых асоб, становішча якіх было разгледжана вышэй, дваранамі не з'яўляліся: апошні разанскі князь, Мацвей Мікіціціч, Сямён Бельскі і Іван Лядскі. Эміграцыя апошніх двух мела вялікае значэнне для віленскага двара, асабліва напярэдадні вайны з Масквой 1534–1537 гг. Гэтыя асобы займалі даволі высокае становішча ў непрыяцельскай дзяржаве, а таму з'яўляліся крыніцай каштоўнай інфармацыі аб маскоўскіх справах. У святле супрацьстаяння Вільні і Масквы іх ад'езд меў для Жыгімонта Старога і ідэалагічнае значэнне. Акрамя таго, як ужо адзначалася, Лядскі быў высокаадукаваным чалавекам і валодаў глыбокімі ведамі ў картаграфіі. У дакументах канцылярыі ён называецца «панам». Відаць, Іван Васільевіч папросту не меў патрэбы пайсці па такім шляху адаптацыі ў новай краіне, як уваходжанне ў кола гаспадарскіх дваран. Што тычыцца Бельскага, то гэты князь увогуле меў вялікія амбіцыі, прэтэндаваў на валоданне не толькі вотчынай свайго бацькі, але таксама і Разанскім княствам. Падставай для такіх прэтэнзій было тое, што яго маці, Ганна Васільеўна, паходзіла з роду разанскіх князёў. Для рэалізацыі сваіх планаў князь Сямён спрабаваў выкарыстаць ваенную сілу Крымскага ханства, нацкаваўшы татар на Маскву, але мэты

не дасягнуў. І тут паўстае рытарычнае пытанне: а ці звязваў увогуле Бельскі сваю будучыню з Вялікім Княствам Літоўскім, дзе ён правёў агулам не больш за 7 год?

Становішча Мацвея Мікіцініча пры віленскім двары і так было дастаткова трывалым – ён служыў вялікай княгіні Алене Іванаўне і быў шчодра адораны і ёй, і яе мужам. Таму імкненне атрымаць тытул двараніна не мела практычнага сэнсу. А для Івана Іванавіча Разанскага гэта стала б відавочным прыніжэннем. У дакументах Метрыкі ён фігуруе як вялікі князь. Былы ўладар калісьці магутнай дзяржавы, які марыў аб аднаўленні незалежнасці ад Масквы, а цяпер пазбаўлены сваёй вотчыны і надзей на яе вяртанне, наўрад ці імкнуўся да адаптацыі ў соцыуме Вялікага Княства Літоўскага. Пасіўнасць Івана Іванавіча ўскосна пацвярджаецца беднасцю звестак аб ім на старонках Метрыкі. Усё, што ён змог прыдбаць за амаль 12 год, – доўг у 118 коп грошаў. Карціну апошніх гадоў разанскага князя дапаўняе паведамленне купца Кузьмы Патрыкеева, які наведаў яго ў выгнанні. Патрыкееў кажа, што Іван Іванавіч «… ныне доспелся, толст… лицем полон… пъет добре и просто, как не государской обычей» [79, с. 16].

Зусім іншую жыццёвую стратэгію дэманструе Іван Цімафеевіч Юрлоў. Як відаць з аналізу яго становішча, гэты эмігрант здолеў ператварыцца ў даволі заможнага землеўладальніка Вялікага Княства Літоўскага. Сакрэт поспеху палягае ў вернай службе гаспадару, дзякуючы якой маскоўскі выхадзец карыстаўся прыхільнасцю Жыгімонта Старога і падтрымкай радных паноў. Імаверна, не апошнюю ролю тут адыгралі асабістыя якасці «пана» Юрлова, яго імкненне самому «зрабіць» свой лёс, не спадзеючыся выключна на міласць вялікага князя. У адрозненне ад асоб велічыні Івана Лядскага, ён не мог разлічваць на свой аўтарытэт, досвед ваеначальніка і г.д. Прыклад гэтага эмігранта і дэманструе нам тыя магчымасці, якія адкрывала Вялікае Княства Літоўскае перад маскоўкімі выхадцамі. Грамадства, дзе здаровы прагматызм нярэдка ўзвышаўся над артыкуламі прывілеяў і Статутаў, давала таленавітым асобам дарогу да поспеху. Як тут не прыгадаць яўрэя Аўрама Езафовіча на пасадзе земскага падскарбія, ці праваслаўнага князя Канстанціна Астрожскага, які быў гетманам найвышэйшым?

Лагічным працягам інкарпарацыі эмігрантаў у шляхецкі стан Вялікага Княства Літоўскага павінен быў стаць іх удзел у палітычным жыцці краіны. Але адсутнасць крыніц, якія б утрымлівалі спісы шляхты, што прысутнічала на соймах першай паловы XVI ст., не дазваляе зрабіць абгрунтаваных высноў.

Аднак у нашым распараджэнні ёсць ліст Жыгімонта Старога да Сямёна Бельскага ад 5 ліпеня 1542 г., у якім гаспадар загадваў яму з'явіцца на сойм у Вільню «до панов рад наших» [80, с. 391]. Гэта вялікакняскае пасланне дазволіла І. Маліноўскаму зрабіць неверагоднае дапушчэнне аб тым, што Бельскі ўваходзіў у гаспадарскую Раду [81, с. 17–18]. Калі б гэта было сапраўды так, то Сямён Фёдаравіч павінен быў атрымаць не загад, а запрашэнне. Хутчэй за ўсё, Бельскі, як і Лядскі, дапускаўся да нарад кіруючых колаў Вялікага Княства Літоўскага ў якасці інфарматара і кансультанта. Узгадаем, што ён правёў некалькі год у Крымскім ханстве і таму мог спатрэбіцца ў якасці дарадцы па татарскіх справах.

Аб паспяховай інкарпарацыі эмігрантаў у шляхецкае саслоўе сведчыць тасксама іх публічная дзейнасць. Асобы, якія нядаўна прыбылі ў Вялікае Княства Літоўскае, праявілі сябе ў адной з важнейшых сфер жыцця краіны – судовай. Тое, што Шуйскі і Лядскі не з'яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі разбіральніцтваў, не змяншае значэння іх прысутнасці на судах. Яны выступалі відавочцамі працэсаў і замацоўвалі выніковыя дакументы сваімі пячаткамі. Ніякіх пратэстаў з боку мясцовай шляхты супраць выканання эмігрантамі гэтай ролі не зафіксавана. Тое, што Сямён Бельскі паходзіў з Маскоўскай дзяржавы, не перашкодзіла яму выступіць сведкам Міхаіла Семічава і прадвызначыць вырашэнне справы на яго карысць [46, с. 98].

Мы наблізіліся да адказу на апошняе пытанне: як успрымалі чужынцаў-масквічоў у мясцовым шляхецкім асяроддзі? Інфармацыя багатага дакументальнага матэрыялу пераконвае ў тым, што ніякай варожасці да выхадцаў з маскоўскай дзяржавы шляхта не праяўляла. Пра іх іншаземнае паходжанне не згадваецца нават тады, калі справа даходзіць да канфліктаў. Больш за тое, пры судовых разбіральніцтвах па маёмасных спрэчках паміж эмігрантамі і мясцовым набілітэтам не зафіксавана спасылак на прававыя нормы, паводле якіх іншаземцам было забаронена мець уладанні і займаць урады. У вачах мясцовай шляхты рэалізацыя эмігрантамі паўнаты правоў мясцовага прывілеяванага саслоўя была легітымнай. Гэта кантрастуе з тым, наколькі хваравіта яна рэагавала на падобныя памкненні з боку палякаў, што адбылося, напрыклад, у 1538 г. [78, слп. 15–16].

Як відаць з праведзенага аналізу становішча маскоўскай знаці, Мікіцініч, Барацінскі, Юрлоў і Шуйскі парадніліся з мясцовымі фаміліямі, што палегчыла іх інтэграцыю ў шляхецкі стан. Гэта таксама сведчыць аб прыняцці шляхтай масквічоў як роўных сабе.

Трэба адзначыць, што ў другой палове XVI ст., пад уплывам пад-

зей Інфлянцкай вайны, а таксама твораў Марціна Кромера, Мацея Стрыйкоўскага, Аляксандра Гваньіні, якія канструявалі адмоўны вобраз маскавіта-варвара, адбываюцца адпаведныя змены ў калектыўнай свядомасці. У гэты перыяд фіксуюцца скаргі маскоўскіх эмігрантаў на абразы з этнічным падтэкстам з боку мясцовай шляхты, выпадкі адмовы служыць пад камандаваннем ротмістра-маскавіта і да т.п., а слова «москвитин» набыло адмоўную канатацыю [10, с. 23, 38].

Лёсы маскоўскіх эмігрантаў у Вялікім Княстве Літоўскім у першай палове XVI ст. паказваюць, што іх інтэграцыя ў мясцовы соцыум праходзіла даволі лёгка. Гэтаму працэсу не перашкаджала *de jure* забарона іншаземцам набываць землі ды ўрады, бо яна не дзейнічала *de facto*. Маскоўскія выхадцы карысталіся правамі шляхецкага саслоўя, уступалі ў сваяцкія сувязі з мясцовым набілітэтам. Тая сацыяльная вышыня, на якую маглі ўзняцца эмігранты ў Вялікім Княстве Літоўскім, залежыла не столькі ад аб'ектыўных, колькі ад суб'ектыўных фактараў. Верная служба вялікім князям, здольнасць і імкненне пашыраць свае ўладанні і адстойваць свае ўладальніцкія правы, праявіць сябе руплівым гаспадаром уласных маёнткаў – вось тое, што магло дапамагчы маскоўскаму выхадцу дасягнуць годнага становішча пры не вельмі высокіх «стартавых» пазіцыях. Самым распаўсюджаным спосабам гэтыя пазіцыі ўмацаваць з'яўлялася набыццё пасады двараніна. Інтэграцыі маскоўскай знаці ў прывілеяванае саслоўе Вялікага Княства Літоўскага садзейнічала і тое, што мясцовая шляхта прымала масквічоў як роўных сабе, не праяўляючы да чужынцаў ніякай варожасці.

Спіс літаратуры

1. Казакоў, А.У. Эміграцыя знаці з рускіх княстваў у Вялікае Княства Літоўскае (40-я гг. XV – 30-я гг. XVI ст.): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.03 / А.У. Казакоў; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2011. – 21 с.

2. Wolff, J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1895. – XXV, 698 s.

3. Herbarz Polski: [w 14 t.] / ułożył i wyd. A. Boniecki. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1899 – 1911.

4. Backus, O.P. Treason as a Concept and Defections from Moscow to Lithuania in the Sixteenth Century / O.P. Backus // Forschungen zur Osteuropäischen Geschichte. – 1970. – Bd. 15. – P. 119–144.

5. Зайцев, И.В. «Позабыв бога, и наше жалованье, и свою душу…» (Приключения князя Семена Федоровича Бельского) / И.В. Зайцев // У источника = Ad fontem: сб. ст. в честь С.М. Каштанова / Рос. Акад. наук, Ин-т всеобщей истории; [сост.: Л.В. Столярова и др.]. – М., 2005. – С. 298–317.

6. Кром, М.М. Судьба авантюриста: князь Семен Федорович Бельский / М.М. Кром // Очерки феодальной России: сб. науч. ст.; под ред. С.Н. Кистерева. – М., 2000. – Вып. 4. – С. 98–115.

7. Grala, H. «Ex Moschouia ortum habent». Uwagi o sfragistyce i heraldyce uchodców moskiewskich / H. Grala // Rocznik Polskiego Towarzystwa Heraldycznego. Nowej Serii. – Warszawa, 1999. – T. IV (XV). – S. 101–130.

8. Сідарэнка, Б. Эміграцыя з Маскоўскай дзяржавы ў Вялікае княства Літоўскае ў канцы XV – першай трэці XVI ст. / Б. Сідарэнка // Беларус. гіст. часоп. – 2006. – № 8. – С. 21–29.

9. Полное собрание русских летописей. – М.: Наука, 1965. – Т. 13: Летописный сборник, именуемый патриаршею или Никоновскою летописью. – V, 532 с.

10. Ерусалимский, К.Ю. Московиты в Польско-Литовском государстве во второй половине XVI – начале XVII в.: автореф. дис. … д-ра. ист. наук: 24.00.01 / К.Ю. Ерусалимский; Рос. гос. гуманит. ун-т. – Москва, 2011. – 49 с.

11. Казакоў, А.У. Князь Мацвей Мікіцініч: паходжанне і эміграцыя / А.У. Казакоў // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы. – Вып. 1. – Минск: РИВШ, 2008.– С. 77–83.

12. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа: [в 14 т.]. – Вильна: Тип. О. Блюмовича, 1867–1904. – Т. 10. – 1874. – VIII, 391 с.

13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 23. Прывілеі, пажалаванні і судовыя рашэнні. Перапісана. 1538–1540 гг.

14. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 1 (1380–1584) / Parengė A. Baliulis, R. Firkovičius. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos inst., 1998. – 207 p.

15. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 6 (1494–1506) / Parengė A. Baliulis. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2007. – 516 p.

16. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 10 (1440–1523) / Parengė E. Banionis, A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų liedybos institutes, 1997. – 178 p.

17. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 11 (1518–1523) / Parengė A. Dubonis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų liedybos institutes, 1997. – 228 p.

18. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 25 (1387–1546) / Parengė D. Antanavičius, A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų liedybos institutes, 1998. – 460 p.

19. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 224 (1522–1530) / I. Valikonitė, S. Lazutka ir kt. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 1997. – 664 p.

20. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 523. Кн. Публічных спраў 1 / Падрыхт. А.І. Груша, М.Ф. Спірыдонаў, М.А. Вайтовіч; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 444 с.

21. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 9 (1511–1518) / K. Pietkiewicz. – Vilnius: Žara, 2002. – 615 p.

22. Литовская Метрика. – Отд. 1. – СПб.: [б. и.], 1903. – Ч. 2 : Книги судных дел, т. 1 / ред. П.А. Гильтебрандт. – VII, 290 с., 1566 стб.

23. НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 237. Кніга віленскага замкавага суда спраўцы ваяводства Івана Гарнастая. Перапісваў Даньель Дзелешкан. 1549–1551 гг.

24. Сборник Русского Исторического Общества. – СПб.: Тип. Импер. Академии Наук, 1882. – Т. 35: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством. 1487–1533 / Под ред. Г.Ф. Карпова. – VI, 869, XII с.

25. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 8 (1499–1514) / Parengė A. Baliulis ir kt. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų liedybos institutes, 1994. – 649 p.

26. НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 18. Зборнік дакументаў, што маюць адносіны да ўладанняў каралевы Боны. 1532–1534 гг.

27. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 12 (1522–1529) / Parengė D. Antanavičius, A. Baliulis. – Vilnius: Žara, 2001. – 854 p.

28. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 230 (1542) / I. Valikonitė, S. Vaskantaitė. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 2001. – 160 p.

29. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 51 (1566–1574) / Parengė A. Baliulis, A. Ragauskas, R. Ragauskiene. – Vilnius: Žara, 2000. – 486 p.

30. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кн. 30: Кніга запісаў (1480–1546) / падрыхт. : В.С. Мянжынскі. – Мінск: Бел. навука, 2008. – 386 с.

31. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 14 (1524–1529) / Parengė L. Karalius, D. Antanavičius. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2008. – 645, [2] p.

32. Спірыдонаў, М. Усталяванне фальварачна-паншчыннай сістэмы ў Беларусі / М. Спірыдонаў // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. – 2008. – С. 259–328.

33. Зимин, А.А. Формирование боярской аристократии в России во второй половине XV – первой трети XVI вв. / А.А. Зимин. – М.: Наука, 1988. – 350 с.

34. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 523 (1528) / Parengė A. Baliulis, A. Dubonis. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2006. – 278 p.

35. Archiwum Główny Akt Dawnych. – Zbiór dokumentów pergaminowych. – Sygn. 5897. Zygmunt potwierdza dokument, w którym Iwan Jurlow zapisuje małżonce Hanne 1000 kop gr. na dobrach swoich na Żmudźi. 1538.

36. Груша, А. «Просите и дано будет вам (Мф. 7:7)». Ещё раз к вопросу о «заочных» листах канцелярии Великого княжества Литовского / А. Груша // Соціум: альм. соц. історії / Ін-т історії України НАН України. – Київ, 2008. – Вип. 8 / голов. ред. В. Смолій. – С. 255–279.

37. Иловайский, Д.И. История Рязанского княжества / Д.И. Иловайский. – М.: Унив. тип., 1858. – 329 с.

38. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 227 (1533–1535) / I. Valikonitė, S. Lazutka ir kt. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 1999. – 400 p.

39. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 225 (1528–1547) / I. Valikonitė, S. Lazutka ir kt. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 1994. – 488 p.

40. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 15 (1528–1538) : Užrašymų knyga 15 / Parengė A. Dubonis. – Vilnius: Žara, 2002. – 446 p.

41. Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVI вв. – Т. VI : Радзивилловские акты из собоания Российской национальной библиотеки. Первая половина XVI в. / Сост. М.М. Кром; редкол.: И. Граля [и др.] – М.; Варшава : Древлехранилище, 2002. – 267 с.

42. Kronika Polska, Litewska, Zmodzka i Wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego. Wydanie nowe, będące dokładnem powtorzeniem wydania pierwotnego krolewieckiego z roku 1582. – Warszawa: Nakł. G.L. Glucksberga, 1846. – T. 2. – 563 s.

43. Научно-исторический архив Санкт-Петербургского института истории Российской академии наук (далей – НИА СПбИИ РАН). – Ф. 124. – Д. 28. Челобитная князя Семена Федоровича Бельского королю польскому Сигизмунду о выдаче ему беглого служебника его Собестьяна.

44. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 29. Перечень вещей, похищенных у князя Семена Федоровича Бельского служебником его Собестьяном.

45. Кром, М.М. Стародубская война (1534–1537). Из истории руско-литовских отношений / М.М. Кром. – М.: Рубежи XXI, 2008. – 140 с.

46. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 19 (1535–1537) / Parengė D. Vilimas. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2009. – 362 p.

47. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 33. 1536 г., июня 17. Лист Виленского воеводы Олбрахта Мартиновича Коштолта дворянину Василию Жабе.

48. Груша, А.І. Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гг. XV – першай паловы XVI ст. / А.І. Груша. – Мінск: Бел. навука , 2006. – 212 с.

49. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 67. Октября 5. Лист Троцкого воеводы Олбрахта Мартиновича Коштолта князю Семену Федоровичу Бельскому.

50. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 81. Октября 1. Лист Троцкого воеводы Станислава Коштолта князю Семену Федоровичу Бельскому.

51. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 82. 1542 г., октября 11. Лист Виленского епископа Павла Гольшанского князю Семену Федоровичу Бельскому.

52. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 83. После 11 октября. Письмо князя Семена Федоровича Бельского Троцкому воеводе Станиславу Олбрахтовичу Коштолту.

53. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 86. Ноября 8. Письмо князя Семена Федоровича Бельского Виленскому воеводе Яну Юрьевичу Глебовичу.

54. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 88. Письмо князя Семена Федоровича Бельского епископу Виленскому Павлу Гольшанскому.

55. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 78. Мая 7. Лист «вызнанный» Степана Останьевича Крукова.

56. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 84. Октября 14. Лист Виленского епископа Павла Гольшанского князю Семену Федоровичу Бельскому.

57. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 70. Письмо князя Семена Федоровича Бельского воеводе (?).

58. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 72. Челобитная повольного Тимофея Никифорова князю Семену Федоровичу Бельскому.

59. Герберштейн, С. Записки о Московии / С. Герберштейн; вступ. статья А.Л. Хорошкевич. – М.: МГУ, 1988. – 429 с.

60. НИА СПбИИ РАН. – Ф. 124. – Д. 89. 1544 г., января 14. Лист епископа Луцкого и Берестейского Юрия Фальчевского об освобождении из тюрьмы людей князя Семена Федоровича Бельского, задержанных на торгу в Ковне.

61. НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 233. Кніга віленскага замкавага суда ваяводы Яна Юр'евіча Глябовіча. Перапісана. 1546–1548 гг.

62. Рыбаков, Б.А. Русские карты Московии XV – начала XVI века / Б.А. Рыбаков. – М.: Наука, 1974. – 111 с.

63. НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 21. «Тые справы початы у книги вписаваны быти приехавши королю его милости и великому князю Жикгимонту до Кракова з ВКЛ лета 1536, мца ноября 22 дня, инд. 10 за пана Михайла, писара». Перапісана. 1536–1537 гг.

64. Herbarz Polski: [w 14 t.] / ułożył i wyd. A. Boniecki. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1899 – 1911. – T. 13. – 1909. – 400, IV s.

65. Литовская Метрика. – Отд. 1 – 2. – СПб.: [б. и.], 1914. – Ч. 3 : Книга Публичных дел, т. 1. / ред. И.И. Лаппо. – IV, 74, 895 с.

66. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: spisy: [w 10 t.] / Inst. Historii Pol. Akad. Nauk. – Warszawa: Wydaw. DiG, 2003–2004. – T. 1 : Województwo Wileńskie XIV–XVIII wiek / pod red. A. Rachuby; oprac.: H. Lulewicz [i inne]. – 2004. – 764 s.

67. Любавский, М.К. Литовско-русский сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М.К. Любавский. – М.: Имп. о-во истории и древностей рос. при Моск. ун-те, 1900. – 850, 232, LXXII с.

68. AGAD. – Archiwum Radziwillów. – Dz. X. – Sygn. 59. Listy Jerzego Radziwiłła do Jana Szymkowicza. 1552–1554.

69. Paprocki, B. Herby rycerstwa polskiego / B. Paprocki [zebrane i wydane r. p. 1584; wyd. K. J. Turowskiego]. – Kraków: Wydaw. Bibl. Pol., 1858. – 964, CLXII, 13.

70. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 43: Кніга запісаў (1523–1560): копія канца XVI ст. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі; падрыхт. В.С. Мянжынскі. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 167 с.

71. Родословная книга князей и дворян российских и выезжих: [в 2 ч.] – М.: Унив. тип., 1787. – Ч. 1. – [40], 352 с.

72. Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М.В. Клочко: 1533–1540. Литовская метрика. Книга судных дел № 9 (Кн. № 228) / Российская академия наук, Институт славяноведения и др.; отв. ред. А.Л. Хорошкевич, Г.Я. Голенченко. – М.: Наука, 2008. – 524, [1] с.

73. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кн. 28: Кніга запісаў (1522–1552) / падрыхт.: В. Мянжынскі, У.Свяжынскі. – Менск: Atheneum, 2000. – 312 с.

74. Любавский, М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно: с прил. текста хартий, выд. великому княжеству Лит. и его обл. / М.К. Любавский. – 2-е Изд-во – М.: Моск. худож. печатня, 1915. – 409 с.

75. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах / АН БССР, Ін-т гісторыі. – Т. 1: IX–XVIII ст. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1936. – XVI, 678 с.

76. Первый Литовский Статут (1529 г.). Primasis Lietuvos Statutas (1529 m.) / Под ред. С. Лазутки. – Vilnius: Margi Rastai, 2004. – 522 p.

77. Dąbkowski, P. Stanowisko cudzoziemców w prawie litewskim w drugiej połowie XV i w XVI wieku (1447–1588) / P. Dąbkowski. – Lwów: Nakładem towarzystwa dla popierania nauki polskiej, 1912. – 87 s.

78. Литовская Метрика. – Отд. 1 – 2. – СПб.: [б. и.], 1914. – Ч. 3: Книга Публичных дел, т. 1. / ред. И.И. Лаппо. – IV, 74, 895 с.

79. Сметанина, С.И. Новый документ о пребывании рязанского князя Ивана Ивановича в Литве // Русский дипломатарий: [сборник] / Федер. арх. служба России, Рос. гос. арх. древ. актов. – М., 2000. – Вып 6. / [отв. ред. А.В. Антонов]. – С. 14–16.

80. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией : в 5 т. – СПб.: Тип. II отд-ния собствен. Е.И.В. Канцелярии, 1846–1853. – Т. 2 : 1506–1544. – 1848. – III, 405, 15, 14 с.

81. Малиновский, И.А. Рада Великого княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России: в 2 ч. / И.А. Малиновский. – Томск: Паровая типо-лит. П.И. Макушина, 1903–1912. – Ч. 2, вып. 1: Рада Великого княжества Литовского. – 1904. – [4], IV, 133 с.

Стрэнкоўскі С.П.

ВІЛЬКЕРЫ ГАРАДСКІХ АБШЧЫН ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XVI ст.

Адным з атрыбутаў гарадскога самакіравання з'яўляюцца лакальныя нарматыўныя прававыя акты, якія датычацца рэгулявання асобных бакоў жыццядзейнасці гарадской абшчыны. Агульная цікавасць да гарадскога самакіравання, выкліканая станаўленнем і развіццём беларускай дзяржаўнасці, не можа пакінуць па-за ўвагай даследчыкаў і гэты яго бок. Тым больш, што ў асноўным ён вельмі слаба закранаўся ў гістарычнай літаратуры. Уласна кажучы, пастановы гарадскіх абшчын Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), якія ўсталёўвалі пэўны парадак вырашэння тых ці іншых праблем горада, закраналіся толькі ў працах Ю. Крашэўскага (віленскія вількеры) [1], З. Капыскага (аршанскі вількер) [2], З. Кяўпы (віленскія вількеры 1552 і 1620 гг.) [3]. У сувязі з гэтым пры напісанні артыкула намі ставілася задача прааналізаваць змест пастаноў гарадскіх абшчын ВКЛ, датаваных XVI стагоддзем для ўстанаўлення напрамкаў жыццядзейнасці гарадскіх абшчын, якія рэгуляваліся гэтымі пастановамі, і спосабаў такога рэгулявання. Для вырашэння задачы намі выкарыстоўваліся агульнанавуковыя метады: класіфікацыя і тыпалагізацыя, лагічны метад, аналіз, сінтэз і абагульненне; спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны. Крыніцамі паслужылі ў асноўным апублікаваныя ў дарэвалюцыйных зборніках дакументаў і змешчаныя ў кнігах Метрыкі ВКЛ гарадскія вількеры. На жаль іх не так шмат і датычацца яны па большай частцы Магілёва, бо менавіта магілёўскія актавыя кнігі ў найбольшай ступені захаваліся да нашых дзён.

Трэба адзначыць, што зборнікі магдэбургскага права прадугледжвалі, што адной з крыніц гарадскога права з'яўляюцца пастановы гарадскіх абшчын. Так першы артыкул *Jus municipale* гаворыць аб тым, што «месцкае права ёсць тое, якога людзі аднаго горада, пастанавіўшы паміж сабою, прытрымліваюцца, часткова з ухвал і вількераў, часткова з старасвецкага звычаю, як дарэчы права ад Карла Цэзара пастаноўленае, якое мяшчане Кёльна над Рэйнам, Магдэбурга і іншыя паводле сваіх вількераў і ўхвал маюць і ужываюць» [4, с. 2]. Пры гэтым глоса да першага артыкула дае наступнае вызначэнне вількера. Вількер – гэта «калі гміна паспалітая на пытанне старэйшых сваіх нешта пастановіць» [4, с. 6].

Польскі юрыст і перакладчык магдэбургскага права на польскую мову Б. Граіцкі дае тлумачэнне, што вількер або плебісцыт – гэта прынятая горадам пастанова, якая разглядаецца ў ім як крыніца права. Пры працяглым карыстанні ім або пацвярджэнні яго вярхоўнай уладай яму павінны падлягаць усе, хто знаходзіцца пад гарадской юрысдыкцыяй [5, а. 52]. Другі польскі юрыст-практык XVI стагоддзя і таксама выдавец кніг магдэбургскага права П. Шчэрбіч гаворыць аб тым, што прымаюцца вількеры на «зграмаджэнні паспольства з радай старэйшых», і ўсе павінны іх прытрымлівацца. Калі ратушны звон заве на такія сходы, то кожны павінен ісці на іх пад пагрозай штрафа [6, с.342]. Артыкул 44 *Jus municipale* адрознівае ухвалы месцкія і пастановы радзецкія [4, с. 125]. П. Шчэрбіч дадае такі від гарадскіх ухвал, як гандлёвыя [6, с. 39], якія разглядаюць парадак куплі-продажу [4, с. 63].

Як бачым ў перакладах магдэбургскага права Б. Граіцкага і П. Шчэрбіча, вількеры з’яўляліся важным элементам гарадскога права. І нездарма, бо магдэбургскае права не магло ўлічыць усе мясцовыя асаблівасці і не разглядала шэраг важных для гарадоў пытанняў.

Глосы да артыкулаў 43 і 44 *«Вейхбільда»* вызначалі, што прыняцце вількераў павінна адбывацца на штогадовым сходзе грамады пад час выбараў гарадскіх уладаў. Яны павінны былі прымацца для карысці горада, быць справядлівымі, зразумелымі ўсім, карыснымі для ўсіх гараджан. Тым вількерам, якія пратрывалі ў горадзе больш за 1 год і 6 нядзель, або ў адпаведнасці з якімі не менш чым двойчы суд прымаў свае рашэнні, або калі яны двойчы падвяргаліся сумненню, але былі прызнаны слушнымі, або былі зацверджаны вышэйшай уладай, ніхто не мог супярэчыць [4, с. 128].

Вількер не мог быць «супраць права пісанага пастаноўленым» [4, с. 49], а мог прымацца толькі ў выпадку прабела ў пісаным праве.

Сучасны расійскі знаўца нямецкага гарадскога права А.Л. Рагачэўскі адзначае, што вількеры не павінны былі супярэчыць пісанаму праву, праву бургграфа ці мясцовага феадала без іх згоды, прадугледжваць санкцыі, звернутыя на асобу парушальніка, рэгуляваць адносіны, якія падлягалі кананічнаму праву. Яны мелі дагаварное паходжанне, замацоўваліся прысягай урада горада і мяшчан, унутры гарадоў мелі большую моц, чым агульнараспаўсюджаныя звычаі, улічваліся судамі пры вынясенні рашэнняў. Вількеры старэйшых гарадоў маглі запазычваць іншыя гарады [7, с. 85–88]. Ён жа адзначае, што першапачаткова вількеры прымаліся на абшчынных сходах – бурдзінгах, а затым гарадской радай і зацвярджаліся бюргерамі. На падставе аналіза *Магдэбург-*

скага Вейхбільда, а таксама «павучанняў» магдэбургскіх шэфенаў для гарадоў Кульма і Швейдэніца, А.Л. Рагачэўскі адзначаў, што гарадскія саветы прымалі вількеры для «агульнай карысці» і накладвалі пакаранні за іх парушэнне [8].

Даследчык львоўскага самакіравання Д. Зубжыцкі дае наступнае размежаванне гарадскіх нараматыўных актаў: дэкрэты арганічныя ці агульныя ўхвалы, якія прымала рада з бурмістрамі, зваліся *senates consultum*; ухвалы, якія рада з бурмістрамі і іншыя станы і паспольства пастанавілі разам – плебісцытамі або вількерамі; ухвалы, прынятыя радай з лаўнікамі і «сарака мужамі» – лаўдумамі [9, с. 21].

Глоса артыкула 12 *Jus municipale* гаворыць, што «у кожнай зямлі горад старэйшы і праднейшы галавою павінен быць правоў іншых гарадоў у гэтай дзяржаве» [4, с. 44]. Нездарма ў ВКЛ такой павагай карысталіся вількеры Вільні.

Найбольш змястоўным з пункту гледжання рэгулявання пытанняў гарадскога самакіравання з'уляецца віленскі вількер, прыняты магістратам і мяшчанамі і зацверджаны Жыгімонтам Старым 9 верасня 1536 года. Ён ўпершыню ў ВКЛ дакладна разглядае пытанні парадку выбараў і дзейнасці магістрата, фінансавых і кантрольных органаў горада, аплаты працы службоўцаў[10, с. 51–60].

Трэба адзначыць, што ні само магдэбургскае права, ні вялікакняжацкія прывілеі не вызначалі дакладны парадак прызначэння, а часта і колькасць гарадскіх службоўцаў. Так, згодна магдэбургскаму праву ў судзе павінна быць адзінаццаць лаўнікаў і войт: адзінаццаць лаўнікаў увасабляюць адзінаццаць апосталаў (за выключэннем Іуды), а войт – самога Збавіцеля. Пры гэтым у самім Магдэбургу суд меў моц пры наяўнасці 6–7 лаўнікаў. У іншых нямецкіх гарадах, якія карысталіся магдэбургскім правам, агульная лічба лаўнікаў была 6, а для правамоцнасці суда хапала наяўнасці 4 ці найменей 3 [11, а. 14–15]. З прывілеяў гарадам ВКЛ на магдэбургскае права канца XIV – першай паловы XVI стагоддзя бадай толькі граматы Драгічыну, Полацку, Мінску, Навагрудку прыводзілі колькасць бурмістраў і радцаў (у Навагрудку таксама лаўнікаў). Парадак жа прызначэння ці выбараў гарадскіх уладаў быў даволі размытым [12, с. 48–59].

У граматах другой паловы XVI стагоддзя, пачынаючы з прывілея Крынкам, вызначалася, што «iedno przed woytem tego miasta teraz y napotem będącego, ktory od nas zawsze wedle potrzeby podawan byc ma, y przed Burmistrzem s posrodku siebie wedle obyczaiow inszych WoXaLitt miast obranemi y postanowionemi prawem Maydemburskim a wedle

postępku y zachowania tego prawa odpowiadac y sprawowac sie maią» ці «одно перед войтом того места теперешним и напотом будучими войтами, которые од нас завжды водле потребы подаваны быти мают, и перед бурмистром, с посродку себе водле обычаю нашых мест великого князства литовского обраными и поставленными, правом майдебурским водле поступку и захованя того ж права отповедати и справовати се мают» (*цытуецца па прывілею Крынкам і Новаму Двару Гродзенскага павета*). Парадак жа прызначэння бурмістраў адлюстроўваўся так: «na ktory vrząd burmistrowski w tem miescie czlowiek pobozny y w prawie Maydemburskiem biegly a w tem ze miescie dobrze osiadly ze czterech osob pospoliteO czlowieka wybranych a przez tych ze mieszczan dzierzawcy naszemu praesentowanych y okazanych a przez tegoz dzierzawce naszeO teraz y napotem będąceO ieden z wierzchnosci naszey potwierdzony y postanowiony byc ma» ці «на которые врады бурмистровские в том месте чоловек побожный и в праве майдебурском беглый а в том месте добре оселый с тых чотырох особ от посполитого чоловека выбранный и через тых мещан объявленых и оказаных через тогож державцу нашого тепер и напотом будучого з верхности нашое один потвержон и постановлен быти мает» [13, а. 53адв–55адв; 14, а. 408адв–412]. Пра колькасьць і парадак вызначэння райцаў і лаўнікаў наогул ні слова. Гэта выклікала да жыцця пэўныя мясцовыя звычаі, якімі, з аднаго боку, кіравалася абшчына і якія, з другога боку, выклікалі розныя злоўжыванні.

Менавіта таму прыняццю першага віленскага вількера папярэднічала працяглая барацьба паміж магістратам і грамадою. Таму ён складаецца з дзвюх частак: спрэчных пунктаў, па якіх канчатковае рашэнне прыняў вялікі князь, і пунктаў, па якіх грамада і магістрат дасягнулі згоды самі. У першай частцы вялікі князь пастанавіў, што колькасць бурмістраў павінна складаць дванаццаць, а радцаў дваццаць чатыры (прычым палова каталікаў, а палова праваслаўных). «Седзячымі» на кожны год былі два бурмістры і чатыры радцы (ізноў жа палова каталікаў, палова праваслаўных). Такім чынам, пры ратацыі ўтваралася шэсць змен бурмістраў і радцаў. За сваю працу рочныя бурмістры павінны былі атрымоўваць 20 коп грошаў на год, радцы – 10 коп.

Пры магістраце ўтвараўся фінансавы орган. Гарадскімі маёмасцямі, даходамі і расходамі павінны былі загадваць шафары. Прычым два з іх павінны быць з рады, а двух рада выбірала з дзесяці «добрых і аселых» мужоў, выбраных грамадою. Дадзеная норма была відазмяненнем вялікакняжацкага вырака ад 24 чэрвеня 1524 года, якім усталёвалася, што двух люнараў для распараджэння па ўзгадненні з бурмістрамі і

радай гарадскімі грашыма выбіраюць бурмістры і радцы, а двух – паспольства [15, с. 170–171]. Ад скрыні з гарадскім скарбам і прывілеямі павінна быць чатыры замкі і адпаведна чатыры ключы: па два ў рочных бурмістраў. Казна магла расходавацца толькі шафарамі, «за ведамасцю ўсіх», на грамадскія патрэбы і з ўнясеннем рахункаў у гарадскія кнігі.

Наступны орган, які ўтвараўся згодна з пастановай, меў кантрольныя функцыі. Шафары кожны год павінны былі рабіць справаздачу перад двума прадстаўнікамі рады, прадстаўнікамі ад цахоў (па аднаму майстру ад цэха) і шасцю мужамі, якіх рада прызначала з выбраных грамадою васямнаццаці чалавек «з купцоў і таксама з іншых людзей». Прычым на справаздачы маглі прысутнічаць і ўсе жадаючыя радцы. Пасля слухання справаздачы прысутныя павінны былі прыносіць прысягу аб нераспаўсюджанні гарадскіх сакрэтаў.

Як сведчыць гісторыя, адным з самых праблемных пытанняў гарадскога самакіравання было захаванне актавых кніг і іншых дакументаў. Невыпадкова ў вількеры адзначалася, што ў ратушы трэба было вызначыць надзейнае месца для захавання гарадской казны і архіва, прычым прадпісвалася порах перанясці ў іншае месца.

Вызначаўся і парадак узаемадзеяння рады і лавы. Прадпісвалася, што рада і лава свае суды павінны ажыццяўляць у розных памяшканнях. Рада магла запрашаць лаўнікаў на свае паседжанні для абмеркавання некаторых спраў. Таксама лаўнікі павінны былі мець сваю пячатку.

Комплексны характар вількеру надаваў разгляд пытанняў гарадской маёмасці і даходаў. Адносна гарадскіх падаткаў з гандлёвых «клетак» вялікі князь устанавіў наступны парадак: гаспадары гэтых клетак асобнага падатка з іх на ратушу плаціць не павінны, толькі як з дамоў; калі ж прадклецце здавалася каму-небудзь у наём, то арандатар павінен быў з прадклецця выплочваць гарадскі падатак у памеры 15 грошаў у год. Мяшчанам дазвалялася пабудаваць кушнерскі дом, у якім павінны былі прадавацца ўсе футры. Плата з гэтага дому павінна была ісці ў гарадскую казну «на будаванне горада». Таксама мяшчане маглі пабудаваць крамы для шаўцоў, ганчароў, саленнікаў, гарбараў, рымараў і продажа іншых рамесных тавараў. Пры гарадской піўніцы, якая знаходзілася каля ратушы, дазвалялася пабудаваць гарадскую кухню.

У другой частцы галоўная ўвага ізноў жа надавалася парадку гарадскога кіравання. Яна пачыналася з таго, што рада і мяшчане павінны цвёрда трымацца магдэбургскага права, бараніць свае прывілеі і вольнасці. Акрамя таго, тое, што запісана ў магдэбургскім праве, «а чаго б пярвей у Віленскім месце не захавалася», тое рада і паспольства маглі

ўсталяваць па абаюднай згодзе. Такім чынам, афіцыйна замацоўвалася права абшчыны і рады на прыняцце іншых вількераў.

Пасля штогадовага выбрання бурмістраў ім і радзе павінны былі прысягнуць усе старэйшыя цахоў. Калі б з-за нерастаропнасці і нядбайства бурмістраў з радцамі і шафараў гораду была нанесена шкода, то яны павінны былі адказваць згодна з магдэбургскім правам. Рада павінна была збірацца на ратушы кожны чацвер. Для спазніўшыхся на пасяджэнне ўстанаўлівалася пакаранне паводле закона.

Уводзіліся пэўныя абмежаванні на заняцце службовых пасад. Забаранялася бацьку і сыну, а таксама родным братам адначасова выбірацца і засядаць у радзе ці лаве. Выключэнне рабілася толькі для тых, хто быў выбраны раней. На будучае дазвалялася аднаму быць у радзе, а другому – у лаве.

Прынцып першаснага значэння здольнасцей, а не паходжання знайшоў сваё адлюстраванне ў тым, што бурмістры павінны былі выбірацца з радцаў «не паводле месца, але паводле годнасці».

Жаданне ўпарадкаваць гарадскія выдаткі адчуваецца ў наступных пунктах. Пасланцы горада да гаспадара павінны былі займацца толькі справамі горада і па прыездзе рабіць справаздачу. Асабістымі справамі ім дазвалялася займацца, толькі ў выпадку адклада вялікім князем разгляду справы, або пасля заканчэння сваёй грамадскай місіі. Прычым у апошнім выпадку пасланнік павінен быў жыць за свае грошы. Парушыўшыя гэты парадак падвяргаліся пакаранню.

Асобныя артыкулы датычыліся судовых пытанняў. Мяшчане за правапарушэнні не павінны былі змяшчацца ў турму разам со злачынцамі, але асобна. Войт і рада не павінны былі мяшчан страшыць і абражаць, а павінны былі размаўляць пачціва. Пад час маравой пошасці ўрад павінен быў сачыць, каб людзі не паміралі без тэстаментаў. Судовы працэс павінен быў занатоўвацца поўнасцю ў гарадскія кнігі, з якіх пры неабходнасці трэба было выдаваць выпісы за справядлівую аплату пісару. У выпадку забароны і нанясення гэтым страт урад павінен быў іх вярнуць пацярпеламу. Мяшчанам дазвалялася мець пракуратара «тутэйшага або чужаземца». Справы пра нерухомасць павінны былі фіксавацца толькі гайным судом горада.

У другой частцы таксама не абмінуты ўвагай эканамічныя пытанні. Для тых, хто трымаў у сваіх руках цагельні, устанаўліваўся пяцігадовы тэрмін, на працягу якога яны павінны былі штогод даваць на будаўніцтва горада тысячу штук цэглы. Пастрыгальня сукна і шынкаванне гарэлкі і віна павінны былі знаходзіцца ў распараджэнні ратушы. Пры

неабходнасці можна было пабудоўваць гасцінны дом. Пацвярджаліся тыя кірмашы, якія існавалі раней.

Адлюстраванне ў вількеры знайшлі і пытанні добраўпарадкавання і абароны. Прадпісвалася пры неабходнасці будаваць і рамантаваць валы і равы. У выпадку пажара кожны мешчанін павінен быў прымаць удзел у яго тушэнні пад кіраўніцтвам рочных бурмістраў. Прадпісвалася збудаваць вадаправод. Тыя, хто ім не карыстаўся, усёроўна павінны былі плаціць на яго падтрыманне 8 грошаў на год. У горадзе павінны былі ўтрымліваццa вільтермайстры (пушкары). Горад абавязаны быў мець пушкі, марціры і іншую абарончую зброю. Ад кожнага мешчаніна таксама патрабавалася мець сваю зброю, як халодную, так і агнястрэльную, супрацьпажарнае начынне, чаму гарадскі ўрад павінен быў штогод рабіць агляд.

Змешаны характар носяць артыкулы, якія прысвечаны паўнамоцтвам і абавязкам рады. Яна павінна была сачыць за тым, каб мяснікі не гандлявалі мясам ад хворай жывёлы, каб перад устаноўленым часам пачатка гандлю ніхто нічым не гандляваў, сачыць за аднастайнасцю мер і ваг, трымаць у сваім веданні гарадскія вароты. Прычым вароты трэба было ўмацаваць жалезнымі цвікамі. Надалей прадпісвалася будаваць дамы толькі з дазволу ўрада. Пад гарадское права трэба было прымаць па хадатайніцтву паручыцеляў. Тыя, хто хацеў выйсці з гарадскога права, павінен быў прадаць сваю нерухомую маёмасць ратушнаму мешчаніну. У парушыўшага гэты парадак маёмасць канфіскоўвалася. Дамы, якія адышлі з-пад гарадской улады без прывілеяў вялікага князя, павінны былі вяртацца гораду. Прыбудаваныя да гарадскіх сцен дамы загадвалася знесці. Для пабудовы вала і рава трэба было адмераць ад гарадской сцяны сорак сажаняў. Радзе прадпісвалася за грамадскія грошы рабіць запас збожжа на выпадак голада, падаражання і г.д. Паны радныя і іншыя ўраднікі дзяржавы не павінны былі накіроўваць на пастой у дамы мяшчан слуг і паслоў. Гэта дазвалялася толькі пад час прыезда вялікага князя, а ў адносінах паслоў – пасля абвяшчэння бурмістраў і па іх накіраванню.

Выніковы артыкул, умацоўваючы палажэнні магдэбургскага права, забараняў радзе без удзелу грамады прымаць новыя гарадскія падаткі і вількеры.

Недасканаласць працэсуальных нормаў магдэбургскага права, неадпаведнасць іх мясцовым звычаям вымушалі вільнян прымаць пастановы судова-працэсуальнага характара. Прыкладам таго, што мясцовыя звычаі незаўсёды прызнаваліся дзяржавай можа быць судовая справа

віленскага мешчаніна Сенькі Андрэевіча з войтам і бурмістрамі Вільні па пытанні вызначэння герады, датаваная 25 чэрвеня 1524 года. У дэкрэце па названай справе вялікі князь адзначыў: «гды ж вы маете от нас право маитборское, которым ся маете справовати и радити, а на стародавныи обычаи жадное оправы и потверженья нашого в себе не маете» [15, с. 172–173]. Каб заканадаўча замацаваць звычаі і судовую практыку, якая склалася ў горадзе, у 1552 годзе віленскія мяшчане ўхвалілі вількер, які ўсталёўваў і размяркоўваў судовыя віны, вызначаў парадак некаторых працэсуальных дзеянняў, вызначаў, што пракуратары (*адвакаты*) павінны быць прысяглымі і пажыццёвымі, забараняў усіх падвойскіх запрашаць толькі аднаму боку судовай справы, а войту даваць сваіх слуг па лаўнікаў, бурмістраў і радцаў. Разглядаючы пытанні спадчыннага права, вількер забараняў вызначаць асобна хергвет і гяраду, уводзіў роўны падзел рухомай і нерухомай маёмасці паміж жанчынамі і мужчынамі, пры гэтым старэйшы сын, мог мець на дзесятую частку больш за астатніх [1, с. 213]. Віленскія вількеры ў далейшым былі пакладзены ў аснову дзейнасці самакіравання іншых гарадоў ВКЛ.

Адным з найбольш балючых пытанняў гарадскога самакіравання быў падзел паўнамоцтваў гарадскіх судоў. Класічнае магдэбургскае права судовую ўладу адносіла да кампетэнцыі бургграфа, фогта ці шультгейса (*войта ці солтыса*) і шэффенаў (*лаўнікаў*). Функцыі ж бурмістра і рады заключаліся ў тым, каб не менш чым раз у тыдзень збірацца ў ратушы для разгляду грамадскіх спраў, прымнажэння гарадскіх пажыткаў, прадухіляць грамадскія шкоды, прыміраць ці рассуджаць «паводле найвысшага розуму і бачання» спрэчкі, сачыць, каб не было дарагавізны харчавання, караць спекулянтаў, даглядаць за пекарамі, мяснікамі і карчмарамі, кантраляваць слушнасць мер і ваг, іх засведчанне гарадскім знакам (як мінімум раз на месяц), не дапушчаць у горадзе сутычак, ахоўваць справядлівасць у дачыненні да ўдоў і сірот, забараняць і выкараняць азартныя ігры (карты, косці і іншыя), забяспечваць выкананне пастаноў, прынятых у ратушы ў прысутнасці старэйшых мяшчан, караць за іх невыкананне штрафамі, штогод рабіць справаздачу аб гарадскіх даходах перад старэйшымі і гаднейшымі з гарадской грамады, пасля абрання прыносіць прысягу [11, а. 7–8].

Раннія прывілеі на магдэбургскае права гарадам ВКЛ, як правіла, судовую ўладу надавалі войту. З кнышынскага фундацыйнага прывілея пачынаецца размежаванне судоў: «перед войтом и лавниками того ж места присяглыми водле часу будучыми о речы дотокливые, которые латинским языком зовут крыминалес: яко о злодейство, мужобойство, на

члонком ображене, о пожогу и иншые вшелякие речы и выступки злосливые, судови войтовскому належачые»; «а перед бурмистром и радами того места вшелякие речы и справы местские и иншые вси, которые судови бурмистровскому и радецкому належат и которые латинским языком цивилес зовут« (*цытуецца па прывілеі Новаму Двару ў Гарадзенскім павеце*) [14, а. 408адв–412].

Прыкладамі размежавання ўлады судоў могуць служыць наступныя вількеры. У 1542 годзе пастанову паміж радай і войтам Бельска аб падзеле паўнамоцтваў зацвердзіла каралева Бона [16, а. 21адв–23адв]. Да кампетэнцыі рады былі аднесены справы майстроў, рамеснікаў, сямейныя спрэчкі, надзор за прадухіленнем хваляванняў, раздораў, замірэнне варагуючых бакоў, прадухіленне замахаў на бяспеку жыцця, кантроль над мерамі і вагамі, пакаранне падробкі рэчаў, спадчынныя і апякунскія справы, спрэчкі пра межы пляцаў, нагляд за ветхімі будынкамі і іх рамонтам, ашацаванне тавараў, скаргі слугаў на паноў і наадварот, а таксама справы, «якія з’яўляюцца агульнымі і да разрада грамадскіх гэтага горада адносяцца».

Войт жа павінен быў разглядаць астатнія справы, прычым як жыхароў горада, так і іншаземцаў. Аднак аднаасобна ў прысутнасці пісара ён мог вырашаць справы, якія не перавышалі 10 марак. Іншыя ж ён павінен быў судзіць разам з лаўнікамі. Войт жа павінен быў заслухоўваць справаздачу старой рады аб даходах і выдатках горада і сачыць, каб расходы ішлі толькі на грамадскія патрэбы. Апеляцыя ад названых трох судоў горада павінна была накіроўвацца да каралевы. Рада горада абавязана была таксама ажыццяўляць надзор над грамадскімі патрэбамі, гарадскімі слугамі і катам, маёмасцямі горада Бельска.

Крынкаўскі вількер, зацверджаны Стэфанам Баторыям 28 лістапада 1586 года [17, с. 59–60], яшчэ больш дэталёва размяркоўваў паўнамоцтвы войтаўскага і бурмістроўскага ўрадаў. Войтаўскаму суду падлягалі справы пра схопленых на крадзяжы, забойстве, гвалтаванні жанчын, падпале, лёгкім і цяжкім параненні, вырыванні валасоў ці барады, аплявухах (*абразах*), аб ведзьмах, чараўніцах, продажу зямель у горадзе і каля яго, аб разбурэнні і пераворванні межаў, а таксама аб усялякіх гвалтоўных рэчах, вынікам якіх было параненне. Войтам забаранялася ўступацца ў бурмістроўскія суды, аседлых людзей саджаць у турму і хапаць іх без слушнага пазывання, акрамя пайманых на гарачым учынку, судзіць у гандлёвыя дні і святы. Памер памятнага ад запісаў усталёўваўся ў 1 грош, а ад крывавай рэчы – 2 грошы, астатнія ж віны павінны былі спаганяцца згодна з правам. Бурмістроўскаму суду падлягалі заставы зямлі, апісванне коней, убрання, усялякага быдла, каштоўнасцяў і іншых

рэчаў, аддадзеных у заставу, малыя і вялікія даўгі, незбудаванне плоту ў горадзе і на гарадскіх землях, добраўпарадкаванне вуліц. Радзецкі ўрад таксама накладваў арышт на зямлю за даўгі, займаўся куплямі і продажамі рухомай маёмасці, прышлымі і гультаямі, усялякім ганьбаваннем, дагляданнем парадку ў горадзе.

Як мы адзначалі вышэй, найбольш поўна прадстаўлены вількеры Магілёва, які атрымаў магдэбургскае права 28 студзеня 1577 года. Амаль адразу яго мяшчане актыўна ўключыліся ў праватворчую дзейнасць. Калі на захадзе ВКЛ для пастаноў гарадскіх абшчын былі прыняты назвы вількер ці плебісцыт, то ў Магілёве выкарыстоўвалі найменне «ўхвала». Уласна кажучы, сярэднявечны нямецкі глагол «uorwilkurin» і беларускі «ўхваліць» маюць аднолькавае значэнне. Таму тэрміны «вількер» і «ўхвала» тоесныя.

Ужо 8 ліпеня 1580 года пералічаныя ў актавым запісе магілёўскага гарадскога ўрада 51 мяшчанін і «при них много людзей посполитых» з свайго асяроддзя выбралі 12 чалавек (*у акце паімённа названа 11*) «для перестереганя вшеляких пожитков меских». Выбраныя прадстаўнікі абшчыны былі прызнаныя «добрыми, веры годными, цнотливыми, побожными» таксама і гарадской радай. Гэтыя асобы павінны былі разам з радай вырашаць усе пытанні пра гарадскі скарб. Абшына пры гэтым абяцала падначальвацца гэтым пастановам (аналаг прыгаданай А.Л.Рагачэўскім абаюднай прысягі ўрада і абшчыны). Тыя ж, хто на выбраных «словы неучстивыми торгал се» ці супрацiўляўся іх рашэнням, павінны былі карацца радай. Названыя дванаццаць асоб павінны былі таксама прадухіляць «бунты, розтирки, незгоды». Выбраныя ў прысутнасці войта, рады і паспольства прынеслі прысягу, якая нагадвае прысягі з магдэбургскага права [18, с. 319–322].

У актавых кнігах Магілёва маецца і такі від вількераў, як пастновы рады па агульнагарадскіх пытаннях. Так 14 сакавіка 1585 года рада Магілёва прыняла «ўфалу», якой усталявала час сходаў для вырашэння «яко бы было што доброго и пожытечного месту и всей речи посполитой местской, яко и пожытки местские, так теж, и о всякие повинности и для послушенства врядового». Гэта быў чацвер, што сведчыць пра ўплыў віленскага вількера 1536 года. Тыя, хто парушаў пастанову, павінны былі заплаць у скарб горада 6 грошаў. Такое ж пакаранне вызначалася і тым, хто не прыйшоў на пазачарговыя паседжанні, якія збіраліся для слухання лістоў караля, паноў-рады ці каралеўскіх пасланцаў. Асабліва ўпартыя павінны былі карацца «везеньем» [18, с. 366]. Кароль пацвердзіў яго 9 чэрвеня 1588 года [19, а. 414адв–415].

Асаблівасць магілёўскага самакіравання праяўлялася ў наяўнасці такіх старажытных інстытутаў, як сотнікі і дзесятнікі. Адпаведна ў Магілёве з'явіўся яшчэ адзін від вількераў – пастановы, якія прымаліся радай і сотнікамі. Так 11 лютага 1588 года рада і сотнікі «старое и новое лавицы» па прычыне нежадання асобных выбраных на бурмістроўства ці ў раду і лаву асоб выконваць свае абавязкі пастанавілі, што такія будуць губляць сваё месца на гарадскім таргу, а іх каморы разам з таварам будуць запячатаны [18, с. 372–373]. Тады ж была прынята і «ўхвала», згодна з якой паседжанні ў чацвер павінны былі пачынацца а васямнаццатай гадзіне па ратушнаму звону. Тыя бурмістры, радцы, лаўнікі і сотнікі, якія не прыйдуць на сход па неўважлівай прычыне павінны заплаціць 3 грошы віны. Вызваляліся ад штрафа тыя, хто маючы пільныя прычыны, прышле замест сябе «приятеля» [18, с. 373].

Уплыў віленскага вількера 1536 года адчуваецца і ў вількеры, ухваленым магілёўскімі мяшчанамі 15 кастрычніка 1588 года, які быў зацверджаны граматай Жыгімонта III 1 лютага 1589 года [20, с. 438–444; 21, с. 59–65, 18, с. 452–456]. Згодна з ім для заведавання прыходам і расходам гарадскога скарбу, для абірання рады (бурмістраў, радцаў, лаўнікаў (*хоць апошнія згодна з магдэбургскім правам да яе не адносіліся*)), прыняцця пастаноў аб падатках і слухання справаздачы ад рады мяшчане выбіралі калегію з 12 чалавек («мужоў»). Гэтыя дванаццаць чалавек са свайго складу вызначалі на кожны год па чатыры чалавекі. Такім чынам стваралася тры рочных склада. Яны вызначалі і памеры ўдзелу грамадзян у выплаце дзяржаўных падаткаў. Падаткі на гарадскія патрэбы калегія прымала разам з радай. Прычым усе пастановы павінны быць з пячаткай горада і асабістымі пячаткамі і подпісамі мужоў. Гарадскія даходы павінны былі збіраць шафары, два з якіх прызначаліся з рады, а два – ад грамады. Шафары аб зборах павінны былі штогод трымаць справаздачу перад радаю і грамадаю, аб чым рада выдавала ім квіт з пячаткамі і подпісамі. Пастановы калегіі разам з бурмістрамі па падатковых справах мелі моц і пры няпоўнай яе колькасці (10; 8; 6; 4 чалавек). Тыя, хто выступаў супраць такіх ухвал, павінны былі падлягаць зняволенню. Таго, хто ў складзе калегіі дрэнна выконваў свае абавязкі, грамада магла замяніць. Прычым адзначалася, што гэты ўрад з'яўляецца добраахвотным. Калегія разам з радаю вызначала персанальны склад пасланцаў да караля. Як сведчыць акт магілёўскага магістрата ад 7 чэрвеня 1589 года пацвярджэнне вількера ў караля за ўласны кошт набыў выбраны з пасольства Цімошка Грыгарэвіч [18, с. 457].

Ужо 1 лістапада 1589 года грамада Магілёва выкарыстала сваё права замены выбраных, якія нядвайна выконваюць свае абавязкі. Прызнаўшы такімі Лукьяна Міхайлавіча, Анціпу Хілковіча, Цімошку Грыгарэвіча і Герасіма Ярмалініча, сотнікі, дзесятнікі і «весь люд посполитый» выбралі на іх месца Аўсея Іванавіча, Канюту Марцінаваіча, Багдана Радковіча, Сяргея Сямёнавіча і Ахрэма Канановіча і яшчэ раз пацвердзілі, што будуць выконваць усе пастановы выбраных і рады паводле папярэдняй ухвалы [18, с. 475–476].

9 лістапада 1589 года бурмістры, радцы, лаўнікі, дванаццаць выбраных, сотнікі, дзесятнікі і ўсё паспольства Магілёва прынялі пастанову аб выдаткаваннні войту Марціну Стравінскаму «за суды его млсти криминальные, так теж и за вины, на его милость приходячие», штогод 130 коп літоўскіх грошаў на свята Новага Года (1 студзеня). За гэта войт павінен быў замест сябе вызначаць ландвойта і раду, якіх грамада «его млсти, обравши сполне», накіруе. Названы юргельт войту павінны аддаваць выбраныя на год шафары разам з радай. Пры гэтым было вызначана, што, калі юргельт не будзе своечасова ўнесены, то войт можа выклікаць адказных асоб горада ў суд караля. Грамада вызначала сабе ў якасці віны ў такім выпадку 100 грывен. Такім чынам магілёўскія мяшчане імкнуліся абмежаваць уплыў войта на гарадскія справы [18, с. 476–478].

Асобныя вількеры датычыліся адзінкавых выпадкаў у кіраванні справамі горада. Прычым ухвалы па такіх пытаннях ад імя грамады Магілёва маглі выносіць сотнікі. Так 31 сакавіка 1590 года сотнікі Магілёва ад імя абшчыны вызначылі прадстаўнікамі ў каралеўскі суд па справе з Аўсеям Максімовічам і Ходарам Федаровічам Сямёна Себасцянавіча і Сідара Мамонавіча. Пры гэтым апошнія атрымалі моц «на зыск и страту справы всякия намовять, чынить, боронить, права сентенцеи слухать и относить, одного албо болшей на местце свое становити и становене напотым отказывать» [18, с. 493–495].

21 чэрвеня 1590 года рада, лава і выбраныя мужы вынеслі пастанову, што паколькі вызначаныя для слухання лічбы рады 4 асобы да гэтай пары яе не выслухалі, то прымаць справаздачу будуць самі выбраныя ў колькасці 12, 10, 8, 7, 6, 5 ці 4 чалавек у вызначаны дзень. Пры гэтым высвятляецца і тэрмін выбрання прадстаўнікоў для слухання лічбы – 28 снежня [18, с. 495–496].

8 лютага 1590 года свой вількер, які датычыўся парадка кіравання гарадскімі справамі, прыняла мінская грамада [22, с. 39–47]. На яго таксама паўплываў віленскі вількер 1536 года. Прычым, як і ў выпадку з магілёўскім вількерам 15 кастрычніка 1588 года, уплыў гэты хут-

чэй канцэптуальнага характару. Прычын прыняцця вількера названа тры: недастатковы клопат бурмістраў і ў цэлым рочных змен магістрата пра гарадскія патрэбы; неабходнасць захавання братэрскай згоды і зычлівасці паміж радай і грамадою, адмоўны характар неабходнасці частага збірання сходаў для выбараў бурмістраў, якіх было 8 змен. З апошняга можна зрабіць выснову, што ў горадзе быў больш старажытны вількер, які вызначаў выбранне гэтых 8 змен, бо фундацыйны прывілей Мінску не агаворвае парадак выбрання рады, ды і з названай у грамаце колькасці бурмістраў і радцаў цяжка скласці гэтыя змены.

Вількер, як і віленскі 1536 года, насіў комплексны характар, разглядаў як пытанні кіравання, так і судовыя, эканамічныя пытанні.

Было вырашана мець не восем, а тры змены магістрата: кожны год па два бурмістры, два радцы і два лаўнікі (у прывілеі на магдэбургскае права лаўнікі наогул не названыя). Прычым выбары іх былі праведзены адначасова з прыняццем вількера з людзей «пабожных, растаропных, у справах месцкіх магдэбургскіх беглых». Выбраныя павінны былі прынесці прысягу на тры гады, так жа як і мяшчане магістрату. Па прыведзенаму зместу можна сцвярджаць, што гэта прысяга з магдэбургскіх кодэксаў. Пры добрым выкананні сваіх абавязкаў выбраныя службоўцы маглі працягваць сваю службу пажыццёва. Пры дрэнным жа выкананні па сканчэнні трох гадоў грамада магла правесці новыя выбары, прыняць новую ўхвалу. Пры неабходнасці бурмістру, радцу ці лаўніку выехаць з горада, ён павінен быў запрасіць на сваё месца адпаведна бурмістра, райцу ці лаўніка з другой змены. Устанаўлівалася аплата рочным бурмістрам у памеры дваццаці злотых у год, радцам адпаведна – па тры капы грошаў, лаўнікам – па две капы. Памеры аплаты гавораць пра меншы памер гарадскіх даходаў у параўнанні з Вільняй. Тэрмін паўнамоцтваў змены адлічваўся ад дня Святога Мікалая веснавога. Па заканчэнні тэрміна змена павінна была перадаць усе гарадскія прывілеі, пячатку, рэестры, лісты і кнігі новай змене і праз бірчых і шафараў адчытацца перад грамадою аб гарадскіх даходах і расходах. Для пасяджэнняў рады прызначаўся чацвер.

Важнае месца ў вількеры адведзена пытанням упарадкавання гарадской казны і фіскальнага кантролю. Усе гарадскія выдаткі павінны былі пакрывацца ўсёй грамадою. Бурмістры, райцы і лаўнікі са згоды грамады маглі арэндаваць гарадскія даходы. Іх збор даручаўся бірчым, а выдача грошаў на расходы – шафарам. Прычым усе яны павінны быць прысяглымі. Калі гарадскіх даходаў не хапала на пакрыццё выдаткаў, дазвалялася ўстанаўліваць асобныя зборы. Калі службоўцы трацілі на

гарадскія патрэбы ўласныя грошы, то грамада разам з радай павінны былі ў хуткім часе іх вярнуць. Было вырашана не мець гарадскіх інстыгатараў, а справу пільнавання гарадскіх маёмасцей і пажыткаў даручыць бурмістрам і радзе.

Шэраг артыкулаў датычыўся гарадскіх маёмасцей. Устанаўлівалася, што тыя, хто набываў у горадзе двары і землі, павінен быў спачатку выканаць прысягу. Тыя, хто пераходзіў пад прыватную юрысдыкцыю і не хацеў выконваць гарадскія павіннасці, гублялі сваю маёмасць і павінны былі падлягаць пакаранню.

Дагаворны характар гарадскога самакіравання пакрэслены як прысягай, якую ўзаемна прынеслі магістрат і абшчына, так і некаторымі артыкуламі. Так, калі б якому мешчаніну «безпраўе і грабёж невінны… прыйшоў», то рада павінна была дабівацца для яго справядлівасці, у тым ліку і «грошам паспалітым». Рада і грамада разам павінны былі раскладваць падаткі на ўтрыманне паслоў і ганцоў і іншыя патрэбы да ста коп грошаў без прысягі, а звыш ста з прысягаю, і на багатых, і на ўбогіх. Мяшчанам забаранялася лаяцца на раду. Пастанаўлялася віна пры невыкананні гэтай ухвалы членамі магістрата ў памеры 50 грывен.

Як сведчаць матэрыялы Магілёва, найбольшая колькасць ухвал датычылася эканамічных пытанняў: вызначэнне і збор падаткаў, усталяванне кошту прадуктаў і г.д. Так 19 кастрычніка 1580 года ландвойт, бурмістры, радцы, лаўнікі і выбраныя прысяглыя асобы (*у акце пералічаны па імёнах 5 мужоў*) Магілёва вызначылі для збора чыншаў радцу Федку Пошыпа. Пры гэтым, калі б пры здачы грошаў у скарб патрабаваліся дадатковыя выдаткі і Пошып унёс бы свае грошы, то іх яму павінны былі кампенсаваць з гарадской скрынкі. Калі ж і апошніх не хапала на кампенсацыю, то прысутныя на паседжанні абяцалі даць свае грошы. Прычым такія выбары названыя штогадовымі, што гаворыць пра наяўнасць пэўнай агульнай гарадской пастановы па гэтаму пытанню і штогадовых разавых ухвал [18, с. 323–325].

6 верасня 1584 года рада Магілёва, убачыўшы, што ў горадзе шмат людзей, якія не могуць «за грош и за два купить хлеба през недостаток свой», вырашыла, што хлебнікі павінны выпякаць на продаж хлеб 4 гатункаў: за 2 асьмакі, за 1 асьмак, за чацьвяртак і за 2 пенязі. Гэтая ж пастанова, спасылаючыся на звычай усіх падняпроўскіх гарадоў (Дуброўны, Оршы, Копысі, Шклова, Быхава, Галоўчына, Крычава), занатавала, што жыта і іншае збожжа на таргу павінны вымяраць не кракаўскім гарнцом, але «мерай, якая есть здавна постановлена», а менавіта «верховатой мерой» ці мерай «з верхом». Пры гэтым у да-

куменце ўтрымліваецца заўвага, што гарады, ВКЛ, якія карыстаюцца магдэбургскім правам, «теж водлуг постановеня своего меру ховают», што ўскосна сведчыць пра наяўнасць у той час адпаведных вількераў іншых гарадскіх паселішчаў [18, с. 353–354].

Як гаворыць змест справы магілёўскага паспольства з бурмістрам Аўсеям Максімовічам, пад час патрэбы якіх-небудзь выдаткаў бурмістры «заказвалі» на ратушу сотнікаў, дзесятнікаў і паспольства, для вызначэння пэўнага «мету» ці падатка з маёмасцей мяшчан [18, с. 418]. Збіралі людзей, як сведчыць тая ж справа, сотнікі [18, с. 420].

«Ухваламі» ў Магілёве звалі і самі падаткі, якія прымаліся пастановамі горада. Так у справе 17 кастрычніка 1590 года названа ўхвала «з одное копы по полтора гроша, а з другое копы по грошу». Грошы ад падатка павінны былі выдаткоўвацца на пакрыццё расходаў асоб, пасланых да караля па гарадскіх справах [18, с. 498]. 18 ліпеня 1591 года магістрат і выбраныя вызначылі падатак у памеры 6 грошаў з маргоў, здаўна дадзеных гораду, і 12 грошаў з маргоў, ізноў прысуджаных гораду рэвізорамі караля, на пакрыццё выдаткаў на названых рэвізораў, накіраванне іх дэкрэта да старосты і іншыя патрэбы [18, с. 510–511]. Прычым, як сведчыць акт ад 1 мая 1591 года пасля збору вызначанага падатка праводзілася асобнае паседжанне рады і выбраных, на якім прымалі справаздачу бірчых і квітавалі іх [18, с. 503–505].

Ухваламі ў Магілёве зваліся і цэхавыя парадкі. Так 1 лютага 1590 года ў актавыя кнігі магістрата ўнеслі сваю «ўхвалу» магілёўскія дойліды [18, с. 482–485], саладоўнікі [18, с. 508–510]. Па аналогіі назва «вількер» у дачыненні цэхавых статутаў мы можам убачыць у Бярэсці, Дзісне, літоўскіх Янішках, але ўжо ў пачатку наступнага стагоддзя.

Права прыняцця вількераў вызначалася, як мы бачылі на пачатку артыкула, самімі зборнікамі магдэбургскага права. Бадай што адзіны фундацыйны прывілей канца XIV – канца XVI стагоддзя, які агаворвае права прыняцця вількера, гэта грамата Віцебску. Мяшчанам разам з войтам дазвалялася прыняць вількер, у якім усталёўваўся б спосаб выканання павіннасцяў і парадак вырашэння іншых гарадскіх спраў [24, а. 218адв–224адв].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што вількеры былі важнай крыніцай гарадскога права, неабходнасць якой была абумоўлена адсутнасцю аднастайнага прававога рэгулявання асобных пытанняў гарадскога жыцця. Адсутнасць пэўных нормаў у самім магдэбургскім праве, як і асаблівасці асобных гарадоў выклікалі неабходнасць прыняцця самімі гарадамі пэўных пастаноў па гэтых пытаннях. Згодна з нормамі

магдэбургскага права яны зваліся «вількерамі». Гэтая назва была найбольш распаўсюджана на заходніх землях ВКЛ, у той час як ва ўсходніх карысталіся яе беларускім адпаведнікам – «ухвала». Права прыняцця вількераў вынікала ўжо з самога факта надання магдэбургскага права, таму ў XVI стагоддзі ў асноўным не абумоўлівалася асобнымі пунктамі фундацыйных прывілеяў. Як мы бачылі вышэй, датычыліся вількеры, у першую чаргу, пытанняў фарміравання гарадскіх органаў улады, дапаможных органаў гарадскога самакіравання, парадка справаздач гарадскога ўрада, аплаты службоўцам за працу, збора падаткаў, узаемаадносін паміж урадам і грамадою, добраўпарадкавання. Па тэрміну дзеяння вількеры былі доўгатэрміновымі (прынятымі на неабмежаваны час) ці прысвечанымі адзінкавым з’явам гарадскога жыцця. Па колу разглядаемых пытанняў вылучаюцца комплексныя вількеры, якія рэгулявалі шырокі пералік палітычных, сацыяльных і эканічных пытанняў, і спецыяльныя вількеры. Сярод апошніх можна адзначыць адміністрацыйныя, якія рэгулявалі парадак дзейнасці органаў самакіравання; судова-працэсуальныя; фіскальныя; гаспадарчыя. Комплексныя вількеры можна лічыць свайго рода «канстытуцыямі» гарадскіх паселішчаў. Па інстытутах гарадской улады, якія прымалі вількеры, можна вылучыць супольныя пастановы рады, лавы і паспольства; сумесныя пастановы рады і выбраных «мужоў» ці рады і прадстаўнікоў тэрытарыяльнага самакіравання (сотнікаў, дзесятнікаў); пастановы рады і лавы ці толькі рады па агульнагарадскіх пытаннях. XVI стагоддзе было часам шырокага распаўсюджання праватворчай дзейнасці гарадскіх абшчын, што было выклікана, у першую чаргу, рэзкім павелічэннем колькасці гарадоў і мястэчак, якія карысталіся магдэбургскім правам.

Спіс літаратуры

1. Kraszewski, J.I. Wilno od jego początków do roku 1750 / J.I. Kraszewski. – Wilno, 1841. – T. 3. – 383 c.

2. Копысский, З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З.Ю. Копысский. – Минск: «Наука и техника», 1975. – 191 с.

3. Kiaupa, Z. 1551 m.ir 1620m. Vilneaus vilkerai ir ju taikymas Lietuvos Didziosios Kunigaikstystes miestuose / Z.Kiaupa // Jaunuju istoriku darbai. Miedziaga respublikinei jaunuju istoriku mokslinei konferecijai. 1976 m.spalis, t.1. – Vilniaus, 1976. – S.41–51.

4. Szczerbicz, P. Ius municipale, to jest prawo miejskie maydeburskie / P. Szczerbicz. – Lwów, 1581. – 237 s.

5. Groicki, B. Artykuły Prawa Magdeburskiego, ktore zową Speculum Saxonum / B. Groicki. – Kraków, 1565. – 105 s.

6. Szczerbicz, P. Speculum Saxonum albo Prawo Saskie y Maydeburskie / P. Szczerbicz. – Lwów, 1581. – 536 s.

7. Рогачевский, А.Л. Меч Роланда. Правовые взгляды немецких горожан XIII–XVII вв. / А.Л. Рогачевский. – СПб.: Изд. СПбГУ, 1996. – 153, [3] с.

8. Рогачевский, А.Л. О взглядах немецкого бюргерства XIV–XV вв. на природу и назначение городских органов власти / А.Л. Рогачевский // Правоведение. – 1989. – № 6. – С. 46–55.

9. Zubrzycki, D. Kronika miasta Lwowa / D. Zubrzycki. – Lwów, 1844.

10. Собрание древних грамот и актов городов Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Ч.1 – [2]. – Вильна, 1843. – Ч.1 – [2]. – XCIV, 208 с.

11. Groicki, B. Porządek sądów miejskich / B. Groicki. – Kraków: Drukował Łazarz Andrusowicz, 1559. – 243 s.

12. Стрэнкоўскі, С.П. Прывілеі і вольнасці беларускіх гарадоў з нямецкім правам у канцы XIV – канцы XVIII стст. / С. П. Стрэнкоўскі. – Мінск: МГІРА, 2008. – 251 с.

13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей – НГАБ). – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Сп. 50. Пажалаванні, пацвярджэнні. Пры пісары Лаўрыне Войне і Б. Дрэвінскім.

14. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Сп. 106. Прывілеі, пажалаванні і дэкрэты Уладзіслава IV.

15. Lietuvos metrika: Kn. 14 (1524–1529) / Lietuvos istorijos institutas; parenge: Laimontas Karalius, Darius Antanavicius. – Vilnius: LII, 2008. – 645 s.

16. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Сп. 33. Метрыка королевы Боны.

17. Lietuvos metrika: Knyga 71 (158–51586) / Lietuvos istorijos institutas; parenge Laimontas Karalius, Darius Antanavicus. – Vilnius: LII, 2008. – XXVI, 141, [1] c.

18. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в Центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией архивариуса сего архива Созонова: Вып. 7. – Витебск, 1876. – 511, V с.

19. НГАБ. – КМФ-18. – Воп. 1. – Сп. 73. Метрыка прывілеяў.

20. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в Центральном архиве в Витебске, изданные под редакцией архивариуса Витебского центрального архива Довгяло. – Витебск, 1883. – Вып. 14. – 530, XIV с.

21. Белорусский архив древних грамот / Предисл. протоиерея И. Григоровича. – М., 1824. – Ч.1. – XVI, 148 с.

22. Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. – Минск, 1848. – XLVIII, 402 с.

23. Беларускі архіў / Бел.АН, Археагр.каміс. [Змест актаў, датоўка іх, заўвагі і паказ. склаў З. Даўгяла]. – Мінск: Выд.Бел.АН, 1930 (1931). – Т. 3: Мінскія акты (XV–XVIII ст.). Вып.1. – XXV, 413 с.

24. НГАБ. Фонд КМФ-18. – Воп.1. – Сп. 83. Прывілеі, пацвярджэнні і пажалаванні.

Моисеев М.В.

МОДЕЛИ ПОВЕДЕНИЯ ДИПЛОМАТОВ МОСКОВСКОЙ РУСИ: ОБЩЕЕ И ИНДИВИДУАЛЬНОЕ (НА ПРИМЕРЕ РУССКО-НОГАЙСКИХ ОТНОШЕНИЙ XVI века)

Внешнеполитическое развитие Русского государства приводило к увеличению количества стран-участниц дипломатического диалога. Постепенно страна начала втягиваться в систему международных отношений и создавать региональные системы взаимоотношений. Отмеченные явления привели к увеличению числа дипломатических представителей, направляемых в разные страны. Этот процесс логично должен был увенчаться созданием специализированного ведомства курировавшего внешнеполитическую деятельность страны и появлением корпуса дипломатов. Международные отношения попадали в сферу деятельности великого князя (царя), Боярской Думы и главы Русской православной церкви. Уже в конце XV века появляются посольские дьяки непосредственно связанные с управлением внешней политикой. В результате, в 1549 году появляется специализированное ведомство – Посольский приказ [1, с. 99–105; 2, с. 14–15]. Вместе с тем выделение посольского ведомства не означало появления специализированной дипломатической службы. В течение конца XV – XVI веков выделяются общие принципы организации дипломатического общения России с ее контрагентами. Сама организация такого общения имела довольно ясные иерархические принципы, особенно это заметно в случае отношений Русского государства со странами-наследниками Золотой орды (иначе говоря, с *постзолотоордынским* миром). Рассмотрим это явление в общих чертах.

Постзолотоордынский мир был отнюдь не монолитен, в нем происходили политические процессы, усложнявшие общую геополитическую картину региона. Одним из условий этих процессов была внутренняя дифференциация государств по династическому принципу. Определялось это следующим принципом: право на верховную власть имели только потомки сыновей Чингиз-хана от первой жены, так называемый «золотой род» (*алтан уруг*). Правители, не принадлежавшие к этой категории, не рассматривались как легитимные. Вместе с тем хан и в ордынские времена, и позднее не всегда обладал всей полнотой власти. Нередко Чингизиды-правители находились в тени своих влиятельных

беклярибеков, таких как Мамай, Тимур и Эдиге. Они сами выбирали ханов, оставляя себе реальное управление страной. Именно по такой схеме была устроена и Ногайская Орда [3, с. 56–87; 4, с. 72–89, 113–119]. Все это привело к тому, что в постзолотоордынском мире и Ногайская Орда, и ее правители (бии) обладали низким статусом. К примеру, крымские ханы называли ногайских биев своими «карачи», то есть слугами [5, л. 8об.].

Подобная ситуация оказывала прямое влияние на организацию русско-ногайского дипломатического общения. Отмеченное обстоятельство позволило Русскому государству выстроить отношения с ногаями на иных основаниях, чем с другими постзолотоордынскими государствами. Уже на заре этих контактов сложилась система «церемониального вассалитета» Ногайской Орды, следствием которой стала упрощенная схема организации посольского обмена и низкий статус направляемых к ногаям дипломатов.

Особенно ясно это становится при сравнении церемониала и системы организации дипломатического общения с другими постзолотоордынскими странами. Сам церемониал отношений Русского государства с этими государствами сохранял элементы золотоордынского дипломатического этикета. Именно тогда сложилась дифференциация дипломатических представителей Руси в Орде. На вершине своеобразной посольской иерархии находились «киличеи» – послы великого князя, они привозили ордынскому хану «многие дары». В самом низу иерархической лестницы располагались гонцы, чьи функции ограничивались доставкой посланий. Официальный статус киличеев был достаточно высок, среди них встречались бояре, представители знати, крупные землевладельцы [6, с. 118–120]. Подобная практика сохранилась и после распада Золотой Орды: в Крымское и Казанское ханство направлялись послами довольно знатные люди, порой имевшие думные чины [7, с. 1, 9, 16, 25, 28, 34 и др.].

Иную картину предоставляют русско-ногайские отношения, которые в силу иерархических различий между правителями государств не имели развитого дипломатического этикета [8, с. 92–93]. Рассмотрим подробнее, как это обстоятельство отразилось на организации дипломатического общения Русского государства с Ногайской Ордой.

При анализе источников выясняется следующая тенденция: в конце XV – начале XVI в. (до 1508 г.) в Ногайскую Орду направляли преимущественно гонцов, так из 6 направленных представителей пятеро – это гонцы, и лишь один упоминается как посол (князь Темир Якшенин). С

1533 г. по 1549 г. Орду посетило 9 гонцов и 8 посланников. В середине XVI века (до 1561 г.) – 15 посланников и 34 гонца. Преобладание гонцов в дипломатическом диалоге Русского государства с Ногайской Ордой наиболее очевидно во время решающего этапа «Казанской войны»: в 1551 и 1552 гг. в Орду направлялись только гонцы. Таким образом, можно сказать, что в Москве стремились свести сами отношения с ногаями к простому обмену посланиями и особой важности им не придавали.

Подобная практика, несомненно, ущемляла интересы ногайской знати. Именно поэтому степняки активно старались добиться права приема у себя московского посланника. В немалой степени это объясняется тем, что только посланники, как ранее киличеи, привозили «многие дары», в то время замещенные «поминками». В результате в середине XVI века оформилась система посольского обмена между Россией и Ногайской Ордой: теперь в орду направлялось три посланника. Один из них направлялся к бию, два других к правителям западного и восточного крыла Орды – нурадину и кековату, соответственно.

Состав, направляемых в Ногайскую Орду дипломатов, определялся в первую очередь территориально-генеалогическим происхождением. Как правило, они происходили из Козельска, Коломны, Калуги, Боровска, Воротынска, Владимира, Мещевска, Мещеры, Рязани и Нижнего Новгорода. То есть из мест, находившийся на дуге от северо-востока к югу-западу и принадлежавших к «восточной украине» в широком смысле слова. Другой закономерностью являются служебные занятия и связи не только самих посланников, но и вообще их рода. Интересно, что среди посланников середины XVI века (с 1554 г.) заметны сослуживцы Афанасия Нагого: Мальцевы и Лачиновы. Причем для Мальцевых русско-ногайские отношения стали едва ли не семейным поприщем, на котором подвизались сначала братья Елизарий и Семен, затем и сын Елизария – Семен. Более одного представителя дипломатического корпуса, задействованного в русско-ногайских отношениях, дали также Вышеславцевы (2 представителя), Колесницыны (2), Михновы (2). Все это позволяет, с известной осторожностью, предположить, что семейственность и предыдущие службы (с их связями) играли определенную роль в механизме привлечения к дипломатической службе тех или иных людей. Еще отчетливее этот факт становится при анализе общей служебной истории не только дипломата, но и всего рода (например, деятельность рода Загряжских).

Социальный статус русских дипломатов в Ногайской Орде не был высоким. Посланниками выступали люди, принадлежавшие к низшему слою Государева двора, а иногда даже представители уездного дворян-

ства. Для периода середины XVI века характерно назначение в посольские миссии детей боярских III статьи. Это П.Д. Тургенев, И.Б. Федцов, И.Т. Загряжский, А.Т. Тишков, П.Г. Совин, М.К. Приклонский, В.П. Федчищев и, возможно, Иван Тверетинов [9, с. 67, 70, 71, 73, 74, 78]. После 1560-х гг. число членов Государева двора несколько сокращается, как правило, они возглавляли посольство и направлялись непосредственно к ногайскому бию; кековат и нурадин были вынуждены довольствоваться приемом посланника более низкого социального статуса.

Таким образом, очевидно, что на организацию дипломатического общения Русского государства с Ногайской Ордой решающее влияние имел низкий иерархический статус Орды. Вместе с тем закономерен вопрос: не связано ли отмеченное обстоятельство с незначительностью самих отношений? Для ответа на него, рассмотрим в общих чертах историю русско-ногайских отношений в XVI веке.

Эти отношения в течение XVI века развивались довольно активно, но постепенно их значение начало снижаться. Наибольший расцвет взаимоотношения Русского государства и Ногайской Орды пережили в 30–50-е гг. XVI столетия. После завоевания Казанского и Астраханского ханств русско-ногайские отношения начинают «провинциализироваться», то есть их содержание постепенно ограничивается вопросами сосуществования с «большим» соседом в приграничной зоне. Однако заметного влияния содержание отношений на организацию дипломатического общения не имело. Наиболее ярким подтверждением этому можно считать и ограничение русско-ногайских отношений во время заключительного этапа «Казанской войны» отправкой гонцов, и миссию Микулы Иванова сына Бровцына в Орду в 1554 г. Коротко говоря, главной задачей этой миссии было дипломатическое сопровождение захвата Астрахани. Однако для исполнения этой ответственной миссии избрали человека, в 1530-е гг. представлявшего дворцовую администрацию в Нижнем Новгороде [10, с. 89] и не имевшего до этого ни малейшего дипломатического опыта (своеобразной вершиной его дипломатической карьеры можно считать исполнение функций пристава у литовских послов в 1554 г. [11, с. 200]). Подобные примеры в истории русско-ногайских отношений можно множить, но это в целом не является целью данной статьи. Для нас важно понять как эти люди, зачастую не имевшие дипломатического опыта, реагировали на изменявшиеся ситуации в отрыве от привычной обстановки и в окружении тех, кто в восприятии средневековых русских интеллектуалов представлялся некоей обобщенно зловещей массой.

Посольский церемониал постзолоордынских стран в значительной степени восходил ко временам могущества Золотой Орды. Многие из его элементов имели непаритетный, а местами и унизительный для отправляющей дипломата стороны характер. Учитывая, что для дипломатии средневековья весьма существенную роль играл символический ряд: *государство = правитель = посол,* становится понятной актуальность изучения моделей поведения, избранных тем или иным дипломатом на «вызовы» протокола принимающей стороны. Одним из наиболее очевидных «вызовов» можно считать практику взимания так называемой «придверной пошлины».

Во всех постзолотоордынских государствах бытовал обычай, по которому дипломатические представители разных стран за право аудиенции платили так называемую «придверную пошлину». О подобных порядках в Улусе Джучи писали еще Джованни дель Плано Карпини и Гильом де Рубрук [12, с. 59, 70–71, 110–111]. Наиболее подробное описание монгольского церемониала встречи послов оставил Джованни дель Плано Карпини. По пути к ставке послов встречали заставы татар. Выяснив, куда они едут, татары просили даров и получали их. Так как, по словам Карпини им «приходилось принуждение обращать в желание» [12, с. 70–71]. По прибытии в ставку, «вождь» посылал к послам «своих рабов управителей», которые спрашивали о «подарках», а получив, требовали дать больше. После получения требуемого, посла вели к хозяйскому шатру. Сходная процедура повторилась и в ставке Бату [12, с. 71–72]. Этот церемониал оказался весьма устойчивым и сохранился в постзолотоордынских государствах, он был распространение и бывшем Чагатайском улусе [13, с. 211, 212, 213, 215, 218]. Русских послов требование пошлин и поминков преследовало, едва они приближались к улусам степняков. Уже в ставке бия к ним посылался теку-дуван, управлявший финансовыми вопросами, и требовал пошлин, после этого на посла «наседали» карачи «трех орд» (в случае с Ногайской Ордой) и придверники [14, с. 125–126].

Русские власти резко негативно относились к практике взимания пошлин с дипломатических представителей своей страны. В каждом наказе рефреном звучало «…а в пошлину никому ничего никак не давати» [14, с. 111, 277]. Однако это «идеальное» требование наказа было трудно исполнимым для дипломата, находившегося вдали от Родины и окруженного представителями ногайской верхушки. Уже первый представитель Русского государства в Орде столкнулся с этой проблемой. Осенью 1490 г. в ставку ногайского бия Мусы прибыл гонец Тулуш.

Алчагир-мирза (сын Мусы) «…силу учинил, взял у него однорятку ноугоньскую, да две однорятки трекуньские, да седло ометюк тимов. А … князь Шамансырь взял у него силно однорятку ипьскую, да другую трекуньскую» [14, с. 39]. Точно также в 1506 г. поступил Алчагир с другим гонцом – Кожухом, приказав с того снять «однорядку придверного» [14, с. 56]. Попытки прекратить эту унизительную практику дипломатическим путем так и не возымели действия. В 1534 г. русский посланник Даниил Губин столкнулся с этой практикой, приобретшей к этому времени усиленный характер. Едва прибыв в ногайские улусы, посланник столкнулся с требованиями послов ногайских мирз отдать им посольские дары для их господ. Д. Губин воспротивился этому, тогда ногаи напали на него и сопровождавших его гонцов и захватили «поминки», отправленные их сюзеренам. Уже во владениях бия орды Саид-Ахмеда, его сын Султан-Ахмед потребовал пошлин и, получив отказ, ограбил русского посланника. В ставке бия ситуация повторилась. Сначала бийский чиновник потребовал пошлин, Д. Губин отказал ему в этом, тогда на следующий день он явился с сопровождением, обыскал весь состав посольства (посланника и гонцов) и изъял требуемые пошлины. После «княжого грабежу» к несчастному посланнику приехали пошлинники «от трех орд и придверники» и ситуация повторилась. Своеобразный сбор пошлин завершили карачи ногайской знати [14, с. 124–126].

Подобная практика продолжалась и позднее. Весьма показателен пример живучести «придверной пошлины» приводимый русским посланником в Ногайской Орде в 1551 г. П. Тургеневым. Ситуация весьма напоминает ту что имела место почти два десятилетия назад с Д. Губиным: так же вначале последовало требование «поминок», а затем двенадцать князей ногайского бия Юсуфа потребовали пошлин, мотивируя это сложившейся международной практикой. Отказ уплатить пошлины, не поколебав ногаев, привел к силовому изъятию их [15, с. 52–53].

Конечно, можно полагать, что столь экстремальный способ получения пошлин с русских посланников и гонцов мог диктоваться враждебной к Русскому государству позицией. Вроде бы для этого есть основания. Упоминаемые выше случаи (ограбление Д. Губина и П. Тургенева) имели место во время серьезного охлаждения русско-ногайских отношений. Инспирировали их бии Саид-Ахмед (в 1534 г.) и Юсуф (в 1551 г.), которые были явно недовольны московской политикой в регионе. Однако такое предположение не будет справедливым. В

1554 г. Исмаил, видевший в Москве своего главного партнера в борьбе за власть, точно так же приказал взять со всего посольства пошлины. Русский посланник М.И. Бровцын упоминает об этом в своей отписке: «Да прислал, государь, ко мне казначея своего, да иных татар, да меня, государь, велел ограбити. И казначеи, государь, меня ограбили и татар твоих донога…» [15, с. 153–154]. Замечательно, что это происходило на фоне борьбы Исмаила с Юсуфом за власть в Орде, а Бровцын должен был провести с первым секретные переговоры по возведению на астраханский престол Дервиш-Али, креатуры как раз Исмаила [16, с. 201]! Следовательно, характер взимания пошлин с дипломатических представителей Русского государства не был жестко связан с позицией самих ногайских аристократов по отношению к Москве.

Однако начало усобицы в Ногайской Орде внесло свои коррективы в процесс взимания пошлин с русских дипломатов. В один из острых моментов междоусобной борьбы в 1555 г. Исмаил вовсе отказался брать пошлины, наоборот он повел себя «необычно» (именно так эту ситуацию охарактеризовал русский посланник И. Загряжский [15, с. 177]), приказав выдавать посольству корм ежедневно. Впрочем, такое поведение диктовала сложившаяся ситуация, так как против Исмаила поднялось большинство ногайских мирз [подробнее см.: 4, с. 270–284]. Ввиду сказанного любопытно, что другой русский посланник, Мясоед Вислово, направленный к союзнику Исмаила Касиму, все-таки был «ограблен» [15, с. 178]. Вероятно, традиционное право взимания пошлин с дипломатов для ногаев было более действенным, чем изменяющаяся политическая обстановка. На нее не повлияли и бурные события 1557 года. В это время Исмаил на непродолжительное время лишился власти в Орде: его сменили мятежные сыновья погибшего в 1554 г. бия Юсуфа. Правителем ногаев стал старший из Юсуфовичей – Юнус-мирза. Новый бий старался убедить московских представителей, что подобная смена власти не угрожает Русскому государству, борьбу же с Исмаилом переводил в плоскость «кровной мести» за убитого последним отца [15, с. 247]. Вместе с тем сбор пошлин с посольств отменен не был. Так, посла И. Тверетинова ногаи «бесчествовали», хотя характер этого «бесчестия» не ясен. Примечательно, что сами ногаи отрицали свою вину, возводя ее на самого посланника: «…сам деи мужик дурен, не знает ни добра, ни лиха» [15, с. 245]. С посланника Елизария Мальцева имелдеши Юнуса попытались взять пошлины, но им это не удалось. Как писал позднее в отписке сам герой происшествия: «государевым здоровьем взяв Бога на помоч, переступ-

пя страх, положили образец в Нагаех, каков преже того не бывал» [15, с. 246]. Однако небывалый успех Е. Мальцева так и остался единичным. Взимание пошлин с дипломатических представителей Русского государства продолжался и позднее, хотя и некоторые обстоятельства и изменились. Так, в 1562 г. с русского гонца в ставке Уруса взяли пошлины, хотя (в этом новшество) обещали позднее возместить [17, л. 47–47об.].

Примечательна реакция посланников и гонцов Русского государства на эту ситуацию, отраженная в отписках и докладах дипломатов. Так, например, Даниил Губин пытался воздействовать на ситуацию словами. П.Д. Тургенев говорил «многие речи по наказу», а в момент силового изъятия пошлин просто покинул место, где это происходило, оставив ногаев наедине с желаемыми материальными ценностями. Примеры подобного развития событий можно еще множить, но главное – это понять, чем объяснить эту повторяющуюся из раза в раз ситуацию. На наш взгляд, мы здесь имеем дело с неким церемониальным действием. Ногаи требуют положенную пошлину: ведь так заведено издавна. Московские дипломаты непреклонно отвечают отказом, затем, «полаяв много», стороны на время расходится. По истечении некоторого времени (как правило, на следующий день) ногаи берут свое, русский посланник покидает место, где совершается, согласно его словам, «грабеж». Таким образом, наиболее распространенной моделью поведения дипломатических представителей Русского государства в случае с «придверной пошлиной» долгое время был ритуальный отказ от ее выплаты и пассивное наблюдение за ее взиманием. Такая ситуация позволяла выйти из «протокольного тупика» создававшегося известным противоречием между сложившейся дипломатической практикой постзолотоордынских государств и решительным требованием великокняжеской канцелярии «пошлин не давать». В результате подобного «грабежа» московские дипломаты пошлин как раз официально и не давали, следовательно и удар по престижу молодого государства был минимальным. Оценивая это явление как проявление криминальных наклонностей степняков, великокняжеская администрация слала возмущенные послания, укоряла ногайскую аристократию, однако более действенных методов искоренения практики «придверной пошлины» не искала. Следовательно, не будет слишком смелым предположить, что эта ситуация по началу удовлетворяла обе стороны.

Однако после захвата Казанского и Астраханского ханств, а так же начала ногайской усобицы середины XVI века, русские дипломаты на-

чали избирать иные сценарии преодоления означенного «протокольного тупика». Наиболее ярким суждено было стать поведению Е. Мальцева: в ответ на требование пошлин, он приказал открыть огонь из пищалей. Убив одного и ранив 5–6 человек, посланник обезопасил себя от взимания пошлин [15, с. 246]. Впрочем, такая реакция являлась скорее исключением. Позднее взимание пошлин продолжалось, но ногайские аристократы старались возместить убытки, понесенные дипломатами. Сохранение же этой практики они мотивировали необходимостью содержать свое окружение.

Список литературы

1. Белокуров, С.А. О Посольском приказе / С.А. Белокуров. – М., 1906.

2. Рогожин, Н.М. Посольские книги России конца XV – начала XVII вв. / Н.М. Рогожин. – М., 1994.

3. Султанов, Т.И. Чингиз-хан и Чингизиды. Судьба и власть / Т.И. Султанов. – М.: АСТ, 2006.

4. Трепавлов, В.В. История Ногайской Орды / В.В. Трепавлов. – М.: Восточная литература, 2000.

5. Российский государственный архив древних актов (РГАДА). – Ф. 123. – Оп. 1. – Кн. 6.

6. Кузьмин, А.В. О происхождении рода Аминевых (к изучению истории киличеев в средневековой Руси) / А.В. Кузьмин// Государство и общество в России XV – начала XX века. Сборник статей памяти Николая Евгеньевича Носова. – СПб., 2007. – С. 116–121.

7. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Крымской и Ногайскою ордами и с Турцией с 1474 по 1505 гг. / Под ред. Г.Ф. Карпова // Сб. Императорского Русского исторического общества. – Т. 41. – СПб., 1884.

8. Назаров, В.Д. Государев двор в посольском церемониале Российского государства (конец XV – середина XVI века / В.Д. Назаров // Репрезентация власти в посольском церемониале и дипломатический диалог в XV – первой трети XVIII века.– М., 2006. – С. 91–95.

9. Тысячная книга 1550 г. и Дворовая тетрадь 50-х гг. XVI века / Подгот. к печати А.А. Зимин. – М.: АН СССР, 1950.

10. Чеченков, П.В. Нижегородский край в конце XIV – третей четверти XVI в.: внутреннее устройство и система управления / П.В. Чеченков. – Нижний Новгород, 2004.

11. «Выписка из посольских книг» о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1487–1572 гг. (сост. Б.Н. Морозов) // Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. – М.; Варшава: Археографический центр, 1997.

12. История монгалов / Дж. дель Плано Карпини. / Путешествие в восточные страны / Г. де Рубрук / Книга Марко Поло / Вступ. ст., коммент. М.Б. Горнуга. – М.: Мысль, 1997.

13. Дженкинсон, А. Путешествие в Среднюю Азию, 1558–1560 гг. /А. Дженкинсон // Английские путешественники в Московском государстве в XVI веке. – Рязань: Александрия, 2007.

14. Посольские книги по связям России с Ногайской Ордой. 1489–1549 гг. / Сост. Б.А. Кельдасов, Н.М. Рогожин, Е.Е. Лыкова, М.П. Лукичев. – Махачкала, 1995.

15. Посольские книги по связям России с Ногайской Ордой. 1551–1561 гг. / Сост. Д.А. Мустафина, В.В. Трепавлов; ответ. научн. ред. М.А. Усманов. – Казань, 2006.

16. Комиссаренко, А.И., Моисеев, М.В. Астраханское ханство по документам ногайской посольской книги за 1551–1556 гг. / А.И. Комиссаренко, М.В. Моисеев // Исторический архив. – № 2, 2004. – С. 199–209.

17. РГАДА. – Ф. 127. – Оп. 1. – Кн. 6.

Герасімава І.В.

«А КАК, ГОСУДАРЬ, ПРИШЛИ В ВИЛЬНУ ТВОИ ГОСУДАРЕВЫ ПОЛКИ»: ЭПІЗОД З ЖЫЦЦЯ СТАЛІЦЫ ЛІТОЎСКАГА КНЯСТВА ПАДЧАС «ПАТОПУ» (1658 г.)

Эпізод з прыходам у Вільню ў пачатку 1658 г. і кватэраваннем ў ёй пяці рускіх палкоў з'яўляецца невялікім, аднак паказальным фрагментам карціны штодзённага жыцця сталіцы Вялікага Княства Літоўскага (далей ВКЛ) падчас кіравання ў ёй акупацыйнай маскоўскай улады, што затрымалася ў горадзе на шэсць гадоў (1655–1661). Цалкам гісторыя рускага ўладарства ў Вільні, якое пачалося ад захопа сталіцы ў жніўне 1655 г. і скончылася ў 1661 г. пакараннем смерцю рускага ваяводы Данілы Яўфімавіча Мышэцкага на віленскай плошчы, досыць вядомая ў гістарыяграфіі XIX–XX стагоддзяў [57, с. 48–77; 62; 67, s. 40–50; 69; 70]. Аднак у апошнія часы былі выяўлены новыя комплексы дакументаў, якія дазваляюць больш падрабязна рэканструіраваць дадзены перыяд жыцця Вільні пад рускім царом. Гэта перш за ўсе матэрыялы віленскіх Суднай і С'езжай ізб – кіраўнічага і судовага інстытутаў, належачых рускай уладзе, якія былі апісаны і ўведзены ў навуковы зварот Э. Мэйлусам [59, 68]. Апрача гэтых крыніц, у даследванні былі выкарыстаны акты, якія датычацца перапіскі рускіх вайскоўцаў з ваяводамі, ваявод з царом і прыказамі, указныя гасударавыя граматы, а таксама дакументы з кніг віленскага гарадскога суда і віленскага магістрата.

Цэнтральным прадметам вывучэння віленскіх дакументаў 1658 г. стаў складаны клубок узаемаадносін паміж рознымі сацыяльнымі групоўкамі віленскага асяроддзя, якое на той час складалася з мяшчан, члонкаў віленскага магістрата, рускіх салдат, а таксама рускай ўлады у постацях ваяводы, суддзі і палкоўнікаў. Як суіснавалі ў адным горадзе жыхары розных дзяржаў? Якую ролю адыгрываў віленскі ваявода князь М.С. Шахаўской ў кіраванні новай сітуацыяй з прыбыццем пяці палкоў? Якую ролю выконвалі новапрыбылыя палкоўнікі? Як складаліся адносіны паміж палкоўнікамі і ваяводай, палкоўнікамі і мяшчанамі? І, на прыканцы, як ставіўся рускі цар да сітуацыі, якая стварылася ў Вільні ў сувязі з квартэраваннем шматлікага ваеннага кантынгента?

Пасля заняцця сталічнай Вільны некалькі тысяч чалавек рускага гарнізона пад уладай рускага ваяводы і палкоўнікаў кантралявалі

акупіраваны горад і паветы, збіраючы з жыхароў падаткі – грашыма, натуральнымі прадуктамі і жывёламі, а таксама актыўна выкарыстоўваючы мясцовыя людзкія рэсурсы. Частка кантынгента рускіх палкоў складалася з тутэйшых сялян, якіх бралі салдатамі ў палкі; мясцовая шляхта вярбавалася часцей цэлымі харугвіямі, якія прысягалі на вернасць рускаму цару. Становішча ў горадзе значна змянілася ў мае 1657 г., калі ў Вільню прыйшла чума. Эпідэмія, падкасіўшая да паловы насельніцтва і нашмат скараціўшая колькасць русскай прасутнасці ў горадзе, трвалася амаль год. У пачатку 1658 г. «моравае паветра» сціхла і ў Вільню зноў пачалі вяртацца мяшчане, якім пашчасціла перачакаць разгул смяротнай хваробы па-за яе межамі.

У гэты ж час выйшаў царскі указ аб размяшчэнні пяці гасударавых палкоў ў Вільні. Гэта вырашэнне было звязана не столькі з жаданнем цара ўзмацніць паслабеўшую пасля эпідэміі чумы абароназдольнасць горада, колькі дыктавалася ваенна-палітычнымі абставінамі. Пункты віленскай дамовы 1656 г. польскім бокам не выконваліся: асабліва зачапіла цара зацягванне каралём Янам Казімірам арганізацыі сейму, дзе б разгледжвалася пытанне аб абранні наступным манархам Рэчы Паспалітай Аляксея Міхайлавіча [65, с. 310]. Цар вырашыў правесці новыя руска-польскія перамовы (паралельна з руска-швецкімі) ў Вільні ўлетку 1658 г. з улікам сучаснай змяніўшайся сітуацыі на знешняпалітычным курсе. Усведамляя, што перамовы могуць сарвацца і трэба будзе весці ваенныя дзеянні, каб замацаваць за сабой акупіраваныя тэрыторыі, руская ўлада пачала сцягваць да Вільні ваенную моц [65, с. 312]. На прыканцы лютага 1658 г. ў сталіцу з розных гарадоў ВКЛ прыбылі пяць новых палкоў: Томаса Беля з Барысава, Даніэля Краферта са Смаленска, Юрыя Кіта і Адама Гохварта з Магілёва, Кашпіра Яндэра са Шклова [37, арк. 1; 25, арк. 2–3].

Паводзіны прыбылых вайсковых людзей адразу з’явіліся праблемай як для мясцовых жыхароў, так і для рускага ваяводы Шахаўскога, які стараўся праводзіць палітыку мірнага суіснавання з мяшчанамі: пасуламі, льготамі, «приветом и лаской» ужо некалькі гадоў дабіваючыся пазітыўнага стаўлення да новай улады. Салдаты прыбылых палкоў, якіх расскватэравалі ў Вільні, ў «порожних избах» у гасподах мяшчан, сталі выкідаць віленцаў з дамоў і самі засяляцца ў іх [29, арк. 1]. Пустыя, кінутыя дамы «в большом городе, и за городом, и в слободах» яны разбіралі і пускалі на дровы [29, арк. 3]. Між тым «старыя» рускія салдаты, якія жылі ў Віленскім Замку разам з ваяводай, хадзілі за дровамі ў лес, як і мясцовыя жыхары [29, арк. 3]. Незадаволенымі ад такога сусед-

ства былі і жыхары блізлежачых паветаў Віленскага ваяводства, у якіх «полков полковники и началные люди посылают в поветы: у шляхт и у крестьян сена берут силно и иные многие налоги шляхтам и крестьянам чинят» [25, арк. 5].

З мясцовымі прадуктамі – хлебам, мясам для новапрыбылых салдат было напружана. Вясновы паводак перашкодзіл пасланаму ваяводай паручыку прывезці сабраны з непрысяжнай шляхты хлеб і «жываціну рагатую», якая была ўзята ў Ашмянскім павеце: «а до Вилны провадит никойми мерами нелзе, потому что воды велики и грези, а хлеб скоро молотит нелзе, потому сыр» [18]. Вырашана было пакінуць жывёлаў ў паветах, а як сойдзе паводак – прыслаць у Вільну [19].

Сітуацыя моцна ўскладнялася тым, што салдатам пяці палкоў на два месяцы – сакавік і красавік – затрымалі выплату жалавання: «А твоего государева жалованя месячнова корму на март и на апрель денгами не дано, и мы, холопи твои, на твоей государеве службе в Вилне живем другой месяцъ без корму и помираем голодною смертью. И нам, холопям твоим, стала скудость великая с соли; и харчю, и бую купить нечем. А безпрестанно, государь, мы, холопи твои, на твоих государевых караулех стоим наги и босы» [16, арк. 1–2]. У пачатку красавіка яшчэ не было прыслана ў горад пра гэта дзяржаўнага ўказу; а ў С’езжую ізбу прыходзілі ратныя людзі пяці палкоў і білі Шахоўскаму чалом «полковники и началные люди и салдаты о твоемъ великого государя жаловане – о месечном, о денежном [упісана над радком. – І.Г.] корме безпрестанно» [17, арк. 1]. Хутка пасля адсылкі ваяводай адпіскі цару адносна гэтых чалабіццяў з прозьбамі аб выплаце грошаў прыйшоў ліст ад смаленскага ваяводы князя Пятра Аляксеевіча Даўгарукава. У лісту ён паведамляў пра затрымку грашовых сродкаў. Сама грашовая казна была даслана з Масквы ў гарады Літоўскага княства яшчэ 20 снежня і для Вільны было выдзелена пэўная сума: срэбных грошай – 2401 рубль адзін алтын, медных грошай – 7335 рублей 20 алтын два гроша («деньги»), яфімкаў і чвэрцін – 2161 рубль 28 алтын [20, арк. 2, 6–7]. Салдатам належала раздаваць «мелкія срэбныя і медныя грошы і яфімкі па трэццям» [20, арк. 3]. Калі царскія цалавальнікі з казной даехалі да Барысава і Мінска, то ваяводы гэтых гарадоў падмянілі большую колькасць срэбных грошай і яфімкаў, прызначаных для Вільні, медзянымі манетамі [20, арк. 8–9, 6]. Выдаць ўсё жалаванне віленскім салдатам аднымі медзякамі было немагчыма, бо гэта прывяло б да іх незадаволенасці, акрамя таго, яшчэ б больш ускладнілася сітуацыя з прадуктамі. Не жадая таргаваць за рускую медзь, якія ўсе прадаўцы павінны былі браць пад страхам суровай

кары, паветныя жыхары часта ўвогуле адмаўляліся ад тарговых паездак ў Вільню [47, s 9; 67, s. 128, 60, c. 35].

Пасля таго, як падлог з медзянымі манетамі быў раскрыты, ваяводам Барысава і Мінска быў дан наказ вярнуць ў Вільню срэбраныя грошы і яфімкі, але аказалася, што грошы ўжо былі розданы салдатам гэтых гарадоў на жалаванне [21, арк. 6]. Віленскаму ваяводзе Шахоўскаму ў Іназемскам прыказе замест недашэдшых грошаў паабяцалі даслаць ў дадатак да медзякоў 11901 рубль 16 алтын срэбнымі, медзянымі грошамі і яфімкамі «па трэццям» [21, арк. 7]. А пакуль грошы не прыйшлі, ваявода выдавал рож салдатам безграшова ў залік будучага жалавання [22].

У сувязі з вышэйзгаданым нядзіўным уяўляецца тое, што вайскоўцы пачалі актыўна красці неабходныя для жыцця рэчы і прадукты ў мясцовых жыхароў. Віленскі рынак стаў месцам частых набегаў з боку рускіх прыбылых салдат [23, арк. 1–2]. У красавіку сітуяцыя выйшла з-пад кантролю: 16 дня салдаты масава атакавалі рынак. Прыбегшыя ў Судную ізбу мяшчане сказалі суддзе Ілле Манастырову, што салдаты новых палкоў «рынак увесь разграбілі» – хлеб, калачы, рыбу і грошы адымаюць, а караульшчыкаў, пастаўленых сцерагчы рынак – «каб салдаты моцна хлеба, і харчу, і грошай не адымалі» – усіх перабілі [23, арк. 3–4].

Ваявода прыняў жорсткія меры і наказаў выпараць батагамі паручыка Філіпа Прэшэра і прапаршчыка Міхайла Канстантынава з палку Томаса Белі, якія стаялі на рынку і глядзелі, як салдаты яго абкрадваюць, але нічога не зрабілі для іх суцішэння [28, арк. 2]. Віленскія мяшчане апазналі аднаго з актыўных удзельнікаў пагрому – салдата Данілава палку Краферта Акмайку Шчадру, татарына. Шахоўскі павёў Акмайку на Судны двор для біцця кнутом, за ім «шли салдаты тех новых полков, человек с пятсот з болшим шюмом и с криком до Суднова двора, и хотели тово салдата отбить» [28, арк. 3]. Калі Акмайку сталі біць кнутом, адзін п'яны салдат палка Васіля Кунінгама стаў выкрыкваць з таўпы: «Отнимите де тово салдата – бить не давайте!», за што сам затым быў наказаны кнутом [28, арк. 4].

Шахаўской, разумеючы тое, што адказваць за пагром прыйдзецца перш за ўсе яму, на сваю рызыку без гасударава указа вырашыў выдаць салдатам з віленскай казны па яфімку на чалавека з далейшым вылічэннем гэтых грошай з іх будучага жалавання [23, арк. 6]. У адпіскі цару ваявода апраўдваўся, што быў вымушаны пайсці на такія меры «для таво, чтоб оне воровства какова болшово не учинили и с твоей бы, великово государя, службы не розбежались, а мне б, холопу твоему, в том

от тебя, великого государя, в опале не быт» [23, арк. 6]. Государаву казну прывезлі ў Вільню 30 красавіка [24, арк. 3–6].

Пасля гэтага выпадку абвострыўся канфлікт паміж ваяводай і палкоўнікамі. Новапрыбылыя палкоўнікі лічылі, што яны не абавязаны ні ў чым падпарадкоўвацца ваяводзе, спасылаючыся на тое, што іх прыслаў у Вільню гасудар: «говорил мне, холопу твоему, полковник Томос Бели при полковниках, при Даниле Краферте да при Юре Ките, и при многих началных людех… что ему полковнику твоих государевых бояр и воевод ни в чем слушат не велено» [23, арк. 7]. Асаблівую незадаволенасць вызвала ў ваенных чыноў тое, што іх падначаленых віленскі ваявода прыказваў за правіннасці біць батогамі і кнутом [23, арк. 7]. Палкоўнікі лічылі, што салдаты падлягаюць толькі іх суду, у сувязі з чым наказвалі жыхарам прыходзіць і жаліцца на вайскоўцаў не ў Судную ізбу рускаму суддзе Ілле Манастырову і не ваяводзе Шахаўскому ў С'езжую ізбу, а да напрамую да іх. Гэта, у сваю чаргу, вызвала пратэсты ў мяшчан, якія на чале з войтам Язупам Пятровым пачалі скардзіцца цару праз ваяводу: «полковники велят нам, холопемъ твоим и сиротам, на салдат, которые чинят нам кривды и обиды большие, обо всякой управе приходит и бит челом к себе. И которых салдатъ имеютъ по улицам, которые бьют, и отымают, и шапки хватают, и мошни режут, и тех салдат велят приводить к себе ж. А мы, холопи твои и сироты, в своих кривдах и обидах бить челом полковникам не хотим, потому что они нам чинят кривды и обиды болшие в домех наших, и на торгах, и по улицам, и они, полковники, справедливости нам никакой не чинят» [29, арк. 2]. З двух зол віленцы выбралі найменшае і прасілі цара ў чалабітных, каб гасудар дазволіў ім вырашаць канфлікты праз ужо вядомую ім мясцовую ўладу, ва «всяких обидах наших судить по-прежнему безволокитно воиводе князь Михайлу Семеновичю Шаховскому» [29, арк. 2].

У чалабітных віленскіх мяшчан цару нічога не было заяўлена пра канфлікты паміж мяшчанамі і рускімі вайскоўцамі, якія датычыліся сэксуальных сувязяў замужніх мясцовых жанчын з апошнімі. Але такія скаргі існавалі: яны былі запісаны ў кнігах віленскага магістрата. Аскаржоныя мужчыны прыходзілі да сваіх суайчыннікаў, а не да рускай улады, з надзеяй на падтрымку іх асабістых спраў мясцовым асяроддзем.

Трагедыя разыгралася ў сям'і віленскага саладоўніка Матыса Йодэшкі. Яго жонка Анна пакінула дзяцей і мужа. Выказаўшы супругу «ty mnie nie godznien chłopie prosty» («ты мне не годны, хло-

пец просты»), яна пайшла жыць да рускага паручыка. Калі разгневаны мужык пайшоў да паручыка забіраць жонку, то палюбоўнік «благавернай» параніў яго шабляй ў лапатку [71, s. 113–115]. Да скаргі саладоўніка была зроблена прыпіска, што яго жонка Анна «publice z panem poruczykiem mieszka, na jedynym łożku sypia, obiady i bankiety, męża z dziatkami porzuciwszy, co dzień u pana porutczyka sprawuje. Ktorą pan poruczyk sukienki, trzosicki i panczoszki jako swej własniej żonie daje» («адкрыта жыве з панам паручыкам, спіць на адным ложку, абеды і банкеты, мужа і дзяцей пакінуўшы, штодзень у пана паручыка спраўляе. Ёй пан паручык сукенкі, паяскі і панчошкі, як сваёй уласнай жонке, дае») [50, л. 72 зв.].

Пусцілася ў загул жонка віленскага мяшчаніна Яна Бяляўскага. Мужык застаў сваю жонку Еву «na pustym placu, ktory niedaleko domu pana Przewoyny Jerzego, ciescia jego, a oyca pomienioney małżonki na Rudnickiey ulicy iest, tamże w izdebce pustey murowaney nałazł ją z trzema moskalami, niepodciwy uczynek sprawujący» («На пустыры, які знаходзіцца недалёка ад дома пана Ежы Пшэвойны, яго цесця і бацькі памянёнай жонкі, на Рудніцкай вуліцы; там жа ў пустай каменай хатцы знайшоў яе з трыма маскалямі, непачцівы ўчынак спраўляючай») [49, арк. 20.]. На гэтым жонка не спынілася і, пасля чарговай здрады, 20 лютага Бяляўскі жорстка яе збіў нагайкай. Цесць, празнаўшы пра гэта, пайшоў у Судную хату да рускага суддзі Манастырова жаліцца на зяця. Прышоўшыя за Бяляўскім з Суднай хаты караульшчыкі пабілі мужыка абухамі і павялі ў аковах да суддзі. Бяляўскі адкупіўся ад апошняга за 5 злотых і яшчэ 10 прыйшлося яму заплаціць у якасці штрафа [48, арк. 19].

Агульная сітуацыя ў горадзе прывяла да таго, што частка гаражан, планаваўшых вярнуцца пасля чумы ў Вільню, не спяшалася гэтае рабіць: «А как, государь, пришли в Вилну твои государевы полки, и полские люди учели быть боязны и страшны, и из Жмуди, государь, многие виленские мещане, хотя быть в Вилну каторые, по се число не бывали по твою государьскую высокую руку» [25, л. 5][1]. Характэрна, што менавіта ў гэты ж час назіраюцца масавыя чалабітныя купцоў і віленскай эліты,

[1] Усе цытаты ў артыкуле даюцца, дзе гэта магчыма, па арыгіналах, а не па выданням XIX стагоддзя – «Акты исторические» [51; 52] ці «Акты Московского государства» [53; 54], паколькі апублікаваныя там дакументы маюць значныя скажэнні. Гл. падрабязней пра «Акты Московского государства» [57]. Што датычыцца дакументаў, якія былі надрукаваны ў «Актаў гістарычных», то ў гэтым выданні акты былі апублікаваны не па арыгіналах, а па польскай копіі 20-х гг. XIX стагоддзя, зробленай лацініцай, якая зараз захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы [45].

жадаючых паехаць за таварам у Кёнігзберг (Кралевец)[2]. Апрача гандлёвай дзейнасці, магчыма, мяшчане, знайшоўшы зручную прычыну, імкнуліся хутчэй з’ехаць з напоўненай рускімі палкамі Вільні ў больш спакойныя мясціны.

Каб дабіцца паляпшэння свайго становішча – вярнуць правы і вольнасці, дараваныя гораду каралямі і вялікімі літоўскімі князямі, а таксама вырашыць надзённыя пытанні – гаражане вырашылі арганізаваць пасольства ад імя сталічных жыхароў ў Маскву да цара. Такія спробы ужо прадпрымаліся і раней, ў 1657 г., аднак, з-за ўспышкі чумы далей Барысава пасланнікаў не прапусцілі. У красавіку 1658 г. Віленскія мяшчане абралі да гэтай справы трох чалавек – войта Язупа Пятрова, радцу Пракопа Дарафеевіча і пісара Мікулая Кастравіцкага ў Маскву. Адным з апошніх пунктаў, запісаных у інструкцыі пасольству, мяшчане сфармулявалі праблемы, звязаныя з прыходам і кватэраваннем у горадзе рускіх палкоў: «Teraz zaś żołnierze Naiaśnieyszego Cara Jego Miłości świeżo do Wilna przybyli, w samym miescie stanąwszy, wielkie y nieznosne miesczanom wilenskim krzywdy czynią: na ulicach zniewazaią, szarpiaią, biią, domy w miescie y na przedmiesciu także, tez Łukiszki rozbieraią, y palą, y inne przykrosci rozne wyrządzaią. A ich miłośc pany officerowie sprawiedliwosci sami nie czynią, y jego miłosci panu woiewodzie czynic nie pozwalaią» («Зараз жа салдаты наяснейшага цара яго міласці нядаўна прыбылі да Вілні і, стаўшы ў самым горадзе, вялікія і нязносныя крыўды чыняць: на уліцах зневажаюць, тузаюць, б’юць, дамы ў горадзе і такжа на прадмесці, таксама Лукішкі разбіраюць і паляць, і іншыя розныя непрыемнасці учыняюць. А іх міласць паны афіцэры справядлівасці не чыняць і яго міласці пану ваяводзе чыніць не дазваляюць») [47, s. 9–10; 67, s. 129]. Віленскія жыхары прасілі цара вывезці палкі з горада, а таксама даць ваяводзе Шахаўскому паўнамоцтвы судзіць палкоўнікаў і іх падначальных [47, s. 10; 67, s. 129]. Цар праігнараваў гэтыя прозьбы, нават не ўзгадаўшы пра іх ва ўказнай грамаце, зробленай на выснове яго сустрэчы з віленскімі пасланцамі [63, с. 457–459].

---

[2] Вяводзе М.С. Шахаўскому падалі ў С’езжай ізбе чалабітныя аб ад’ездзе ў Кёнігзберг 24 мешчаніна: Ян Агурцэвіч, Кшыштаф Сакалоўскі, Сіман Канстантыновіч, Юры Паўловіч, Іван Канстантынаў, Стэфан Красоўскі, Стэфан Жэпніцкі, Захарыяш Лункевіч, Мікалай Федаровіч Пячонка, Рыгор Гражэўскі, Сямен Цімафееў, Хведар Шарэйка, Петр Працэвіч, Юзэф Міронаў Заблоцкі, Ян и Хведар Белмачэвічы, Афанас Ташніцкі, Андрэй Вярбіцкі, Васіль Сяргеевіч, Матвей Баяраў, Павел Малята, Адам Багданаў, Матвей Дзягілевіч, Кандрат Парфяновіч [31].

Нарошчванне ваеннай прысутнасці ў Вільні працягвалася вясной і летам. Да сталіцы падцягнуліся маскоўскія стральцы прыказу Сцяпана Какавінскага і Івана Ендаурава ў складзе 927 чалавек [26, арк. 1–3]. У траўні з Полацка прыйшоў полк Томаса Даліэлі і размясціўся ў прыгарадзе Вільны, у Спаскай слабадзе, нягледзячы на пратэсты віленскага ваяводы, прыгатаваўшага ім дамы ў вялікім горадзе [10, арк. 3–6]. Ваявода спрабаваў усе сродкі, каб палкоўнік падчыніўся прыказу: спасылаўся на царскі указ аб кватэраванні палка ў Вільні, выпарваў батогамі салдат палка Даліелі, якія прыносілі яму адмовы начальства, і скарзіўся цару на ганьбу. Чым скончылася гэта справа – засталося невядомым. Аднак аб тым, што ўладная моц была, хутчэй, на баку палкоўнікаў сведчыць наступны факт. У чэрвені частку салдат са старых віленскіх палкоў па гасудараву ўказу перакінулі ў новыя палкі, каб колькасць салдат кожнага з іх дацягнула да тысячы: 100 чалавек аддалі палку Даліэлі і 37 салдат пайшло ў полк Краферта [12, арк. 1]. Ваявода і старыя віленскія палкоўнікі былі вельмі незадаволены гэтым указам: «и ныне у нас, холопей твоих, во всех наших трех полках осталось з здоровых и болных солдат пятьсот дватьцеть один человек, да ис тех же наших полков тех салдат посылаютца из Вилны [упісана над стракой «посылаютца из Вилны» замест закрэсленага: «посланы». – *І.Г.*] на твои государевы розные посылки для твоих государевых всяких [упісана над стракой. – *І.Г.*] дел и нам, холопем твоим, на твоей государеве службе быт стало не с кем, и против твоих государевых неприятелей города одержать будет невмоч» [12, арк. 3]. У канцы чэрвеня ў Вільню прыйшлі вятчане – 1792 чалавека, якіх размеркавалі пароўну ў новыя палкі [11].

Як дакладна адзначыў А. Рахуба, Вільня ў гэты час становіцца перавалачным пунктам рускіх войскаў, складам, у якім трымалі ўсялякага рода жывелаў для пітанія рускіх вайскоўцаў і да якога сцягвалі ваенную зброю і боепрыпасы [70, s. 69]. Віленскіх збройнікаў абавязалі адрамантаваць і пачысціць «рейтарское и драгунское и салдацкое порченое руже, карабины и пистоли и мушкеты и всякую брон…чтоб было все в деле [закрэслена: «и в лице». – *І.Г.*] и к стрелбе готово» [9, арк. 1]. У адпіскі Шахаўской папярэджваў цара, што «вскоре, государь, руже починит не моцно, потому что многие пищалные стволы без лож, и без замков, и без казенных вюрютош, а мастеровых людей в Вилне не много: многие в моровое поветрие померли» [9, арк. 2 зв.]. Не паспелі віленскія майстры паправіць зброю і да восені: у верасні роспіс зброі так і не была прыслана з Вільні ў Маскву. Разрадныя дзякі стаміліся нагадваць ваяводзе пра рамонт зброі: «В прошлой во 7166 [1658] год посланы к тебе

наши многие грамоты, а велено рейтарское и драгунское и салдацкое порченое ружье и всякую бронь починить и устроить в крепких местех» [38, арк. 1]. Акрамя зброі, належачай рускім вайскам, у віленскай гасударавай казне меўся вялікі асартымент зброі, які быў канфіскаваны ў мяшчан. Віленцам новая ўлада забараняла мець у дамах зброю, «чтоб в приходное время с воинскими людми вместе за один не были и им бы ружья никакого не продавали и не отдавали» [1, арк. 396; 52, с. 39]. За час свайго кіравання горадам Шахаўской сабраў з мяшчан 69 шабляў, 2 палаша, 118 мушкетных, карабінных і пістольных пішчаляў, 12 шпаг, 6 лукаў, звыш 500 страл, 13 чэканаў, 39 бердышаў, 3 тапарка, 3 пратазана, 13 рагацін [1, арк. 396; 52, с. 39].

Пушкарскага нарада ў Вільні не было, па меншай меры, да канца лета. Яго князь Ю.А. Даўгарукаў яшчэ ў лістападзе 1657 г. перавез ў Полацк [5]. У былым віленскім нарадзе меліся наступныя пушкі: «Мядзведзь», «Сапегін пасынак», пушка Белеўская (з Белева), чатыры галанскія пушкі, дзве драбавыя, тры вогненыя, 10 пушак шклоўскіх і магілеўскіх, адна жалезная, дзве зацінных (ад слова *зацін* – зарад). Апрача пушак, у нарад уваходзілі 165 зацінных пішчаляў і 146 зацінных стволоў [44, арк. 22]. Акрамя таго, на Замкавай плошчы стаялі дзве трафейныя вялікія пушкі, выкапаныя ў 1656 г. каля двара князёў Радзівілаў [2; 54, с. 508]. Калі улетку стала канчаткова вядома, што перамовы рускага пасольства з польскімі камісарамі ўсе ж такі адбудуцца, 20 чэрвеня ў Вільню накіраваўся акольнічы і ваявода, князь Ю.А. Даўгарукаў са сваім войскам [65, с. 373]. Ен і прывез назад з Полацка ў Вільню пушкарскі нарад: «наряду, и зеля, и свинцу, и всяких пушечных и хлебных запасов, и драгунского ружя мы, холопи твои, из Полоцка к Вилне…взяли» [8, арк. 43; 54, с. 607].

Магчыма, што ў ліпні ен ужо быў пад Вільняй, паколькі 4 жніўня князь сустрэўся з вялікімі пасламі і скрадзіўся на тое, што ў салдат яго войска скончваюцца харчовыя запасы і, калі польскія камісары ў хуткім часе не прыедуць і перамовы не пачнуцца, то вайскоўцы паразбягаюцца з палкоў. Сустрэча скончылася агульным рашэннем сарваць перамовы і раз’ехацца: паслы выехалі з Вільні, а Даўгарукоў з войскам пайшоў паходам у бок Коўны, на Жэмайцію [65, 392–393]. Аднак цар указам вярнуў і тых і другіх назад у Вільню [65, 402].

Пасля прыезду Даўгарукава ў горад адбылася перадача ваяводай Шахаўскім у кіраванне акольнічага расскватэраваных у Вільні палкоў, у якіх было на той момант 4656 чалавек (за выключэннем начальных людзей), атрадаў прысяжнай шляхты – 3891 чалавек, двух маскоўскіх

кавалёў і віленскага мешчаніна, працаваўшага тлумачом [13, л. 4–5]. Юрыю Аляксеевічу таксама было выдана «пушек и ядер и мушкетов и фетилю и всяких пушечных и полковых запасов» з віленскай гасударавай казны [13, л. 5–6].

У сувязі з прыходам палкоў Даўгарукага ў Вільню клапоты па забеспячэнню іх пастоя паляглі на плячыма мясцовых жыхароў, якія мусілі перамалаціць сабраны для салдатаў у паветах хлеб, перавезці ў Вільню і скласці ў жытніцах, каб да прыходу ратных людзей ўсе было падрыхтавана [7; 54, с. 621]. Жыхароў абавязалі аддаць свае падводы для палкоў Даўгарукава[3]. Усяго з мяшчан і з паветнага насельніцтва было сабрана 547 падвод [13, л. 5].

Трывожная ваенная абстаноўка вакол Вільні нагняталася на працягу ўсяго года. Калі ў горадзе і яго прыгарадах паступова кантцэнтраваліся асноўныя сілы русскіх войскаў, то ў паветах Віленскага ваяводства гаспадарылі жаўнеры караля і гетманаў В. Гансеўскага і П. Сапегі. У ваеводстве царыў хаос: шляхта падзялілася на тых, хто служыў рускаму гасудару і тых, хто быў верны польскаму каралю. У паветах ішла грамадзянская вайна: шляхетныя атрады чынілі разбойніцкія нападзенні на ўладання суайчыннікаў. Да Шахаўскога ў гэты перыяд часта прыходзіла прысяжная шляхта са скаргамі на спусташэнне іх маёнтках польскімі вайскоўцамі: «а желныри, государь, королевские и гетманские безпрестани твои государевы поветы грабят и разоряют от Вилны в ближних местех верстах во шестидесят, и в пятидесят, и менши» [3, арк. 169; 54, с. 601]. Жаўнеры караля і гетманаў вывазілі з паветаў скот, выбіралі хлеб у маёнтках прысяжнай шляхты [33, арк. 1–2; 35]. Шляхціцы Ашмянскага павета палка Мікалая Сухціцкага, прысягнуўшыя царю, былі аграблены і пазбіты жаўнерамі Гансеўскага, якія уварваліся ў іх маёнткі і парубілі іх сем'і і чэлядзь [36]. У той жа час «конпанея» шляхціцаў таго ж палкоўніка «яго царскай міласці» пана Сухціцкага разбойнічала ў Ліцкім павеце [34]. У сваю чаргу прысяжная цару шляхта Ліцкага павета, забіўшы рускага капітана Міхайла Власьева, адабрала ў яго гасудараву грашовую зборную казну [4, арк. 39; 54, с. 616].

Спрыялі актывізацыі ваенных дзеянняў у княстве каралеўскія ўнівярсалы, заклікаўшыя мясцовых жыхароў да адкрытай барацьбы [61, с. 151]. На прыканцы лета гетманскія вайскі ўчынялі актыўныя ваенныя

[3] У інструкцыі, дадзенай мяшчанамі віленскаму пасольству ў Маскву, быў пункт аб асвабаджэнні мяшчан ад павіннасцяў, звязаных з ваенным часам – аддача падвод, развоз лістоў паслам, салдацкіх стацый і г.д. Гэтыя прозьбы цар Аляксей Міхайлвіч праігнараваў, што відаць і на прыкладзе канкрэтнага выпадку [46, s. 4].

дзеянні ў Віленскам, Трокскам, Ваўкавыскам, Слонімскам, Лідскам, Навагрудскам паветах, паўсюдна рабуя і забівая рускіх ратных людзей, якія стаялі там на залогах: «королевские жалныри около Вилны стоят в поветех кругом и их де, салдат, рубят и в полон емлют, и ис поветов вон выбили, всех хлебных запасов и денежных доходов на тебя, великого государя, выбират не дали» [4, арк. 42; 54, с. 616]. Узятых ў плен салдат жаўнеры «и мучили, и роспрашивали: где стоят из Вилны на залогах началные люди, и сколко де в Вилне войска?» [4, арк. 43; 54, с. 616]. Сагнаныя з паветаў рускія салдаты, якія прыходзілі да Вільні, папярэджвалі ваяводу пра хуткае наступленне літоўскіх войскаў на горад: «и гетманы, государь, Сапега и Гансевской идут к Вилне со всем войском» [4, арк. 44; 54, с. 617].

У верасні рускія салдаты заўважалі ўсе большае збіранне войскаў Літоўскага княства па абедзвум бакам ракі Віліі, што «от той тесноты польских людей твоим ратным людем стало утеснение большое: всякими запасы оскудали и конских кормов взять негде» [54, с. 613]. Гетман Гансеўскі з войскам падыйшоў да Вільні 27 верасня і стаў абозам, а Сапега размясціўся са сваімі людзямі ў 10 верстах ад сталіцы [54, с. 613]. Прысяжная цару шляхта масава далучалася да войскаў Літоўскага княства. Сапега разсылаў лісты шляхце ў паветы, склікая яе збірацца на бой, «чтобы против государевых ратных людей все были готовы» [15, л. 2]. Літоўскія войскі заблакіравалі ўсе подступы да горада, не прапушчая ні людзей, ні сялян з правізіяй, адганяя з прыгарадаў Вільні стада кароў і каней [54, с. 613].

Рускія вайсковыя рады папоўніліся ў верасні: да горада падышлі 380 казакоў на чале з ваяводай Васілем Валынскім, белгарадскі полк Ягана Краферта ў складзе 1250 чалавек і дзесяць маскоўскіх стральцоў [6]. Кіруючы рускімі войскамі Далгарукаў не спяшаўся даваць наказ уступаць у бой, чакаючы вынікаў мірных перамоў пасольства Адоеўскага з каралеўскімі камісарамі, якія праходзілі ў стане, «в десяти верстах от Вильны» [54, с. 623]. Калі прыйшлі навіны аб тым, што паслы не дамовіліся аб перамір’і і раз’ехаліся, было прынята рашэнне пачынаць бітву [54, с. 614]. Бой рускіх войск з жаўнерамі гетмана Гансеўскага адбыўся 11 кастрычніка 1658 г. за ракой Віліяй, скончыўшыся перамогай рускай раці: войска Гансеўскага было разбіта, а яго самога ўзялі ў плен. Сапега з жаўнерамі не паспеў злучыцца з войскам Гансеўскага, і дазнаўшыся аб тым, што войскі польнага гетмана разбіты, адышоў у бок Навагрудка да ракі Неман [54, с. 614].

Праз некалькі дзен пасля перамогі русскія войска пад камандаваннем Далгарукава разам з паўнамоцнымі пасламі выйшлі з Вільні ў бок

Масквы [54, с. 614]. Прычынай такога хуткага адыходу з горада стала адсутнасць у ім хлебных запасаў і конскіх кормаў, у сувязі з чым салдаты пачалі разбягацца: «в полках стало малолюдно» [54, с. 614]. З выплатай грошай салдатам узніклі цяжкасці: грашовая казна да Вільні ізноў не паспела даехаць. У кастрычніку Далгарукаму было прыказана зрабіць крупны грашовы займ у палкавых чыноў і віленскіх мяшчан: «и вы б до тех мест, как к вам нашу великого государя казну в Вилну привезут, собрали взаймы всяких чинов у ратных людей, а будет у наших ратных людей денег собрат немочно, и вы б драгуном и салдатом на кормъ денги занели у буймистров, и у райц, и у лавников, и у жидов, и у иных всяких чинов у богатых людей» [40]. Верагодна, што так і была зроблена, паколькі ў лістападзе грашовая казна толькі дайшла да Смаленска. У канцы гэтага месяца Далгарукаў інфармаваў цара, што, паколькі жалаванне са Смаленска ў Вільню так і не было прыслана, грошы прыйшлося выдаваць з тых сродкаў, «которые денги к нам, холопем твоим, присланы были с Москвы на роздачю рейтарским полковником и их полков началным людем, и которые денги взяли мы, холопи твои, в Вилне у воиводы, у князь Михайла Шеховскова» [42, л. 3].

Вайскоўцы працягвалі уцякаць з рускіх палкоў і па дарозе ў Маскву, чым карысталіся атрады паветнай шляхты, падпільноўваўшыя «адсталых» ад войска салдат і забіваўшыя іх. Адзін з такіх выпадкаў здарыўся пад мястэчкам Войстэчка ў Ашмянскім павеце. Мясцовая шляхта на чале з суддзею Янам Карэвай пляніла там 43 рускіх салдата, якія, «собравшись из розных полков, стороннею дорогою для хлеба, и хотели пройтить на Борисов» [14, л. 6]. Паабяцаўшы праводзіць рускіх вайскоўцаў у палкі, калі яны здадуцца без бою, шляхцічы ўзялі 35 пленных сабе па хатах, частку з якіх потым забілі, а астатніх «пасажалі на воду» [14, л. 7].

Пешага строю палкі пайшлі на службу згодна гасудараву ўказу ў розныя гарады: полк Т. Даліэля – у Полацк, Д. Краферта – у Смаленск, А. Гохварта – у Віцебск, Ю. Кіта – у Магілёў, К. Яндера – у Шклоў і Т. Белі – у Барысаў [45]. Горад атрымаў поўгадавую перадышку да наступнага прыходу ў траўні 1659 г. чатырох рускіх палкоў [39].

У канцы года віленскі магістрат падлічваў прыходы і расходы. Прыход у 1658 г. склаў 142 копы 9 грошай, что было трохі больш, чым у моравы год, калі у першы квартал мяшчане сабралі 20 коп літоўскіх [51, арк. 12][4]. Па-ранейшаму, найбольш даходныя артыкулы

[4] Для параўнання: да рускага заваявання віленскі гарадскі даход складаў у сярэднем 3000 злотых [29].

гарадскога бюджэта заставаліся ў заведванні ваяводы Шахаўскога, негледзячы на тое, что цар даў згоду віленскаму пасольству на вяртанне магістрату гэтых даходаў: «а до того, што вага, гостыны, бочки медне, подужное бруковое, откуль тако ж немалые приход был, в заведываню князя Михайла Семеновича Шоховсково, воиводы виленскова, остают – щого всего сам пан воивода его царьского величества ответ даст» [31, л. 9–10]. Верагодна, ва ўмовах, калі востра не хапала грошай на кармленне вялікай рускай арміі, расквартэраванай у Вільне, ваявода Шахаўскі на месцы не быў гатовы да выканання шчодрых царскіх падарункаў.

Жыцце мяшчан у 1658 г., такім чынам, працякала ва ўмовах нарошчвання ваеннага кантынгенту ў Вільні, стычак з рускімі салдатамі, працы для забяспечвання харчам і зброяй навапрыбылых палкоў, а таксама выцягвання з насельніцтва грошай і прадуктаў. Гэта ускладнялася перманентнай вайной у паветах, якая потым перарасла ў адкрытыя ваенныя дзеянні, якія праходзілі ў непасрэднай блізкасці ад сталіцы. З канца жніўня, а можа быць і крыху раней, Вільня і яе жыхары жылі у блакадзе, якую стварылі іх суайчыннікі. Засталося невядомым – якую стопень свабоды руха мелі віленскія мяшчане ў гэты момант і ці мелі яны магчымасць выяхаць з горада ў бяспечныя мясціны.

Традыцыйныя віленская ўлада – магістрат – не меў аніякага ўплыву на сітуацыю ў гэты перыяд. Яго дзейнасць супраць вайскоўцаў абмяжоўвалася калектыўнымі чалабітнымі цару, якія не садзейнічалі паляпшэннію іх становішча. Віленскі гарадскі суд таксама нічым не мог дапамагчы ў канфліктным сітуацыях мяшчан з рускімі вайскоўцамі, нават ў тых выпадках, калі яны датычыліся сэксуальных вольнасцяў, дапушчаных віленскімі замужнімі жанчынамі ў адносінах да рускіх салдат альбо наадварот. Верагодна, пасольства, арганізаванае магістратам, адбылося не без падтрымкі рускага ваяводы Шахаўскога, які праз гэта жадаў неяк паўплываць на навядзенне парадка ў Вільні і адвесці ад сабе магчымы гнеў цара. Аднак пасольства ў цэлам не апраўдала чаканняў ні ваяводы, ні мяшчан. Саступкі, якія зрабіў для віленцаў Аляксей Міхайлавіч, заставаліся на той момант на паперы. Прозьбы мяшчан, якія супярэчылі палітыцы цара на заваяваных землях – аддаць паўнамоцтвы вайсковага суда віленскаму ваяводдзе, убраць з горада новапрыбылых вайскоўцаў, не прымаць мяшчанам удзел у іх забяспечванні ці адмяніць хаджэнне медзяной манеты – увогуле не былі ім заўважаны.

Ваявода Міхайла Шахаўской у дадзеным выпадку аказаўся паміж дзвух агнеў. З аднаго боку, адносны парадак у сталіцы і клімат ўзаемацярпення, якія яму ўдалося дасягнуць за тры гады кіравання ў Вільні, падштурхоўвалі яго у канфліктах з вайсковымі палкоўнікамі пераходзіць на бок віленскіх мяшчан і адстойваць іх інтарэсы. Вялікую ролю ў гэтым адыгрываў жах апалы, якую ен мог палучыць за невыкананне сваіх абавязкаў у якасці віленскага ваяводы. У некаторых момантах Шахаўскому прыйшлося выходзіць за рамкі сваіх паўнамоцтваў і без гасударава указа самому прымаць хуткія меры па стабілізацыі становішча ў горадзе. З іншага боку, на ваяводу былі ўзнесены новыя абавязкі па кватэраванню, забеспячэнню харчам і зброяй рускіх палкоў, якія ен выконваў за кошт жыхароў, разбурая і без таго галечае мясцовае насельніцтва.

Новапрыбылыя ваенныя палкоўнікі лічылі сабе гаспадарамі на пакоранай зямлі, сілай, якая не павінна падпарадкоўвацца мясцовым правілам. Спробы ваяводы пры дапамозе цялесных пакаранняў заставіць новапрыбылых людзей саблюдаць парадак у горадзе прыводзілі да бунтаў з боку вайскоўцаў і іх палкоўнікаў. Падобна, што цар у канфлікты мясцовага ваяводы з палкоўнікамі ня ўмешваўся і ад даго апошнія яшчэ больш адчувалі сваю ўседазволенасць.

У новапрыбылых салдат, у адрозненні ад старых вайскоўцаў, не было зацікаўленасці ў навядзенні парадку ў горадзе і захаванні добрых адносін з мяшчанамі. Яны ведалі, што прыйлі сюды ненадоўга і чакалі ваеннай справы, каб можна было пажывіцца за кошт вайны. Новапрыбылыя салдаты успрымалі мясцовых жыхароў як ворагаў, з якімі нельга лічыцца, а іх горад – як заваяваную рускімі тэрыторыю, якую можна разграбляць да астатку. Хранічная затрымка грашовых сродкаў, якая цягнула ў сваю чаргу скудасць салдацкага корму, турхала вайскоўцаў на самавольствы і разбой, падагравая і без таго накаленую атмасферу ў сталіцы ВКЛ.

Па думке Б.Н. Флоры, пасля адходу войска Далгарукава з Вільні ў Смаленск, руская ўлада ў заходных вобласцях княства фактычна перастала існаваць, паколькі малалікія рускія гарнізоны аказаліся ў акружэнні варожай моцы [65, 423]. З гэтым можна згадзіцца: падзеі, якія адбываліся ў Вільні ў 1658 г., змянілі стаўленне тутэйшых жыхароў да рускай ўлады ў негатыўны бок і прымусілі ўсе слаі мясцовага насельніцтва аб'яднацца і ўключыцца ў далейшую барацьбу за вызваленне зямель Вялікага княства Літоўскага ад рускіх захопнікаў.

Спіс літаратуры

1. Российский государственный архив древних актов (далей РГАДА). – Ф. 210. Разрядный приказ. – Московский стол. – Стб. 244, л. 390–398. – Роспіс дзеянняў М.С. Шахаўскога на пасадзе віленскага ваяводы за 1655–1659 гг.

2. РГАДА. – Ф. 210. – Моск. стол. – Стб. 270, л. 697–698. – Адпіска віленскага ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. [01.06–03.07].1656, Вільня.

3. РГАДА. – Ф. 210. – Моск. стол. – Стб. 286, л. 168–169. – Адпіска віленскага ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. 23.02.1658. Вільня.

4. РГАДА. – Ф. 210. – Моск. стол. – Стб. 289, л. 39–44. Адпіска віленскага ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. 27.09.1658. Вільня.

5. РГАДА. – Ф. 210. – Моск. стол. – Стб. 301, л. 14–15. – Указная гасударава грамата акольнічаму і ваяводзе, князю Ю. А. Даўгарукаву. 02.11.1657.

6. РГАДА. – Ф. 210. – Моск. стол. – Стб. 301, л. 121. – Адпіска казацкага ваяводы Васіля Валынскага і Аляксея Аляксеева цару Аляксею Міхайлавічу. 15.09.1658. Вільня.

7. РГАДА. – Ф. 210. – Моск. стол. – Стб. 302, л. 36–39. – Адпіска акольнічага і ваяводы, князя Ю.А. Даўгарукава з таварышамі цару Аляксею Міхайлавічу. 07.08.1658. Вільня.

8. РГАДА. – Ф. 210. – Моск. стол. – Стб. 302, л. 43–44. – Адпіска акольнічага і ваяводы, князя Ю.А. Даўгарукава з таварышамі цару Аляксею Міхайлавічу. 07.08.1658. Вільня.

9. Российская государственная библиотека. Отдел рукописей. (далей ОР РГБ) – Ф. 178. – № 6916. Материалы виленской Съезжей избы за 1656–1659 гг. – Д. 47. Адпіска віленскага ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. 12.05.1658. Вільня.

10. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 50. – Казка майора з палка Кашпіра Яндэра Цімафея Дыраграфа і іншых. 23.05.1658. Вільня.

11. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 52. – Адпіска віленскага ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. 23.06.1658. Вільня.

12. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 53. – Адпіска віленскага ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. 16.07.1658. Вільня.

13. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 55. – Адпіска ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. 25.08.1658. Вільня.

14. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 59. – Запіс у віленскай С’езжай ізбе аб прывядзенні палоннага салдата Кашпірава палка Яндэра Івана Мядзведзева і яго распытванні. 27.02.1658. Вільня.

15. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 60. – Запіс у віленскай С’езжай ізбе распытванняў ўрадніка пана Яна Раецкага Аляксандра Залеўскага. 08.03.1659. Вільня.

16. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 65. – Чалабітная салдат і начальных чыноў пяці новапрыбылых палкоў у Вільню. [01–30.04].1658. Вільня.

17. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 73. – Адпіска ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. 04.04.1658. Вільня.

18. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 75, л. 1. – Адпіска паручыка Івана Сторма меньшага віленскаму ваяводзе, князю М.С. Шахаўскому. 08.04.1658. Ашмянскі павет.

19. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 75, л. 2. – Памяць паручыку Івану Сторму з наказам карміць жывелаў у сёлах да заканчэння паводкі, а потым даслаць іх у Вільню. 09.04.1658, Вільня.

20. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 77. – Адпіска смаленскага ваяводы, князя П.А. Далгарукава віленскаму ваяводзе М.С. Шахаўскому. 09.04.1658. Смаленск.

21. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 78. – Адпіска віленскага ваяводы, князя М.С. Шахаўскога смаленскаму ваяводзе, князю Пятру Аляксеевічу Даўгарукаву. [09].04.1657.

22. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 80. – Памяць паручыку Астафію Варэцкаму з наказам выдаць безграшова жыта салдатам пяці новапрыбылых палкоў. 15.04.1658.

23. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 82. – Адпіска ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. [18].04.1658. Вільня.

24. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 87, л. 3–6. – Памяць капітану Дзяменцію Дзякаву і паручыку Івану Мячкову прыняць гасудараву грашовую казну ў Антона Хрыстафорава. 30.04.1658.

25. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 99. – Адпіска ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. [01–30.04].1658. Вільня.

26. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 101. – Адпіска ваяводы, князя М.С. Шахаўскога цару Аляксею Міхайлавічу. 15.07.1658. Вільня.

27. ОР РГБ. – Ф. 178. – №6916. – Д. 165. – Справа ў віленскай С’езжай ізбе малага барабаншчыка палка Кашпіра Яндэра Юрыя Абрамава. 04.04.1658. Вільня.

28. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 167. – Справа ў С’езжай ізбе па ізвету суддзі Іллі Манастырова віленскаму ваяводзе, князю М.С. Шахаўскому аб грабяжы рускімі салдатамі харчу і грошай на рынке. 16.04.1658. Вільня.

29. ОР РГБ. – Ф. 178. – №6916. – Д. 168. – Чалабітныя віленскіх мяшчан. [01–30].04.1658. Вільня.

30. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 188. – Роспіс расходаў і прыходаў г. Вільні, якія бывалі да маскоўскага нашэсця («як раней бывала»). [01–30.08].1658.

31. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 189. – Роспіс расходаў і прыходаў г. Вільні за 7166 г. [01–30.08]. 1658.

32. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 191. Чалабітныя віленскіх і полацкіх мяшчан. [14].04. 1658. Вільня.

33. ОР РГБ. –Ф. 178. – № 6916. – Д. 202, л. 1–2. – Адпіскі полацкага ваяводы Д.С. Вялікага-Гагіна віленскаму ваяводзе, князю М.С. Шахаўскому. 03.05.1658. Полацк.

34. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 204. – Адпіска віленскага ваяводы, князя М.С. Шахаўскога шляхце Ліцкага павета. [01–31].05.1658. Вільня.

35. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 205. – Памяць кананіку Віленскага павета Яну Тызінаузу і ксёнзу Тызінаузу з наказам не дапускаць каралеўскіх жаўнераў у іх паветы. 29.05.1658.

36. ОР РГБ. – Ф. 178. – № 6916. – Д. 206. – Чалабітная жаўнераў палка Мікалая Сухціцкага Кшыштафа Каменскага і іншых. 1658.

37. Российская национальная библиотека. Отдел рукописей (далей ОР РНБ). – Ф. 532. Основное собрание грамот. – №. 1089. – Чалабітная прапаршчыка палка Томаса Беля Карнілы Станіслаўлева. 10.02.1658, Вільня.

38. ОР РНБ. – Ф. 532. – № 1106. – Указная гасударава грамата ў Вільню ваяводзе, князю М.С. Шахаўскому. 01.09.1658, Масква.

39. ОР РНБ. – Ф. 532. – № 1110. – Даклад баярына І.Д. Міласлаўскага цару Аляксею Міхайлавічу. 17.04.1659.

40. ОР РНБ. – Ф. 532. – № 1157. – Указная гасударава грамата ў Вільню князю Ю.А. Даўгарукаву з таварышамі. 13.10.1658. Масква.

41. ОР РНБ. – Ф. 532. – № 1183. – Адпіска князя Ю.А. Даўгарукава з таварышамі цару Аляксею Міхайлавічу. [20.11.–07.12]. 1658. Смаленск.

42. ОР РНБ. – Ф. 532. – № 1186. – Адпіска князя Ю.А. Даўгарукава з таварышы ў Іназемскі прыказ. 28.11.1658. Смаленск.

43. ОР РНБ. – Ф. 532. – № 1215. – Урывак чалабітнай Ашмянскай шляхты віленскаму ваяводзе, князю М.С. Шахаўскому. 1658.

44. ОР РНБ. – Ф. 532. – №1221. – Роспісы пушак і стрэльбаў, дасланыя з гарадоў Вялікага Княства Літоўскага ў Пушкарскі і Аружэйны прыказы. [01.09–01.08].1658–1659.

45. ОР РНБ. – Ф. 532. – № 1301. – Роспіс палкоўнікам, якія былі ў Вільне з баярамі і ваяводай Ю.А. Даўгарукавым, і якім прызначана быць на гасударай службе па гарадам. [10.10–31.10]. 1658.

46. ОР РНБ. – Ф. 550. Основное собрание рукописной книги. – F.II.85. – 259 л. – Копийная книга документов делопроизводства виленского воеводы, князя М.С. Шаховского (1656–1659).

47. ОР РНБ. – Коллекция автографов и грамот. – Авт. 169. – Autentyk Instrukcyi do Najaśniejszego Alexieja Michajłowicza, danej od miasta Wilna Panam Józephowi Piotrowiczowi – wójtowi, Prokopowi Doroffiewiczowi – rajcy i Mikołajowi Kostrowickiemu – pisarzowi. 24.05.1658. Wilna.

48. Lietuvos Valstybės Istorijos Archyvas (далей LVIA). – SA. – № 5098, fol. 19r–19v. – Сустрэчная скарга віленскага мяшчаніна Яна Бяляўскага на цесця Ежы Пшэвойну. 25.02.1658.

49. LVIA. – SA. – № 5098, fol. 20r-20v. – Скарга віленскага мяшчаніна Яна Бяляўскага на сваю жонку Еву Пшэвайнянку. 25.02.1658.

50. LVIA. – SA. – № 5098, fol. 71v–72r. – Скарга саладоўніка Матыса Йодэшкі на сваю жонку Ганну. 07.06.1658.

51. LVIA. – F. 458. – Ap. 1. B. 15. – Прыходная-расходная кніга віленскага магістрата за 1657–1659 гг.

52. Акты исторические, собранные и изданные Археографическою комиссиею. – СПб.: Типография II отделения собственной Е.И.В. канцелярии, 1842. – Т. IV (1645–1676). – 592 с.

53. Дополнения к актам историческим, собранные и изданные Археографическою комиссиею. – СПб.: Типография Эдуарда Праца, 1851. – Т. IV. –VII, 439 с.

54. Акты Московского государства, изд. императ. Акад. наук под ред. А.Н. Попова. – Т.2. Разрядный приказ. Московский стол. (1635–1659). – СПб.: Типография Императорской Академии наук, 1894. – XLV, 773 с.

55. Акты Московского государства, изд. императ. Акад. наук под ред. Д.Я.Самоквасова. – Т.3. Разрядный приказ. Московский стол. (1660–1664). – СПб.: Типография Императорской Академии наук, 1901. – XXX, 674 с.

56. Акты, относящияся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. – Т. 5. (1633–1699). – СПб.: Типография В.В. Пратца, 1853. – 318 с.

57. Василевский, В.Г. Очерк истории города Вильна / В.Г. Василевский // Памятники русской старины в Западных губерниях империи, издаваемые по высочайшему повелению П.Н.Батюшковым. – Вып. 6. – СПб.: Тип. А. Траншеля, 1874. – VII, 206 с.

58. Герасимова, И.В. Проблема научной достоверности публикаций документов о Вильне под властью русских воевод (1655– 1661) в XIX веке И.В. Герасимова // Славяноведение. – 2011. – № 4. – С. 16– 27.

59. Мейлус, Э. Вильнюс во время «Потопа» (1655– 1661 гг.): источниковедческие проблемы / Э. Мейлус // Lietuvos Didžiosios kunigaikštystės istorijos šaltiniai. Faktas. Kontekstas. Interpretacija. – Vilnius: LII leidykla, 2007. – S. 419– 427.

60. Мельникова, А.С. Некоторые аспекты изучения денежной реформы 1654–1663 гг. / А.С. Мельникова // Денежные реформы в России: История и современность. Сборник статей. – Сост. М.М. Альтман. – Москва: Древлехранилище, 2004. – С. 28– 36.

61. Мялешка, В. Грамадзянская вайна на Беларусі / В. Мялешка // Profesor Henryk Łowmiański, życie i dzieło. Pod red. A.Kijksa i K. Pietkiewicza. – Poznań, 1995. – P. 135– 154.

62. Сторожев, В.Н. Московское управление в Вильне XVII века с приложением текста виленских приходных каменишных книг 1658 г. / В.Н. Сторожев. – М.: Типография Э. Лисснера и Ю. Романа, 1894. – 26 с.

63. Полное собрание законов Российской Империи. / Под. ред. М.М. Сперанского. – М.: Типография II Отделения собственной Е.И.В. Канцелярии, 1830. – Т. 1. (1649– 1675). – 1072 с.

64. Флоря, Б.Н. Православие в Ливонии и Великом княжестве Литовском (2-я половина 1650-х – начало 1660-х гг.) Б.Н. Флоря // Вестник церковной истории. – № 3(11), 2008. –С. 65-73.

65. Флоря, Б.Н. Русское государство и его западные соседи (1655– 1661 гг.) / Б.Н. Флоря. – М.: Индрик, 2010. – 655 с.

66. Borowik, P. Funkcjowanie samorządu miejskiego w Grodnie podczas «potopu moskiewskiego» (1655– 1661) oraz kilka uwag o zniszczeniu miasta przez Moskali / P. Borowik // Гарадзенскі палімпсест. XII–XX ст. – Гародня-Беласток, 2008. – С. 29–39.

67. Kraszewski, J.I. Wilno od początków do roku 1750 / J.I. Kraszewski. – Wilno: nakładem i drukiem Józefa Zawadskiego, 1840. – T.II. – 528 s.

68. Meilus, E. Du nauji šaltinių kompleksai apie Vilnių maskvėnų okupacijos metu (1655–1661) / E. Meilus // Konstantinas Jablonskis ir istorija. Sudarė F. Rimša. – Vilnius, 2005. – P. 231– 246

69. Meilus, E. Przynależność etniczna wilnian i ich lojalność względem władzy w czasie wojen z Moskwą w połowie XVII w. Rozważania nad tematem / E. Meilus // Kultura Litwy i Polski w dziejach: tożsamość i wspułistnienie. Materiały międzynarodowej konferencji, zorganizowanej w dniach 15–17 padziernika, 1998 r., redakcja Maria Kawalec. – Kraków: Międzynarodowe Centrum Kultury, 2000. – Nr. 9. – S. 93–103.

70. Rachuba, A. Wilno pod okupacja moskiewską w latach 1655–1661 / A. Rachuba // Lithuania, 1994. – Nr. 2– 3 (Nr. 11– 12). – S. 62– 72.

71. Wilniane. Żywoty siedemnastowieczne. / Opracował, wstępem i komientarzami opatrzył David Frick. – Biblioteka Europae Orientalis. – T. XXXII. – Warszawa: Uniwersytet Warszawski, 2008. – XXXIV, 663 s.

Туминская О.А.

К ВОПРОСУ СЛОЖЕНИЯ ИКОНОГРАФИИ СВЯТЫХ ЮРОДИВЫХ НОВГОРОДСКОЙ ЗЕМЛИ

Иконопочитание узаконено в Церкви определением, принятым в VII деянии VII Вселенского собора. Подтвердив учение шести первых Вселенских соборов, отцы церкви устанавливают неприкосновенность сохранения церковных преданий и традиций, утверждаемых письменно или неписьменно [1, с. 26]. Одно из них заповедует делать живописные иконные изображения, т.к. это согласно с историей евангельской проповеди и служит подтверждением, что Христос истинно, а не призрачно вочеловечился. «На таком основании определяем: чтобы святые иконы предлагались для поклонения, точно также, как и изображение честного животворящего креста, будут ли они сделаны из красок или мозаичных клеточек или из какого-нибудь другого вещества, только бы сделаны были добросовестно. И будут ли они находиться в церквах, на священных сосудах, на стенах или на дощечках. Чем чаще при помощи икон они являются предметом нашего созерцания, тем более взирающие на эти иконы возбуждаются к воспоминанию о самых первообразах, приобретают более любви к ним, и получают более побуждений воздавать им лобзание, почитание и поклонение…» [1, с. 41].

Иконопись тесно связана с агиографией. Нельзя не обратить внимания на то, что лучшие с эстетической, художественной стороны произведения иконописи всегда (возможно, за редким исключением) наиболее совершенны в богословском отношении и точны в соблюдении иконографического канона. Таковы и жития: лучшие их образцы всегда каноничны. Лишь в период заката житийного жанра, когда агиограф теряет чувство внутреннего канона, житие превращается либо в повествовательную литературу, либо в официозную, в которой господствует уже внешний канон. Само по себе «плетение словес» не противопоказано агиографии, о чем свидетельствует творчество Епифания Премудрого, но лишь до тех пор, пока оно не становится самоцелью, пока эстетика не начинает довлеть над содержанием, пока догматическое сознание автора неотделимо от его личной живой веры во святых и в святость святого, словесную икону которого он пишет. В противном случае житие превращается в бытовую повесть, а агиография – в изящную словесность. Так же и в иконе: использование новых художественных приемов допу-

стимо до тех пор, пока икона не превращается в картину. В последнем случае начинается эклектика. «Идеальное житие», «идеальная икона» постепенно разрушаются, распадается сам жанр, порождая секуляризованное, светское, т.е. принципиально иное (не только по форме, но, главное, по мировоззрению и внутреннему содержанию) искусство [2, с. 98].

Обратимся к местно чтимым святым. Нас интересуют юродивые Христа ради, начало их почитания и первые изображения. На новгородской земле прославились святые юродивые: Николай Кочанов (ум. 1392 г.), Федор Новгородский (ум. 1392/1395 г.), Михаил Клопский (ум. 1456/1471 г.), Иаков Боровичский (ум. 1540 г.), Арсений Новгородский (ум. 1570 г.). Память о Николае Кочанове сохранена в строительстве церкви во имя св. Пантелеймона (1772 г.). Первый каменный храм появился здесь еще в 1554 г. по велению новгородского архиепископа Пимена, а деньги на его строительство собрали самые именитые граждане Великого Новгорода. Это было связано с тем, что под стенами храма находилось место вечного упокоения знаменитого новгородского юродивого Николая Кочанова. Затем, перестраивая и добавляя к небольшому четырехгранному каменному объему приделы, церковь изменила свое наименование – в честь св. Пантелеймона. Михаил Клопский – устроитель церкви Троицы в Клопском монастыре, комплекс строений которого сложился на Веряжи в XVI–XVII вв. Фресковой росписи в церквах Клопского монастыря нет. Боровичская церковь Святого Духа возникла на месте чудесного явления праведного Иакова Боровичского при перестройке ее из деревянной (1554 г.) в каменную в XVII в. Сведений о церкви Рождества Богоматери, в которой служил святой Арсений Новгородский, как и о других разрушенных постройках Арсеньева Богородицкого монастыря почти нет. На сегодняшний день можно констатировать, что на новгородской земле в XIV–XVI вв. подвизалось пять блаженных, и почитание этих святых было выражено в строительстве церквей и написании икон. Ни один памятник не сохранился в первозданном виде, за исключением церкви Феодора Стратилата, которая является косвенным отражением почитания памяти этого святого в народе. Кроме упомянутой церкви, стенописей ни в одной из названных церквей не было или они не сохранились.

Время строительства церкви Феодора Стратилата на Ручье относится к 1360–1361 гг., время ее росписи не выходит за пределы 1396 г., т.е. спустя три десятилетия после возведения храма. Можно уверенно сказать, что и строительство храма и росписи велись под единым «художественным руководством»: «В лето 6869 (1361)… Симеон Андреевич с мате-

рию своею боголюбивою Натальею заложиша церковь камену святый Феодор на Феодорове улице» («заложи церковь камену Федор святыи на Федорови улице Семеон Ондреевич с боголюбивою матерью своею Натальею» – IV Новгородская летопись); II Новгородская летопись называет имя заказчицы храма: «того же лета постави Наталья церковь камену святаго Андрея уродивого, на Сетецки» [3, с. 132]. Вл. Седов предполагает, что Симеон Андреевич был боярином, проживающим в районе Плотницкого конца Торговой стороны Новгорода. Наталья – мать его, а Андрей – отец, в честь небесного покровителя которого построен монастырь на Ситечке и возведен Андреевский храм. В Феодоровской церкви в юго-восточной части храма расположен придел в честь Симеона Дивногорца и росписи южной стены слева от окна, атрибутируемые как изображение святого Симеона Столпника. Придел и росписи, скорее всего – ктиторский заказ «боярина Симеона Ондреевича». Мотив Покрова в архитектуре и стенописи дает возможность почитания отца заказчика (Ондрея), ибо в покровских сценах почетное место занимает фигура святого Андрея Юродивого. Таким образом, одна семья строит два храма, в которых ясно прочитывается посвящение новому и непривычному для того времени почитанию аскетического подвига. Можно говорить о прямом посвящении (церкви Андрея Юродивого) и косвенном (церкви Феодора Стратилата с приделами Покрова, Симеона Дивногорца, включением изображений аскетов – Симона Столпника, Евфросина, Павла Препостного, Онуфрия Великого и, предположительно, Феодора Новгородского). По каким причинам эту семью интересовали святые юродивые – неизвестно, но факт строительства храмов и росписи в одном из них очевиден. Это первый в истории коллективной памяти славян пример почитания юродства на Руси.

В Феодоровской церкви нет изображений русских юродивых Христа ради. Программа украшения древнерусских храмов росписями в XIV–XV вв. не включает мотив изображения современных этому историческому моменту событий. Русские юродивые Христа ради вступили в исполнение своего подвига на Руси лишь с XIV в. (Прокопий Устюжский, затем Никола Кочанов и Феодор Новгородский), а их прославление началось не ранее, чем через сто лет после святой кончины каждого из них, т.е. приходится на XVI–XVII вв. Примечательно, что в росписях ручьевской Феодоровской церкви прослеживается тема аскетизма, наличествует тема Покрова. Подтверждение тому – сохранившаяся фигура Андрея Юродивого в росписи на западной стене хор. Цветовая гамма росписей переливается от бледных карминно-свекольных оттенков до

голубовато-серых. Фигуры удлиненные, композиционный и колористический мотив сцены Покрова выдержан в общей стилистике византийских росписей XIII–XIV вв.

Такім чынам, «Epitome» належыць не Стрыйкоўскаму, а значыць адлюстроўвае іншакшы, чым яго, вобраз мінулага ВКЛ, акрамя таго, у пэўнай ступені папярэднічае гістарычным штудыям Стрыйкоўскага, па якіх звычайна і ацэньваецца стан гісторыяпісання ў ВКЛ у другой палове XVI ст. (гл. раней), што яшчэ больш павышае эўрыстычнае значэнне даследавання гэтай верагоднай працы Аўгустына Ратундуса.

Перцэптыўны план. Адбор падзей з мінулага

У нараталогіі вылучэнне перцэптыўнага плану пункту погляду прадугледжвае адказ на пытанне «Чыімі вачыма наратар глядзіць на падзеі?» [24, с. 125–126]. Калі адаптаваць гэты падыход да аналізу гістарыяграфічных тэкстаў, то асноўнай задачай зробіцца высвятленне таго, гісторыю каго ці чаго распавядае наратар. Усведамленне таго, што апісваць мінулае можна па-рознаму існавала ў ВКЛ у разгляданы перыяд. Так, абавязковай складовай часткай прадмоў да тагачасных гістарычных тэкстаў было пазначэнне таго, пра што будзе весціся гаворка: «пра старадаўнія справы продкаў і князёў сваіх, пра пачатак, паходжанне, ператварэнні і разнастайныя падзеі свайго народу» [16, s. XLI], «у другой кнізе падаюцца паходжанне і старажытнасць князёў і народу Вялікага Княства Літоўскага» [18, с. 42]. Акрамя аб'екту працы, пры даследаванні гісторыяпісання немалую ролю адыграе вызначэнне межаў абазнанасці таго ці іншага аўтара: калі ў фікцыянальным творы колькасць і варыятыўнасць магчымых апісаных падзей бясконцая [24, с. 158], то ў аповядзе пра мінулае яна абумоўлена наяўнасцю звестак у крыніцах: нават відавочныя прыдумкі, кшталту «рымскай легенды», грунтуюцца на творчай трансфармацыі рэальных акалічнасцяў, звычайна сучасных аўтару [31, s. 8–25; 32, p. 278–280].

Як крыніцы ў «Epitome» згадваюцца «Lituanica historia» [19, s. 94, 96] (або проста «historia» [19, s. 96]), «memoriae Russicarum litterarum» [19, s. 95], «scriptores Lituaniae historiae» [19, s. 98], пад якімі трэба разумець беларуска-літоўскія летапісы, што пацвярджаецца зместам гэтых згадак, невядомых іншым крыніцам. Па-першае, што імя правадыра рымлян было Палемон (сам Ратундус лічыць яго скажэннем імя Публій Лібон), менавіта так ён завецца ў другім летапісным зводзе [*далей – ДЛЗ*] –

«Хронiцы Вялiкага Княства Лiтоўскага i Жамойцкага» [34, с. 128 i далей] (у «Хронiцы Быхаўца» – яго імя перадаецца як Апалон [33, с. 128]). Па-другое, што Кукавойт быў унукам Даўспрунга – прысутнічае ў шэрагу спісаў ДЛЗ, што змяшчаюць «рымскую легенду» [34, с. 147, 175, 195–196]. Па-трэцяе, што Мантвіл быў праўнукам Палемона, гэта таксама вынікае са звестак летапісаў. Нават у выпадках, калі крыніца прама не пазначаецца, аснову дадзеных для «Epitome» складаюць беларуска-літоўскія летапісы, пры гэтым не толькі ДЛЗ, але і «Хроніка Быхаўца», бо толькі яна змяшчае перададзеную ў «Epitome» [19, s. 95] інфармацыю пра паход Гімбута і Кернуса на Браслаў і Полацк [33, с. 129]. Але стваральнік «Epitome» не абмяжоўваецца толькі інфармацыяй з летапісаў. Таксама ён, у цэлым, паўтарае арыгінальныя разважанні «Размовы Паляка з Літвінам» [30, p. 264–266] аб паходжанні Віценя і Гедыміна [19, s. 100–101] і ў выпадку Віценя спасылаецца на «historiam Lituanorum», пры гэтым ў беларуска-літоўскіх летапісах нідзе не сцвярджаецца пра прамое паходжанне Віценя ад Палемона. Магчыма, у дадзеным выпадку Ратундус абапіраецца на ўласную працу па гісторыі Літвы.

Акрамя таго, аўтар «Epitome» прама спасылаецца на звесткі «Хронікі зямлі Прускай» тэўтонскага храніста Пятра з Дусбургу (першая трэць XIV ст.) [19, s. 100–101] і «Хроніку палякаў» (1519 г.) Мацея Мехавіты [19, s. 100–101]. Паказальна, што ён прыцягвае нелетапісныя звесткі менавіта для падмацавання ўласных разваг пра высокае паходжанне Гедыміна і Віценя. Такую ж ролю падмацавання звестак – на гэты раз «рымскай легенды» – адыграе апеляцыя да нямецкага храніста XVI ст. Эразма Стэлы (ён перадае, што рымлянін Антоній заснаваў Утрэхт ля вусця Рэйну, значыць рымляне маглі дасягнуць і Літвы) [19, s. 95]. Таксама, хоць пра гэта ў тэксце не сказана прама, Ратундус карыстаецца «Аб паходжанні і дзеях палякаў» (першае выданне – 1555 г.) Марціна Кромера.

Параўнанне:

«Аб паходжанні і дзеях палякаў» Марціна Кромера	«Epitome»
Dlugossus vero scribit, civili bello, quod inter Caesarem et Pompeium gestum est, manum quandam Romanorum deserta Italia, in iis oris consedisse urbemque Romove de nomine Romae nomine dixisse, eamque diu metropolim gentis fuisse [35, p. 61–62].	Sunt et qui civili bello, quod inter C. Caesarem et Pompeium gestum est, manum quandam Romanorum, deserta Italia, in iis oris consedisse urbemq. Romove de nomine Romae condidisse scriptis prodiderunt [19, s. 95].

Гэтыя звесткі ўзыходзяць да паведамлення польскага храніста XV ст. Яна Длугаша [36, p. 225–226], што і адзначае і Кромер, але ў «Epitome» спасылка ідзе не на аднаго аўтара, а на бліжэй не акрэслены іх шэраг («sunt et qui»). Вытлумачыць такое змяненне можна праз заўвагу самога Ратундуса, што канкрэтны час і абставіны прыбыцця рымлян у Літву спрэчныя, але сам факт рымскага паходжання літвінаў безумоўны [19, s. 95]. Аўтару «Epitome» трэба было пераканаўча давесці «рымскасць» Літвы, таму ён пашырыў кола аўтараў, якія гэта сцвярджалі, а таксама не згадаў іншыя версіі: ад кельтаў ці выхадцаў з Басфору (Філіп Калімах, гісторык канца XV ст.) [31, s. 10–11], ад гепідаў («Хроніка ўсяго свету» Марціна Бельскага) [37, list 359], ад змяшэння готаў і гепідаў з уцекачамі з Рыму (Стрыйкоўскі ў «Ганцы цноты») [14, s. 536].

Вынікае, што ў цэлым крочачы за тэкстам беларуска-літоўскіх летапісаў, Ратундус, прынамсі ў «легендарнай частцы» (бо ў гістарычнай – тэкст занадта лапідарны для магчымасці вызначэння крыніц), раз-пораз дадае звесткі з іншых крыніц, якія часам мусяць адно толькі паказаць эрудыцыю аўтара (прыгадванне Ціта Лівія [19, s. 97]), але ў большасці выпадкаў служаць падмацаванню найбольш важных (паходжанне з Рыму) альбо найбольш хісткіх і адначасова таксама важных (радавод Віценя і Гедыміна) тэзісаў «Epitome». Так уяўляецца адна з асаблівасцяў працы складальніка «Epitome» на стадыі адбору звестак.

Іншыя асаблівасці вынікаюць з аб’екту, на які звернута ўвага ў «Epitome». Ужо ў назве твору адзначаецца, што гэта «Кароткі аповяд **пра літоўскіх князёў**» [19, s. 94], таксама і ў прадмове да перакладу Статуту сказана, што «Epitome» прысвечана «паходжанню і распаўсюджанню літоўскіх князёў» [21, p. XIX]. Такім чынам, Ратундус выразна пастулюе, што яго твор – гэта гісторыя дынастыі Палеманідаў–Ягелонаў («a migratione Italorum P. Libone [...] Duce usque ad Jagellones») [19, s. 94]. Заўважым, што створаны на замову магнацкіх родаў ДЛЗ [31, s. 20–21; 32, p. 276; 38, с. 162; 39, с. 155–158] мае назву «Хроніка **Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага**». Замена магнацкага пункту погляду на дынастычны прывяла да таго, што ў «Epitome» не перадаецца прысутная ў беларуска-літоўскіх летапісаў інфармацыя пра «шляхты четыри были рожаи наивышшие», якія прыбылі разам з Палемонам [33, с. 128; 34, с. 128 і далей], пра «панов радных» – пачынальнікаў родаў Гаштольдаў, Давойнаў і Манівідаў [33, с. 130; 34, с. 129 і далей]. Урэшце, «Epitome» пісалася для азнаямлення Баторыя з генеалогіяй вялікіх князёў літоўскіх [27, s. 105], і гэтыя «магнацкія» аповяды не з’яўляліся для яе абавязковымі.

Мэта – апісаць гісторыю пануючай дынастыі – задавала аўтару «Epitome» «логіку селектыўнасці» [24, с. 172] і пры працы над рэальнай гісторыяй. Ратундус старанна абмінае канфлікты ўнутры роду Гедымінавічаў (перадусім, барацьбу Ягайлы супраць Кейстута і Вітаўта [19, s. 102; 27, p. 106]), на якіх, сапраўды, не выпадала акцэнтаваць увагу ў аповядзе для новаабранага караля і вялікага князя.

Падсумоўваючы, выпадае адзначыць, што ў перцэптыўным плане (адбор звестак) адрозненні «Epitome» ад ранейшай гістарычнай традыцыі ў ВКЛ праяўляліся ў падмацаванні летапіснай карціны мінулага ВКЛ доказамі, заснаванымі на звестках іншых крыніц, а таксама ў пераглядзе прыярытэтных тэм пры апісанні гісторыі ВКЛ – ад гісторыі магнатаў і дынастыі да гісторыі адной дынастыі, таму зніклі «магнацкія радаводы» з ДЛЗ, а таксама моманты, якія б выстаўлялі вялікіх князёў у невыгодным выглядзе.

Ідэалагічны план. Ацэнка звестак

Адабраныя аўтарам для ўласнага тэксту звесткі павінны былі быць ацэнены і інтэрпрэтаваны. Адрозненні ў ацэнцы і інтэрпрэтацыі падзей паміж «Epitome» і яе крыніцамі, а таксама творамі, сінхроннымі ёй, выглядаюць наступным чынам.

Істотным адрозненнем «Epitome» ад ранейшых твораў з’яўляецца ўжо сама практыка крытычнага параўнання і каментавання дадзеных крыніц, што можна акрэсліць як праяву рэнесансных падыходаў у гісторыяпісанні ў ВКЛ другой паловы XVI ст., бо ў Сярэднявеччы не было прынята ўстаўляць у тэкст аўтарскія крытычныя разважанні [22, с. 245–246; 40, s. 183–184], і яны амаль не сустракаюцца ў летапісанні ВКЛ (рэдкі вынятак – выраз сумнення («яко бы») у аповядзе пра трох сыноў Рынгальта ў спісе Рачынскага [34, с. 149], але гэта даволі позні спіс – па філігранях ён датуецца 80-і гадамі XVI ст. [34, с. 11–12]). Але такі «крытычны» падыход служыць тым самым мэтам, што дапасаванне на стадыі адбору да інфармацыі летапісаў паведамленняў з іншых крыніц, – зрабіць летапісны аповяд больш верагодным, «рацыяналізаваць» легендарныя звесткі, а зусім не паставіць іх пад сумнеў. Наогул «рацыяналізацыя» «рымскай легенды» была ўласціва гістарычнай думцы ВКЛ [23, s. 6], таму і ў «Epitome» здзейснена спроба даказаць, што імёны і справы многіх нашчадкаў Палемона «былі забыты з-за адлегласці ў часе» [19, s. 97], і гэтым самым зняць акцэнтаваную Ратундасам храналагічную неверагоднасць аповяду летапісаў [19, s. 96, 98–99]. Задача павысіць пераканаўчасць гісторыі дынастыі вялікіх

князёў літоўскіх прыводзіла да выкарыстання зусім слабых аргументаў: так, каб абранне Віценя вялікім князем выглядала больш верагодна, у «Epitome» ён адначасова з’яўляецца і сынам нобіля (як у летапісах), і сынам караля Літвы (як у Пятра з Дусбургу) [19, s. 100–101].

Увогуле, «рымская легенда», нягледзячы на ўсе заўвагі аўтара «Epitome» пра яе недакладнасці, перадаецца ў творы амаль цалкам. Акрамя асновы прэстыжу вялікакняскай улады, паходжанне дынастыі з Рыму («Ягайла і Вітаўт, што паходзілі з Лібонава, гэта значыць, з лацінскага роду» [21, p. XX]) таксама падмацоўвала ідэю Ратундуса пра неабходнасць напісання законаў ВКЛ не на старабеларускай, а на лацінскай мове [21, p. XVIII-XIX] (пра спрэчкі пра мову гл. таксама [26, s. 63–64, 69–71; 31, s. 34–36]). Тым не менш, выклад легенды ў «Epitome» вылучаецца значнымі сэнсавымі адрозненнямі ў ацэнцы і інтэрпрэтацыі падзей. Ужо Ян Якубоўскі адзначыў, што і ў «Размове Паляка з Літвінам» [30, p. 264], і ў «Epitome» [19, s. 100–101] падкрэсліваецца, што Віцень у простай лініі быў нашчадкам Палемона [26, s. 68–69]. Але, паводле летапісаў, панаванне спачатку перайшло ад Палеманідаў да прадстаўнікоў гербу Кітаўрас, а пасля да ўладальнікаў гербу Калюмны, да якіх і належаў Віцень, і не сказана, што ён быў нашчадкам Палемона [33, с. 136; 34, с. 151 і далей]. У выпадку антыпольскай [12, s. 141–148; 27, p. 94–104] «Размовы Паляка з Літвінам» гэткая карэктура тлумачыцца задачамі аўтара: злучэнне Ягелонаў з Палемонам патрабавалася, каб зрабіць літоўскую кіруючую дынастыю больш старажытнай і неперарванай, а значыць паказаць перавагі палітычнай сістэмы ВКЛ над польскай [41, с. 49]. Зрэшты, і ў кантэксце ўслаўлення дынастыі ў «Epitome» (гістарычны прэстыж Ягелонаў быў неабыякавы Стэфану Баторыю, які быў жанаты з Ганнай, дачкой Жыгімонта I Старога) такі распаўсюджаны ў дамадэрным гісторыяпісанні прыём як доказ пераемнасці ўладароў па крыві [22, с. 395] таксама быў дарэчы. Відавочна «дынастычная» скіраванасць «Epitome» у той час, як у беларуска-літоўскіх летапісах, як здаецца, змена пануючых родаў павінна была павышаць прэстыж асобных магнацкіх фамілій, якія на старонках летапісаў выводзіліся з гэтых родаў, перадусім Гаштольдаў (герб Калюмны) і Гальшанскіх (герб Кітаўрас).

«Магнацкі» уплыў, аднак, у «Epitome» не знік зусім: тут у легенду ўведзены князь па імю Радзівіл, адсутны ў летапісных зводах. Ратундус быў шчыльны звязаны з магнацкім родам Радзівілаў (дарэчы, частку сваёй працы па гісторыі ВКЛ ён у 1560 годзе адаслаў Мікалаю Радзівілу Чорнаму [12, s. 130]), так што прычыны гэтага «радзівілаўскага» следу

і ў «Размове Паляка з Літвінам» [30, p. 263], і ў «Epitome» вытлумачальны [19, s. 96; 26, s. 68]. Неабходна, тым не менш, звярнуць увагу на ўчынкі «новаўведзенага» Радзівіла. Гэтаму князю прыпісаны пачатак падпарадкавання Русі і перамогі над татарамі [19, s. 96–97]. Калі першы «подзвіг» выводзіцца з гісторыі летапіснага прататыпу Радзівіла – князя Эрдзівіла–Скірмунта [33, с. 130; 34, с. 129], то перамога над татарамі, а менавіта над ханам Курдасам у летапісах прыпісана іншым князям (іх імёны ў розных спісах адрозніваюцца) [34, с. 131, 148 і далей]. Заўважым, што ў канцы «Epitome» пісьменнік спадзяецца, што Стэфан Баторый падчас свайго панавання адпомсціць ворагам Рэчы Паспалітай – татарам і Маскве [19, s. 104], пры гэтым у прадмове да перакладу Ратундус выразна імкнецца паказаць еднасць, перадусім, моўную, паміж Літоўскай Руссю і Масквой (гэта рабілася, каб дыскрэдытаваць старабеларускую мову) [21, p. XIX, XXI]. Атрымліваецца, што аўтар «Epitome» ўганараваў Радзівіла як пераможца двух асноўных ворагаў Літвы – татараў і Русі/Масквы. Але гэта наватвор у плане зместу, а сваёй формай – перанясенне надзённых пытанняў у мінуўшчыну – ён не адрозніваецца ад механізмаў стварэння «рымскай легенды» беларуска-літоўскіх летапісаў.

Яшчэ ў адным аспекце «Epitome» застаецца на ідэйных пазіцыях беларуска-літоўскіх летапісаў – маецца на ўвазе ацэнка адносінаў паміж Літвою і Руссю. «Epitome» пераказвае звесткі летапісаў пра перамогі легендарных князёў над Руссю [19, s. 96–98], пры гэтым падкрэсліваецца, што рускія землі былі захоплены («ad occupandas eas regiones», «regiones Roxolanas paternis suisque armis occupatas» [19, s. 96–97]). Цікава, што ў іншым творы Ратундуса – «Размове Паляка з Літвінам» – сцвярджаецца, што «Русь добраахвотна паддалася» Радзівілу, таксама апавядаецца пра ваяўнічасць русінаў, а ў якасці выдатных дзеячаў мінулага ВКЛ названы два безумоўныя русіны – Канстанцін Астрожскі і Астафій Дашкевіч [30, p. 228, 263]. Аднак у «Epitome» русіны ВКЛ фактычна былі атаясамлены з Масквою, таму іх адносіны з літоўскай дынастыяй апісаны як барацьба.

Акрамя таго, летапісны аповяд пра падпарадкаванне Скірмунтам–Эрдзівілам (Радзівілам – у «Epitome») дапоўнены выкладам прычыны паходу на Русь – тамтэйшыя землі былі больш урадлівымі, чым жамойцкія [19, s. 96]. Гэты дадатак пацвярджае, што Ратундус быў знаёмы з узыходзячай да Яна Длугаша інфармацыяй, што літвіны плацілі даніну Русі венікамі, бо былі беднымі, а іх зямля неўрадлівай [42, p. 167]. Зразумела, што такі скіраваны на ўслаўленне ВКЛ і яго дынастыі твор як «Epitome» не мог змясціць настолькі абразлівыя для літвінаў звесткі.

Іншая справа, што інфармацыя пра іх падпарадкаванне князям Кіеўскай Русі перадаецца і Мацеем Стрыйкоўскім [15, s. 96; 16, s. 234]. Але ў яго творах яна, па-першае, упісвалася ў агульную канцэпцыю заняпаду з-за міжусобіц Русі і ўзвышэння Літвы, чые князі «жылі ў супольнай згодзе» [16, s. 219–220], а па-другое, у пэўнай ступені апраўдвала напады літвінаў на Русь, бо Стрыйкоўскі сцвярджаў, што яны былі адказам на першапачатковыя паходы рускіх князёў на Літву [15, s. 93; 16, s. 86]. Як бачна, «захопніцкая» тэорыя падпарадкавання Русі, выкладзеная ў летапісах і прынятая ў «Epitome», магла з той ці іншай нагоды трансфармавацца ў «мірную» («Размова Паляка з Літвінам») або «абарончую» (Стрыйкоўскі).

Выразную залежнасць ад надзённых патрэб мела яшчэ адна асаблівасць выкладу гісторыі ў «Epitome». У адрозненне ад аповяду беларуска-літоўскіх летапісаў, у ёй сцвярджаецца, што рымляне атабарыліся не толькі ў Літве, але і Лівоніі, якая была названа ад імя іх правадыра Лібона (Палемона) [19, s. 95]. Пасля адзначаецца, што лівонцы і латыгола (Livonii et Laticolae) адасобіліся ад літвінаў, толькі калі прынялі хрысціянства [19, s. 99]. Зрэшты, гэтае паведамленне не прыдумка самога Ратундуса – пра засяленне Лівоніі, Літвы і Прусіі «атрадам рымлян на чале з нейкім Лібонам» («Romanorum manum duce Libone aliquo») да яго пісаў Марцін Кромер [35, p. 62]. Паказальна, аднак, што ў «Epitome» згадваецца адзінства толькі Літвы і Лівоніі, якая адносна нядаўна апынулася ў складзе ВКЛ, а пасля Рэчы Паспалітай і з’яўлялася арэнай ваеннага і ідэалагічнага супрацьстаяння Дзяржавы Абодвух Народаў і Масквы, у кантэксце якога і трэба разумець распаўсюджанне тэрыторыі літвінаў-рымлян на Лівонію [43, p. 18].

У такім «дынастычна» арыентаваным творы як «Epitome» немалое значэнне мае ацэнка ўзаемаадносін уладароў з падданымі, перадусім, магнатамі і шляхтай. Зрэшты, сам па сабе «дынастычны» пункт погляду на мінулае не спрыяў асабліваму падкрэсленню дзеяў станаў у гісторыі. Ужо адзначалася, што ў «Epitome» абмінаюцца летапісныя аповяды пра легендарных продкаў магнацкіх фамілій. Але яшчэ больш пераважная абыякавасць «Epitome» да ролі магнатаў у гісторыі выяўляецца пры параўнанні з «Хронікай» Стрыйкоўскага, у якой паны пачынаюць удзельнічаць у абранні князёў ледзь ці не з часоў сына Палемона – Кунаса [16, s. 85]. Такі погляд на мінуўшчыну вынікаў з перанясення ў яе рэчаіснага дзяржаўнага ладу часоў Стрыйкоўскага. У выпадку бяздзетнасці папярэдняга легендарнага ўладара «панове» абіралі вялікага князя і ў тэкстах летапісаў [33, с. 134–135; 34, с. 131, 149, 151

і далей]. Але ў «Epitome» «народ» («populares») удзельнічае ў абранні князя толькі ў выпадку Віценя [19, s. 100–101]. Характэрна, што шэрагі аргументаў на карысць таго, што Гедымін быў не слугой, а сынам Віценя розняцца ў «Epitome» і «Хронiцы» Стрыйкоўскага тым, што ў апошняй дадаецца заўвага, што прысутнасць на вялікакняскім троне забойцы не пацярпелі бы станы і землі ВКЛ [16, s. 355]. І нават узвышэнне магнацкага роду – Радзівілаў – адбываецца ў тэксце «Epitome» праз называнне Радзівілам аднаго з вялікіх князёў літоўскіх, а не праз вывад гэтай фаміліі ад слыннага дарадцы Гедыміна Ліздзейкі, як у Стрыйкоўскага [14, s. 545] і Гваньіні [18, с. 315]. Такім чынам, у «дынастычнай» карціне мінулага, створанай аўтарам «Epitome», роля паноў значна змяншалася ў параўнанні з роллю вялікіх князёў.

Тым не менш, прадстаўнікі вышэйшага саслоўя задзейнічаны ў эпізодах, звязаных са смерцю двух «тыранаў» у гісторыі ВКЛ – Жыгімонта Кейстутавіча і легендарнага Даўмонта, якога летапісы [33, с. 135–136; 34, с. 151 і далей], а за імі і «Epitome» [19, s. 100] зрабілі забойцам свайго брата Трайдэна і ўзурпатарам улады. У першым выпадку паны забіваюць ненавіснага Жыгімонта, а ў другім дапамагаюць сыну Трайдэна Рымунту перамагчы Даўмонта [19, s. 100, 103]. Такое непадпарадкаванне князю, зрэшты, апраўдваецца: сцвярджаецца, што не злодзей Даўмонт, а менавіта Рымунт быў законным і спадчынным уладаром, а пра Жыгімонта сказана, што той «бязлітасна і сквапна кіраваў». Апраўданне манархацыду ў «дынастычнай» гісторыі Ратундуса не павінна здзіўляць, бо ў «Размове з Паляка з Літвінам» Ратундус тлумачыць, што «той ужо не будзе ані каралём, ані князем, ані манархам, але тыранам, хто законаў не трымаецца. Павер мне – такога б Літва не цярпела» [30, p. 262], а сочыць за выкананнем уладаром законаў менавіта «рада, духоўная і свецкая» [30, p. 247], гэта значыць манархія ў яго разуменні павінна кантралявацца з боку арыстакратыі [44, с. 235–237].

Хоць асноўная ўвага ў «Epitome» звернута на падзеі да Крэўскай уніі (1385 г.), але і здарэнні пасля яе таксама падвяргаюцца інтэрпрэтацыі ў творы. Тут, бадай што, найбольш важным падаецца ацэнка Ратундусам такога складанага пытання як узаемаадносіны паміж ВКЛ і Польшчай. Адзначым, што ў беларуска-літоўскім летапісанні «Хроніка Быхаўца» мела выразны антыпольскі характар [26, s. 58–61; 45, с. 46; 46, с. 137], а для Стрыйкоўскага праблема ацэнкі польска-літоўскіх стасункаў была адна з найбольш складаных [11, s. 200–201]. Што датычыць «Epitome», то літоўскі даследчык Альбінас Ёвайшас выказаў меркаванне, што яе мэта выводзіцца з літоўска-польскага ідэалагічнага супрацьстаяння:

трэба было паказаць новаму каралю, што ён кіруе дзвюма дзяржавамі – не адной Польшчай, але Польшчай і Літвой [27, p. 107]. Але, на нашу думку, «Epitome» хутчэй імкнецца не акцэнтаваць увагу на супярэчнасцях: напрыклад, не адлюстроўвае некаторыя выпадкі наяўнасці толькі персанальнай (а не дзяржаўнай) уніі паміж Польшчай і ВКЛ. Так, сцвярджаецца, што Ян Альбрэхт быў і каралём польскім, і вялікім князем літоўскім [19, s. 103] – у рэчаіснасці ён быў толькі каралём польскім (1492–1501), а вялікім князем літоўскім у гэты час быў яго брат Аляксандр (1492–1506). Таксама змову супраць Казіміра ў 1481 годзе Ратундус тлумачыць толькі тым, што літвіны былі «абураныя адсутнасцю [ў Княстве] караля Казіміра» [19, s. 102]. А ў крыніцы гэтага паведамлення – «Аб паходжанні і дзеях палякаў» Марціна Кромера [35, p. 539] – прычынай змовы названа яшчэ жаданне літвінаў захапіць Падолле, забранае Каронай. Акрамя таго, падкрэсліваецца, што Вітаўт кіраваў у ВКЛ з дазволу («permissu») польскага караля Ягайлы, які пры гэтым заставаўся найвышэйшым князем літоўскім («Supremi Ducis») [19, s. 102–103]. Такім чынам, слаўнае мінулае павінна было быць бесканфліктным не толькі ў адносінах унутры дынастыі, пра што гаворка ішла раней, але і ў адносінах паміж народамі Рэчы Паспалітай.

Атрымліваецца, што ў плане ацэнкі і інтэрпрэтацыі адрозненні «Epitome» ад папярэдняй гістарыяграфічнай традыцыі вынікалі, папершае, з своеасаблівага – «дынастычнага» – пункту погляду на мінулае (аповяд пра паходжанне Віценя ад Палемона і абарона знатнасці Гедыміна), па-другое, з неабходнасці падмацаваць гістарычнымі аргументамі важныя для рэчаснасці пытанні (праблема ўваходжання рускіх зямель і Лівоніі ў склад ВКЛ, ацэнка адносін паміж ВКЛ і Польшчай), па-трэцяе, з імкнення да далейшага «ўдакладнення» «рымскай легенды» (заўвагі пра колькасць пакаленняў нашчадкаў Публія Лібона). Пры гэтым значныя адрозненні ў ацэнцы мінулага ВКЛ выяўляюцца таксама пры параўнанні «Epitome» з сінхроннымі ёй працамі Стрыйкоўскага і Гваньіні і нават з яшчэ адным верагодным творам Ратундуса – «Размовай Паляка з Літвінам». Апошняе ў гістарыяграфіі тлумачыцца змяненнем акалічнасцяў, у якіх пісаліся «Epitome» і «Размова Паляка з Літвінам», і рознымі задачамі гэтых тэкстаў [26, s. 68–69, 27, p. 105]. Такім чынам, у ідэалагічным плане «Epitome» вылучаецца на фоне ранейшага гісторыяпісання ВКЛ не столькі «рэнесанснымі» праявамі (да іх можна з нацяжкай аднесці «рацыяналізацыю» тэорыі аб рымскім паходжанні літвінаў), колькі адлюстраваннем у сваім змесце новых задач палітычнага і сацыяльнага характару.

Моўны план. Пазначэнне звестак

Галоўным адрозненнем «Epitome» ад беларуска-літоўскіх летапісаў у моўным плане з’яўляецца яго лацінамоўнасць. Як ужо адзначалася, аўтар «Epitome» падкрэслівае сваю першаснасць у справе напісання лацінамоўнай гісторыі «літоўскіх князёў» [21, p. XIX]. У цэлым, пераклад Статуту ВКЛ на лацінскую мову Ратундус тлумачыць, па-першае, неабходнасцю зрабіць яго зразумелым для Стэфана Баторыя, па-другое, недакладнасцю, шматзначнасцю і шматслоўнасцю старабеларускай правазнаўчай тэрміналогіі, па-трэцяе, паходжаннем літвінаў з Рыму [21, p. XVIII–XXI]. Істотна таксама, што «рускую» мову ён называе «варварскай» [21, p. XX], зразумелай толькі варожай Маскве і шэрагу народаў «у турэцкай няволі» [21, p. XXI]. Ён спрабуе акрэсліць лацінскую мову як адзіную прымальную для ВКЛ, распаўсюдзіць яе на прававую сферу, а таксама напісаць на ёй гісторыю Літвы, нават зрабіць яе мовай паўсядзённай камунікацыі [19, p. XIX-XX; 26, s. 69]. Імкненне выцесніць «старабеларускую мову» і русінаў у цэлым на «перыферыю» культурнай прасторы праяўляецца не толькі ў прыведзенай вышэй аргументацыі пераваг лацінскай мовы, але і наступным момантце з плану «пазначэння». Ратундус у «Epitome» прыводзіць радавод князёў Слуцкіх-Алелькавічаў, якія паходзілі ад Альгерда [19, s. 102]. Акрамя ўслаўлення саміх Алелькавічаў (Ратундус з’яўляўся аўтарам панегірыку ў гонар гэтага роду [15, s. 604; 27, p. 104]), гэтая згадка мусіла на прыкладзе пацвердзіць прыведзеную ў прадмове думку, што сярод «знатных русінаў» таксама маюцца «лаціняне», выхадцы з Рыму, у аддзяленні якіх ад літвінаў вінавата прыналежнасць да праваслаўя [21, p. XIX]. У сваю чаргу летапісы паслядоўна называюць праваслаўных князёў і баяраў «літоўскага» паходжання русінамі [47, с. 118–119]. Яшчэ больш яскрава ў іншым помніку першай трэці XVI ст. – Лісце канцлера ВКЛ Альбрэхта Гаштольда да каралевы Боны Сфорцы (1525 г.) – тыя ж Алелькавічы (а таксама яшчэ адныя Гедымінавічы – Чартарыйскія) залічаны ў шэрагі «русінаў» і аддзелены ад «літвінаў», з якімі сябе атаясамляў выхадзец з літоўскага баярства А. Гаштольд [48, p. 260–269]. Калі для Альбрэхта Гаштольда галоўным пунктам падзелу было веравызнанне, то для Аўгустына Ратундуса ў «Epitome» на першае месца выходзіць паходжанне. Пакідаючы ў баку вострадыскусійнае пытанне сэнсавага напаўнення тэрмінаў «літвін» і «русін» (розныя падыходы і дэфініцыі гл., напрыклад, [47; 49]), звернем увагу на тое, што «далучэннем» праваслаўных Гедымінавічаў да «літвінаў» Ратундус спрабаваў зменшыць падставы для выкарыстання ў грамадскім жыцці «старабела-

рускай» мовы, бо ў такім выпадку яна апыналася чужой і для значнай часткі праваслаўнай магнатэрыі.

Зрэшты, найменні «Русь» і «русін» у «Epitome» згубілі адно з сваіх ранейшых значэнняў, а менавіта сіноніма слова «праваслаўны». Складальнік «рымскай легенды» ў 20-30-я гг. XVI ст. мог, напрыклад, напісаць, што «И пиметь Кгинвил дочку у великого князя тверьского Бориса именем Марью, для которое жь окристился в руску вѢру» [34, с. 130], бо «руская вера» ў тагачаснай свядомасці была тоесна праваслаўю. Але ўжо ў 70-я гг. таго ж стагоддзя аўтар «Epitome» дадаваў, што праціўнікі Рынгальта былі «вернікамі грэчаскага абраду», не задавольваючыся інфармацыяй, што гэта «рускія церкі» [19, s. 97]. Таксама адзначаецца, што пад уплывам «рускага царка» Льва Рымунт прыняў менавіта «хрысціянскую веру грэчаскага абраду» [19, s. 100]. Натуральна, што ў летапісных тэкстах тлумачальных дадаткаў пра «грэчаскі абрад» няма, там ворагі Рынгальта – гэта проста «князи руские» [34, с. 148], а веравызнанне Рымунта акрэслена як «вѢра хрестиянская», а што гэта «грэчаскі закон» вынікае з кантэксту: «мешкаючы Рымонту у князя Льва, и навчылся языка руского» [34, с. 150]. «Epitome» пісалася ў іншых абставінах, калі пад уздзеяннем Рэфармацыі і Контррэфармацыі русіны сталі не толькі праваслаўнымі, але і пратэстантамі, а пасля католікамі, што не перашкаджала ім заставацца і для сябе, і для іншых русінамі [50, с. 554–555]. Гэты прыклад добра адлюстроўвае, як са змяненнем рэчаіснай сітуацыі змянялася «моўнае» пазначэнне тых ці іншых падзей мінулага.

Актуалізацыя рэлігійнага фактару ў Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI ст. адбілася ў тэксце «Epitome» яшчэ і ў тым, што ў параўнанні з летапісным варыянтам зніклі амаль усе згадкі пра паганскае ўшанаванне («подле римского обычая») памяці памерлых легендарных уладароў [33, с. 129, 134; 34, с. 129, 131–132 і далей]. А ў адзіным наяўным апісанні паганскіх звычаяў назіраецца выразнае адрозненне ў моўным плане: калі ў летапісах сцвярджаецца, што сын Палемона Спера пасяліўся ля возера, якое пасля яго смерці шанавалі як святое месца, то ў «Epitome» замест «возера» з'яўляецца «балота» («paludi») [19, s. 95]. Сапраўды, Ратундусу заўзятаму католіку, актыўнаму дзеячу Контррэфармацыі [12, s. 116–128, 27, p. 75–88], не выпадала станоўча трактаваць паганскія традыцыі.

Такім чынам, у моўным плане адрозненні паміж «Epitome» і ранейшай летапіснай традыцыяй вынікаюць са змянення кантэксту, у якім ствараліся гэтыя творы (значэнне наймення «Русь»), а таксама з

асаблівасцяў самога тэксту «Epitome» (праваслаўныя «літвіны», аповяды пра паганства), які вырашаў уласныя, не тоесныя летапісным, задачы.

У цэлым, выклад гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў «Epitome», сапраўды, істотна адрозніваецца ад летапіснага, што прасочваецца ў планах адбору, ацэнкі і пазначэння звестак. Аднак асаблівасці вобразу мінулага ў «Epitome» вынікалі перадусім з іншага пункту погляду на даўнія падзеі: калі ў беларуска-літоўскім летапісанні XVI ст. важную ролю мела гісторыя магнацкіх родаў, то ў «Epitome» на першае месца выйшаў аповяд пра слаўныя ўчынкі вялікіх князёў, што адбілася ў адборы звестак (замоўчванне ўнутрыдынастычных канфліктаў) і іх ацэнцы (абарона высокага паходжання Віценя і Гедыміна). Таксама на паказ мінуўшчыны ўплывалі змены ў грамадска-палітычным кантэксце ў параўнанні з часам стварэння летапісных зводаў, што адлюстроўваецца ў ідэалагічным (праблемы Лівоніі і Русі) і моўным (пытанне лацінскай мовы, сэнсавае напаўненне тэрміну «Русь»). Атрымліваецца, што гэтыя наватворы мелі пераважна сітуатыўны характар, што пацвярджаецца сур’ёзнымі разыходжаннямі «Epitome» і ў адборы, і ў ацэнцы, і ў пазначэнні падзей з сінхроннымі ёй тэкстамі (творамі Стрыйкоўскага і Гваньіні), нават з іншым творам яе верагоднага аўтара – Аўгустына Ратундуса («Размова Паляка з Літвінам»). Атрымліваецца, што адзіным «метадалагічным» адрозненнем «Epitome» ад ранейшага гісторыяпісання можна лічыць спробы ўдакладнення «рымскай легенды», але, што паказальна, гэтая крытычнасць не заходзіла далей: у самой легендзе аўтар «Epitome» не сумняваўся.

Epitome Principum Lituaniae

«Epitome Principum Lituaniae a migratione Italorum P. Libone vel, ut Lituanica historia scribit, Palemone Duce usque ad Jagellones» («Кароткі аповяд пра літоўскіх князёў ад перасялення італійцаў з Публіем Лібонам, або, які піша Літоўская гісторыя, Палемонам, да Ягелонаў») упершыню быў апублікаваны ў 1912 годзе польскім гісторыкам Янам Якубоўскім як дадатак да яго працы «Даследаванне міжэтнічных адносін на Літве да Люблінскай уніі» [19] па тэксце, які змяшчаўся на л. 33–48 рукапісу лацінскага перакладу Статуту ВКЛ 1566 году (у больш ранняй – 1900 г. – публікацыі самога перакладу пададзены толькі пераказ «Epitome» [21, p. XXIII–XXIV]). У 2000 годзе «Epitome» была перадрукавана ў зборніку «Šešioliktojo amžiaus raštija» («Пісьменніцтва шаснаццатага стагоддзя») [20], выдадзеным Інстытутам літоўскай літаратуры і фальклору. Тамса-

ма быў змешчаны пераклад твору на літоўскую мову, зроблены, верагодна, Антанасам Дамбраўскасам, з удакладненнямі і каментарам Сігітаса Нарбутаса.

Пераклад «Epitome» на беларускую мову здзяйсняецца паводле публікацыі Я. Якубоўскага. Імёны перадаюцца так, як прынята ў гістарычнай традыцыі (з пазначэннем пры першым узгадванні лацінскага варыянту з «Epitome»). Заўвагі да тэксту пазначаны лічбамі ў круглых дужках.

* * *

Кароткі аповяд пра літоўскіх князёў ад перасялення італійцаў з Публіем Лібонам, або, які піша Літоўская гісторыя, Палемонам, да Ягелонаў

Літвіны вядуць сваё паходжанне ад італійцаў; мова сялян, набліжаная шмат у чым да італьянскай мовы, верагодна, узнікла з-за далечыні ў прасторы і часе; бо знатныя з-за прызвычаення, якое маюць, жывучы з палякамі і русінамі у супольнай дзяржаве, замянілі родную мову польскай і рускай. А прыйшлі яны на гэтыя землі, якія зараз пад уладай Літвы, у часы Даміцыя Нерона (*Domicio Nerone*), рымскага імператара, бязлітаснага ворага роду чалавечага, і на чале з Публіем Лібонам (*P. Libone*), якога гісторыя памылкова называе Палемонам (*Palemonem*), на самы край кола зямнога (*orbis terrarum*) ўцяклі, куды не сягала ўлада Рыму, як сцвярджаюць рускія кнігі пра мінулае (1), і ад гэтага Лібона Лібонія (*Libonia*), цяпер Лівонія (*Livonia*), прazвалася (2).

Ёсць тыя, якія пішуць, што яны [літвіны] ўцяклі сюды, калі Атыла (*Attila*) з гунамі рабаваў Італію (3). Ёсць і такія, якія сцвярджаюць у кнігах, што падчас грамадзянскай вайны паміж Гаем Цэзарам (*C. Caesarem*) і Пампеем (*Pompeium*) нейкі атрад рымлян, пакінуўшы Італію, размясціўся ў гэтых краях і заснаваў горад Ромавэ (*Romove*), ад назвы Рыму (4). Я не бяруся ацаніць спрэчнае, хто з іх больш праўдзівы, пакуль што толькі вядома, што літвіны паходжаннем італійцы (5). Нарэшце, Эразм Стэла (*Erasmus Stella*) (6) паведамляе, што ў кнігах Утрэхцкага архіву (*Ultraiectinorum tablinis*) змяшчаецца, што раней Утрэхт (*Ultraiectum*) (7) называўся Антонія (*Antonia*) і быў заснаваны Антоніем (*Antonio*), а гэты Антоній далучыўся да тых, хто з Рыму ад нялітасці Нерону ўцёк, і атабарыўся ля вусця Рэйну, іншыя ж паплылі шукаць больш аддаленых мясцін. Гэта пацвярджае праўдзівасць «Літоўскай гісторыі»: калі былі тыя, хто, уцякаючы ад жорсткасці Нерона, даплыў з Рыму па Атлантычным моры да вусця Рэйну, то былі і тыя, якія ў Літве і Лівоніі (*Libonia*) аселі.

Перадаюць, што ў гэтага Лібона, або, калі недакладна, Палемона, нарадзіліся тры сыны – Борк (*Borcum*), Спера (*Speram*) і Кунас (*Cunam*). Закладзены Боркам над ракою Юра горад праз злучэнне назвы і ракі і імя заснавальніка быў названы Юрбаркам.

Спера з-за вялікай сваёй набожнасці шанаваўся як бог, балота (*paludi*), названае яго імем, дзе быў пакладзены ягоны прах, лічылі месцам для пакланення.

А Кунас перажыў абодвух братоў і, калі народ разросся, пашырыў тэрыторыю пражывання за кошт пустак і праз шлюбы з суседзямі.

Гімбут (*Gimbutus*), сын Кунаса, у Жамойці, яго брат Кернус (*Cernus*), таксама сын Кунаса, у Літве панавалі; пішуць, што яны, злучыўшы свае войскі, той частцы Русі, якая ўключае Браслаўскую і Полацкую землі, вялікую шкоду нанеслі (8).

Мантвіл (*Montvilus*), сын Гімбута, трымаючы адну Жамойць – бацькавы ўладанні, перадаў Літву свайму дзядзьку Кернусу. Кернус, не пакінуўшы нашчадка мужчынскага полу, аддаў сваю дачку Паяту (*Poiatam*) замуж за Жывінбуда (*Sivimbudo*), сына Даўспрунга Цэнтаўра (*Desprungi Centauri*) (9), які, як мяркуецца, разам з Публіем Лібонам у гэтыя землі з Італіі прывандраваў, і ў якасці пасагу перадаў яму [Жывінбуду] Літву.

Сын Гімбута Мантвіл успадкаваў уладу ў Жамойці, а Паятай народжаны сын Жывінбуда Кукавойт (*Cucuvitus*), як напісана, у Літве і Жамойці панаваў (10), што няслушна, калі толькі, магчыма, Радзівіл (*Radivillus*), брат Мантвіла (11), яшчэ адзін сын Гімбута, калі пайшоў у паход на Русь, пакінуў таму [Кукавойту] Жамойць. Сапраўды, гэты Радзівіл, калі даведаўся, што скіфамі (12) царкі раксаланаў і аланаў (13) паскіданы і пазабіваны, а іх землі знішчаны і разрабаваны, пакінуўшы Жамойць, як апавядаецца, разам з братам Мантвілам пайшоў паходам для захопу гэтых зямель, у параўнанні з Жамойцю больш урадлівых і з-за цяплейшага надвор'я больш заселеных, і спачатку ў крэпасці, якая на мове раксаланаў называецца Наваградак (*Novogrodiam*), размясціўся; затым перайшоў раку Кронан, якую Нёманам (*Nemum*) называюць, у заходнім напрамку да Гродна, пасля і той край Літвы, які завецца Падляшша (*Podlachia*), заняў і ў ім Бярэсце (*Brescium*), Драгічын, Мельнік, разбураныя і разрабаваныя скіфамі крэпасці, аднавіў.

Калі пішуць, што Кукавойт, сын Жывінбуда Цэнтаўра, вёў вайну з крыжакамі ў Прусіі (14), здаецца, дакладна не вылічваюць бег часу. Калі «Літоўская гісторыя» мае рацыю, што гэты Кукавойт быў унукам Даўспрунга, які, як мяркуюць, з Публіем Лібонам у гэтыя землі

прыйшоў, то з часоў, калі дзед [Даўспрунг] з іншымі сюды з Рыму ўцёк, не мінула і дзвесце гадоў, а крыжакі нашмат пазней пасля веку Нерона, калі Публій Лібон з Даўспрунгам сюды прывандраваў, пачалі засяляць Прусію, як усе гісторыі сведчаць, неўзабаве пасля 1200 году ад нараджэння Хрыста. Атрымліваецца, што Нерон жыў і Даўспрунг, дзед Кукавойта, у гэтыя землі прыйшоў на тысячу з нечым гадоў раней за з'яўленне крыжакоў у Прусіі. Такім чынам, няслушна, што ўнук Даўспрунга [Кукавойт] пражыў тысячу гадоў і мог ваяваць з крыжакамі.

Калі Мантвіл і Радзівіл, як гісторыя кладзе, праўнукі Публія Лібона, або Палемона, былі італійцамі, то ці Русь, або Раксаланія, адчула скіфскую зброю нашмат раней за Батыя (*Batum*), які, як пішуць, каля Году Божага 1245 першы яе панішчыў, ці, чаму больш хочацца верыць, гэты Мантвіл, таксама як Кукавойт, нашмат пазней [жылі] пасля прыбыцця італійцаў у Літву і павінны быць названы больш аддаленымі нашчадкамі, чым праўнукі. І нават апісаныя як сыны таго Публія Лібона Борк, Кунас і Спера з'яўляліся не сынамі, а больш далёкімі нашчадкамі, бо, здаецца, іх імёны ніякай сувязі з італьянскімі не маюць (15). Трэба меркаваць, што імя і справы больш блізкага нашчадка Лібонава былі забыты з-за адлегласці ў часе. Як паведамляюць, гэты Мантвіл меў двух сыноў, а менавіта Нёмана (*Nemnum*) і Скірмунта (*Scirmuntum*), ад Нёмана рака Кронан атрымала імя, бо ў ёй у нешчаслівым выпадку ён патануў, таксама як ад Тыберына (*Tiberio*), які патануў у Альбуле, тая была названа Тыбрам, як піша Лівій (16). Скірмунт жа памёр бяздзетным (17).

Радзівіл, брат Мантвіла, або, як нехта прапануе, яго сын, пасля бацькавай смерці землі раксаланаў, занятыя бацькавай і ўласнай зброяй, апанаваў і, калі яны былі патрывожаны скіфскімі нападамі, ён забіў правадыра скіфаў Курдаса (*Curdassum*) і войска яго знішчыў (18), ды ў міры пакінуў уладу сыну Мінгайлу (*Mingailo*).

Мінгайла (Mingailus), сын Радзівіла, расставіўшы варту па бацькавых крэпасцях і гарадах, зноў заняўся набыццём спадчынных зямель і далучыў да дзяржавы Літвы, Жамойці і Русі падпарадкаваных вайною палачан, пскавічан і наўгародцаў, рускага народу (19).

Скірмунт (*Scirmuntus*), сын Мінгайлы, у многіх бітвах перамог Мсціслава (*Mescislaum*), які спрабаваў сілай вярнуць сабе ўладу над Руссю. Потым падтрыманы дапаможнымі войскамі князя Літвы і Жамойці Жывінбуда Цэнтаўра скіфаў, якія на чале з Балаклаем (*Balacleo*), нападалі на Русь, перамог, як перадаюць, праз падрыхтаваную ля Койданава засаду.

Транята (*Troniatus*), сын Скірмунта, уладарыў пасля бацькі і Курду (*Curdam*), ваяводу (*legatum*) князя скіфаў Балаклая (20), які шырока рабаваў Русь вялікім войскам, сабраным з Трансрананскіх (*Transrhananis*) (21), якіх мы па-простаму называем Заволжскімі (*Zawolhanos*), скіфаў, ля ракі Акунёўка, дзе адбылася крывавая бітва, перамог; але ў гэтай былі забіты браты Траняты Любарт (*Lubortus*) і Пісімонт (*Passimuntus*), як і іншыя слаўныя князі. Аднак усё-такі перамога прыйшла Траняту.

Альгімунт (*Olgimuntus*), сын Траняты, успадкаваў ўладу ад бацькі, які не нашмат перажыў перамогу [ля Акунёўкі], і ў квітнеючым спакоі карыстаўся плёнам ад бацькавай перамогі, бо многія гады скіфы, узрушаныя тым няшчасцем, устрымліваліся ад уварванняў у рускія землі.

І Рынгальт (*Ringoltus*), сын Альгімунта, пасля смерці бацькі сам спачатку мірна кіраваў дзяржавай. Праз шмат гадоў рускія царкі, вернікі грэчаскага абраду, Дзмітрый Друцкі (*Demetrius Drucensium*), Святаслаў Кіеўскі (Suetoslaus Kiioviensium), Леў Уладзімірскі (*Leo Wladimiriensium*) пайшлі вайною на яго, падтрыманыя атрадамі скіфаў, і імкнуліся адабраць у Рынгальта тыя ўладанні, якія яго продак Радзівіл заняў (22), але на вялікае сваё гора, бо і самі яго войскам былі забіты, і ля берага ракі Кронан, дзе яна прымае ў сябе раку Магільна, войска іх было знішчана. А Рынгальт, атрымаўшы шчаслівую перамогу, спакойна Наваградскую дзяржаву сыну Міндоўгу (*Mendago*), які таксама называны Міндала (*Mindalo*), затым Мандольфам (*Mandolphus*), як адныя пішуць, пакінуў; аднак, некаторыя сцвярджаюць, што Рынгальт памёр бяздзетным, іншыя ж даводзяць, што ён пакінуў сына Войшалка (*Volsuincum*), але той быў неваяўнічым, таму наваградцы, грэбуючы яго бяздзейнасцю, да Свінтарога (*Suintaurum*), які ўладарыў над літвінамі і жамойтамі, перайшлі (23).

Але калі слушна, што Міндоўг (*Mendagum*) быў сынам Рынгальта, то таксама слушна, што павінна быць нашмат больш, як напісана раней, бліжэйшых нашчадкаў Публія Лібона, чым колькі іх налічваецца. Бо гэты Рынгальт, як напісана аўтарамі «Літоўскай гісторыі», дзясяты па ліку пасля Лібона, а яго сын Міндоўг, па сведчанню ўсіх твораў, каля Году Божага 1250 жыў, прыняў хрысціянскую веру, і калі быў абліты святой вадой Хрышчэння, назваўся Мандольфам, ён жа, як вядома, пасля адрокся ад веры (24). Такім чынам, атрымліваецца, што ад Нерона, які быў рымскім цэзарам меней, чым праз шэсцьдзясят гадоў пасля Нараджэння Хрыста, і ад чыёй лютасці ўцякаючы, Публій Лібон, як пішуць, прывандраваў у Літву, і ад гэтага Лібона на працягу 1200 гадоў дзесяць магло мінуць пакаленнняў, калі толькі мы паверым, што кожны

ў кожным пакаленні жыў больш за 100 гадоў, у што бязглузда верыць. Ці калі мы жадаем крочыць за думкай іншых, якія пішуць, што ўцекачы-італійцы прыйшлі сюды ў тыя часы, калі Атыла, кароль гунаў, Італію праз шмат гадоў ад часоў Нерона разбурыў, але і ад часоў Атылы дзесяць пакаленняў у кароткасці гэтага чалавечага веку не маглі да перыяду жыцця Мандольфа цягнуцца.

Мандольф Транятам (*Troniato*), сынам Даўмонта (*Dovimunto*), быў забіты, і Свінтарог (*Suintaurus*), як «Літоўская гісторыя» кладзе, праўнук Паяты, праўнучкі Публія Лібона, за ім [Мандольфам] ішоў, і заняўшы дзяржаву Наваградскую, як напісана, далучыў яе да Літвы (25). Але і ён, калі быў нашчадкам Лібона ў шостым пакаленні, не мог дасягнуць часоў Мандольфа. Гэты Свінтарог ці быў яго [Публія Лібона] нашчадкам у шостым калене, што, верагодна, няслушна, ці больш аддаленым нашчадкам тых, хто з Публіем Лібонам у гэтыя землі прыйшоў і, як мяркуем, па бацькавай лініі паходзіў ад Цэнтаўра, таварыша (comite) Публія Лібона і, як перадаецца, панаваў у Літве, Лівоніі (26) і ў большай частцы Русі.

Далей у гэтага Свінтарога быў сын Гірмунт (*Girmuntum*), якога іншыя Герватам (*Giervatum*) завуць (27), у Гірмунта – Калігін (*Coliginum*), у Калігіна – Раман (*Romanum*), у Рамана – Даўмонт (*Dovimuntum*), нарэшце, сынам гэтага Даўмонта быў Траната, як некаторыя паведамляюць (28). Гэтым жа Транятам быў забіты Мандольф, затым пасля Мандольфа панаваў яго сын Войшалк (*Voisalcum*), нарэшце, калі і той быў забіты, Літоўскую дзяржаву атрымаў Свінтарог, продак Траняты, як такое можа быць? Як магло быць, што Свінтарог пераажыў пяць наступных пакаленняў і да часу Войшалка, бацьку якога забіў далёкі нашчадак [Свінтарога, г. зн. Траната], дажыў і пры гэтым ад настолькі далёкіх ад сябе нашчадкаў пераняў уладу ў Літоўскай дзяржаве?

Аднак усім вядома, што Свінтарог ці пазней, ці раней, але кіраваў у Літве.

За ім ішоў яго сын Гірмунт, альбо Герват, у панаванне якога лівонцы (*Livonii*) і латыгола (*Laticolae*), пачаўшы навучацца хрысціянскай веры, пачалі і адыходзіць ад літвінаў, тады яшчэ паганцаў (29); ён заснаваў горад, які, як напісана, ад свайго імя назваў Гервятамі. Таксама ён меў двух сыноў – Трабуса (*Trabum*) і Калігіна; Трабус заснаваў горад, які па сённяшні дзень захоўвае яго імя, і памёр бяздзетным.

У Калігіна нарадзіўся Раман. Раман жа, як паведамляецца, меў пяць сыноў – Нарымунта (*Narimuntum*), Гольшу (*Olsam*), Гедрута (*Gedrutum*), Даўмонта і таго, хто вышэй ужо ўзгадваўся, забойцу Мандольфа Трайдэна (*Troidenem*) (30).

Нарымунт, старэйшы па нараджэнню, атрымаў усю ўладу ў Літве. Тэўтонскія рыцары, пры гэтым адначасова і рэлігійныя браты, бо так называліся, на чале з Фольквінам (*Volquino*) сілай прымушалі яго да хрысціянскай веры, беспаспяховыя ў гэтай справе напалі, але былі ім пераможаны, сам правадыр Фольквін быў забіты і пяцьдзясят прадней-шых рыцараў, якіх па сваім звычаі называлі комтурамі (*Commendatores*), у бітве, мужна змагаючыся, загінулі (31). Гэты Нарымунт, адхіліўшы герб продкаў, замест «Гіпацэнтаўра» (*Hyppocentauro*) ўзяў сабе як герб, па прыкладзе Міндоўга, «Узброенага Рыцара» (*Equitem armatum*). Бо Мандольф першым стары свой герб замяніў на «Ўзброенага Рыцара», як перадаюць, для пазначэння, што князі літоўскія павінны быць моцнымі, дзейснымі і ваяўнічымі мужамі (32).

Калі Нарымунт пайшоў з жыцця, уладу ўспадкаваў яго брат Трайдэн. Ён шмат бедстваў прынес Польшчы, Мазовіі і Прусіі, бо ў яго часы яна [Польшча] не адным кіравалася, а разарваная на мноства сатрапій, альбо княстваў, была слабая, каб абараніць сябе, і прыдатная для нападаў чужынцаў, пра што сведчыць і «Хроніка палякаў» (*Chronica Polonorum*) (33).

Гэты Трайдэн з дачкой мазавецкага князя меў сына Рымунта (*Rimuntum*), які пад уздзеяннем рускага царка Льва (*Leone*), якому быў вельмі адданы, прыняўшы хрысціянскую веру грэчаскага абраду, даў абет манаскага жыцця. Але калі яго бацька Трайдэн быў забіты сваім братам Даўмонтам з-за жадання ўладарыць, [*Рымунт*], узрушаны бацькавай смерцю, адрынуў звычаі манаскага жыцця і прыняўся помсціць забойцу бацькі. Даўмонт жа быў ненавісны для пакрыўджаных ім і з-за гэтага забойства, і з-за папярэдняй абразы, якую нанес старэйшаму брату Нарымунту, жонку якога ўзяў заганным шлюбам. Таму лёгка ўсе змовіліся на яго [*Даўмонта*] забойства і дазволілі, каб у хуткай бітве ён быў пераможаны Рымунтам, у гэтай сутычцы Даўмонт быў забіты. Народ жа жадаў, каб вярхоўная ўлада была перададзена Рымунту, законнаму і спадчыннаму ўладару, але той, задаволены помстай за смерць бацькі, вярнуўся да звычаяў манаскага жыцця. Як бы ні рознілася тут гісторыя, што ён яшчэ працяглы час панаваў і, калі на Русі вёў здабычу, загінуў, пераможаны Львом, сваім настаўнікам у веры (34), паведамляецца, аднак, што спярша ён загадаў сваім, каб Віценя (*Vitenem*), мужнага чалавека, абралі сабе гаспадаром, таму што з роду Цэнтаўраў ніхто не вылучыўся: два яго [Рымунта] стрыечныя браты – Альгімунт (*Olgimunto*), сын Гольшы (*Olschae*), і Гінвіл (*Ginvilo*), сын Гедрута (*Gedroti*), тады яшчэ малалетнія – былі адхілены. Бо наяўны неспакой-

ны стан спраў у Літве патрабаваў, калі для яе ратавання і кіравання быў узяты муж харобры, а ніхто не лічыўся больш мужным і падыходзячым для кіравання Рэспублікай, чым Віцень.

Але гэты Віцень (*Vitenes*), як сцвярджае Пётр Дусбург (*Petrus Dusburch*), старажытны аўтар гісторыі прусаў, быў сынам Путынуэра (*Putinueri*), караля Літвы (35). Ён прынес шматлікія бедствы Польшчы, як вышэй ужо адзначалася, падзеленай на ўладанні многіх, а таксама і Прусіі, хоць і часта небеспакаранна. Паходзіў жа ён [Віцень] з Палемонава, альбо Лібонава, роду Калюмнаў (*Columnensium*), які ўжо вырадзіўся ў звычайныя шляхецкія роды (36), як паведамляе «Гісторыя літвінаў» (37). Яго бацька Пацін (*Potinum*), або, як Дусбург піша, Путывер (*Putiverum*) меў у Жамойці маёнтак Айрагола (*Hieracolae*) і Трайдэна, калі той падарожнічаў па Жамойці, гасцінна прыняў. Яго [Путывера] сын Віцень, тады яшчэ зусім хлопчык, сваімі вялікімі здольнасцямі спадабаўся Трайдэну, які ўзяў яго для выхавання сярод княскіх дзяцей. Затым, стаўшы дарослым, ён мужна і спрытна адзначыўся ў справах, паказаў сваю адданасць і стараннасць князю, які прызначыў яго маршалкам (*palatio praefectum*). Такім чынам, Рымунт лёгка пераканаў сваіх, каб Віценю, мужу харобраму, перадалі ўладу, асабліва, калі з'яўляецца праўдай, што Пётр Дусбург піша, што быў сынам караля і вёў свой род ад Лібона (38).

Ад Віценя ўладу пераняў яго сын Гедымін (*Gediminus*), хоць аўтары польскай гісторыі прыдумляюць, што гэты Гедымін з'яўляўся не сынам Віценя, а стайнікам, і нават беспадстаўна дадаюць, што ён забіў свайго пана (39); гэта, магчыма, адтуль пайшло, што Гедымін забіў таго Дракаліта (*Dracolytum*), унука Даўмонта, апошняга ўладара ў Літве з роду Цэнтаўраў, які [Дракаліт] прагнуў спадчыннай улады і ў гэтым падахвочваўся прусамі (40). Таму суседзі [крыжакі] дзеля знявагі, зайздросцячы новай уладзе Гедыміна, разнеслі, што князь і ўладар Літвы слугой, а для большай знявагі, стайнікам забіты. Нават Мехавіта (*Miechovius*) піша, што Гедымін быў забіты ў Прусіі ў 1307 годзе ад Нараджэння Хрыста, а Віцень панаваў Літве праз чатыры гады пасля смерці Гедыміна, гэта значыць, у Год Божы 1311 (41). Так, калі, згодна з Мехавітам, Віцень перажыў Гедыміна, якім чынам загінуўшы чатырма гадамі раней Гедымін мог забіць свайго пана? Але гэтыя плёткі былі выдуманыя па вышэйзгаданай прычыне.

Безумоўна вядома, што Ўладзіслаў Лакетак (*Wladislaum Loketkonem*), кароль Польшчы, быў чалавекам слыннай адвагі, разважлівасці і высакароднасці; як ён мог дапусціць, каб дачка Гедыміна, стайніка і

забойцы, выйшла замуж за яго сына Казіміра (*Casimiro*), які павінен быў стаць вярхоўным уладаром? Канешне, настолькі заганны для сваёй крыві, зняважаны нізкасцю паходжання і забойствам шлюб высакародны і прагнучы славы князь павінен быў адхіліць.

Гедымін заснаваў Трокі і паклаў пачатак Вільні, цяперашняй сталіцы Літвы. Паведамляецца, што ён часта вёў войны з прусамі, лівонцамі і русінамі і пашырыў свае ўладанні. Ён пакінуў сем сыноў – Мантывіда (*Montividum*), Нарымунта (*Narimuntum*), Альгерда (*Olgerdum*), Карыята (*Coriatum*), Любарта (*Lubortum*), Яўнута (*Jaunutum*) і Кейстута (*Keistutum*). З іх найбольш здольнасцямі вылучаліся Альгерд і Кейстут, таму яны і ўспадкавалі бацькаву дзяржаву, астатнім жа братам былі прызначаны ўдзелы (*Satrapiae*). Як напісана, Альгерд меў з Марыяй (*Maria*), дачкой цверскага князя, хрысціянкай грэчаскага абраду, дванаццаць сыноў: Ягайлу (*Jagellonem*), Скіргайлу (*Skirgellonem*), Свідрыгайлу (*Suitrigellonem*), Карыгайлу (*Corigellonem*), Нарымунта (*Narimuntum*), Лінгвена (*Languinum*), Любарта (*Lubartum*), Андрэя (*Andream*), Бутава (*Butavum*), Карыбута (*Coributum*), Канстанціна (*Constantinum*), Вігунта (*Vignutum*), інакш Аляксандра (*Alexandrum*) (42). З іх некаторыя прынялі матчыну веру грэчаскага абраду, а некаторыя затым, калі Ягайла стаў каралём Польшчы, разам з ім сапраўдную рымскую каталіцкую веру пачалі вызнаваць; і ад іх большасць княскіх родаў у Літве і Русі вядзе сваё паходжанне і ўжывае герб Віценева роду – «Ўзброенага вершніка», асабліва Слуцкія (*Slucenses*). Бо Альгерд быў продкам у шостым калене цяперашняга князя, чые папярэднікі ішлі ў наступным парадку: у Бутава, альбо Ўладзіміра (*Vlodimirus*) (43), сына Альгерда, быў сын Аляксандр (*Alexander*), званы Алелька (*Olelko*), у Аляксандра – Міхаіл (*Michael*), у Міхаіла – Сямён (*Simon*), якога літвіны, абураныя адсутнасцю [ў Княстве] караля Казіміра, пастанавілі зрабіць [вялікім] князем (44), але Казімір (*Casimirus*) своечасова супрацьдзейнічаў іх змове; у гэтага Сямёна быў сын Юрый (*Georgius*), які з’яўляецца бацькам гэтага Юрыя (*Georgii*), [цяперашняга] князя Слуцкага.

А Кейстут меў шэсць сыноў – Жыгімонта (*Sigismundum*), Таўцівіла (*Totvilum*), Войдата (*Voidatum*), Патрыкея (*Patricium*), Дангута (*Dongutum*) і Вітаўта (*Vitoldum*), які сярод іх вылучаўся здольнасцямі (45).

Таму што Ягайла, сын Альгерда, здаваўся свайму бацьку больш здатным для кіравання Літоўскай дзяржавай, здарылася, што той яму свае землі і ўладу, таксама як Кейстут свае Вітаўту, пакінуў. Астатнія браты, задаволеныя звычайным жыццём, кіравалі правінцыямі, вылучанымі кожнаму ў якасці часткі бацькоўскай спадчыны.

Ягайла, сын Альгерда, першы абвяшчальнік (*promulgator*) хрысціянскай веры ў Літве, параможца і знішчальнік маскавітаў, скіфаў і прусаў, як стаў хрысціянінам і якімі быў знакамітымі справамі, добра вядома з польскіх хронік; бо быў абраны польскім каралём, калі ажаніўся з Ядзвігай (*Hedvigi*), дачкой Людвіга (*Ludovici*), польскага і венгерскага караля, і адгэтуль спадчынная ўлада перадавалася да Жыгімонта Аўгуста (*Sigismundum Augustum*), яго праўнука, апошняга караля ў Польшчы з яго роду. Улада гэтай дынастыі трымалася амаль дзвесце гадоў.

Стрыечны брат Ягайлы Вітаўт, які пасля хрышчэння атрымаў імя Аляксандр (*Alexandri*), быў харобрым воінам: не толькі пільна абараняў Літву ад маскавітаў і скіфаў, але і сам на абодвух гэтых ворагаў хадзіў вайною і знішчыў іх незлічоныя войскі. Калі нагайскія (*Nohaiensibus*), крымскія (*Tauricanis*), заволжскія скіфы былі падначалены ягонай зброяй, ён даў ім законы і па свайму жаданню паставіў ім царкоў; тых жа, якія здаваліся больш няўрымслівымі, каб не паўставалі, ён прымусіў перасяліцца ў Літву і жыць ва ўнутранай яе частцы, ля ракі Вака; яны жывуць тут на роўных правах з мясцовымі, аднак, да сённяшняга дня трымаюцца мусульманскай веры.

Вітаўт, з дазволу Ягайлы кіраўнік усіх спраў у Літве, вялікім, а Ягайла найвышэйшым князем тытулаваліся.

Калі Вітаўт памёр, яго брат Жыгімонт, яшчэ адзін сын Кейстута, зрабіўся вялікім князем літоўскім, часта турбаваны вайсковымі нападамі стрыечнага брата Свідрыгайлы, брата караля Ягайлы (46), урэшце, у выніку змовы сваіх быў забіты, бо бязлітасна і сквапна кіраваў.

Пасля яго ў Княстве ўладарыў Казімір, сын Ягайлы, які затым, калі яго брат Уладзіслаў (*Wladislao*) ля Варны быў забіты туркамі, стаў каралём польскім.

Калі Казімір скончыў свой жыццёвы шлях, яго сын Ян Альбрэхт (*Joannes Albertus*), як у Каралеўстве Польскім, так і ў Вялікім Княстве Літоўскім, усімі галасамі быў абраны і кіраваў дзевяць гадоў (47), а яго спадкаемцам стаў Аляксандр (*Alexandrum*), сын Казіміра, які панаваў у Польшчы і Літве няпоўных пяць гадоў.

Сын Казіміра Жыгімонт Першы (*Sigismundus Prius*), які міласцю свайго брата Ўладзіслава, венгерскага і чэшскага караля, трымаў Княства Глогаўскае і Апаўскае, прыехаў у Літву ў час апошняй хваробы пакутуючага Аляксандра і знайшоў брата ўжо памерлым. Жыгімонт атрымаў уладу ў Вялікім Княстве, а затым і ў Кароне.

Пры гэтым каралі Рэч Паспалітая квітнела ўсімі барвамі. Кіраваў 41 год; пражыў 82 гады, пакінуў квітнеючую і спакойную дзяржаву Жыгімонту Аўгусту.

Дзясяцігадовы Жыгімонт Аўгуст са згоды палякаў і літвінаў быў укаранаваны каралеўскай дыядэмай, каб атрымаў досвед, пераймаючы ў пануючага бацькі. Ён памёр ва ўзросце толькі 52 гадоў у Кнышыне 7 ліпеня Году Божага 1572, пакінуўшы асірацелую Рэч Паспалітую ў вялікім усеагульнум смутку ды слязах.

Калі Рэч Паспалітая апынулася ў стане міжкаралеўя, пасля таго як на Варшаўскім сойме, прызначаным абраць караля, было адхілена шмат прэтэндэнтаў, каралём быў абвешчаны Генрых Анжуйскі (*Henricus Andagavensis*), сын французскага караля Генрыха (*Henrici Galliae Regis*). Але пасля свайго прыезду ў Польшчу і ў адпаведнасці з урачыстым і прынятым звычаем каранавання ў Кракаве дыядэмай, калі яго старэйшы брат Карл (*Carolo*), які панаваў у Францыі (*Gallia*), памёр, Генрых, знаходзячыся ў Польшчы няпоўных пяць месяцаў, каб хто-небудзь у яго адсутнасць братаў трон не заняў, натхнёны міласцю да радзімы, каб яна не апынулася ў небяспецы, таемна ад усіх з'ехаў з Польшчы і пасняшаўся ў Францыю шляхам праз Маравію і Аўстрыю, а затым праз Венецыянскія землі, і зноў Польшчу прывёў да міжкаралеўя.

Збянтэжаныя гэтым нечаканым і раптоўным ад'ездам караля палякі і літвіны, калі адусюль пакінутай дзяржаве пачалі шкодзіць варожыя напады як туркаў і татараў, гэтак і маскавітаў, склікалі ў другі раз Варшаўскі сойм, каб абраць караля, дзе самыя высакародныя і слаўныя на зямлі ўладары дамагаліся каралеўства, калі спачатку большасць Сенату і частка народу былі нязгодныя і гучна спрачаліся, амаль Боскім рашэннем быў абраны Стэфан Баторый (*STEPHANVS Batoreus*), трансільванскі князь, чыя мудрасць, справядлівасць, адвага настолькі вылучаюцца, што мы можам спадзявацца, што хутка Рэч Паспалітая пад яго кіраваннем будзе шчаслівай і спакойнай ды адпомсціць сваім ворагам, на што няхай дазволіць Літасцівы і Ўсемагутны Бог. Амінь.

Пераклад Яўгена Глінскага

Заўвагі

(1) Уцёкі рымлян у Літву да часоў панавання рымскага імператара Нерона (54–68 гг. н.э.) адносіць «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага» [другі беларускі летапісны звод, *далей – ДЛЗ*], якая, відаць, і акрэслена як «рускія кнігі пра мінулае». З іншых тэкстаў, якія былі напісаны да з'яўлення «Кароткага аповяду», храніст і паэт Мацей Стрыйкоўскі (1547 – каля 1593) ў «Ганцы цноты» (1574 г.) выкладае гэтую версію сярод іншых [14, s. 537]. Аднак у гэтых творах правадыр рым-

лян называецца толькі Палемонам. Затое ў «Размове Паляка з Літвінам» правадыр уцекачоў ад лютасці Нерона называецца выключна Публіем Лібонам [30, p. 263]. Яшчэ раней пра «нейкага Лібона» («Libone aliquo») як правадыра ўцекачоў з Рыму ў Прыбалтыку піша польскі храніст Марцін Кромер (1512–1589) у «Аб паходжанні і дзеях палякаў» (першае выданне – 1555 г.) [35, p. 61–62].

(2) Звесткі пра такую этымалогію назвы «Лівонія» змяшчае «Размова Паляка з Літвінам» [30, p. 263], якая, верагодна, мае аднаго аўтара з «Epitome». Яшчэ да яе Кромер сцвярджаў, што ад Лібона ўцекачы назваліся лівонцамі [35, p. 62].

(3) Перасяленне рымлян у Літву да часоў нашэсця гунаў Атылы (451–454 гг.) адносіць «Хроніка Быхаўца» (трэці летапісны звод, *далей – ХБ*). Дакладней, яе незахаванае паведамленне пра гэта рэканструюецца па «Хроніцы» (1582 г.) Мацея Стрыйкоўскага [10, с. 128]. Ён жа ў «Ганцы цноты» таксама пералічвае гэтую версію сярод астатніх [7, s. 537].

(4) Версія аб уцёках рымлян падчас грамадзянскай вайны паміж Юліем Цэзарам і Пампеем [49–45 гг. да н.э. – *Я.Г.*] выкладзена ў творы польскага храніста Яна Длугаша (1415–1480) «Аналы, альбо хронікі слаўнага Каралеўства Польскага» [11, p. 225–226; 12, p. 167]. У XVI ст., пераказваючы аповяд Длугаша, польскі храніст Мацей Мехавіта (1457–1523) у «Трактаце аб дзвюх Сарматыях» (1517 г.) неакрэслена кажа, што частка італійцаў прыйшлі ў літоўскія землі «з-за нязгоды з рымлянамі» [13, с. 98], а ў «Хроніцы палякаў» (1519, 1521 гг.) называе «грамадзянскую вайну» прычынай іх руху ў прыбалтыйскія землі [14, p. 32]. Аднак апісанне гэтай версіі ў «Epitome» фактычна з'яўляецца цытатай з Кромера [9, p. 61–62; таксама гл.: 15, с. 135–136].

(5) «Італійскае» паходжанне літвінаў ужо ў XV–XVI ст. не ўяўлялася такім безумоўным. Так, польскі храніст Марцін Бельскі (каля 1495–1575) у «Хроніцы ўсяго свету» пісаў, што «літоўскі народ здаўна пайшоў з заморскіх краін Паўночнага мора, з народу, які гісторыкі клічуць гепідамі» [16, list 359]. Яшчэ раней італьянскі гуманіст на службе польскага каралеўскага двара Філіп Калімах (1437–1496) лічыў літвінаў нашчадкамі ці то кельтаў, ці то выхадцаў з Басфору [17, s. 10–11]. Урэшце, Мацей Стрыйкоўскі ў сваіх творах імкнуўся паказаць, што спачатку на прыбалтыйскім узбярэжжы жылі «ваяўнічыя» готы, гепіды і і г.д., «продкі літоўскія» [7, s. 536; 18, s. 36 і далей], з якімі пасля зліліся прыбышы-рымляне [18, s. 78]. Гэта дало падставы даследчыкам характарызаваць канцэпцыю Стрыйкоўскага як спалучаючую «сармацкую» і «рымскую» легенды [19, s. 184; 20, s. 30].

(6) Эразм Стэла (Эразм Стэла Лібанатан, Ёган Шцюлер, каля 1460–1521) – нямецкі гісторык, лекар і палітычны дзеяч. Аўтар гістарычных прац «De rebus et populis orae inter Albim et Salam», «De antiquitatibus Borussiae», «De rebus Saxoniae, Thuringiae, Libanothiae, Misniae et Lusatiae». «De antiquitatibus Borussiae» (Базель, 1518) шырока выкарыстоўвалася Мацеем Стрыйкоўскім, які называе гэтую кнігу «Прускія старажытнасці» [18, s. 43], альбо «Пруская гісторыя» [18, s. 78, 80]. Польская даследчыца творчасці Стрыйкоўскага Юлія Радзішэўска адзначала, што ён у ненадрукаванай працы «Аб пачатках...» першым выкарыстаў твор Стэлы, «да таго часу ў Польшчы невядомага аўтара» [21, s. 119]. Але, як бачна, з працамі Эразма Стэлы быў знаёмы і стваральнік «Epitome». Зрэшты, насуперак сцвярджэнню Ю. Радзішэўскай, раней за Стрыйкоўскага гэтага нямецкага гісторыка цытаваў Марцін Кромер [9, p. 61]. Падрабязней пра Эразма Стэлу [22, s. 670].

(7) Утрэхт – зараз горад у Нідэрландах, у антычныя часы на яго месцы знаходзілася паселішча племені батаваў, а з I ст. н.э. рымская крэпасць пад назвай Trajectum.

(8) Паведамлення пра паход Гімбута і Кернуса на Полацк і Браслаў няма ў ніводным з існуючых спісаў ДЛЗ, затое яно чытаецца ў «Хроніцы Быхаўца» [10, с. 129]. Таксама пра гэтую выправу згадвае і Стрыйкоўскі ў «Ганцы цноты» [7, s. 539].

(9) Апісваючы пераход улады ў Літве ад Кернуса да Жывінбуда, аўтар крочыць услед за ДЛЗ, бо ў ХБ [10, с. 129] і «Ганцы цноты» [7, s. 540] Жывінбуд названы сынам, а не зяцем Кернуса. Дарэчы, Жывінбуд названы зяцем Кернуса і ў «Размове Паляка з Літвінам» [8, p. 263]. Аднак у некаторых спісах ДЛЗ зяцем Кернуса, мужам яго дачкі Паяты называецца спачатку Гірус, сын Даўспрунга, але ўжо ў іншым месцы ў якасці бацькі Кукавойта і мужа яго маці Паяты фігуруе Жывінбуд. Такая блытаніна назіраецца ў наступных спісах: Альшэўскім [23, с. 175], Румянцаўскім [23, с. 195–196], Рачынскага [23, с. 147]; падрабязней гл.: 15, с. 141].

(10) Сумнеўнае на думку аўтара «Epitome» паведамленне, што Кукавойт кіраваў не толькі ў Літве, але і ў Жамойці, чытаецца ва ўсіх спісах ДЛЗ [23, с. 91, 130, 147, 175, 196, 216] і ў ХБ [10, с. 131], перадаецца Стрыйкоўскім у «Ганцы цноты» [7, s. 541]. Пераход Жамойці пад уладу прадстаўнікоў гербу Кітаўрас (Цэнтаўр) у летапісах абумоўліваецца не воляй князя Радзівіла, як у «Epitome», а смерцю ўладара Жамойці Неманаса (альбо Вікінта), сына Мантвіла [23, с. 129, 146, 175, 194–195, 215], пра яго Ратундус у гэтым кантэксце зусім не згадвае [падрабязней гл.: 15, с. 140, 142].

(11) «Радзівіл, брат Мантвіла» невядомы летапісам. Характэрна, што прадстаўнік пануючай дынастыі з такім імем згадваецца ў іншай верагоднай працы Ратундуса – «Размове Паляка з Літвінам», дзе ён апісаны як «унук альбо нашчадак Гнубута [Гімбута. – *Я.Г.*]» [8, p. 263]. У шэрагу летапісаў дзейнічае сын Мантвіла Эрдзівіл (альбо Скірмунт), чые ўчынкі – падпарадкаванне Чорнай Русі – супадаюць з прыпісанымі Ратундусам Радзівілу [пра Радзівіла ў «Epitome» гл.: 4, s. 68].

(12) Аўтар «Epitome» за рэдкім выключэннем называе татараў «скіфамі», крочачы за тагачаснай звычкай «антыказаваць» геаграфічныя назвы [24, с. 193–206]. У рэчаіснасці скіфы, іранамоўнае насельніцтва Паўночнага Прычарнамор'я, зніклі яшчэ ў III ст. н.э. [пра скіфаў гл.: 25, с. 322].

(13) Раксаланы і аланы – іранамоўныя (сармацкія) качавыя плямёны перыяду антычнасці. Былі вядомы антычным і раннесярэднявечным гісторыкам і географам (Іосіф Флавій, Тацыт, Пталемей, Страбон, Іардан і інш.), таму гэтыя этнонімы трывала замацаваліся ў еўрапейскай інтэлектуальнай традыцыі Сярэднявечча і Ранняга Новага часу. Так, для літаратуры XVI ст. было ўласціва называць рускія землі «Раксаланіяй», хоць канкрэтнае напаўненне гэтага тэрміну магло адрозніваецца. Напрыклад, польскі гісторык Мацей Мехавіта пісаў пра «Раксаланію», разумеючы пад ёй «рускія» землі ВКЛ і выключаючы з яе Масковію, пры гэтым ён сцвярджаў, што ўласна раксаланы і аланы «зусім знішчаны і загінулі» [13, с. 89, 242–243]. Аднак Стрыйкоўскі называе «народам рускім або раксаланскім» усіх тых, каго сёння прынята акрэсліваць як усходніх славян [18, s. 93]. Той самы Стрыйкоўскі адрознівае «аланаў або літаланаў» (са спасылкай на Эразма Стэлу, гл. заўв. раней), якіх залічвае ў «літоўскі народ» і апісвае як «племя мужных готаў» [18, s. 43, 54], ад «іншых аланаў», на яго думку, суседзяў печанегаў [18, s. 51].

(14) Пра бітвы Кукавойта з крыжакамі існуючым зараз летапісам невядома.

(15) Стрыйкоўскі, наадварот, у «Ганцы цноты» выводзіў выводзіў этымалогію імя Спера наступным чынам: «Spera, a Sperando, Italice Speranca» [7, s. 539].

(16) Тыберын – легендарны цар Альбы. Прыведзены ў «Epitome» аповяд пра яго ўзяты з раздзелу 3 кнігі 1 «Гісторыі Рыму ад заснавання горада» Ціта Лівія (59 г. да н.э. – 17 г. н.э.) [26, с. 12].'

(17) Устаўкавы сюжэт з Радзівілам прыйшоў у супярэчнасць з інфармацыяй летапісаў, таму Ратундус вымушаны быў неяк «уладкаваць» лёс «летапісных» дзяцей Мантвіла – Неманаса (Вікінта) і Скірмунта (Эрдзівіла), таму другі з іх, згодна з летапісамі, бацька Мінгайлы, на старонках «Epitome» пазначаны як бяздзетны.

(18) Летапісная бітва Траняты, сына Скірмунта Мінгайлавіча, з Курдасам у «Epitome» падвоілася, і адзін з яе варыянтаў стаў яшчэ адной падставай для канструявання слаўных ўчынкаў Радзівіла.

(19) Летапісы звязваюць з імем Мінгайлы толькі падпарадкаванне Полацка, не згадваючы пра Вялікі Ноўгарад і Пскоў. У «Ганцы цноты» дададзена, што «полацкім» нашчадкам Мінгайлы падпарадкоўваўся і Пскоў [7, s. 540].

(20) Каб не паўтарацца, аўтар «Epitome» вымушаны быў некалькі сказіць імя Курдаса і ператварыць яго ў Курду. Гл. заўв. раней.

(21) У антычных аўтараў (Клаўдый Пталемей, Аміян Марцэлін) Волга называлася Ра (лац. Rha), адсюль і «Transrhananis Scythis» у «Epitome».

(22) Чарговая незаснаваная на летапісных звестках згадка пра Радзівіла.

(23) Пра тое, што Рынгальт памёр бяздзетным, сцвярджаецца толькі ў раннім спісе Красінскага [23, с. 131] (кароткая рэдакцыя ДЛЗ [27, с. 159]) і Еўраінаўскім спісе [23, с. 217], які, на думку М.М. Улашчыка, утрымлівае самы старажытны і адпаведна найменш апрацаваны варыянт легенды [15, с. 144]. У іншых жа спісах ДЛЗ – Археалагічнага таварыства [23, с. 92], Альшэўскім [23, с. 176], Рачынскага [23, с. 149], Румянцаўскім [23, с. 197] – падаюцца версіі і пра бяздзетнасць Рынгальта, і пра наяўнасць у яго сыноў, з якіх па імю называецца Войшалк, але другая з гэтых версій, відавочна, не пераконвала летапісцаў, бо яны адзначаюць, што «Ино далеи о том Воишвилаку не пишеть» (спіс Рачынскага) [23, с. 149]. ХБ без усялякіх сумненняў называе сынам Рынгальта Міндоўга [10, с. 132]. Стрыйкоўскі ў «Ганцы цноты» пасля аповяду пра панаванне Рынгальта апісвае гісторыю Міндоўга, але ступень іх сваяцтва ніяк не пазначае [7, s. 541; гл. таксама: 15, с. 132].

(24) З беларуска-літоўскіх летапісаў пра Міндоўга, сына Рынгальта, ведае толькі ХБ [10, с. 132–134]. Таксама падзеі панавання Міндоўга перадае і «Ганец цноты» [7, s. 541–542]. Затое польскай храністыцы былі добра вядомы постаці Міндоўга, яго сына Войшалка, забойцы Міндоўга Траняты і іншых літоўскіх князёў, звесткі пра якіх узыходзяць да Галіцка-Валынскага летапісу. Так, Длугаш згадвае пра хрышчэнне і каранацыю Міндоўга [28, p. 82], яго вяртанне ў паганства [28, p. 126], смерць Міндоўга [28, p. 139], панаванне і забойства Войшалка [28, p. 157]. Звесткі Длугаша перадаюцца і Кромерам [9, p. 230, 232, 240]. Аднак аўтар «Epitome», верагодна, пазычае інфармацыю пра гэтыя падзеі з «Хронікі палякаў» Мацея Мехавіты, на што паказвае называнне Міндоўга «Мандольфам», або «Міндалам», як у Мехавіты («Mendolphus», «Mindale») [14, p. 153, 161]. У Кромера імя Міндоўга перадаецца як «Mendocus» або «Mindacus». Імя Міндоўга як у Мехавіты называе першакрыніца апошняга – «Аналы» Длугаша, але ў іншым месцы «Epitome» яго аўтар спасылаецца акурат на Мехавіту ды і звярнуцца да яго друкаванага твору было прасцей, чым да рукапіснай хронікі Длугаша.

(25) Цікава, што ў летапісах не згадваецца менавіта пра далучэнне Наваградскай дзяржавы да Літвы, як у «Epitome». У ХБ у дадзеным месцы пропуск, а ў спісах ДЛЗ пра Свінтарога сказана, што ён панаваў «на Великом княжестве Литовском и Жомоитском, и Новгородском, и Руском» (спіс Археалагічнага таварыства, у астатніх – аналагічна) [23, с. 92].

(26) Пра ўладу літоўскіх князёў над Лівоніяй беларуска-літоўскія летапісы не паведамляюць.

(27) Сына Свінтарога спісы Археалагічнага таварыства, Рачынскага, Альшэўскі і Румянцаўскі, а таксама ХБ называюць Скірмантам (Скірымантам) [23, с. 93, 149, 177, 197; 10, с. 134], толькі ў спісах Красінскага і Еўраінаўскім [23, с. 132, 218] ён названы Гірмантам, але нідзе Герватам. У «Ганцы цноты» прысутнічае Гірмант [7, s. 543].

(28) Ніводзін з існуючых спісаў летапісаў ніякага Траняту не робіць сынам ніякага Даўмонта, хоць гэтыя імёны ў розных варыяцыях сустракаюцца ў помніках беларуска-літоўскага летапісання.

(29) Вельмі цікавая інтэрпрэтацыя летапіснага паведамлення. Усе спісы выкладаюць падзеі інакш: князь Гірмант (Скірмант) перамог латыголу «и их самих выстинал, и инших в полон вывел, и землю их пусту вчинил» (спіс Археалагічнага таварыства) [23, с. 93] (ХБ унікальна прыпісвае гэтую перамогу Кернусу і Гімбуту [10, с. 129]), а на іх месца прыйшлі крыжакі. Пра бітвы Гірманта з крыжакамі згадваецца і ў «Ганцы цноты» [7, s. 543].

(30) Верагодна, аўтар «Epitome» паблытаў імёны Траняты і Трайдэна.

(31) Вядомы аўтару «Epitome» Пётр з Дусбургу піша пра смерць II магістра Лівонскага ордэна Фольквіна (1208–1236) у бітве, але не акрэслівае дзе і з кім. З іншых лівонскіх крыніц вядома, што гэта была бітва пры Шаўлях 22 верасня 1236 г. [29, с. 62, 285]. Зразумела, што лівонскія крыніцы ніяк гэтую бітву з імем Нарымунта не зніТоўваюць.

(32) Гісторыя пра ўвядзенне гербу «Пагоня» выкладзена ва ўсіх летапісах, дзе ёсць «рымская легенда», але там яна змешчана ў прамове Рымунта аб прызначэнні вялікім князем Віценя, і ў ёй ніяк не згадваецца Міндоўг. Але ўжо Стрыйкоўскі ў «Ганцы цноты» карэктуе звесткі летапісаў наступным чынам: «Гэты Нарымунт герб прыдумаў «Пагоня», // Як Русь піша, але адыходзіць ад праўды, // Бо быў паганцам, як мог крыж на тарч пакласці // [...]. Пасля хрышчэння Міндоўг яго заснаваў // [...]. Яго шаноўны Нарымунт славу вярнуў, // Зноў той герб сваім зрабіў» [7, s. 543–544].

(33) «Хроніка палякаў» («Chronica Polonorum») – гістарычны твор, напісаны польскім гісторыкам, географам, астролагам і медыкам Мацеем Мехавітам (каля 1457–1523 гг.). Першае яе выданне (1519 г.) было канфіскавана з-за наяўнасці антыягелонскіх звестак, другое (1521 г.) выйшла з праўкамі гісторыка Ёста Людвіга Дэцыя [падрабязней гл.: 30, с. 66–69; 31, s. 45–57].

(34) Зразумела, што аповяд беларуска-літоўскіх летапісаў пра Рыманта (Рымунта) – гэта чарговы пераказ гісторыі князя-манаха Войшалка [17, s. 15], толькі з поўнай заменай імёнаў. Войшалк, згодна з ХБ (і яе крыніцай у гэтай частцы – Галіцка-Валынскім летапісам), сапраўды, загінуў ад рук князя Льва, але акурат пра Рыманта «рымскай легенды» гэтак ў летапісах нідзе не сказана. Магчыма, у часы напісання «Epitome» існавалі менш «падчышчаныя» летапісы, дзе гісторыя Рыманта цалкам паўтарала жыццёвы шлях Войшалка. Можа быць, дадзеная заўвага – вынік

уласных разважанняў аўтара, але слоўны кантэкст – «як бы ні рознілася тут гісторыя» – хутчэй кажа, што ён у дадзеным выпадку абапіраецца на нейкую крыніцу.

(35) Пётр з Дусбургу паведамляе пра Пукувера, што ён паслаў свайго сына Віценя ў паход на Куявію [29, с. 148].

(36) У летапісах адзначаецца, што Віцень быў з роду Калюмнаў, але нідзе не сказана, што як гэты род, так і сам Віцень, былі нашчадкамі ўласна Палемона. Але ўжо ў «Размове Паляка з Літвінам» Віцень праз зусім не прысутную ў летапісах генеалогію выведзены наўпрост ад Палемона (Публія Лібона) [8, p. 264]. Акцэнт на гэтым, як бачна, робіцца і ў «Epitome».

(37) Апавядаючы пра непрысутную ў летапісах генеалогію Віценя, аўтар «Epitome» спасылаецца не на «Літоўскую гісторыю» (Lituanica historia) як звычайна, а на «Гісторыю літвінаў» (Historia Lituanorum). Цяжка сказаць, што за гістарычны твор хаваецца за гэтай назвай. Можна выказаць гіпотэзу, што гэта страчаная праца самога Ратундуса, якая вядома пад умоўнай назвай «Хроніка альбо Гісторыя Літвы».

(38) Натуральна, Пётр з Дусбургу не выводзіў Віценя з роду Лібона, гэта ўласныя прыдумкі аўтара «Epitome».

(39) Ужо Ян Длугаш піша, што Гедымін панаваў, «захапіўшы ўладу і сапраўднага князя, у якога выконваў абавязкі стайніка, забіўшы» [12, p. 92]. Яго даслоўна паўтарае Мацей Мехавіта [14, p. 264] і некалькі больш маляўніча пераказвае Марцін Кромер [9, p. 360]. Акрамя таго, Мацей Стрыйкоўскі ў «Ганцы цноты» прытрымліваецца таго ж меркавання [7, s. 544], але ўжо ў «Хроніцы» [18, s. 353–356], наадварот, палымяна выступае супраць гэтай версіі, пашыраючы аргументы, выкладзеныя аўтарам «Размовы» [8, p. 263] і «Epitome». З'яўленне «чорнай» легенды пра стайніка Гедыміна звязваецца ці то з крыжацкай прапагандай, перадусім, памфлетамі францысканца Ёгана Фалькенберга [32, p. 130], ці то з антылітоўскімі творамі з Русі [17, s. 26–27].

(40) Пётр з Дусбургу паведамляе толькі пра хрышчэнне і пераход на бок крыжакоў літвіна Драйка [29, с. 159]. Усе астатнія падрабязнасці пра Дракаліта створаны аўтарам «Epitome». Пад «прусамі» тут маюцца на ўвазе крыжакі.

(41) Прынятыя ў навуцы даты панавання Віценя – 1295–1316 гг., Гедыміна – 1316–1341 гг. Але ў «Хроніцы палякаў» смерць Гедыміна датавана 1307 годам [14, p. 214–215], а пад 1311 годам апавядаецца пра паход на Прусію «найвышэйшага князя Літвы Віктэна» («Victenen supremus dux Lithuaniae») [14, p. 215–216].

(42) Менавіта такі пералік сыноў Альгерда з памылковым пазначэннем, што ўсе яны былі дзецьмі ад цверскай князёўны, у іншых крыніцах не сустракаецца. Найбольш набліжаны да яго – гэта варыянт Яна Длугаша [12, p. 93], прыняты наступнай польскай хранiстыкай, напрыклад, [9, p. 361; 14, p. 264; 16, list 380], у тым ліку і Стрыйкоўскім у «Ганцы цноты» [7, s. 547]. У гэтым варыянце трохі адрозніваецца паслядоўнасць князёў і замест Канстанціна, як у «Epitome», згадваецца Барыс. Затое пра Канстанціна вядома абодвум варыянтам з беларуска-літоўскіх летапісаў – выкладзенаму ў спісе Рачынскага [23, с. 154] і супольнаму варыянту Еўраінаўскага–ХБ [23, с. 224; 10, с. 142], праўда, у іх адзначаецца, што гэта былі дзеці ад двух шлюбаў [погляд сучаснай навукі на генеалогію Альгердавічаў гл.: 33, s. 47–161].

(43) Іншыя крыніцы не сцвярджаюць, што Ўладзімір было хрысціянскім імем Бутава, і што апошні быў продкам князёў Слуцкіх. Аднак менавіта Ўладзіміра (без пазначэння якога-небудзь яго паганскага імя) продкам Алелькавічаў называе ХБ [10, с. 163] і, відавочна, услед за ёй Стрыйкоўскі ў «Хроніцы» [34, s. 57]. У навуковай

літаратуры Бутаў (Бутаўд Генрых) называецца сынам Кейстута [33, s. 204; 35, s. 55], а адрозны ад яго Ўладзімір – сынам Альгерда і продкам князёў Слуцкіх [33, s. 81–84; 35, s. 101–115].

(44) Тут аўтар «Epitome» памыляецца, бо ў змове супраць Казіміра ў 1481 годзе ўдзельнічаў і быў за гэта пакараны смерцю Міхаіл Аляксандравіч (Алелькавіч) [36, s. 330], а не яго сын Сямён (памёр у 1505 г.). Зрэшты, гэтая памылка была пазычана з польскіх хронік: напрыклад, Марцін Кромер у гэтым выпадку называе Сямёна, кіеўскага князя, сына Алелькі (!) («Simonem Kiouiensium ducem, Olelconis filium») [9, p. 539]. Магчыма, у дадзеным выпадку паблытаны Міхаіл і яго брат Сямён Аляксандравіч (Алелькавіч) (памёр у 1470 г.). Падрабязней пра род князёў Алелькавічаў-Слуцкіх гл. [36, s. 323–336]. Дарэчы, Аўгустын Ратундус быў аўтарам панегірыку ў гонар роду Алелькавічаў [37, s. 604], які быў прыкладзены да неапублікаванага твору Стрыйкоўскага «Аб пачатках...».

(45) Пералік сыноў Кейстута, верагодна, пазычаны з «Аб паходжанні і дзеях палякаў» Марціна Кромера, дзе, як і ў «Epitome», згадваецца Дангут (у Кромера – Dougotus) [9, p. 361]. У хроніцы Длугаша ў гэтым месцы лакуна [12, p. 93], таму і Мехавіта, і Марцін Бельскі называюць імёны толькі пяці сыноў [14, p. 264; 16, list 380]. У ХБ замест Дангута названы Андрэй Гарбаты [10, с. 142]. Стрыйкоўскі ў «Ганцы цноты» крочыць за версіяй Кромера [7, s. 547], а ў «Хроніцы» пералічвае імёны толькі пяці Кейстутавічаў (не называючы ані Андрэя, ані Дангута-Доўгата), хоць піша, што ўсяго іх было шэсць [34, s. 58–59]. Погляд сучаснай навукі на генеалогію Кейстутавічаў – гл. [33, s. 196–234].

(46) Аўтар «Epitome» прапускае панаванне Свідрыгайлы Альгердавіча (1430–1432 гг.).

(47) У рэчаіснасці Ян Альбрэхт быў толькі каралём польскім (1492–1501 гг.) і не быў вялікім князем літоўскім, якім у гэты час быў яго брат Аляксандр (1492–1506 гг.). Адзначым, што польскія хронікі, у адрозненне ад «Epitome», гэтыя падзеі перадаюць слушна, напрыклад [9, p. 658–659; 14, p. 347; 38, p. 15–16]. Гэтая памылка аўтара «Epitome» адзначалася [6, p. 107] ў навуковай літаратуры.

Спіс літаратуры

1. Белазаровіч, В.А. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі / В.А. Белазаровіч; пад аг. рэд. І.П. Крэня, А.М. Нечухрына. – Гродна: ГрДУ, 2006. – 346 с.

2. Падокшын, С.А. Гісторыя ад Мацея / С.А. Падокшын // Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын.– Мінск, 2003. – С. 280–289.

3. Караў, Дз. Беларуская і польская гістарыяграфія ў XVI–XX стст. / Дз. Караў // Беларусіка = Albaruthenica. – Кн. 3: Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / Рэд. А. Мальдзіс і інш. – Мінск, 1994. – С. 242–251.

4. Семянчук, А.А. Фарміраванне нацыянальнай гістарычнай канцэпцыі ў ВКЛ: спроба рэканструкцыі / А.А. Семянчук // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. – Т. 2: Протарэнесанс і Адраджэнне / С.І. Санько і інш.; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск, 2010. – С. 593–605.

5. Radziszewska, J. Maciej Stryjkowski. Historyk-poeta z epoki Odrodzenia / J. Radziszewska. – Katowice: Uniwersytet Sląski, 1978. – 168 s.

6. Bardach, J. Maciej Stryjkowski i jego twórczość w świetle najnowszych badań / J. Bardach // Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVII wieku / J. Bardach. – Białystok; Warszawa, 1970. – S. 68–83.

7. Бидная, А.А. Генезис исторической науки в Великом Княжестве Литовском и формирование исторического сознания общества (XVI – начало XVII вв.): автореф. дисс. ... канд. ист. наук / А.А. Бидная; ГрГУ им. Я. Купалы. – Гродно, 2009. – 23 с.

8. Подокшин, С.А. Философия истории Матея Стрыйковского / С.А. Подокшин // Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын; навук. рэд. А. С. Майхровіч; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск, 2003. – С. 54–60.

9. Jučas, M. Lietuvos metraščiai ir kronikos / M. Jučas. – Vilnius: Aidai, 2002. – 208 p.

10. Рогов, А.И. Русско-польские культурные связи в эпоху Возрождения (Стрыйковский и его хроника) / А.И. Рогов; отв. ред. М.Н. Тихомиров. – Москва: Наука, 1966. – 312 с.

11. Wojtkowiak, Z. Maciej Stryjkowski – dziejopis Wielkiego Księstwa Litewskiego. Kalendarium życia i działalności / Z. Wojtkowiak; Uniw. im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. – Poznań: Wyd-wo Nauk. Uniw. im. Adama Mickiewicza w Poznaniu, 1990. – 248 s., 20 il., 1 k.

12. Baryczowa, M. Augustyn Rotundus Mieleski, wójt wileński, pierwszy historyk i apologeta Litwy / M. Baryczowa // Ateneum Wileńskie. – 1936. – № 11. – S. 117–172.

13. Zachara-Wawrzyńczyk, M. Geneza legendy o rzymskim pochodzeniu Litwinów / M. Zachara-Wawrzyńczyk // Zeszyty Historyczne / Uniw. Warszawski. – Warszawa, 1963. – T. III. – S. 5–35.

14. Stryjkowski, M. Goniec cnothy / M. Stryjkowski // Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi: 2 t. / M. Stryjkowski. – Warszawa: G. L. Glüksberg, 1846. – T. 2. – 1846. – S. 467–557.

15. Stryjkowski, M. O początkach, wywodach, dzielnościach, sprawach rycerskich i domowych sławnego narodu litewskiego, żemojdzkiego i ruskiego / M. Stryjkowski; oprac. J. Radziszewska. – Warszawa: PIW, 1978. – 764 s.

16. Stryjkowski, M. Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi: 2 t. / M. Stryjkowski. – Warszawa: G. L. Glüksberg, 1846. – T. 1 / Przedmowy M. Malinowskiego i I. Daniłowicza. – 1846. – LXIX, XLIX, 392 s.

17. Семянчук, А.А. Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі / А.А. Семянчук. – Гродна: ГрДУ, 2000. – 163 с.

18. Гваньїні, О. Хроніка Європейської Сарматії / О. Гваньїні; упорядкув. та пер. з пол. о. Юрія Мицика. – Київ: Києво-Могилянська академія, 2007. – 1006 с.

19. Kroniczka Książąt Litewskich 1576 r. // Jakubowski, J. Studya nad stosunkami narodowościowemi na Litwie przed Unią Lubelską / J. Jakubowski. – Warszawa, 1912. – S. 94–104.

20. Epitome Principum Lituaniae // Šešioliktojo amžiaus raštija / Lietuvių literatūros ir tautosakos institutas; red. S. Narbutas. – Vilnius, 2000. – P. 296-305.

21. Pomniki prawa Litewskiego z XVI wieku: Statut Litewski drugiej redakcyi (1566) / Wydał F. Piekosiński. – Kraków: AU, 1900. – LXX, 568 s.

22. Гене, Б. История и историческая культура средневекового Запада / Б. Гене; пер. с фр. Е.В. Баевской, Э.М. Береговой; отв. ред. И.И. Соколова. – Москва: Языки славянской культуры, 2002. – 496 с.

23. Vasiliauskas, A. Antyk i sarmatyzm / A. Vasiliauskas // Kultura Wielkiego Księstwa Litewskiego: analizy i obrazy / Oprac. V. Ališauskas et al. – Kraków, 2006. – S. 1–21.

24. Шмид, В. Нарратология / В. Шмид. – М.: Яз. славян. культуры, 2003. – 311 с.

25. Мицик, Ю. Вступ / Ю. Мицик // Гваньїні, О. Хроніка Європейської Сарматії. – Київ, 2007. – С. 5–33.

26. Jakubowski, J. Studya nad stosunkami narodowościowemi na Litwie przed Unią Lubelską / J. Jakubowski. – Warszawa: Nakład Towarzystwa naukowego Warszawskiego, 1912. – 104, VI s.

27. Jovaišas, A. Augustino Rotundo Lietuvos valstybės vizija / A. Jovaišas // Šešioliktojo amžiaus raštija / Lietuvių literatūros ir tautosakos institutas; red. S. Narbutas. – Vilnius, 2000. – P. 75–114.

28. Korzeniowski, J. [Wstęp] / J. Korzeniowski // Rozmowa Polaka z Litwinem. – Kraków, 1890. – S. III–VIII.

29. Dubonis, A. The Case of the Chronicle of Rivius / A. Dubonis // Lithuanian Historical Studies. – 2008. – Vol. 5. – P. 7–20.

30. Rozmowa Polaka z Litwinem / Parengė R. Koženiaskienė // Šešioliktojo amžiaus raštija / Lietuvių literatūros ir tautosakos institutas; red. S. Narbutas. – Vilnius, 2000. – P. 201–275.

31. Łatyszonek, O. Polityczne aspekty przedstawienia średniowiecznych dziejów ziem białoruskich w historiografii Wielkiego Księstwa Litewskiego XV–XVI w. / O. Łatyszonek // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2006. – №25. – S. 5–44.

32. Petrauskas, R. Socialiniai ir istoriografiniai lietuvių kilmės iš romenų teorijos aspektai / R. Petrauskas // Literatūros istorija ir jos kurėjai / Lietuvių literatūros ir tautosakos institutas; red. S. Narbutas. – Vilnius, 2004. – P. 270–285.

33. Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; отв. ред. Б.А. Рыбаков. – Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / Сост., авт. предисл. и ред. т. Н.Н. Улащик. – Москва: Наука, 1975. – 233 с.

34. Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, отв. ред. Б.А. Рыбаков. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / Сост., авт. предисл. и ред. т. Н.Н. Улащик. – Москва: Наука, 1980. – 305 с.

35. Cromerus, M. De origine et rebus gestis Polonorum libri XXX [Electronic resource] / M. Cromerus. – Basilea: Ioannes Oporinus, 1558. – 11, 720, 70 p. – Mode of access: http://dlibra.biblioteka.tarnow.pl/dlibra/doccontent?id= 126&from=FBC. – Date of access: 16.03.2011.

36. Dlugossius, J. Annales seu Cronicae incliti Regni Poloniae: libri 12 / J. Dlugossius. – Varsavia: PWN, 1964–2001. – Liber 1–2 / Editionem curavit et introductio I. Dąbrowski; textum recensuit atque praefatio instruxit V. Semkowicz-Zaremba; comment. C. Pieradzka, B. Modelska-Strzelecka. – 1964. – 468 p.

37. Bielski, M. Kronika, tho iesth Historya Swiata [Electronic resource] / M. Bielski. – Kraków: Mattheusz Siebeneicher, 1564. – 5, 468, 11 l. – Mode of access: http://www.wbc.poznan.pl/dlibra/doccontent?id=3650&from=FBC. – Date of access: 23.03.2010.

38. Улащик, Н.Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания / Н.Н. Улащик; отв. ред. В.И. Буганов; Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР. – Москва: Наука, 1985. – 264 с.

39. Чамярыцкі, В.А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў / В.А. Чамярыцкі; рэд. Я.С. Лур'е; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Янкі Купалы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 192 с.

40. Dobrowolski, K. Studia nad ideologią nauki i jej metodami w Polsce w wiekach średnich i w epoce Odrodzenia / K. Dobrowolski // Studia z pogranicza historii i socjologii. – Wrocław etc., 1967. – S. 84–193.

41. Глінскі, Я.С. Вобраз мінулага Вялікага Княства Літоўскага ў творах Аўгустына Ратунда / Я.С. Глінскі // Научные труды Республиканского института высшей школы: Исторические и психолого-педагогические науки: в 2 ч. – Ч. 1. – Минск, 2011. – С. 45–53.

42. Dlugossius, J. Annales seu Cronicae incliti Regni Poloniae: libri 12 / J. Dlugossius. – Varsavia: PWN, 1964–2001. – Liber 10: 1370–1405 / Consilium editorum: C. Pieradzka (praeses) et al.; textum recensuit et moderavit D. Turkowska; comment. S. Perzanowski. – 1985. – 448 p.

43. Bucevičiutė, L. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės erdvė: geopolitinė perspektyva XVI a. naratyvinuose tekstuose / L. Bucevičiutė // Lietuvos istorijos metraštis. – 2008. – №2. – P. 5–32.

44. Бортнік, І.А. Сацыяльна-палітычныя ідэі ў ананімным творы «Размова Паляка з Літвінам» / І.А. Бортнік // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. – Вып. 2. – Минск, 2009. – С. 224–243.

45. Марзалюк, І. Ідэалагічнае змаганне «Літвы» за роўны статус з «Каронай» (паводле беларуска-літоўскіх летапісаў XV-XVI стст.) / І. Марзалюк // Край – Kraj: Polonica-Albaruthenica-Lithuanica. – 2001. – № 1-2. – С. 42–48.

46. Флоря, Б.Н. О «Летописце Быховца» / Б.Н. Флоря // Источники и историография славянского Средневековья: сб. ст. – Москва, 1967. – С. 135–144.

47. Марзалюк, І. Тэрміналогія этнічнай гісторыі Беларусі 14–17 ст.: набліжэнне да рэаліяў, ці стварэнне новых міфаў? / І. Марзалюк // Гістарычны альманах. – 2003. – Т. 9. – С. 113–122.

48. Albertus Gastold, Palatinus Vilnensis, Bone Sphortie, Regine Polonie // Acta Tomiciana. – T. 7. – 1857. – P. 258–269.

49. Сагановіч, Г. Прывід нацыі ў імгле стэрэатыпаў / Г. Сагановіч // Беларускі гістарычны агляд. – 2003. – Т. 10. – Сш. 1–2. – С. 281–318. – Рэц. на кн. Марзалюк, І.А. Людзі даўняй Беларусі: этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII ст.) / І.А. Марзалюк. – Магілёў: МДУ імя А. Куляшова, 2003. – 324 с.

50. Самусік, А. Этнічныя працэсы і традыцыйныя беларуская культура / А. Самусік // Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан і інш.; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск, 2008. – С. 541–590.

51. Меховский, М. Трактат о двух Сарматиях / М. Меховский; введ., пер. и коммент. С.А. Аннинский; отв. ред. Б.А. Греков. – Москва; Ленинград: Изд-во АН СССР, 1936. – 288 с.

52. Mathia de Mechow. Chronica Polonorum [Electronic resource] / Mathia de Mechow. – Cracovia: Hieronymus Vietor, 1521. – 22, 379 p. – Mode of access: http://www.wbc.poznan.pl/dlibra/docmetadata?id=1994&from=&dirids=1. – Date of access: 12.09.2010.

53. Семянчук, А. Роля рымскай легенды ў фармаванні дзяржаўнай ідэалогіі Вялікага Княства Літоўскага / А. Семянчук // Białoruskie Zeszyty Historyczne. –2002. – №18. – S. 178–184.

54. Deutsche Biographische Enzyklopädie. – Band 9: Schlumberger – Thiersch / Herausgegeben von R. Vierhaus. – München: K G Saur, 2008. – 924 s.

55. Рассадзін, С. Скіфы / С. Рассадзін // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 6. – Кн. 1: Пузыны – Усая / Беларус. Энцыкл.; рэдкал. Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск, 2001. – С. 592.

56. Тит Ливий. История Рима от основания города: в 3 т. / Тит Ливий; ред. пер. М.Л. Гаспаров, Г.С. Кнабе; ред. коммент. В.М. Смирин; отв. ред. Е.С. Голубцова. – Москва: Наука, 1989–1993. – Т. 1. – 1989. – 576 с.

57. Dlugossius, J. Annales seu Cronicae incliti Regni Poloniae: libri 12 / J. Dlugossius. – Varsavia: PWN, 1964–2001. – Liber 7–8 / Consilium editorum: S. Budkowa et al.; textum recensuit et moderavit D. Turkowska; comment. C. Pieradzka. – 1975. – 436 p.

58. Петр из Дусбурга. Хроника земли Прусской / Петр из Дусбурга; изд. подг. В.И. Матузова. – Москва: Ладомир, 1997. – 384 с.

59. Barycz, H. Życie i twórczość Macieja z Miechowa / H. Barycz // Maciej z Miechowa. 1457–1523. Historyk, geograf, lekarz, organizator nauki. – Wrocław; Warszawa, 1960. – S. 15–74.

60. Tęgowski, J. Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów / J. Tęgowski. – Poznań; Wrocław: Wydawnictwo Historyczne, 1999. – 320 s.

61. Stryjkowski, M. Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego: 2 t. / M. Stryjkowski. – Warszawa: G. L. Glüksberg, 1846. – T. 2. – 1846. – 568 s.

62. Wolff, J. Ród Gedimina / J. Wolff. – Kraków: Drukarnia Wł. Ł. Anczyca i Spółki, 1886. – VIII, 172 s.

63. Wolff, J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa: Drukiem J. Filipowicza, 1895. – XXV, 698 s.

64. Scriptores rerum Polonicarum. – T. 2: Chronicorum Bernardi Vapovii pars posterior 1480–1535 / Wstęp i wyd. J. Szujski. – Kraków: AU, 1874. – XXXII, 367 p.

Рецензии

Фёдараў В.В.

ПЕРШАЕ СІСТЭМНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ ПА СІМВОЛІЦЫ ЎЛАДЫ ЯГЕЛОНАЎ

(Piech Z. Monety, pieczęcie i herby w systemie symboli władzy Jagiellonów. Warszawa: Wydawnictwo «DiG», 2003. – 365 s.)

У сучасных даследаваннях, прысвечаных манаршай уладзе і розным аспектам яе функцыянавання, важнае месца займае вывучэнне сімвалаў улады. Менавіта ў межы гэтай тэматыкі цалкам укладаецца адносна нядаўняя манаграфія вядомага польскага спецыяліста ў галіне сфрагістыкі і геральдыкі, прафесара Кракаўскага ўніверсітэта Зянона Пеха. Згодна з задумай аўтара, дадзеная праца прадстаўляе першы этап штудыяў, звязаных з даследаваннем ягелонскай уладнай сімволікі. У манаграфіі высвятляюцца месца і роля пячатак, манет і гербаў у сістэме сімвалаў улады манархіі Ягелонаў – адной з наймагутнейшых дынастый Цэнтральна-Усходняй Еўропы ў Познім Сярэдневеччы і пачатку Ранняга Новага часу. Сфрагістыка, менніцтва і геральдыка Ягайлы і яго нашчадкаў маюць даволі працяглую традыцыю даследавання. Але апошняя зводзілася, як правіла, да вывучэння толькі некаторых відаў крыніц, якія рэпрэзентавалі ўладную сімволіку Ягелонаў. Таму разглядаемую манаграфію З. Пеха можна назваць першым сістэмным даследаваннем сімвалаў улады манархіі гэтай дынастыі.

Паняцце «манархія Ягелонаў» З. Пех выкарыстоўвае ў вузкім сэнсе. Ён разумее пад ім толькі злучаныя ўніяй Каралеўства Польскае і Вялікае Княства Літоўскае, а не ўсе дзяржавы, трон якіх займалі нашчадкі Ягайлы (с. 41). Галоўнымі мэтамі сваей працы аўтар бачыць спробу прасачыць на матэрыялах сфрагістыкі, нумізматыкі і геральдыкі этапы эвалюцыі сімвалаў улады польска-літоўскай галіны Ягелонаў і прычын, якія абумовілі гэты працэс. Таму развіццё сімволікі ўлады Польшчы і ВКЛ у 1386–1572 гг. З.Пех разглядае ў шырокім палітычным, дынастычным і адмінстрацыйным кантэксце. Дзеля дасягення сваіх мэт аўтар карыстаецца шырокай базай крыніц, перш за ўсё, рэчавых і выяўленчых: пячаткамі, манетамі і медалямі, гербамі, скульптурнымі кампазіцыямі, кніжнымі мініятурамі і графікай, гербоўнікамі, габеленамі і інш.

Храналагічныя межы працы вызначаны часам, які традыцйна вылучаецца польскімі гісторыкамі як «ягелонскі перыяд». Гэтую эпоху адкрыла ўступленне на польскі трон Уладзіслава Ягайлы ў 1386 г. Праўда,

у першым раздзеле манаграфіі З. Пеха верхняя рыса даследавання з 1572 г. – смерці Жыгімонта Аўгуста крыху адсунута да 1596 г. – часу, калі памерла родная сястра апошяга з Ягелонаў, каралева Ганна. У структурным плане даследаванне падзяляецца на чатыры часткі.

Як вядома, існаванне сфрагістычных сістэм, характэрных для кожнага канкрэтнага манарха было адной з неабходных умоў функцыянавання дзяржавы. Пячатка з'яўлялася адным з самых асноўных носьбітаў інфармацыі аб дзяржаве і яе ўладцы, прэзентавала іх. Надпячаткавая выява напрамую прапагандавала сімвалы каралеўскай ці княскай улады. Таму менавіта першы раздзел разглядаемай працы прысвечаны іканаграфіі пячатак польскіх каралёў і вялікіх князёў літоўскіх. З.Пех цалкам згаджаецца з думкай, выказанай яшчэ ў 1910 г. М. Гумоўскім аб тым, што пячаткі Ягайлы адкрылі новую эпоху ў гісторыі польскай сфрагістыцы. Вядома аб існаванні маестатнай, вялікай, сярэдняй, і малай гербавых, а таксама сыгнетавай пячатак родапачынальніка дынастыі.

Ад старой, пястаўска-анжуйскай эпохі захаваўся тып маестатнай пячаткі, але пашырылася колькасць земскіх гербаў. Апошняе было не толькі маніфестацыяй тэрытарыяльнай структуры дзяржавы, але, магчыма, і сведчыла аб узросце ролі земляў, якія ўваходзілі ў склад каралеўства (с. 55). Аўтар адзначае, што з пачатковага перыяду кіравання Ягайлы сфармавалася і трохступеневая сістэма гербаў, якая мовай геральдыкі адлюстроўвала ўзаемаадносіны Польшчы з ВКЛ і адміністрацыйна-тэрытарыяльную структуру Кароны.

Традыцыі сфрагістыкі бацькі цалкам пераняли ягоныя сыны, Уладзіслаў Варнейчык і Казімір. Праўда, у часы апошняга пачаў назірацца застой у развіцці ягелонскіх пячатак, звязаны са стратай і неўжываннем пасля 1454 г. маестатнай пячаткі. Ролю апошняй стала адыгрываць вялікая канцлерская пячатка. Чарговае развіццё сфрагістыка польскіх каралёў атрымала ў часы наступніка Яна Альбрэхта, Аляксандра. Быў створаны новы тып пячатак, які выкарыстоўваўся з некаторымі мадыфікацыямі аж да згасання дынастыі. Так, адсутнасць маестатнай пячаткі паспрыяла да развіцця вялікай гербавай пячаткі, цэнтральнай кампазіцыяй якой з'яўлялася не выява манарха *in majestate*, а гербавая кампазіцыя (як на пячатцы Аляксандра) альбо дзяржаўны герб Польскага карелеўства – «Арол» (пячаткі Жыгімонта Старога і Жыгімонта Аўгуста).

Не меньш падрабязна, чым пячаткі польскіх каралёў, аўтар манаграфіі разглядае сфрагістыку вялікіх князёў літоўскіх у акрэслены перыяд. У лік апошніх уваходзілі і тыя, хто не належыў да дынастыі Ягелонаў.

Такі падыход, які не зусім адпавядае назве манаграфіі, З.Пех тлумачыць тым, што з 1386 г. князі, якія кіравалі ВКЛ, знаходзіліся пад вярхоўнай уладай польскага караля. Аўтар адзначае, што да Крэўскай уніі ў ВКЛ дамінаваў конны тып пячаткі. Пасля падзей 1385–1387 гг. гэтая традыцыя не знікла. Праўда, рэцэпцыя польскіх узораў, якая пачалася з таго часу, у значнай ступені закранула і сфрагістыку вялікіх князёў літоўскіх. Так, Вітаўт падобна Ягайлу, стварыў такую ж трохступеневую сістэму пячатак. З'яўленне галоўнейшай з іх, маестатнай, З. Пех справядліва звязвае з незалежніцкімі памкненнямі Кейстутавіча і датуе 1404 г. – часам, калі вялікая гербавая пячатка Кейстутавіча перастала ўжывацца (с. 93–94). Праўда, не трэба цалкам выключаць магчымасці, што пячатка з выявай Вітаўта *in majestate* магла з'явіцца і адразу пасля Салінскага з'езда 1398 г., але пачала ўжывацца толькі тады, калі для гэтага прадставілася належная палітычная каньюктура[1]. Свідрыгайла, як мяркуе З. Пех, хутчэй за ўсё, не меў маестатнай пячаткі. Даследчык тлумачыць гэта адсутнасцю арыгінала апошняй і няпэўнасцю звестак на гэты конт (с. 99). Але канчаткова адмятаць верагоднасць адваротнага ўсё ж такі не прыходзіцца, паколькі наступнік Вітаўта, магчыма, праводзіў палітыку, скіраваную на адасабленне Княства ад Кароны[2]. Да таго ж ягоны супернік, Жыгімонт Кейстутавіч, заняўшы віленскі стол, працягнуў традыцыю ўжывання маестатнай пячаткі.

